С. В. Марозава
С. П. Марозаў

# Культурная спадчына Уніяцкай Царквы Беларусі (1596–1839 г.)



С. В. Марозава
С. П. Марозаў

# Культурная спадчына Уніяцкай Царквы Беларусі (1596–1839 г.)

Гродна
“ЮрСаПрынт“
2023

pawet.net

УДК 271.4:930(476)"1596/1839"
ББК 63.3(4Беи)4
М63

главы I–III, V–X – С. В. Марозава;
глава XI – С. П. Марозаў;
глава IV, Заключэнне – сумеснае аўтарства.

**Рэцэнзенты:**

*Галіна Аляксандраўна Флікоп-Світа,*
кандыдат мастацтвазнаўства, старшы навуковы супрацоўнік аддзела выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі;

*Bogumiła Jędrzejewska,*
прафесар, доктар біялагічных навук, загадчык аддзела біягеаграфіі Інстытута млекакормячых Польскай акадэміі навук, Белавежа.

**Марозава, С. В.**
**Марозаў, С. П.**
М63 Культурная спадчына Уніяцкай Царквы Беларусі (1596–1839 г.)/ С. В. Марозава, С. П. Марозаў – Гродна: "ЮрСаПрынт", 2023. – 298 с.

ISBN 978-985-7257-71-3.

Манаграфія прысвечана ўдзелу Уніяцкай Царквы Беларусі (1596–1839 г.) у культуратворчых працэсах канца XVI – першай паловы XIX ст. і яе ўкладу ў развіццё адукацыі, кніжнай культуры, архітэктуры, скульптуры, жывапісу, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, музыкі і тэатра Беларусі. Паказаны лёс культурнай спадчыны Уніяцкай Царквы ў XIX ст.

Прааналізавана гістарыяграфія царкоўнай Уніі як з'явы культуры. Гісторыка-культурная спадчына Уніі і адраджэнне Беларускай Грэка-Каталіцкай Царквы разгледжаны скрозь прызму сучаснага канцэпта "месцы памяці".

Кніга прызначана для ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй і культурай Беларусі.

**УДК 271.4:930(476)"1596/1839"**
**ББК 63.3(4Беи)4**

**ISBN 978-985-7257-71-3**

© Марозава С. В., Марозаў С. П., 2023
© "ЮрСаПрынт", афармленне, 2023

# УВОДЗІНЫ



*Грамата Берасцейскай уніі 1596 г.*
*Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Украіны ў Львове*

Пошукі беларускай і ўкраінскай духоўнай і свецкай элітай месца сваіх земляў і народаў у еўрапейскіх духоўна-культурных і рэлігійна-палітычных працэсах другой паловы XVI ст. прывялі іх да заключэння ў 1596 г. Берасцейскай царкоўнай уніі. Гэта была спроба пераадолець на рэгіянальным узроўні раскол хрысціянства. Імкненне да сінтэзу каштоўнасцей яго ўсходняга і заходняга адгалінаванняў – геаграфічна і гістарычна наканаваная адметнасць Беларусі. Геапалітычны фактар заўсёды быў вызначальным у гістарычным лёсе нашага народа.

Берасцейская унія стала паваротным момантам і адной з найбуйнейшых падзей канфесійнай гісторыі Усходняй Еўропы. Яна надала ўнікальнасць беларускай і ўкраінскай мадэлям царкоўна-рэлігійнага развіцця і стала важным укладам беларускага народа ў скарбніцу сусветнай цывілізацыі.

За час свайго існавання ўніяцкая версія хрысціянства істотна пацясніла пазіцыі традыцыйных рэлігій, сама ператварылася ў традыцыйны культавы інстытут і ў другой палове XVIII ст. стала канфесійнай дамінантай – заняла першае месца ў Беларусі па колькасці храмаў і вернікаў. Паводле царкоўнай статыстыкі за 1790 г., у беларускіх паветах Вялікага Княства Літоўскага (без усходняй часткі Беларусі, тады ўжо далучанай да Расіі) налічвалася 143 праваслаўных,

283 каталіцкіх і 1199 уніяцкіх прыходаў[1]. Напярэдадні падзелаў Рэчы Паспалітай уніяты мелі тут 8 епархій з 9300 прыходамі, 10300 святарамі, 4,5 мільёнамі вернікаў і 172 манастыры з 1458 манахамі[2]. Сацыяльную базу Уніі складалі дробная шляхта, гараджане і сяляне.

Дзейнасць Уніяцкай Царквы склала цэлую эпоху ў царкоўным і нацыянальным жыцці Беларусі, сфарміравала значны пласт айчыннай культуры. Яна спрыяла развіццю адукацыі, кнігадрукавання, архіўнай справы; пакінула значны след у мастацтве: архітэктуры, жывапісе, скульптуры, музыцы; пашырыла міжнародныя кантакты Беларусі і садзейнічала яе збліжэнню з еўрапейскай культурнай прасторай. Многія даследчыкі (Адам Станкевіч, Уладзімір Конан, Леанід Лыч, Іван Трацяк, Рышард Радзік, Леанід Цімашэнка, Барбара Скінэр і інш.) лічаць, што ўніяцкае веравызнанне стала фактарам фарміравання беларускай культурнай ідэнтычнасці, а ў канкрэтна-гістарычных умовах канца XVIII – першай паловы XIX ст. з’яўлялася фактарам самасцвярджэння беларускага народа і яго этнаабароны.

Нягледзячы на неаднаразовую дэлегалізацыю (у 1839 г. на землях Беларусі, 1875 г. на Падляшшы, 1946 г. в Украіне), Грэка-Каталіцкая Царква дзейнічае і сёння, адроджаная на хвалі рэлігійнага “рэнесансу” на мяжы XX–XXI ст.

Перабудова, здабыццё нашай краінай суверэнітэту актуалізавалі ў грамадстве і навуцы пытанне аб гістарычнай і нацыянальнай спецыфіцы Беларусі, а ў яго кантэксце – пытанне аб месцы і статусе Беларусі ў сям’і хрысціянскіх народаў. З 1990-х г. тэма царкоўнай Уніі,

[1] Грыцкевіч А. П. Рэлігійнае пытанне і знешняя палітыка царызму перад падзеламі Рэчы Паспалітай // Весці Акадэміі навук БССР. Серыя грамадскіх навук. 1973. № 6. С. 62.

[2] Марозава С., Філатава А. Уніяцкая царква // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 6, кн. 1. Мінск, 2001. С. 584.

занядбаная у савецкі час, стала прадметам павышанай увагі айчыннай і замежнай навукі. Найбольш цікавяць даследчыкаў тыя змены, якія Унія ўнесла ў непасрэдны геапалітычны і культурны кантэкст народаў, і тая спадчына, якую яна пасля сябе пакінула.

***Мэта нашага даследавання*** – ахарактарызаваць удзел Уніяцкай Царквы Беларусі (1596–1839 г.) у культуратворчых працэсах канца XVI – першай паловы XIX ст. і спадчыну, якую яна пасля сябе пакінула.

Для дасягнення мэты прадугледжана ***вырашэнне наступных задач***:

♦ даказаць, што царкоўная Унія як з'ява культуры мае значны пласт прысвечанай ёй навуковай літаратуры і сваіх даследчыкаў – аўтарытэтных вучоных розных галін гуманітарных ведаў з Беларусі і замежжа;

♦ вызначыць новыя з'явы і павевы, прыўнесеныя Уніяцкай Царквой у беларускую культуру ў галіне адукацыі, кніжнай культуры, архітэктуры, жывапісу, скульптуры, музычнага, тэатральнага, дэкаратыўнапрыкладнога мастацтва, і ахарактарызаваць уклад Уніі ў развіццё гэтых галін культуры;

♦ прасачыць лёс культурнай спадчыны Уніяцкай Царквы ў XIX ст.;

♦ разглядзець гісторыка-культурную спадчыну Уніі і адраджэнне Беларускай Грэка-Каталіцкай Царквы скрозь прызму канцэпцыі "месцаў памяці".

Аб'ектам даследавання з'яўляецца канфесійная гісторыя Беларусі. Прадмет даследавання – праявы "берасцейскага працэсу" 1596–1839 г. у сферы культуры.

У аснову даследавання пакладзены прынцыпы аб'ектыўнасці і гістарызму. Яно праведзена з выкарыстаннем каштоўнаснага і сістэмна-структурнага падыходаў і ***грунтуецца на наступных тэарэтыка-метадалагічных падыходах***:

♦ рэлігійныя ўяўленні кожнага народа развіваюцца па-свойму, адпаведна умовам яго жыцця;

♦ хрысціянскія канфесіі прыстасоўваюцца да канкрэтных нацыянальных, сацыяльных і дзяржаўных умоў. Беларускае хрысціянства ў розныя гістарычныя эпохі набывала адпаведныя царкоўныя і культурныя формы. Уніяцтва – адзін з этнаадаптыўных сродкаў і фактар прыстасавання хрысціянскай царквы да новых гістарычных умоў функцыянавання беларускага грамадства;

♦ адмова ад падзелу хрысціянскіх кафесій, што існавалі ў мінулым у Беларусі, на сапраўдныя і памылковыя, гістарычныя і негістарычныя, а звязаныя з імі культурныя тыпы – на перша- і другарадныя;

♦ спецыфіка гістарычнага развіцця Беларусі ў мінулым, у тым ліку ў рэлігійнай сферы, шмат у чым вызначалася геапалітычным становішчам;

♦ Беларусь з'яўляецца паўнавартасным і суверэнным суб'ектам гісторыка-цывілізацыйнага працэсу, а не аб'ектам волі суседніх дзяржаў. Берасцейская унія – гэта варыянт набыцця ўласнай рэлігійнай ідэнтычнасці ва ўмовах супрацьстаяння і ціску Усходу і Захаду, спроба займець сваё месца ў еўрапейскім рэлігійна-культурным хрысціянскім раскладзе;

♦ Царква – важны інстытут культуры і фактар дзяржаватварэння, прэтэндэнт на ролю правадыра этнасу;

♦ міжканфесійныя адносіны – форма дыялогу культур;

♦ рэлігія і Царква – адна з формаў праявы нацыянальнай культуры; канфесійны фактар – своеасаблівы этнічны дэтэрмінатыў народа; духавенства з'яўляецца прадстаўніком і лідарам народа не ў меншай ступені, чым яго дзяржаўныя, палітычныя, грамадскія і культурныя дзеячы.

# Берасцейская унія як з’ява культуры: гістарыяграфічнае асэнсаванне




*Выданні, прысвечаныя Берасцейскай царкоўнай уніі ды Уніяцкай Царкве*

- *З гісторыі пастаноўкі пытання*
- *Сучасная беларуская гістарыяграфія*
- *Сучасная замежная гістарыяграфія*

## З гісторыі пастаноўкі пытання

Цікавасць да гісторыі Уніяцкай Царквы мае 400-гадовую традыцыю. Першыя старонкі яе гісторыі пісаліся ў канцы XVI ст. На іх уздымаліся пытанні мовы, адукацыі, навукі, культурных традыцый, пераймання дасягненняў заходнееўрапейскай цывілізацыі, захавання ідэнтычнасці, неабходнасці абуджэння духоўнага жыцця. Уласна навуковае вывучэнне гісторыі Уніяцкай Царквы пачалося ў XIX ст. За стагоддзі, што прайшлі пасля Берасцейскага сабора 1596 г., вакол Уніі назапасілася велізарнае мора літаратуры рознай навуковай вартасці[3]. Яе аўтары, прадстаўнікі розных эпох, краін і народаў, у сваіх даследаваннях часам выходзілі і ў свет культуры.

У канцы XIX – пачатку XX ст. у Вільні, Кіеве і Пецярбургу выйшлі кнігі, прысвечаныя персаналіям знакавых уніяцкіх культурна-рэлігійных дзеячаў[4] ды

[3] Марозава С. Берасцейская царкоўная унія 1596 г. у беларускай гістарыяграфіі. Гродна, 2002.

[4] Трипольский Н. Униатский митрополит Ипатий Потей и его проповедническая деятельность. Киев, 1878; Бобровский П. О. Михаил Кириллович Бобровский (1785–1848), ученый, славист-ориенталист. СПб., 1889; Недельский С. Униатский митрополит Лев Кишка и его значение в истории унии. Вильна, 1893; Турук Ф. Униатский митрополит Иосиф Вельямин Рутский (1613–1637) и его значение в истории униатской Западной русской церкви. Петроград, 1916.

ўніяцкай абраднасці[5]. Праўда, царская, а ўслед за ёй савецкая гістарыяграфія настойліва праводзіла думку, што значэнне беларускага культурнага фактару мела дзейнасць толькі праваслаўных друкарань, бібліятэк, школ, жывапісцаў, пісьменнікаў і г.д.

У самой Беларусі ў 1920-я г. зараджаецца навуковая цікавасць да выданняў уніяцкіх аўтараў і друкарняў як да помнікаў беларускага пісьменства, літаратуры і кнігадруку (В. Ластоўскі[6]), да базыльянскага ордэна з яго школамі як да культурнай сілы (А. Савіч[7]).

Аднак сталінізм, а потым застойны перыяд затрымалі распрацоўку гісторыі Уніі ў СССР – яе трактоўка вярнулася ў рэчышча імперскай гістарыяграфіі XIX – пачатку XX ст. і папоўніла негалосны спіс табуіраваных тэм, якія старанна абміналі гісторыкі. Разглядаючы Унію праз прызму ўсходнеславянскага адзінства, аўтары небеспадстаўна бачылі ў ёй сілу, якая дыферэнцыравала беларускі народ ад рускага, што, аднак, ёй ставілася ў віну.

У 1940-я – 1980-я г. грунтаваная на нацыянальным нігілізме савецкая канцэпцыя гісторыі Беларусі штучна звужала цікавасць да Уніі, абмяжоўвала яе даследаванне вузкім кругаглядам ідэалогіі і палітыкі, навязвала комплекс яе культурнай непаўнавартаснасці. Унія стала падчаркай беларускай гістарычнай навукі.

Тым не менш, у 1960-я г. у гістарыяграфіі БССР з'явілася новая тэндэнцыя – традыцыю замоўчвання

5 Хойнацкий А. Ф. Западнорусская церковная уния в ея богослужении и обрядах. Киев, 1871.

6 Ластоўскі В. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі: Спроба паясьніцельнай кнігопісі ад канца X да пачатку XIX стагодзьдзя. Коўна, 1926.

7 Савич А. Западнорусские униатские школы // Труды БГУ. Минск, 1922. № 2–3.

і дыскрэдытацыі пачынае падточваць асцярожная цікавасць да Уніі і яе дзеячаў. У 1970-я – 1980-я г. гэта тэндэнцыя ўзмацняецца (працы Уладзіміра Кароткага і Кацярыны Пракошынай пра Мялеція Сматрыцкага; Леаніда Аляксеева з Масквы і Генадзя Каханоўскага пра базыльянскага архімандрыта і гісторыка Ігната Кульчынскага). Мікалай Улашчык выказваў меркаванне аб датычнасці Уніяцкай Царквы да беларускага летапісання. Ён канстатаваў: *“Наколькі шмат высунула навуковых дзеячаў вясковае ўніяцкае духавенства, настолькі беднымі засталіся праваслаўныя, хаця ўмовы для іх былі несуразмерна больш спрыяльныя”*[8].

Філосафы, філолагі, культуролагі, мастацтвазнаўцы пачалі даследаваць у межах гісторыі нацыянальнай культуры яе амаль нераспрацаваную ўніяцкую частку і тым паказвалі ўдзел гэтай канфесіі ў культуратворчых працэсах XVII–XVIII ст. Элеанора Вецер, Надзея Высоцкая, Юрый Хадыка расшуквалі, сістэматызавалі і апісвалі ўніяцкія абразы, Ала Лявонава вывучала творы скульптуры, Анатоль Кулагін і Уладзімір Дзянісаў – храмабудаўніцтва.

Упершыню за савецкі час прадметам спецыяльнага даследавання стаў буйны ўніяцкі асяродак, якім у XVII–XVIII ст. быў Супрасль. Культуролаг Юрый Лабынцаў паказаў яго як беларускі культурна-асветны цэнтр; даказаў, што кірылічныя выданні базыльянскай друкарні ў Супраслі – значная з’ява беларускай нацыянальнай і ўсёй ўсходнеславянскай культуры[9].

---

[8] Улашчык М. М. Хроніка // Скарыніч: Літаратурна-навуковы гадавік. Мінск, 1991. Вып. 1. С. 121.

[9] Лабынцев Ю. А. Кирилловское книгопечатание в Супрасле и его роль в развитии восточнославянских культур XVII–XVIII веков: Автореф. дис. … канд. филол. наук. М., 1980.

Этнолагі прыйшлі да высновы, што ў другой палове XVII–XVIII ст. асноўны этнічны масіў беларускага народа трымаўся ўжо не праваслаўнай, а ўніяцкай веры[10]. Валянцін Грыцкевіч даказаў факт дамінацыі ўніятаў у канфесійнай структуры насельніцтва Беларусі ў канцы XVIII ст. і асудзіў кацярынінскую палітыку падаўлення Уніі, якую ўсхваляла ўся папярэдняя афіцыйная гістарыяграфія[11].

Шмат новага для разумення культурна-рэлігійных працэсаў на беларускіх землях у канцы XVI–XVII ст. далі працы 1970-х – 1980-х г. філосафаў Уладзіміра Конана і Сямёна Падокшына, гісторыка культуры Георгія Галенчанкі, філолага Адама Мальдзіса. Культурнае ажыўленне, літаратурны ўздым у Беларусі пасля 1596 г. сталі ўспрымацца ў навуцы як неаспрэчны факт. Дыскутаваліся яго матывы: увядзенне Уніі ці адпор ёй?

Аднак да 1990-х г. тэма "Унія і культура" не ўваходзіла ў лік даследчых прыярытэтаў беларускіх навукоўцаў. З'яўленне спецыяльных манаграфічных прац пра дзеячаў Уніі[12] ды асветнікаў-базыльян[13] было маг-

---

[10] Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя / В. К. Бандарчык, І. У. Чаквін, І. Г. Углік і інш. Мінск, 1985. С. 132, 138, 147, 149.

[11] Грыцкевіч А. П. Рэлігійнае пытанне і знешняя палітыка царызму перад падзеламі Рэчы Паспалітай // Весці Акадэміі навук БССР. Серыя грамадскіх навук. 1973. № 6. С. 62–71.

[12] Lewicki K. Książe Konstanty Ostrogski a unia brzeska 1596. Lwów, 1933; Семчук С. Митрополит Рутський. Торонто, 1967; Szegda M. Działalność prawno-organizacyjna metropolity Jozefa IV Welamina Rutskiego (1613–1633). Warszawa, 1967; Panucević V. Sv. Josaphat Archijapiskap Polacki. 1623–1963. Chikago, 1963; Żochowski S. Unia Brzeska w Polsce XVII wieku: Monografia Ks. Cypriana Żochowskiego metropolity Calej Rusi i Arcybiskupa Połockiego (1635–1693). Brysbane-Londyn, 1988.

[13] Ваврик М. М. Нарис розвитку і стану василіянського чина XVII–XX ст.: Топографічно-статистична розвідка. Рим, 1979;

чымым толькі за межамі СССР. Іх аўтарамі з’яўляліся ўкраінскія, польскія, а таксама беларускія эмігранцкія даследчыкі.

## Сучасная беларуская гістарыяграфія

Разняволенне навуковай думкі на мяжы 1980-х – 1990-х г. зрабіла занядбаную раней гісторыю канфесій адной з прыярытэтных тэм беларускай гістарыяграфіі, якая павярнулася тварам і да старой уніяцкай праблематыкі. Прыйшло разуменне, што без уліку канфесійнага складніку немагчыма поўнае і аб’ектыўнае вывучэнне айчыннай гісторыі. Даследаванні апошняга часу дазволілі па-новаму ацаніць ролю царкоўна-рэлігійнага фактару ў дзяржаўным, этнанацыянальным і культурным жыцці народа.

Стала відавочным, што нягледзячы на неабсяжнае мора кніг і артыкулаў пра Унію, яна застаецца малавядомай; што яе дарэвалюцыйныя і савецкія даследчыкі пісалі гісторыю не Уніі, а антыуніі. З-за панавання пэўных стэрэатыпаў і догмаў (тэорыя афіцыйнай народнасці, партыйна-класавы падыход, спрошчана зразуметая ідэя славянскага адзінства) яны не змаглі раскрыць усю паўнату феномена ўніяцтва, этнакультурная сутнасць якога была больш складанай, чым гэта ўяўлялася да нядаўняга часу. Побач з даследаваннем уніяцтва ў традыцыйных – палітычным і рэлігійным – вымярэннях з’явілася моцная тэндэнцыя да яго разгляду ў кантэксце культурных працэсаў канца XVI–XX ст., і гэта вымярэнне прыносіла найбольш пазітыўныя ацэнкі дзейнасці Уніяцкай Царквы.

---

Pidłypczak–Majerowicz M. Bazylianie w Koronie i na Litwie: Szkoly i książki w działalności zakonu. Warszawa-Wrocław, 1986.

Канферэнцыі (у тым ліку замежныя[14]), дыскусіі, публікацыі 1990-х г. істотна ўзбагацілі разуменне феномена Уніі. Яны ўнеслі ў гістарыяграфію шэраг новых пазіцый: прызнанне ідэолагаў і дзеячаў Уніі літаратурнымі аўтарытэтамі і іх ролі ў развіцці нацыянальнай культуры, а самой Уніі – важнай састаўной часткай гісторыі культуры; прызнанне ідэалагічна-мастацкіх вартасцей літаратурнай спадчыны Мялеція Сматрыцкага ўніяцкага перыяду жыцця і гуманістычнага характару прац Іпація Пацея; назіранне, што пераймание досведу заходняга хрысціянства не перашкаджала Уніяцкай Царкве адстойваць сваю адметнасць. Было падвергнута сумневу палажэнне аб асіміляцыі беларусаў праз Уніяцкую Царкву; "легалізаваны" яе ўклад у развіццё архітэктуры, жывапісу, музыкі, асветы; прызнаны факт небезбалеснасці ліквідацыі Царквы для беларускага народа і яго культуры і г.д.

Гісторыя ўніяцкага адгалінавання хрысціянства, дзейнасць яго падзвіжнікаў з'явіліся на старонках вучэбнай літаратуры. Пашырыліся кола даследчыкаў царкоўнай Уніі, сам прадмет даследавання і яго храналагічныя межы. На змену абагульняючай тэме "Берасцейская царкоўная унія" прыйшло паглыбленае вывучэнне асобных яе бакоў і прыватных пытанняў. Пачалося філасофскае асэнсаванне гісторыі Уніі.

З першых жа гадоў XXI ст. гэтыя канцэптуальныя навацыі далі сябе знаць грунтоўнымі навуковымі пра-

[14] Unia Brzeska. Geneza, dzieje i konsekwencje w kulturze narodów słowiańskich. Kraków, 1994; Берестейська унія та українська культура XVII століття: Матеріали Третіх "Берестейських читань". Львів, Київ, Харьків, 20–23 червеня 1995 р. Львів, 1996; Unia brzeska z perspektywy czterech stuleci: Materiały międzynarodowego sympozium naukowego, Lublin, 20–21/IX 1995 r. Lublin, 1998.

цамі: дысертацыямі, манаграфіямі, салíднымі артыкуламі, выданнямі крыніц.

Значную ролю ў фарміраванні сучаснага навуковага ўяўлення аб феномене Уніяцтва адыграла канцэптуальная праца беларускага філосафа, доктара філасофскіх навук ***Сямёна Падокшына "Унія. Дзяржаўнасць. Культура (Філасофска-гістарычны аналіз)"***[15]. Вучоны абгрунтаваў у ёй палажэнне аб гістарычнай перадвызначанасці Берасцейскай уніі геапалітычным становішчам Вялікага Княства Літоўскага, якое прымушала шукаць шляхі захавання палітычнай і духоўна-культурнай незалежнасці дзяржавы. Творцаў і прыхільнікаў Уніі філосаф аднёс да прадстаўнікоў спецыфічнага тыпу гістарычных дзеячаў "на мяжы культур" і прызнаў здабыткі нацынальна-культурнай дзейнасці на базе Уніяцтва.

Характэрныя рысы менталітэту гэтага тыпу дзеячаў "на мяжы культур" – імкненне да культурнага дыялогу, рэлігійнай згоды ў межах хрысціянства, да інтэграцыі і сінтэзу паміж Усходам і Захадам – Сямён Падокшын раскрыў на прыкладзе галоўнага "архітэктара" Берасцейскай уніі ў сваёй працы ***"Іпацій Пацей: Царкоўны дзеяч, мысліцель, пісьменнік на пераломе культурна-гістарычных эпох"***[16].

Доктар філасофскіх навук ***Уладзімір Конан*** лічыць Берасцейскую унію формай выяўлення беларускай ідэі, трэцяй духоўнай сілай паміж нацыя-

---

[15] Падокшын С. А. Унія. Дзяржаўнасць. Культура (Філасофска-гістарычны аналіз). 2-е выд. Мінск, 2000.

[16] Падокшын С. А. Іпацій Пацей: Царкоўны дзеяч, мысліцель, пісьменнік на пераломе культурна-гістарычных эпох. Мінск, 2001.

налізаванымі ў XVII–XVIII ст. расійскім Праваслаўем і польскім Каталіцызмам[17].

Кандыдат культуралогіі ***Іван Трацяк*** у манаграфіі ***“Беларускае каталіцкае духавенства ля вытокаў сацыякультурнай ідэнтыфікацыі”*** выказаў упэўненасць, што адмаўленне ўплыву на беларускую культуру любой з распаўсюджаных на нашых землях хрысціянскіх канфесій абарочваецца памылковым разуменнем яе спецыфікі. Ён лічыць, што Грэка-Каталіцтва было “створана” для абароны ад экспансіі з усходу; што Уніяцкая Царква ў пачатку сваёй дзейнасці магла існаваць толькі пры падтрымцы ўладаў, але потым стала неад'емнай часткай беларускага грамадства, захавальнікам мовы і культуры мясцовага насельніцтва. Скасаванне Брэсцкай уніі, калі для далучэння ўніятаў да пануючай веры выкарыстоўвалі вайсковыя часткі, а не місіянераў, аўтар называе брыдкай старонкай гісторыі[18].

Даследаваннем працэсу фарміравання культурнай ідэнтычнасці Грэка-Каталіцкай Царквы на беларускіх землях у XVII–XVIII ст. цяпер займаецца магістр гістарычных навук ***Кірыл Корбут***[19]

---

[17] Конан У. М. Беларуская нацыянальная ідэя: гістарычны аспект і сучасныя праблемы // Літаратура і Мастацтва. 1998. 12 чэрвеня. С. 5.

[18] Трацяк І. І. Беларускае каталіцкае духавенства ля вытокаў сацыякультурнай ідэнтыфікацыі. Гродна, 2013.

[19] Корбут К. Літургічныя пытанні ў “Артыкулах” Брэсцкага царкоўнага сабору // Беларускі гістарычны часопіс. 2022. № 7. С. 38–43; яго ж: Асноўныя напрамкі даследавання культурнай спадчыны Грэка-каталіцкай царквы ў беларускай гістарыяграфіі // Научные труды Республиканского института высшей школы. 2021. Вып. 21, ч. 1. С. 210–217; яго ж: Месяцаслоў Грэка-каталіцкай царквы як фактар фарміравання новай культурнай традыцыі // Религия и общество – 15: сборник научных статей. Могилев, 2021. С. 202–204.

Культуратворчай дзейнасці і культурнай спадчыне Уніяцкай Царквы Беларусі прысвяцілі канцэптуальныя працы гісторыкі Леанід Лыч, Святлана Марозава і культуролаг Алесь Суша.

У кнізе доктара гістарычных навук, прафесара ***Леаніда Лыча "Уніяцкая царква Беларусі: этнакультурны аспект"*** яе дзейнасць разгледжана скрозь прызму ўплыву на фарміраванне і захаванне нацыянальнай культуры і свядомасці беларусаў. Перыяд пасля 1839 г. ахарактарызаваны як наступленне на беларускасць і знішчэнне багатай культурнай спадчыны Царквы[20].

Стварэнне, функцыянаванне і ліквідацыя Уніяцкай Царквы разгледжаны скрозь прызму этнічнасці і культуры ў манаграфіі доктара гістарычных навук, прафесара ***Святланы Марозавай "Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1839 гады)"***[21]. Уніяцкая версія хрысціянства трактуецца аўтарам як з'ява культурна-цывілізацыйнага памежжа. Яна стваралася на візантыйска-славянскай аснове з дапушчэннем заходніх запазычанняў і развівалася ва ўзаемадзеянні гэтых дзвюх традыцый, якія то ўжываліся разам, то спрачаліся за прыярытэт.

1596 год, як паказана ў манаграфіі, даў моцны штуршок актывізацыі інтэлектуальна-культурнага жыцця, выклікаў усплёск актыўнасці беларускага этнасу, стаў каталізатарам росту яго этнічнай, культурнай, канфесійнай і гістарычнай самасвядомасці. За час свайго існавання Уніяцкая Царква сфарміравала магутны пласт культуры (у галіне кнігадрукавання,

[20] Лыч Л. Уніяцкая царква Беларусі: этнакультурны аспект. 2-е выд. Мінск, 2011.

[21] Марозава С. В. Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1839 гады). Гродна, 2001.

архітэктуры, жывапісу, скульптуры, музыкі) з выразна акрэсленымі нацыянальнымі асаблівасцямі. Рэвізія ўніяцкага культурна-абрадавага комплексу ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. абярнулася вымываннем гэтага пласту нацыянальнай культуры.

Абгрунтавана палажэнне, што Уніяцкая Царква праводзіла сваю мэтанакіраваную моўную лінію, арыентаваную на ўласную паству – просты беларускамоўны народ і дробную шляхту. Яе сутнасць – увядзенне ў сакральную сферу беларускай мовы пры захаванні кананічнасці царкоўнаславянскай мовы, якая падвяргалася беларусізацыі. Ужыванне польскай мовы з’яўлялася адлюстраваннем змены моўных арыентацый у грамадстве. Прыняцце Уніі не змяняла этнічнай тоеснасці вернікаў – яны аднолькава з праваслаўнымі лічылі сябе, сваю веру, абрады, храмы, духавенства, прыходы, населеныя пункты “рускімі”.

У манаграфіі ***Святланы Марозавай “Сваёй веры ламаць не будзем…”: супраціў дэўнізацыі ў Беларусі (1780–1839 гг.)”*** паказана рэакцыя беларускага народа на дэмантаж Уніяцкай Царквы ўладамі Расійскай імперыі ў 1780–1839 г. і абарона вернікамі сваіх сакральных рэліквій: абразоў і скульптур, кніг і арганаў, якія выдалялі з храмаў, ды і саміх храмаў ад пераварочвання ў пануючую веру[22].

Кандыдат гістарычных навук ***Дзяніс Лісейчыкаў*** спецыялізуецца на вывучэнні гісторыі ўсходнехрысціянскіх цэркваў Беларусі. Прадмет яго даследавання – такі сацыяльны пласт грамадства як уніяцкае парафіяльнае святарства XVI–XIX ст. Яно ўтварала даволі закрытую сацыяльную групу са сваімі

[22] Марозава С. “Сваёй веры ламаць не будзем…”: супраціў дэўнізацыі ў Беларусі (1780–1839 гг.). Гродна, 2014.

нормамі паводзін, выхавання дзяцей, вядзення гаспадаркі, стаўлення да штодзённага і сакральнага.

Манаграфія ***Д. В. Лісейчыкава “Штодзённае жыццё ўніяцкага парафіяльнага святара беларуска-літоўскіх зямель 1720–1839 гг.”*** – гэта цікавая гісторыя жыццёвых светаў “маленькіх людзей”[23]. У ёй разглядаюцца такія пытанні, як уплыў белага духавенства на этнакультурныя і палітычныя працэсы на беларуска-літоўскіх землях, мова штодзённага ўжытку святара, узровень яго адукацыі, стаўленне да ўніяцкага святарства з боку дзяржавы, змены яго маёмаснага стану, стаўленне святароў да падрыхтоўкі і скасавання Уніі.

Паказаны асаблівасці сямейнага выхавання, адукацыі і кар’еры святара. Абвяргаецца стэрэатып, што ўніяцкія святары былі малаадукаванай часткай грамадства. Гэту групу вылучала знаёмства з кніжнай культурай. У XVIII – пачатку XIX ст. менавіта святарства аказвала найбольшы ўплыў на менталітэт мясцовага насельніцтва.

Ахарактарызаваны стан святарскай гаспадаркі, апісаны працоўныя абавязкі святара (душпастырская дзейнасць, утрыманне бібліятэк, нагляд за могілкамі, рэгістрацыя цудаў), яго вольны час. Прычыну нізкай грамадска-палітычнай актыўнасці белага ўніяцкага духавенства аўтар бачыць у яго сямейным становішчы і неабходнасці дбаць пра свае сем’і і забеспячэнне будучыні дзяцей.

Праца ***Д. В. Лісейчыкава “Святар у беларускім соцыуме: прасапаграфія ўніяцкага духавенства 1596–1839 гг.”*** створана на аснове метада прасапа-

[23] Лісейчыкаў Д. В. Штодзённае жыццё ўніяцкага парафіяльнага святара беларуска-літоўскіх зямель 1720–1839 гг. Мінск, 2011.

графіі – калектыўнай біяграфіі ўніяцкага духавенства XVI–XIX ст. Напісаная на дакументах і матэрыялах архіваў Беларусі і суседніх краін, манаграфія ўтрымлівае 8,5 тысяч біяграфій прадстаўнікоў беларускага ўніяцкага духавенства. Раскрываюцца пытанні лакалізацыі святарскіх фамілій, асабістага жыцця святароў, узаемаадносін са свецкай і духоўнай уладамі. Разгледжаны эканамічны бок залежнасці святара (фундушы, будаўніцтва цэркваў), рэлігійная канверсія вернікаў і духавенства і інш. Паказана, што ўніяцкія сем'і падарылі навуцы, адукацыі, мастацтву шмат выдатных дзеячаў: мысліцеля Францішка Савіча, пісьменніка Яна Баршчэўскага, мастака Івана Хруцкага, плеяду прафесараў Віленскага ўніверсітэта[24].

Дзяніс Лісейчыкаў з'яўляецца пачынальнікам выдавецкай серыі Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі "Святыні Вялікага Княства Літоўскага". Яе галоўная задача – сістэматызаваная публікацыя масавых крыніц па гісторыі асноўных канфесій на тэрыторыі Беларусі XVI–XVIII ст. Першае выданне серыі – ***"Уніяцкія цэрквы Вялікага Княства Літоўскага XVII ст.: матэрыялы генеральных візітацый"***[25].

Гісторыя Берасцейскай уніі пакінула багатую дакументальную спадчыну. Яна месціцца ў беларускіх і пераважна замежных архівах. Таму кожная публікацыя выяўленых даследчыкамі гістарычных крыніц адкрывае доступ да іх шырокага кола чытачоў і дае штуршок для новых навуковых распрацовак. Такую карысную паслугу для беларускай навукі і для амата-

[24] Лісейчыкаў Д. В. Святар у беларускім соцыуме: прасапаграфія ўніяцкага духавенства 1596–1839 гг. Мінск, 2015.

[25] Уніяцкія цэрквы Вялікага Княства Літоўскага XVII ст.: матэрыялы генеральных візітацый. Мінск, 2021 (Серыя "Святыні Вялікага Княства Літоўскага").

раў гісторыі Уніі таксама робіць ***тэматычнымі публікацыямі збораў дакументаў*** полацкі краязнаўца ***Мікалай Баўтовіч***[26].

Дысертацыя ***"Культурная спадчына грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі ў кантэксце дыхатаміі "Усход-Захад"***[27] і публікацыі кандыдата культуралогіі ***Аляксандра Сушы*** прысвечаны паказу спецыфікі матэрыяльнай і духоўнай спадчыны, якая шмат пацярпела ад войнаў, пажараў, урадавай палітыкі, але найбольш – ад ліквідацыі самога яе носьбіта – Уніяцкай Царквы.

У XIX ст. новыя ўладальнікі (Праваслаўная і Каталіцкая Цэрквы), як сцвярджае Алесь Суша, адаптавалі гэту спадчыну ў сістэму сваіх кашоўнасцей, а тое, што не магло быць безумоўна прынята, – тут не абыйшлося без страт. Найбольшыя страты панесла нематэрыяльная (духоўная) частка спадчыны. Музычная творчасць, пеўчыя традыцыі, абраднасць, інтэлектуальнае і манаскае жыццё, адукацыя Уніяцкай Царквы былі асуджаны на знікненне са спыненнем існавання іх носьбітаў. Матэрыяльную спадчыну з улікам яе каштоўнасці чакаў больш спрыяльны лёс. Але частка яе падверглася зменам да непазнавальнасці (перабудоўваліся храмы, змяняўся іх інтэр'ер, перапісваліся іконы і т.п.).

Манаграфія ***Сяргея Клімава "Базилиане"*** – першае ў беларускай гістарыяграфіі спецыяльнае даследаванне, прысвечанае гісторыі элітнага манаскага ордэна, які сфарміраваўся на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага ў XVII ст. 150 старонак кнігі –

[26] Полацкія пакутнікі: Збор дакумэнтаў. Полацак, 2000; Эпісталяцыя Сьвятога Язафата: Збор дакумэнтаў. Полацак, 2006.

[27] Суша А. А. Культурная спадчына грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі ў кантэксце дыхатаміі "Усход–Захад". Аўтарэф. дыс. ... канд. культуралогіі. Мінск, 2009.

гэта амаль 60 гадоў гісторыі малавядомага ордэна (1770-я – 1830-я г.), які "ўвабраў" у сябе эліту грамадства, – базыльяне паходзілі ў асноўным са шляхты і былі вельмі адукаванымі. Чалавек у ордэне праходзіў шлях ад пачатковай адукацыі да ступені доктара навук. Апісаны працэс рэкрутацыі ў ордэн, яго ўнутраная структура, грамадская дзейнасць[28]. Праўда, ордэн хутка згас на тэрыторыі Беларусі – да 1839 г. тут практычна не засталося яго кляштараў.

Кніга ***Леаніда Лаўрэша "Грэка-каталіцкая (уніяцкая) Царква на Лідчыне"*** – першае ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі краязнаўчае даследаванне на матэрыяле гісторыі Уніяцкай Царквы. Пасля разгляду важнейшых царкоўна-рэлігійных працэсаў у рэгіёне ў ёй прыведзены гістарычныя нарысы 15-ці мясцовых ўніяцкіх парафій з паказам перыпетый лёсаў іх святароў і паствы[29].

Для Святланы Марозавай, Дзяніса Лісейчыкава, Галіны Флікоп-Світы ўніяцкая праблематыка ў яе культурна-гістарычным аспекце з'яўляецца асноўным полем навуковага пошуку. Для Аляксандра Сушы, Сяргея Клімава, Івана Саверчанкі[30], Леаніда Лаўрэша – адзін з важных напрамкаў даследчай дзейнасці. Але названымі аўтарамі далёка не абмяжоўваецца кола сучасных беларускіх даследчыкаў гісторыі Уніяцкай Царквы і яе культурнай спадчыны. Да гэтых пытанняў звяртаецца ў кантэксце сваіх асноўных навуковых інтарэсаў даволі значны лік навукоўцаў.

Палемічную літаратуру і ідэйную барацьбу вакол Берасцейскай уніі па-новаму асэнсоўваюць філолаг

[28] Климов С. М. Базилиане. Могилев, 2011.
[29] Лаўрэш Л. Грэка-каталіцкая (уніяцкая) Царква на Лідчыне. Полацк, 2012.
[30] Саверчанка І. Апостал яднання і веры: Язэп Руцкі. Мінск, 1994.

***Іван Саверчанка***[31] і філосафы ***Наталля Кутузава***[32], ***Віктар Старасценка***[33], ***Дзмітрый Смалякоў***[34].

Важкім укладам у разуменне Берасцейскай уніі як сацыякультурнага феномена з’яўляецца прысвечаны ёй вялікі раздзел, напісаны вядучымі спецыялістамі, у фундаментальнай калектыўнай працы па гісторыі інтэлектуальнай культуры ***“Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі”***[35].

Культуратворчая дзейнасць і культурная спадчына Уніяцкай Царквы ўваходзіць у сферу навуковых інтарэсаў значнай групы даследчыкаў мастацтва. Сярод іх – доктар мастацтвазнаўства, член-карэспандэнт Беларускай акадэміі архітэктуры, прафесар ***Тамара Габрусь***[36]. Яна раскрыла ў сваіх працах працэс узрастання на беларускай глебе прынцыпаў мастацкага стылю

[31] Саверчанка І. Паэтыка і семіётыка публіцыстычнай літаратуры Беларусі XVI–XVII стст. Мінск, 2012; яго ж: Aurea mediocritas. Кніжна-пісьмовая культура Беларусі: Адраджэнне і ранняе барока. Мінск, 1998.

[32] Кутузова Н. Нация, религия и государственность в полемической литературе Беларуси конца XVI – первой половины XVII вв. 2-е дополненное изд. Минск, 2005.

[33] Старасценка В. У. Праблемы рэлігійна-палітычнага і нацыянальна-культурнага жыцця ў палемічнай публіцыстыцы (канец XVI – пачатак XVII ст.) // Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі: у 6 т. Т. 3: Рэфармацыя. Контррэфармацыя. Барока. Мінск, 2013. С. 36–66; Старостенко В. Становление национального самосознания белорусов: этапы и основополагающие идеи (X–XVII вв.). Могилев, 2001.

[34] Смалякоў Д. Сацыяльна-філасофскія погляды рэлігійных палемістаў у Беларусі канца XVI – сярэдзіны XVII стагоддзя. Мінск, 2020.

[35] Брэсцкая унія як сацыякультурны феномен // Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі: у 6 т. Т. 3: Рэфармацыя. Контррэфармацыя. Барока. Мінск, 2013. С. 197–285.

[36] Габрусь Т. В. Сакральнае дойлідства Беларусі: 1000-гадовая спадчына. Мінск, 2014; яе ж: Паэзія архітэктуры. Мінск, 2012; яе ж: Мураваныя харалы: Сакральная архітэктура беларускага барока. Мінск, 2001.

“віленскае барока”, які існаваў у арэале распаўсюджання Уніі ў другой і трэцяй чвэрці XVIII ст. і мае неафіцыйную назву “ўніяцкае барока”. На матэрыяле шматлікіх помнікаў (Сафійскі сабор у Полацку, цэрквы і манастыры базыльян у Беразвеччы, Барунах, Вольна, Талачыне, Багаяўленская і Крыжаўзвіжанская цэрквы ў Жыровіцах, Уваскрасенская царква ў Віцебску і інш.) гісторык архітэктуры паказала нацыянальную адметнасць гэтага вытанчанага стылю.

***Тамара Габрусь*** прапанавала новую мастацтвазнаўчую сістэматызацыю і класіфікацыю помнікаў драўлянага хрысціянскага храмабудаўніцтва Беларусі. Яна паказала адметныя асаблівасці нацыянальнага “нізавога”, ці драўлянага, барока; прывяла шмат архіўных фотаздымкаў і рэканструкцый такіх збудаванняў. Даследчыца лічыць навукова некарэктным падзел усёй сукупнасці помнікаў беларускага драўлянага сакральнага дойлідства па канфесійным прынцыпе на каталіцкія і праваслаўныя, што практыкуецца ў навуковай і навукова-папулярнай літаратуры. Пры гэтым поўнасцю ігнаруюцца асаблівасці ўніяцкага царкоўнага дойлідства, якое складала асноўную частку традыцыйнага драўлянага храмабудаўніцтва Беларусі XVII–XVIII ст. Уніяцкія храмы, найбольш пашыраныя ў той час, мелі асобную канфесійна-ідэалагічную праграму. Яны, як паказала Т. Габрусь, складаюць найбольш самабытную і значную частку нацыянальнай сакральнай архітэктурнай спадчыны, увасобленай ў дрэве, хаця б з прычыны таго, што на канец XVIII ст. уніятамі з’яўляліся звыш 80% насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага[37].

[37] Габрусь Т. В. Драўлянае хрысціянскае храмабудаўніцтва Беларусі. Мінск, 2020. С. 24, 33–34.

Пытанням уніяцкага храмабудаўніцтва і яго ролі ў фарміраванні аблічча беларускіх вёсак і гарадоў удзяляюць увагу вядомыя гісторыкі архітэктуры – доктар мастацтвазнаўства ***Анатоль Кулагін***[38] і акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ***Аляксандр Лакотка***, спецыяліст па праблеме эвалюцыі беларускай архітэктуры ў сусветным кантэксце і яе нацыянальных рысаў[39].

Гісторыя і архітэктура ўніяцкіх храмаў знайшла адлюстраванне ў шматтомным фундаментальным выданні “Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце”[40].

Спецыялістам па архітэктуры ўніяцкіх храмаў Беларусі, арганізацыі іх сакральнай прасторы з’яўляецца ***Ірына Ажашкоўская***[41].

---

[38] Кулагін А. М. Каталіцкія храмы Беларусі: энцыклапедычны даведнік. Мінск, 2000; 2008; яго ж: Праваслаўныя храмы Беларусі: энцыклапедычны даведнік. Мінск, 2001; 2007; яго ж: Шэдэўры архітэктуры ракако: гісторыка-архітэктурны нарыс. Мінск, 1991.

[39] Лакотка А. Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры. Мінск, 1999; яго ж: Беларусы. Т. 2: Дойлідства. Мінск, 1997.

[40] Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце: у 4 т., 6 кн. Т. 2: XV – сярэдзіна XVIII ст. Мінск, 2006; Т. 3, кн. 1: Другая палова XVIII – першая палова XIX ст. Мінск, 2007.

[41] Ожешковская И. Н. Основные направления в развитии архитектуры униатских храмов Беларуси в конце XVI в.– первой половине XIX в. // Архитектура во времени и пространстве: материалы междунар.научно-практ. конференции, 29 апреля 2021 г. Минск, 2021. С. 59–64; яе ж: Развитие архитектуры униатских храмов Беларуси конца XVI – первой половины XIX в. основные периоды и их особенности // Архитектура: сборник научных трудов. Минск, 2022. Вып. 15. С. 35–41; яе ж: Особенности организации сакрального пространства униатских храмов Беларуси XVII – начала XIX вв. // Архитектура: сборник научных трудов. Минск, 2021. Вып. 14. С. 34–39; яе ж: Греко-католические иконостасы базилианских монастырей Беларуси // Міжнародны навуковы кангрэс беларускай культуры (Мінск, 5–6 мая 2016 г.): зборнік матэрыялаў. Мінск, 2016. С. 99–102.

Расійска-беларускі спецыяліст па манастырскай архітэктуры Беларусі, член-карэспандэнт Расійскай акадэміі архітэктуры і будаўнічых навук ***Інэса Слюнькова*** на старонках сваіх прац удзяліла шмат увагі базыльянскім кляштарам. У манаграфіі ***“Монастыри восточной и западной традиций: Наследие архитектуры Беларуси”*** яна паказала ўздзеянне на іх будаўніцтва рознаканфесійных хрысціянскіх традыцый. Манастырская архітэктура для даследчыцы – гэта не толькі факт беларускай нацыянальнай культуры, але і істотная складаемая хрысціянскага царкоўнага мастацтва сумежных краін[42].

У манаграфіі ***“Храмы и монастыри Беларуси XIX века в составе Российской империи. Пересоздание наследия” Інэса Слюнькова*** прадставіла карціну скасавання і рэканструкцыі каталіцкіх, уніяцкіх і праваслаўных манастыроў і храмаў, новае царкоўнае будаўніцтва. Гэта была, па яе словах, архітэктура “прыстасавання”, накіраваная на выкарыстанне і мадэрнізацыю помнікаў у рэчышчы агульнадзяржаўных інтарэсаў і каштоўнасцей. У манаграфіі паказана, як у выніку татальнага “выпраўлення” спадчыны змянялася сакральная тапаграфія, перастраўся архітэктурны ландшафт краю, складвалася візуальнае адзінства тэрыторый і змянялася эстэтыка навакольнага матэрыяльнага свету, якая апавядала пра сябе мовай эклектыкі[43].

Уніяцкую скульптуру вывучалі кандыдат мастацтвазнаўства ***Аляксандр Ярашэвіч***[44], жыва-

[42] Слюнькова И. Н. Монастыри восточной и западной традиций: Наследие архитектуры Беларуси. М., 2002.

[43] Слюнькова И. Н. Храмы и монастыри Беларуси XIX века в составе Российской империи. Пересоздание наследия. М., 2010.

[44] Ярошевич А. От ренессанса к барокко: мемориальная и алтарная пластика Беларуси XVII–XVIII веков. Мінск, 2019.

піс – доктар мастацтвазнаўства ***Надзея Высоцкая***[45], ***Элеанора Вецер***[46] і інш.

Кандыдат мастацтвазнаўства ***Галіна Флікоп-Світа*** прысвяціла сваю дысертацыю ***“Мастацкія і іканаграфічныя асаблівасці іканапісу грэка-каталіцкіх храмаў Беларусі XVII – першай паловы XIX ст.”***[47] маладаследаванаму пласту беларускага сакральнага мастацтва – іканаграфіі ўніяцкіх абразоў Беларусі XVII–XIX ст. У манаграфіі “***Іканастасы і алтары грэка-каталіцкіх храмаў Беларусі XVII – першай трэці XIX ст.***”[48] даследчыцай устаноўлены асаблівасці ўніяцкіх іканастасаў, іх канструкцыя і праграма; прычыны знікнення іканастасаў у шэрагу храмаў і перабасталявання ўнутранай царкоўнай прасторы на лацінскі лад. Распрацавана тыпалогія ўніяцкіх прысценных алтароў; ахарактарызаваны рэпертуар грэка-каталіцкага іканапісу; матэрыял, на якім пісаліся ўніяцкія іконы; устаноўлены іх іканаграфічныя крыніцы. Працы Г. Флікоп-Світы заснаваны на гістарычных дакументах з архіваў, музеяў і бібліятэк Беларусі, Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны, Аўстрыі, якія дапамаглі ёй даследаваць стан каля 2600 прыходскіх, філіяльных, манастырскіх і кафедральных грэка-каталіцкіх храмаў Вялікага Княства Літоўскага.

---

[45] Иконопись и алтарная живопись Беларуси XII–XVIII веков / автор текста и составитель Н. Ф. Высоцкая. Минск, 2012.

[46] Іканапіс Заходняга Палесся XVI–XIX стст. / В. Ф. Шматаў, Э. І. Вецер, М. П. Мельнікаў і інш. Мінск, 2002.

[47] Флікоп-Світа Г. А. Мастацкія і іканаграфічныя асаблівасці іканапісу грэка-каталіцкіх храмаў Беларусі XVII – першай паловы XIX стагоддзяў. Аўтарэф. дыс. … канд. мастацтвазнаўства. Мінск, 2014.

[48] Флікоп-Світа Г. А. Іканастасы і алтары грэка-каталіцкіх храмаў Беларусі XVII – першай трэці XIX ст. Мінск, 2021.

Сакральным рэчам, плеценым з саломкі, у тым ліку Царскім Брамам з іканастасаў вясковых уніяцкіх цэркваў, прысвечана манаграфія доктара мастацтвазнаўства, ***Вольгі Лабачэўскай "Мастацтва дзеля славы Божай: саламяныя іканастасныя вароты і царкоўна-культавыя прадметы"***[49].

Спецыфічныя рысы музычнай практыкі Уніяцкай Царквы даследавала кандыдат мастацтвазнаўства ***Тамара Ліхач***[50]. Музычнае мастацтва знайшло адлюстраванне таксама ў працах доктара мастацтвазнаўства ***Ларысы Касцюкавец***, музыказнаўцы ***Гая дэ Пікарда*** з Вялікабрытаніі, спецыяліста па арганазнаўству ***Уладзіміра Неудаха***[51], даследчыцы "Полацкага сшытка" з уніяцкага малітоўніка XVII ст., доктара мастацтвазнаўства, прафесара ***Людмілы Сідаровіч***[52].

Творы ўніяцкай кніжнасці даследавалі беларускія вучоныя: доктар філалагічных навук ***Юрый Лабынцаў*** (Масква) і кандыдат філалагічных навук ***Ларыса Шчавінская***[53], доктар філалагічных навук ***Мікалай***

---

[49] Лабачэўская В. А. Мастацтва дзеля славы Божай: саламяныя іканастасныя вароты і царкоўна-культавыя прадметы. Мінск, 2018.

[50] Ліхач Т. У. Музычнае мастацтва уніяцкай царквы Беларусі // Актуальные проблемы мировой художественной культуры: Материалы международной научной конференции. В 2-х ч. Ч. 1. Гродно, 2004. С. 212–216; яе ж: Музыка ва ўніяцкіх храмах Беларусі пачатку XIX ст. // Весці Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. 2010. № 16. С. 55–58.

[51] Неўдах У. Cantantibus organis: Беларуская арганная культура ў кантэксце еўрапейскага музычна-гістарычнага працэсу. Мінск, 1999.

[52] Сидорович Л. Н. Феномен белорусского музыкального искусства XVII века. 2-е изд. Витебск, 2014.

[53] Лабынцев Ю., Щавинская Л. Западнобелорусское письменное наследие XVII–XX вв.: (экспедиционные исследования 2000–2002 гг.). Минск, 2004; Щавинская Л. Литературная культура белорусов Подляшья XV–XIX вв.: Книжные собрания Супрасль-

***Нікалаеў*** з Пецярбурга[54], магістр тэалогіі, спецыяліст па гісторыі кірылічнага кнігадруку Вялікага Княства Літоўскага ***Юрый Лаўрык***[55], кнігазнаўца ***Тамара Самайлюк*** і інш.

Гісторыю стварэння і развіцця ў канцы XVI – першай трэці XIX ст. Уніяцкай Царквой сваёй сістэмы адукацыі і яе навучальныя ўстановы, іх праграмы, педагагічныя кадры вывучаюць ***Андрэй Самусік***[56], ***Анатоль Сцебурака***[57], ***Людміла Масейчук***[58] і інш.

Сфарміраваўся цэлы пласт біяграфістыкі, прысвечаны знакавым постацям гістарычнай Уніі ў Беларусі.

ского Благовещенского монастыря. Минск, 1998; Супрасльский церковнославяно-польский словарь 1722 г. Минск, 1995.

[54] Гісторыя беларускай кнігі. Т. 1: Нікалаеў М. В. Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага. Мінск, 2009.

[55] Лаўрык Ю. Базыльянскія бібліятэкі // Наша вера. 2008. № 2. С. 57–63; яго ж: Кніжныя зборы пры грэка-каталіцкіх святынях // Наша вера. 2008. № 3. С. 46–51.

[56] Самусік А. Ф. Адукацыя белага ўніяцкага духавенства на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVI – трэцяй чвэрці XVIII стагоддзя // Научные труды Республиканского института высшей школы. 2019. Вып. 19, ч. 2. С. 41–48; яго ж: Роля І. Пацея ў стварэнні ўніяцкай адукацыі на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVI – пачатку XVII ст. // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. 2020. № 2. С. 58–62; яго ж: Роля Замойскага сабору 1720 г. у развіцці ўніяцкай адукацыі на тэрыторыі Беларусі // Религия и общество – 14: сборник научных статей. Могилев, 2020. С. 254–257; яго ж: Жыровіцкая базыльянская семінарыя ў 1709–1773 гг. // Матэрыялы XVI Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў: да 500-годдзя заснавання Жыровіцкага манастыра і бібліятэкі, Мінск, 15 мая 2020 г. Мінск, 2020. С. 41–45; яго ж: Адукацыя базыльян на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XVII ст. // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. 2021. Т. 66, № 1. С. 58–67.

[57] Сцебурака А. М. Станаўленне уніяцкай сістэмы адукацыі ў Беларусі ў канцы XVI – першай палове XVII ст. // Научные труды Республиканского института высшей школы. Минск, 2007–2008. Вып. 6, ч. 1. С. 284–290.

[58] Мосейчук Л. И. Теологическое образование приходского униатского духовенства на белорусских землях в 1743–1839 гг. Диссертация … канд. ист. наук. Минск, 2018.

Выдадзены кнігі або брашуры пра "архітэктара" Берасцейскай уніі Іпація Пацея[59], стваральніка базыльянскага ордэна і рэфарматара Царквы Іосіфа (Язэпа) Руцкага[60], пра полацкага архіепіскапа Язафата Кунцэвіча[61], уніяцкага, потым праваслаўнага царкоўнага дзеяча Міхаіла Галубовіча[62] і інш. З-пад пяра кандыдата багаслоўя, протаіерэя ***Аляксандра Раманчука*** выйшлі кнігі пра літоўскага мітрапаліта Іосіфа Сямашку[63]. Прадметам дысертацыйнага даследавання стала навукова-педагагічная і асветніцкая дзейнасць вучонага-славіста, прафесара Віленскага ўніверсітэта і ўніяцкага каноніка Міхала Баброўскага[64], які лічыцца адным з першых творцаў беларускай нацыянальнай ідэі. Артыкулы прысвечаны дзейнасці мітрапаліта і пісьменніка Льва Кішкі, апошняга ўніяцкага мітрапаліта Язафата Булгака, брэсцкага епіскапа Ігнація Жалязоўскага і інш.

---

[59] Падокшын С. А. Іпацій Пацей: Царкоўны дзеяч, мысліцель, пісьменнік на пераломе культурна-гістарычных эпох. Мінск, 2001.

[60] Саверчанка І. Апостал яднання і веры: Язэп Руцкі. Мінск, 1994.

[61] Эпісталяцыя Сьвятога Язафата: Збор дакумэнтаў / Укладаньне і апрацоўка М. Баўтовіча. Полацак, 2006.

[62] Малеев Н. Архиепископ Михаил Голубович: штрихи к портрету. Бельск Подляшский, 2021.

[63] Романчук А. Высокопреосвященный Иосиф (Семашко), митрополит Литовский и Виленский: очерк жизни и церковно-общественной деятельности. Изд. 2-е. Москва: Минск, 2018; его же: Иосиф (Семашко), митрополит Литовский и Виленский: жизнь и служение. Минск, 2012.

[64] Пустаход Т. С. Навукова-педагагічная і асветніцкая дзейнасць М. К. Баброўскага (1784-1848 гг.). Дысертацыя ... канд. гіст. навук. Мінск, 2017.

## Сучасная замежная гістарыяграфія

Важкае слова ў вывучэнні гісторыі Уніяцкай Царквы Беларусі і звязанай з ёй нацыянальна-культурнай праблематыкі сказалі замежныя навукоўцы. Апошнія два-тры дзесяцігоддзі былі плённымі на яе распрацоўку ў Польшчы, Украіне, Расіі. Погляды на Унію даследчыкаў розных краін і нацый, навуковых школ, канешне ж, адрозніваюцца. У расійскай гістарыяграфіі ідэя Уніі, як правіла, падаецца чужой беларускаму народу, а Масква – гарантам стабільнасці і працвітання Беларусі ў процівагу падступным лацінянам, рымскаму прастолу і Рэчы Паспалітай. Навукоўцам з Украіны і Польшчы Унія бачыцца інакш. Але ўсе яны сыходзяцца на меркаванні, што Берасцейская унія – гэта знакавая з’ява ў цывілізацыйнай прасторы, у якой беларускае і ўкраінскае грамадства імкнулася знайсці сваё месца.

З’явай у навуцы сталі манаграфіі найбуйнейшых спецыялістаў па вытоках і пачатках Берасцейскай уніі: ***“Криза і реформа: Київська митрополія, Царгородский патріархат і генеза Берестейськоі унії”*** доктара філасофіі ў галіне славянскай і візантыйскай культурна-царкоўнай гісторыі ***Барыса Гудзяка*** (ЗША, Украіна)[65], ***“Между Римом и Царьградом: Генезис Брестской церковной унии 1595–1596 гг.”***[66] прафесара Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта ***Міхаіла Дзмітрыева*** і працы прафесара ***Леаніда Цімашэнкі*** з Украіны[67].

[65] Гудзяк Б. Криза і реформа: Київська митрополія, Царгородский патріархат і генеза Берестейськоі унії. Пер. з англ. Львів, 2000.

[66] Дмитриев М. В. Между Римом и Царьградом: Генезис Брестской церковной унии 1595–1596 гг. М., 2003.

[67] Тимошенко Л. Берестейська унія 1596 р.: Начальний посибник. Дрогобич, 2004.

Прафесар ***Леанід Цімашэнка*** лічыць Берасцейскую унію фенаменальнай з’явай украінска-беларускай царкоўнай гісторыі. Феномен Уніі і Грэка-Каталіцкай Царквы, на яго думку, заключаецца ў тым, што з фактару дэстабілізацыі ўкраінска-беларускага царкоўнага жыцця XVI–XVII ст. яна змагла даказаць сваю жыццяздольнасць іператварыцца ў важны фактар нацыянальнага жыцця ўкраінцаў і беларусаў.

Сёння, як сцвярджае даследчык, ніводзін сур’ёзны гісторык не стане аспрэчваць аб’ектыўную абумоўленасць падзеі 1596 г., якая была рэакцыяй часткі ўкраінска-беларускага грамадства на тагачасныя крызісныя з’явы ў Царкве і культуры і на няўдалыя спробы выхаду з іх. Вучоны перакананы, што важна перастаць глядзець на Берасцейскую унію з пазіцый, характэрных для тагачасных яе праціўнікаў або прыхільнікаў. Неабходна адрозніваць спрэчныя пытанні ў гістарычнай памяці, якія з’яўляюцца выключна канфесійнай праблемай уніятаў і праваслаўных, і спрэчныя пытанні ў навуковай гістарыяграфіі[68]. Між тым, як канстатуе Л. Цімашэнка, мае месца ігнараванне гісторыі Беларускай Грэка-Каталіцкай Царквы XVI–XIX ст. як апрыёры спрэчнай на розных узроўнях: грамадскім, навуковым, рэлігійным.

Замежнай гістарыяграфіі ўласцівая асаблівая цікавасць да пытання аб уплыве Берасцейскай уніі на фарміраванне і развіццё беларускай, украінскай, польскай культуры.

Важнае значэнне для разумення царкоўна-рэлігійных, духоўна-культурных і грамадска-палітычных працэсаў канца XVI – пачатку XIX ст. у Беларусі і месца беларускіх зямель у веравызнаў-

[68] Цімашэнка Л. Спрэчныя пытанні з гісторыі Берасцейскай уніі // Палітычная сфера. 2014–2015. № 22–23. С. 161.

чай структуры Еўропы маюць даследаванні гісторыкаў з Польшчы – прафесараў ***Антоні Мірановіча***[69], ***Томаша Кемпы***[70], ***Анджэя Гіля***[71], а таксама прафесара ***Барбары Скінэр*** з Універсітэта штата Індыяна ў ЗША[72]. Рэлігійную культуру і ўсходняе хрысціянства ва Украіне і Беларусі, уніяцкую ідэю і яе інстытуцыяналізацыю ў Кіеўскай мітраполіі вывучаў украінскі даследчык, доктар гістарычных навук ***Ігар Скочыляс***[73]. Царкоўная Унія і яе спадчына ўваходзяць у асноўную сферу навуковых інтарэсаў польскіх гісторыкаў, дактароў гістарычных навук ***Войцеха Вальчака***[74] і ***Дароты Вярэды***[75].

[69] Миронович А. Церковные унии в Беларуси, Литве, Украине и Польше и их последствия. Белосток, 2020.

[70] Kempa T. Recepcja unii brzeskiej na obszarze Wielkiego Księstwa Litewskiego i ziem ruskich Korony do połowy XVII wieku // Rocznik Instytutu Europy Środkowo-Wschodniej. 2005. R. 3. S. 141–170.

[71] Gil A. Chełmska diecezja unicka 1596–1810. Dzieje i organizacja. Lublin, 2005.

[72] Skinner B. The Western Front of the Eastern Church: Uniate and Orthdox Conflict in 18th century Poland, Ukraine, Belarus and Russia. Illinois, 2009; яе ж: Wartości społeczne Kościoła unickiego w XVIII w. // Geopolityczne miejsce Białorusi w Europie i świecie. Warszawa, 2006. S. 205–214.

[73] Скочиляс І. Генеральні візитації в українсько-білоруських єпархіях Київської уніатської митрополії. 1596–1720 роки // Записки НТШ. 1999. Т. 238. С. 46–94; Гіль А., Скочиляс І. Володимирсько-Берестейська єпархія XI–XVIII століть: історичні нариси. Львів, 2013; Gil A., Skoczylas I. Kościoły wschodnie w państwie polsko-litewskim w procesie przemian i adaptacji. Metropolia Kijowska w latach 1458–1795. Lublin, 2014; Замойський провінційний собор Руської Унійної Церкви 1720 року, кн. 1: Діяння та постанови / упоряд. Р. Паранько, Іг. Скочиляс, Ір. Скочиляс. Львів, 2021 (Серія "Київське християнство", т. 23).

[74] Walczak W. Unicka eparchia Turowsko-Pińska w XVII–XVIII wieku. Struktura organizacyjna. Białystok, 2012.

[75] Wereda D. Biskupi unickiej metropolii kijowskiej w XVIII wieku. Siedlce–Lublin 2013; яе ж: Unicka diecezja Włodzimiersko-Brzeska (część Brzeska) w XVIII wieku. Siedlce, 2014.

Значнымі вехамі ў асэнсаванні Уніі праз прызму культуры сталі працы доктара навук ***Марыі Підліпчак-Маяровіч*** пра базыльянскія школы і бібліятэкі[76] і прафесара ***Марыі Цубрыньскай-Леанарчык***, прысвечаныя ролі Супрасльскага базыльянскага кляштара ў гісторыі інтэлектуальнай культуры XVIII ст[77]. Доктар навук ***Ёланта Гетка*** вывучае ўклад базыльянаў у развіццё "рускай" ("русінскай") мовы ("простай", народнай мовы; мовы зносінаў), літаратуры і культуры, пераемнікамі якіх цяпер з'яўляюцца беларусы і ўкраінцы. Яе асаблівая ўвага – да феномену рускамоўнага кнігадруку базыльян у XVIII ст[78].

Несумненную цікавасць уяўляе праца прафесара ***Юзафа Марошака*** аб мастацкай спадчыне царкоўнай Уніі на Беласточчыне[79] і яго даследаванне па гісторыі Супрасльскага манастыра як уніяцкай установы[80].

Спецыяліст па этнагісторыі Усходняй Еўропы ***Рышард Радзік*** дапускае, што ў 1839 г. беларусы былі пазбаўлены таго грамадскага слоя, які стварыў найбольшыя шансы на нацыянальную эскалацыю іх беларускасці. У сітуацыі, калі спаланізаваная шляхта не магла стаць базай беларускага нацыянальнага руху, калі беларусы не мелі ні значнага заможнага

---

[76] Pidłypczak-Majerowicz M. Bazylianie w Koronie i na Litwie: Szkoły i książki w działalności zakonu. Warszawa–Wrocław, 1986; яе ж: Biblioteki i bibliotekarstwo zakonne na wschodnich ziemiach Rzeczypospolitej w XVII–XVIII wieku. Wrocław, 1996.

[77] Cubrzyńska-Leonarczyk M. Dziedzictwo Unii Brzeskiej: z dziejów oficyny wydawniczej OO Bazylianów w Supraślu (1695–1803). Warszawa–Białystok, 2007.

[78] Getka J. U progu modernizacji. Ruskojęzyczne drukarstwo bazyliańskie XVIII wieku. Lublin, 2019.

[79] Maroszek J. Dziedzictwo unii kościelnej w krajobrazie kulturowym Podlasia, Białystok 1996.

[80] Maroszek J. Monografia miasta igminy Supraśl. Supraśl, 2013.

мяшчанства, ні сваёй свецкай інтэлігенцыі, ліквідацыя царызмам уніяцкай іерархіі пазбавіла беларускае грамадства асяродка, які меў найбольшыя шансы на тое, каб – так, як гэта стала ў населенай украінцамі Усходняй Галіцыі, – выклікаць беларускі нацыятворчы працэс і кіраваць ім на пачатковай фазе яго развіцця. Падпарадкаваны расійскай Царкве і царскім уладам расійскі ці зрусіфікаваны клір, які ў 1830-я – 1860-я г. змяніў беларускі праваслаўны (былы ўніяцкі) клір, прадстаўляў не беларускія нацыянальныя, але – у значнай ступені – імперскія інтарэсы, не быў зацікаўлены ў фарміраванні беларускай нацыі і да яе станаўлення не спрычыніўся[81].

***Такім чынам,*** пытанне аб Берасцейскай царкоўнай уніі як з’яве культуры было пастаўлена навукай ў апошняй трэці XIX ст. Аднак да канца XX ст. яно не з’яўлялася даследчым прыярытэтам. Апошнія два–тры дзесяцігоддзі на ніве вывучэння Уніі і Уніяцкай Царквы як феномена беларускай гісторыі і культуры плённа працавала цэлая група аўтарытэтных вучоных з розных краін:

***Беларусь*** (філосафы Сямён Падокшын, Уладзімір Конан, Наталля Кутузава, Віктар Старасценка, Дзмітрый Смалякоў; гісторыкі Георгій Галенчака, Леанід Лыч, Святлана Марозава, Дзяніс Лісейчыкаў, Сяргей Клімаў, Юрый Лаўрык, Андрэй Самусік, Людміла Масейчук, Тацццяна Пустаход; культуролагі Алесь Суша, Янка Трацяк; мастацтвазнаўцы Тамара Габрусь, Анатоль Кулагін, Аляксандр Лакотка, Галіна Флікоп-Світа, Ірына Ажашкоўская; філолагі Адам Мальдзіс, Уладзімір Кароткі, Іван Саверчанка; музы-

[81] Radzik R. Rozwój narodowy społeczności polskiej i białoruskiej w okresie zabiorów // Historycy wobec problemów tożsamości narodów. XVIII–XX wiek. Lublin, 1992. S. 42–43.

казнаўцы Тамара Ліхач, Уладзімір Неўдах; багаслоў Аляксандр Раманчук);

***Расія*** (Юрый Лабынцаў, Ларыса Шчавінская, Міхаіл Дзмітрыеў, Інэса Слюнькова і інш.);

***Украіна*** (Леанід Цімашэнка, Ігар Скочыляс, Барыс Гудзяк і інш.);

***Польшча*** (Марыя Папежыньска-Турэк, Марыя Цубрыньска-Леанарчык, Ёланта Гетка, Дарота Верэда, Войцех Вальчак, Юзаф Марошак, Анджэй Гіль, Антоні Мірановіч, Томаш Кемпа і інш.);

***ЗША*** (Барыс Гудзяк, Барбара Скінэр і інш.).

***Названыя спецыялісты даследавалі шырокі спектр пытанняў гісторыі Уніі ў яе навукова нерэалізаваным этнакультурным аспекце***: Берасцейская унія як з'ява культурна-цывілізацыйнага памежжа і сацыякультурны феномен; змены, якія яна прынесла ў геапалітычны і культурны кантэкст народаў; яе ўдзел у культуратворчых працэсах XVII–XVIII ст., уклад у развіццё архітэктуры, жывапісу, музыкі; культурнае ажыўленне і літаратурны ўздым пасля 1596 г.; базыльянскі ордэн як культурная сіла, яго школы, бібліятэкі, друкарні; роля Супрасльскага кляштара ў гісторыі інтэлектуальнай культуры XVIII ст.; працэс узрастання на ўніяцкай глебе мастацкага стылю "віленскае барока"; Унія як фактар нацыянальнага жыцця беларусаў; 1839 г. і яго ўплыў на беларускі нацыятворчы працэс; моўная палітыка Царквы; спецыфіка матэрыяльнай і духоўнай спадчыны Царквы, яе выкарыстанне ў XIX ст. новымі ўладальнікамі, перастварэнне і "выпраўленне" імі гэтай спадчыны; абарона ўніятамі сваіх сакральных рэліквій у час дэунізацыі 1830-х г.; рэкрутацыя з уніяцкіх святарскіх сямей бе-

ларускай культурнай і навуковай эліты XIX ст.; біяграфістыка знакавых дзеячаў Уніі; і інш.

Дысертацыі, кнігі, артыкулы названых аўтараў заснаваныя на саліднай крыніцавай базе, грунтуюцца на архіўным матэрыяле.

***Для сучасных навуковых падыходаў да ўніяцкай праблематыкі характэрныя наступныя рысы і тэндэнцыі:***

- ♦ канцэптуальнасць;
- ♦ філасофскае асэнсаванне;
- ♦ цывілізацыйны падыход;
- ♦ еўрапейскі кантэкст;
- ♦ разгляд Уніяцкай Царквы як паўнавартаснага суб’екта гістарычнага працэсу;
- ♦ пашырэнне праблемнага поля і храналогіі даследаванняў;
- ♦ рост колькасці спецыялістаў, для якіх гісторыя Уніі з’яўляецца прыярытэтным або важным напрамкам навуковай дзейнасці;
- ♦ усё больш часты выхад у свет этнічнасці і культуры, моцны акцэнт на культуратворчай дзейнасці Уніяцкай Царквы;
- ♦ адмова ад шэрагу стэрэатыпаў дарэвалюцыйнай і савецкай гістарыяграфіі;
- ♦ плюралізм поглядаў;
- ♦ вяртанне ў навуку і гістарычную памяць грамадства імёнаў і частковая рэабілітацыя ўніяцкіх царкоўных дзеячаў;
- ♦ узбагачэнне пантэона беларускіх дзеячаў культуры і навукі выхадцамі з уніяцка-базыльянскага асяроддзя;
- ♦ прасвечванне гісторыі Уніі скрозь прызму сучасных навуковых трэндаў (гісторыя штодзённасці,

жанр прасапаграфіі, біяграфістыка, гістарычная памяць і інш.);

♦ узмоцненая ўвага да мікрагісторыі (храмы, школы, кнігі, музычныя творы, іконы, сакральныя рэліквіі і інш.);

♦ стварэнне першага краязнаўчага даследавання на матэрыяле гісторыі Уніяцкай Царквы;

♦ выяўленне масіву новых гістарычных крыніц;

♦ мастацкая спадчына Уніяцкай Царквы – навуковы трэнд.

Унушальная гістарыяграфія і масіў уведзеных у навуковае абарачэнне новых гістарычных крыніц, разам з новымі падыходамі, дазваляюць нам сёння лепш разумець Берасцейскую унію, чым нашым папярэднікам 20–30 гадоў таму.

У той жа час сучасная навука не выпрацавала адзінага зладжанага і ўзгодненага погляду на пытанне аб месцы і ролі Уніяцкай Царквы ў лёсе беларускага народа і яго культуры. Яно застаецца прадметам дыскусій. Розніца поглядаў даследчыкаў зыходзіць з іх дзяржаўнай і нацыянальнай прыналежнасці, адлюстроўвае іх грамадскія, палітычныя, рэлігійныя сімпатыі і антыпатыі, тлумачыцца багаццем і разнароднасцю крыніц, залежыць ад спосабу мыслення і кампетэнтнасці, вынікае з прычыны адсутнасці адзінага крытэрыю ў падыходзе да праблемы.

***У вывучэнні гісторыі Уніяцкай Царквы можна выдзеліць дзве плыні.*** Адна вядзе даследаванні з новых метадалагічных пазіцый, ставіць новыя пытанні і шукае на іх адказы, стварае грунтоўныя працы (манаграфіі, дысертацыі, артыкулы) на саліднай крыніцавай базе, якую пашырае новымі архіўнымі матэрыяламі.

Прадстаўнікі другой плыні спецыяльным даследаваннем праблемы не займаліся, архівы па ёй не вывучалі, а працуюць на аснове другаснага, значыць, ужо адпрацаванага матэрыялу. Свае палажэнні яны грунтуюць на выбарачных "класічных" фактах і паблёклых аўтарытэтах дарэвалюцыйных папярэднікаў, а работы сучасных калег не ведаюць або пакідаюць без увагі. Многія працы аўтараў гэтай плыні маюць папулярны, палемічна-апалагетычны або мартыралагічна-патрыятычны характар і ў канчатковым выніку дэфармуюць вобраз Уніяцтва і Праваслаўя ў Рэчы Паспалітай. Такія працы не ўваходзілі ў прадмет нашага разгляду.

Адвечная для айчыннай гістарыяграфіі і запатрабаваная вучонымі суседніх краін тэма "Берасцейская унія і лёс беларусакага народа, яго культуры" яшчэ далёкая ад вычарпальнага навуковага вырашэння, багатая на невывучаныя пытанні. Яна чакае і, несумненна, знойдзе сваіх новых даследчыкаў.



*Касцёл Святых Пятра і Паўла ў Барунах з двухпавярховым будынкам (за ім) базыльянскай школы для свецкай моладзі, сярэдзіна XVIII ст. Сучасны выгляд*



# Уклад Уніяцкай Царквы ў развіццё адукацыі

- *Канец XVI – першая палова XVII ст.: стварэнне навучальных установ на “рускай” адукацыйнай аснове*
- *Занялады і новыя ўздымы актыўнасці ў асветніцкай сферы (другая палова XVII – першая палова XVIII ст.)*
- *Апошняя чвэрць XVIII ст.: базыльяне апаноўваюць адукацыйную прастору Беларусі*
- *Уніяцка-базыльянская сістэма адукацыі ў першай трэці XIX ст.*

## Канец XVI – першая палова XVII ст.: стварэнне навучальных установ на "рускай" адукацыйнай аснове

У апошнія дзесяцігоддзі XVI ст. на тэрыторыі Беларусі інтэнсіўна стваралі свае школы пратэстанты (кальвіністы і арыяне), каталікі (езуіты) ды праваслаўныя брацтвы. Належнае выхаванне моладзі яны лічылі лепшым сродкам абароны ад уплыву іншых канфесій. Як і кожная з хрысціянскіх канфесій, якія прыйшлі ў Беларусь раней, Уніяцкая Царква распаўсюджвала свой уплыў праз культурна-стваральную дзейнасць. Адным з прыярытэтных напрамкаў гэтай дзейнасці было стварэнне ўласнай сістэмы адукацыі для выхавання адданых сабе адукаваных людзей і падрыхтоўкі духоўных кадраў.

Рэлігійна-нацыянальнае ажыўленне канца XVI ст. узняло патрэбнасць у асвеце на высокі ўзровень і паставіла пытанне аб рэфармаванні існуючай сістэмы адукацыі. Гэта неабходнасць была прадыктавана дэнацыяналізацыяй сацыяльных вярхоў і іх адыходам ад Праваслаўнай Царквы, якая аказалася няздольнай задаволіць іх інтэлектуальныя запыты; незайздросным станам адукацыі, якая тады развівалася пераважна пры культавых установах; невысокім культурным узроўнем духавенства, якое складала пе-

раважную частку інтэлектуальнай эліты Вялікага Княства Літоўскага; пошукамі моладдзю адукацыі за мяжой, галоўным чынам, у Польшчы, дзе яна падвяргалася асіміляцыі. У 1595 г. берасцейскі епіскап Іпацій Пацей з болем пісаў пра свой народ, які дзеячы Рэфармацыі "простаком Руским, быдлом глупым, неуком пошивают", "придаючы, жесмы простакове глупые, немаючы ани писма, ани науки"[82]. Адукацыйныя пытанні востра гучалі тады ў асяроддзі царкоўных іерархаў.

Творцы Уніі добра разумелі важнасць нацыянальнай асветы і ставілі перад сваёй Царквой высакародную мэту вывесці "рускі" народ з невуцтва. Ідучы на дыялог з хрысціянскім Захадам, яны агаварылі за ёй права "засноўваць семінарыі і школы грэцкай і славянскай мовы там, дзе гэта ўяўляецца найбольш зручным". Своеасаблівасць Царквы патрабавала і самабытнай сістэмы адукацыі, здольнай сінтэзаваць візантыйска-славянскія традыцыі (з усходнім багаслоўем, стараславянскай і грэчаскай мовамі) з традыцыямі рымска-каталіцкімі (з заходняй тэалогіяй і латынню). Адукацыйныя захады Уніяцкая Царква стала рабіць з самага пачатку свайго існавання

Першыя дзеянні ўніятаў па арганізацыі школьнай справы і стварэнні ўласнай сеткі навучальных устаноў узначаліў выхадзец са старажытнага беларускага шляхецкага роду, ураджэнец сядзібы Ражанка пад Брэстам, ***царкоўны і дзяржаўны дзеяч Вяліка-***

[82] Потей И. Уния альбо выклад преднейшых артыкулов ку зъодноченью Греков с костелом Рымским належащых // Памятники полемической литературы в Западной Руси. Птб., 1882. Кн. 2. С. 145.

***га Княства Літоўскага, пісьменнік-палеміст Іпацій Пацей (1541–1613)***.

На думку беларускага філосафа С. А. Падокшына, уніяцкая сістэма адукацыі мела дастаткова яскрава выражаную нацыянальную накіраванасць. У светапоглядзе І. Пацея, які стаяў ля яе вытокаў, філосаф адзначыў такія элементы нацыянальнай самасвядомасці як 1) імкненне адасобіцца ад грэка-візантыйскага і маскоўскага Праваслаўя, выпрацаваць пэўную адметную – і ад Праваслаўя, і ад Каталіцтва – канфесію, хоць і залежную ад Рыма; 2) ідэя “направы” рэлігійна-царкоўнага і духоўна-культурнага жыцця беларуска-ўкраінскага рэгіёна, якая прадугледжвала развіццё адукацыі, кнігадрукавання, багаслоўя на роднай мове; 3) апеляцыя да айчыннай духоўна-культурнай традыцыі, заклік дбаць “на продкі свае”, “на старожитность, на давность, на повшехность”. Гэтыя і іншыя характарыстыкі даюць падставу казаць пра І. Пацея як пра – у большай ці меншай ступені – нацыянальна арыентаванага царкоўнага дзеяча, мысліцеля і пісьменніка. Яго погляды мелі пэўны прагрэсіўны характар, былі арыентаваны на адраджэнне нацыянальнай духоўнай культуры, развіццё роднай мовы, свецкіх ведаў, адукацыі[83].

Паколькі сваю асветніцкую праграму Уніяцкая Царква распачала пазней за іншыя канфесіі, то адставанне спачатку спрабавала кампенсаваць на базе

[83] Падокшын С. А. Іпацій Пацей: Царкоўны дзеяч, мысліцель, пісьменнік на пераломе культурна-гістарычных эпох. Мінск, 2001; Марозава С. Фарміраванне патрыятычнай традыцыі ў духоўным і грамадска-палітычным жыцці ВКЛ у XVI ст.: ад Скарыны да Пацея // Беларускі гістарычны часопіс. 2022. № 10. С. 27–35.

і на ўзор праваслаўных адукацыйных асяродкаў, што пераходзілі пад яе кантроль разам з цэрквамі ды манастырамі.

Першую ўніяцкую навучальную ўстанову намерваліся стварыць на аснове брацкай беларускай школы ў Берасці, якую пакінулі настаўнікі, што падаліся "до Вильни на сытые пироги". Каралеўскай граматай 1597 г. яна была перададзена ў распараджэнне і кіраванне І. Пацею, "абы в школе Руской… лепшый порядок и наука быти могла". ***Берасцейскую школу*** ўзначаліў запрошаны з Рыма грэчаскі святар "веры рускай", выпускнік Папскай калегіі ў Рыме, доктар багаслоўя Пётр Аркудзій – сакратар і дарадца І. Пацея. Школа атрымала фундуш – вёску Таракань (Пінскі павет), прыбытак ад якой належала накіроўваць на заснаванне "колегиума альбо семинариум для науки людей молодых" і ў ім "научати их, ведучи до добрых обычаев и веры старожитной греческой, под послушенством костела повшехного римского"[84].

Менавіта берасцейскае вучылішча спачатку бачылася І. Пацею ў якасці асноўнага цэнтра ўніяцкай адукацыі ў Вялікім Княстве Літоўскім. Але першае пачынанне сутыкнулася са шматлікімі цяжкасцямі: недахоп сродкаў, настаўніцкіх сіл, што не дазволіла ўзняць гэту школу да ўзроўню семінарыі. А прызначэнне ў 1599 г. І. Пацея кіеўскім мітрапалітам (1599–1613) прымусіла іерарха клапаціцца аб дабрабыце і культурным развіцці ўсёй Царквы, вырашаць дзясяткі іншых важных пытанняў яе жыцця. Праца па арганізацыі ўніяцкай школы ў Берасці была згорнута.

[84] Акты, издаваемые Виленскою комиссиею для разбора древних актов. Т. 16: Документы, относящиеся к истории церковной унии в России. Вильна, 1889. С. 379.

Восенню 1599 г. І. Пацей пераехаў у Вільню, куды забраў П. Аркудзія, і там заняўся арганізацыяй ***духоўнай семінарыі ў Троіцкім манастыры***, дзе канцэнтраваліся, "науками ся бавячи", лепшыя інтэлектуальныя сілы Уніяцкай Царквы. У 1601 г. вучоныя інакі заснавалі тут "рускую семінарыю". Яна існавала на сродкі дабрадзеяў і прыбыткаў ад фальваркаў Пячэрск (Аршанскі павет) і Таракань (Пінскі павет). З яе сцен выйшаў шэраг значных дзеячаў Уніі, а між імі – некалькі мітрапалітаў і епіскапаў.

У 1601 г. была перададзена Уніяцкай Царкве школа "языка и письма словеньского, руского, греческого, латиньского и польского" пры Магілёўскім брацтве. Аднак пакрыўджанай брацii ўдалося вярнуць яе. Мы бачым барацьбу канфесій за навучальныя ўстановы, якія, у сваю чаргу, канкурыравалі за ўплыў на моладзь.

Першым пакаленням уніяцкіх лідараў нельга адмовіць у шчырым імкненні ўзняць духоўны ўзровень беларускай Царквы і грамадства праз рэарганізацыю адукацыі і спыніць дэнацыяналізацыю шляхты праз езіуцкія і замежныя навучальныя ўстановы. Ужо І. Пацей у сваіх захадах па стварэнню нацыянальнай асветы выступіў супраць распаўсюджанага звычаю аддаваць дзяцей у гэтыя ўстановы з-за выпадкаў пераманьвання ордэнам уніяцкай моладзі ў рыма-каталіцызм. Падрыхтоўка кадраў духавенства была адной з найважнейшых задач Царквы.

І. Пацей спрабаваў таксама стварыць новыя ўніяцкія асветніцкія цэнтры ў Супрасльскім манастыры – праваслаўным культурным асяродку; у Слуцку; замяніць езуіцкі калегіум на ўніяцкую семінарыю ў Полацку. Перашкодай на гэтым шляху стала супра-

ціўленне праваслаўных і кальвіністаў, фактычная адсутнасць дапамогі з боку ўладаў ды эліты, недахоп уласных рэсурсаў: сродкаў і адукаваных асобаў. Кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт III Ваза дапамагаў уніятам “больш маральна, чым матэрыяльна”. З ліку ж магнатэрыі Вялікага Княства Літоўскага рэальную дапамогу ўніятам аказваў толькі канцлер Леў Сапега: выдзяляў храмам і манастырам фундушы, аказваў палітычную падтрымку. Тым не менш, намаганні І. Пацея па стварэнню ўніяцкай адукацыі паступова пачалі даваць станоўчыя вынікі. Канец XVI – пачатак XVII ст. стаў пачаткам яе зараджэння, а выхаваныя ў гэты час кадры забяспечылі яе далейшае развіццё ў наступныя дзесяцігоддзі[85].

Новую якасць царкоўная сістэма адукацыі набыла пасля рэформы базыльянскага ордэна, якую правёў ўраджэнец Наваградчыны, ***мітрапаліт Іосіф (Язэп) Вельямін Руцкі (1613–1637)***. Ён атрымаў салідную адукацыю ва ўніверсітэтах Прагі і Вюрцбурга, а таксама ў Грэчаскай калегіі ў Рыме – такой адукацыі не меў ніхто з тагачаснага беларускага духавенства. Поўны жадання і энергіі прысвяціць сябе служэнню на карысць Уніяцкай Царквы І. Руцкі ў 1601 г. прыбыў у Вільню, дзе ўзначаліў семінарыю, утвораную ў 1601–1603 г. пры Троіцкім манастыры. Першапачаткова вядучым цэнтрам уніяцкай адукацыі яму бачылася Віленская семінарыя. Тады ўжо было відавочна, што зрабіць асновай уніяцкай адукацыі праваслаўныя школы – не лепшы спосаб вырашэння праблемы. Ды і не была праваслаўная адукацыя тым моцным падмуркам, на якім збіраўся ўзводзіць гмах сваёй Царквы

[85] Самусік А. Ф. Роля І. Пацея ў стварэнні ўніяцкай адукацыі на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVI – пачатку XVII ст. // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. 2020. № 2. С. 58–62.

малады царкоўны тэарэтык і практык, будучы хрысціянскі лідар Беларусі.

Свой план узвышэння Царквы праз стварэнне ўніяцкага ордэна, у якім бачыўся залог яе магутнасці, і выхаванне духавенства новай фармацыі праз уздым школьнай справы І. Руцкі выклаў ***у трактаце “Discursus”, або “Развага нейкага русіна пра выпраўленне ладу грэчаскага абраду” (1605)***. Чалавек, які ацаніў вартасць еўрапейскай адукацыі, ён паставіў пытанне пра неабходнасць стварэння Уніяцкай Царквой уласнай “рускай” сістэмы адукацыі. У той жа час ён быў схільны да пераймання каталіцкага досведу і прыцягнення на першых парах, пакуль уласных педагагічных сіл не хапала, езуітаў, якія лічыліся лепшымі настаўнікамі ў Еўропе. Адукацыйная праграма Руцкага прадугледжвала поўную манаполію ў гэтай сферы базыльян, здольных стварацць і рэарганізоўваць навучальныя ўстановы ды забяспечыць іх педагогамі больш самааддана і аператыўна, чым белае духавенства ці свецкія настаўнікі. Такім чынам, асветніцкі рух ва ўніяцкім асяроддзі набыў мэтанакіраванасць і праграмны характар.

Першы крок у рэфармаванні адукацыі быў зроблены ў 1613 г., калі Руцкі заручыўся каралеўскім прывілеем, які фармальна легалізаваў уніяцкае школьніцтва. Паколькі ў праваслаўных не было школ, гаварылася ў ім, развілася “в народе руском неумеетность”. Віленскаму манастыру Св. Тройцы, дзе шмат інакаў “в науках вызволеных твичыла”, было дазволена заснаваць школы ў Наваградку, Менску і іншых месцах, якія будуць прызнаныя найбольш зручнымі, “и в тых школах учыти всих наук … языком кгрецким,

латинским, словенским, польским и руским"[86]. Аналагічны прывілей, атрыманы ад Рыма, фармальна ўраўняў статус уніяцкіх школ з езуіцкімі.

У бліжэйшыя гады дараванае права было рэалізавана адкрыццём школ для шляхецкай і мяшчанскай моладзі ў Наваградку (у 1613 г., пашырана ў 1624 г.), Мінску (1617 г.), навіцыята ў Быцені (1617 г.), пачатковых школ для манахаў і святароў у Полацку, Жыровіцах, Барунах і Чарэі (каля 1617 г.), Белай і Магілёве (каля 1624 г.). Гэтыя навучальныя ўстановы былі створаны ў найбольш забяспечаных манастырах і разам з імі развіваліся або занепадалі.

Найбольш высокі акадэмічны ўзровень забяспечвала ***Троіцкая семінарыя ў Вільні***. Яе праграма навучання ўключала "вольныя мастацтвы", мовы (царкоўнаславянская, лацінская, грэчаская) і асновы багаслоўя. Але ў хуткім часе на першае месца сярод уніяцкіх навучальных устаноў выйшла ***Мінская семінарыя***, у якой вучылася не толькі духавенства, але і свецкая шляхецкая моладзь. Менавіта гэту навучальную ўстанову ў сярэдзіне 1620-х г. І. Руцкі вырашыў пераўтварыць у новы вядучы асяродак уніяцкай адукацыі, бо развіццю семінарыі ў Вільні перашакаджала канкурэнцыя з боку езуіцкай акадэміі, кальвінскай гімназіі ды праваслаўнай брацкай школы.

Для рэалізацыі грандыёзных планаў рэфармавання Царквы І. Руцкаму патрэбны былі кадры з еўрапейскай адукацыяй. Кіраўніком базыльянскага ордэна мог стаць толькі чалавек "значне учоный, впрод в речах духовных". Настаяцелі манастыроў мелі абавязак пастаянна клапаціцца пра стварэнне добрай рэпу-

[86] Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (Санкт-Пецярбург). Ф. 823. Воп. 1, спр. 384, арк. 1; Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России. Т. 2: 1599–1637. СПб., 1865. С. 70–71.

тацыі “згромаженья” праз павышэнне адукацыйнага ўзроўню манахаў. Кожны член ордэна павінен быў прайсці курс навучання ў навіцыяце.

Кваліфікаваныя духоўныя кадры таксама рыхтаваліся ў папскіх калегіумах (алюмнатах), заснаваных езуітамі ў 1560-я – 1580-я г. у Рыме, на тэрыторыі Габсбургскай імперыі (у Аламоўцы, Грацэ, Ведні і Празе) і самой Рэчы Паспалітай (у Брунсбергу, Вільні, Калішы, Пултуску, Нясвіжы, Полацку). Рэлігійныя кантакты з Захадам праз Унію на два стагоддзі адкрылі больш шырокія магчымасці таленавітай беларускай моладзі атрымліваць адукацыю ў еўрапейскіх навучальных установах, якія давалі глыбокія веды, аўтарытэт і шанцы на бліскучую духоўную кар’еру на Радзіме.

Асабліва прэстыжным быў ***грэчаскі Афанасьеўскі калегіум у Рыме***. Ён рыхтаваў з усходнеславянскіх юнакоў кадры, здольныя працаваць на карысць царкоўнай Уніі ва Усходняй Еўропе і служыць свайму “народу рускаму”. Большасць выпускнікоў гэтага калегіума сталі вядомымі дзеячамі Царквы, культуры, асветы. Праз яго прайшлі 9 з 15-ці ўніяцкіх мітрапалітаў, многія епіскапы і амаль усе кіраўнікі базыльянскіх школ Рэчы Паспалітай. Грэчаскі калегіум успрымаўся ў асяроддзі беларускіх уніятаў як асноўны цэнтр атрымання вышэйшай адукацыі, што адкрываў ім дзверы да хуткай царкоўнай кар’еры.

Шматгадовая вучоба здольных манахаў у краі і за мяжой, утрыманне школ і прафесараў было вялікім цяжарам для базыльянскага ордэна. Праблема фінансавання вырашалася частым павелічэннем падаткаў з манастыроў і духавенства.

Недахоп уласных сіл і досведу ў адукацыйнай сферы штурхаў да супрацоўніцтва з езуітамі, асабліва

інтэнсіўнага на першым этапе. Адносіны Царквы з ордэнам езуітаў, з якім яна актыўна пачала канкурыраваць на ніве адукацыі, былі няпростымі, але, як высветлілася пазней, канкурэнцыі яна не вытрымала. Асветніцкія захады новай Царквы езуіты ўспрымалі як крыўду для сябе. Са свайго боку, дзеячы Уніі бачылі ў езуіцкіх школах сродак лацінізацыі і апаляччвання беларусаў, абвінавачвалі ордэн у “крадзяжы душ”, таму насцярожана ставіліся да іх сістэмы адукацыі. Вядома скарга 1666 г. на езуітаў у Рым з просьбай увогуле забараніць ім трымаць уласную школу ў Мінску, каб завяршыць справу па арганізацыі ў горадзе Галоўнай базыльянскай семінарыі. У сярэдзіне XVIII ст. езуіты прасілі заступніцтва канцлера Вялікага Княства Літоўскага, бо жыровіцкія базыльяне, якія апанавалі адукацыйную прастору, патрабавалі скасавання езуіцкіх школ на адлегласці мілі ад Слоніма.

Навучальныя ўстановы Уніяцкай Царквы фарміравалі інтэлектуальную эліту, інтэлігенцыю Беларусі. З іх дапамогай Пацей і Руцкі стварылі новую фармацыю духавенства, якая прынесла вялікую карысць Царкве. З ростам адукаванасці святароў узрастала рэлігійная свядомасць вернікаў, большасць з якіх іншымі крыніцамі ведаў не маглі карыстацца.

Школы Руцкага рыхтавалі кадры не толькі для ордэна базыльян, але і для дзяржаўнай службы ў Вялікім Княстве Літоўскім. Тым самым яны ўдзельнічалі ў выхаванні яго эліты і пры гэтым спрыялі яе захаванню пры ўніяцкай веры, а таксама пры рускай (беларускай) этнічнай і культурнай самасвядомасці.

Тастамент (завяшчанне) І. Руцкага, напісаны на старабеларускай мове 20 кастрычніка 1636 г. у маёнтку Рута Наваградскага павета, пралівае святло на апошнія клопаты гэтага выбітнага рэлігійнага і культурнага дзеяча беларуска-літоўскіх земляў, аднаго з самых

адукаваных людзей Вялікага Княства Літоўскага, Ён завяшчаў утрымліваць пры саборнай царкве ў Вільні школу з бясплатным харчаваннем для навучання "рускіх" клірыкаў, якія б "вучылися языка латинского и иншых наук, але жебы первеи речы руские умели". "Лацінскія" навукі для ўніяцкага святарства мітрапаліт дапускаў толькі пры наяўнасці "рускай" адукацыйнай асновы[87].

У 1643 г. рымская Кангрэгацыя прапаганды веры замацавала за "рускімі ўніяцкімі епіскапамі" права засноўваць школы для навучання ў іх моладзі "ніжэйшым і вышэйшым навукам". Адукацыйныя захады і традыцыі першых уніяцкіх мітрапалітаў працягнулі іх пераемнікі. Прадметам асаблівага клопату ***мітрапалітаў Рафаіла Корсака (1637–1640)***, ураджэнца Навагрудка, і ***Антонія Сялявы (1641–1655)***, родам з Полацкага ваяводства, была ***Мінская семінарыя***. У 1654 г. яе "дагляд і кіраванне" быў даручаны доктару тэалогіі Бенедыкту Тарлецкаму, які па заканчэнні Рымскага калегіума вярнуўся на сваю радзіму "Русь і Літву". Пры ім семінарыя стала аўтарытэтнай навучальнай установай з кваліфікаваным выкладчыцкім штатам, 8-гадовым тэрмінам навучання, ростам да яе цікавасці з боку грамадства і базыльянскага ордэна. Б. Тарлецкі выводзіў Мінскую семінарыю на ўзровень калегіума з вышэйшымі курсамі. Сам ён, як пісаў у 1655 г., выкладаў некаторыя прадметы, у прыватнасці, багаслоўе "на народнай мове"[88].

---

[87] Лісейчыкаў Д. В. Мітрапаліт Іосіф Вельямін-Руцкі і яго тастамент [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: https://niab.by/newsite/by/content/all/мітрапаліт-іосіф-вельямін-руцкі-і-яго-тастамент. Дата доступу: 15.02.2023.

[88] Самусік А. Ф. Адукацыя базыльян на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XVII ст. // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. 2021. Т. 66, № 1. С. 58–67.

Асабліва папулярным і прэстыжным у базыльянскіх колах быў ***Быценьскі навіцыят***. Гэта першая ордэнская навучальная ўстанова такога тыпу на беларускіх землях. Пасаду архімандрыта мог заняць толькі той, хто прайшоў іспыт у Быцені. Навіцыят меў пяцігадовы тэрмін навучання. На яго ўтрыманне з манастыроў штогод збіралі 3 тыс. злотых. Паколькі адзін навіцыят не мог забяспечыць базыльянскі ордэн дастатковай колькасцю адукаваных людзей, А. Сялява паспрабаваў заснаваць у Вільні другі навіцыят па ўзору Быценьскага.

У XVII ст. базыльянскае школьніцтва пачынае падтрымліваць добразычлівая да новай веры знаць. Віленскіх і жыровіцкіх базыльян матэрыяльна падтрымліваў Леў Сапега. На сваёй радзіме ў Аршанскім павеце ён заснаваў і фінансаваў уніяцкія школы ў Чарэі, Талачыне, Друі, Іказні, Горках, а таксама школу павышанага тыпу ў Жыровіцах[89].

## Заняпады і новыя ўздымы актыўнасці ў асветніцкай сферы (другая палова XVII – першая палова XVIII ст.)

Сістэма адукацыі, створаная базыльянскім ордэнам на беларускіх землях, зведала перыяды ўздыму і заняпаду, звязанага са спусташальнымі войнамі, якія пракаціліся па беларускіх землях (1654–1667 г., 1700–1721 г.). Жорсткі пераслед Уніяцкай Царквы ў час ваеннага ліхалецця 1648–1651 і 1654–1667 г. амаль дашчэнту знішчыў базыльянскае школьніцтва –

[89] Галоўны архіў старажытных актаў (Варшава). Архіў (фонд) Жыгіёта, спр. 810, арк. 1; Архіў (фонд) Радзівілаў. Аддзел VIII. Духавенства, спр. 262, арк. 1; спр. 570, арк. 1, 15, 64, 68, 72–73.

спынілі працу айчынныя школы і семінарыі. Працэс яго адраджэння зацягнуўся на дзесяцігоддзі. ***У другой палове XVII ст. у Беларусі было ўсяго некалькі значных адукацыйных цэнтраў базыльян – Мінск (да 1655 г.), Быцень (з другой паловы 1660-х г.), Баруны (з канца XVII ст.)***.

Да згасання большасці традыцыйных уніяцкіх адукацыйных цэнтраў (з адначасовым узрастаннем ролі Быценьскага манастыра) вялі таксама востры недахоп сродкаў на аднаўленчыя працы і канкурэнцыя з боку езуітаў, якія імкнуліся цалкам узяць пад свой кантроль працэс навучання тутэйшай моладзі. У XVII ст. Уніяцкай Царкве не ўдалося стварыць канкурэнтаздольную езуіцкай сістэму адукацыі. Гэта шмат у чым тлумачыць той факт, чаму яна не здолела прывабіць да сябе беларускую праваслаўную шляхту.

У апошняй чвэрці XVII ст. адукацыйныя магчымасці Уніяцкай Царквы намагаўся ўзмацніць выхадзец з Полацкага ваяводства, ***мітрапаліт Цыпрыян (Кіпрыян) Жахоўскі (1674–1693)***. У 1679 г. ён адзначаў, што “навіцыятаў мала, семінарый на Русі бракуе”[90]. Брэсцкі епіскап (з 1679 г.), а потым ***мітрапаліт Леў Заленскі (1694–1708)*** на ўласныя сродкі засноўваў школы ў сваёй епархіі.

Новы ўздым актыўнасці ўніятаў у асветніцкай сферы адбываўся ў канцы XVII ст. – распачалі працу Барунская школа і Супрасльская друкарня. Але і ён быў прыпынены чарговым ліхалеццем – Паўночнай вайной. Уніяцкае школьніцтва адрадзілася толькі пасля Замойскага сабора 1720 г. дзякуючы адукацыйнай палітыцы ***мітрапаліта Льва Кішкі (1714–1728)*** і яго наступнікаў.

[90] Żochowski S. Unia Brzeska w Polsce XVII wieku: Monografia Ks. Cypriana Żochowskiego metropolity Calej Rusi i Arcybiskupa Połockiego (1635–1693). Brysbane-Londyn, 1988. S. 157.

У XVII ст. базыльяне змаглі наладзіць адукацыю на радзіме і за мяжой для свайго ордэна, а спецыяльных школ для падрыхтоўкі белага духавенства не стварылі. Нізкі адукацыйны ўзровень прыходскага духавенства, якое ў большасці сваёй уяўляла сельскую эліту, стаў сапраўднай праблемай Уніяцкай Царквы ў наступным стагоддзі. Даволі вузкае кола базыльянінтэлектуалаў не магло падтрымліваць на належным узроўні аўтарытэт сваёй канфесіі ў дзяржаве пры агульным нізкім адукацыйным узроўні святароў і вернікаў, які часцяком абмяжоўваўся хатнім навучаннем.

Адукацыйныя пытанні занялі важнае месца на ***Замойскім царкоўным саборы 1720 г.*** Ён пастанавіў людзей неадукаваных у духоўнае званне не прымаць, на пасады не прызначаць, паству ім не давяраць і абавязаў епіскапаў, па магчымасці, заснаваць у кожнай епархіі семінарыю. Фактычна ўпершыню ў гісторыі ўніяцкай канфесіі на саборы было ўзнята пытанне і аб неабходнасці пашырэння асветы ў свецкіх колах уніяцкага насельніцтва. Належала стварыць тэалагічную школу ў кожным манастыры, дзе служыла не менш за 12 манахаў. У першай палове – сярэдзіне XVIII ст. уніяцкае школьніцтва працягвала развівацца без радыкалізму і інтэнсіўнасці, як стагоддзе да таго. Яно спалучала ўласныя асветніцкія традыцыі з дасягненнямі айчыннай і замежнай каталіцкай педагогікі. Прыярытэтнай па-ранейшаму заставалася асвета базыльян.

У 1750-я г. распачалася рэарганізацыя ўніяцкай школьнай справы. З пранікненнем у айчыннае грамадства прагрэсіўных ідэй эпохі Асветніцтва Царква ўсё больш распаўсюджвае сваю адукацыйную дзейнасць на белае святарства і свецкую моладзь.

## Апошняя чвэрць XVIII ст.: базыльяне апаноўваюць адукацыйную прастору Беларусі

Пасля 1773 г. адбыліся істотныя змены у адукацыйнай дзейнасці базыльян. Паўплывалі два фактары: скасаванне ордэна езуітаў і стварэнне Адукацыйнай камісіі – абодва ў 1773 г. Базыльяне імкнуліся стаць спадкаёмцамі адукацыйнай сістэмы езуітаў і пасля касацыі ордэна занялі і яго месца ў сферы адукацыі. Ім былі перададзены езуіцкія школы ў Брэсце, Мінску, Наваградку, Гродна, Пінску, Вільні, Браславе, Дубне. Полацку і інш., пасля чаго базыльянскае школьніцтва заняло бачнае месца ў Беларусі, ці не самае прадстаўнічае для апошняй чвэрці XVIII ст. Колькасць базыльянскіх школ хутка павялічвалася.

***На хвалі Асветніцтва і дзейнасці Адукацыйнай камісіі (1773–1794)*** – першага ў Еўропе "міністэрства" асветы – ***базыльяне пакрылі беларускія землі разгалінаванай сеткай рознатыповых навучальных установ***: ад пачатковых школ да філасофска-тэалагічных студый, якія рыхтавалі кадры для ордэна і ў меншай меры – прыходскае духавенства і свецкае чынавенства.

У 1770-я – 1790-я г. сярэднія школы (вучылішчы) працавалі пры базыльянскіх манастырах у Беразвеччы, Брэсце, Барунах, Вільні, Вярбілаве, Жыровіцах, Лядах, Паддубісе, Талачыне. Пры гэтым ***вучылішчы ў Барунах, Беразвеччы і Жыровіцах мелі свецкі характар*** і рыхтавалі моладзь да грамадзянскай дзяржаўнай службы. Навучальныя ўстановы павышанага тыпу, дзе базыльяне ўдасканальваліся ў філасофіі,

тэалогіі, рыторыцы, дзейнічалі ў Антопалі, Быцені, Вільні, Свержані, Таракані, Нясвіжы, Лыскаве, Любяшове, Жыровіцах, Віцебску, Полацку. Большасць гэтых навучальных устаноў працавалі па праграмах і статуту Адукацыйнай камісіі. Даследчыкі ўніяцкай сістэмы адукацыі налічылі “на Літве і Русі” 22 базыльянскія школы (сярэднія і павышанага тыпу), якія дзейнічалі пад патранатам Адукацыйнай камісіі.

Акрамя таго, базыльянскія манастыры Кобрына, Ракава, Паддубіса, Антопаля, Сырыцы, Сераціна, Тадуліна і іншых населеных пунктаў у канцы XVIII – першай трэці XIX ст. утрымлівалі на свае сродкі пачатковыя школкі для дзяцей з бедных сем’яў і ў іх вучылі “чытаць і пісаць па-польску і па-руску, лічыць і хрысціянскай навуцы”[91]. У дэканатах працавалі трохгадовыя школы для навучання дзяцей святароў ва ўзросце ад сямі да дзесяці гадоў.

Пасля стварэння Адукацыйнай камісіі базыльянскія школы падпалі пад яе кантроль. Вынікам сталі паступовыя перамены ў змесце адукацыі. Эпоха Асветніцтва несла цікавасць да практычных ведаў. Адпаведна, праграмы базыльянскіх школ значна больш часу адводзілі матэматыцы і прыродазнаўчым навукам. Разам з падручнікамі Адукацыйнай камісіі ў сцены манастырскіх школ прыходзіў рацыяналізм, якому саступала сваё месца схаластыка.

Педагагічныя кадры базыльянскіх школ мелі даволі высокі ўзровень падрыхтоўкі і былі знаёмыя з перадавой педагагічнай думкай свайго часу. Шмат хто з настаўнікаў меў універсітэцкую адукацыю, некаторыя нават выкладалі ў Віленскай акадэміі. Пе-

[91] Описание документов архива западнорусских униатских митрополитов. Т. 1: 1470–1700. СПб., 1897. С. 616–621.

дагагічная дзейнасць (6 гадоў працы настаўнікам) была абавязковай для тых, хто намагаўся зрабіць адміністрацыйную кар'еру і заняць пасаду ў ордэне. Шляхта і мяшчане імкнуліся аддаць сваіх дзяцей для навучання ў базыльянскія школы.

Устанавіць агульную колькасць усіх базыльянскіх школ складана, бо не ўсе з іх працавалі рэгулярна. Звычайна яны мелі невялікую колькасць вучняў і настаўнікаў. З падзеламі Рэчы Паспалітай базыльянская сістэма адукацыі ператрывала першыя гады ў межах Расійскай імперыі і нават павялічыла колькасць сваіх школ. У 1804 г. базыльяне мелі найбольшыя настаўніцкія кадры ў сярэдніх школах Віленскай навучальнай акругі – 74 педагогі з іх агульнай колькасці 349[92].

## Уніяцка-базыльянская сістэма адукацыі ў першай трэці XIX ст.

Педагагічны досвед базыльян спачатку прыйшоўся даспадобы расійскаму ўраду, які меў намер цалкам пераўтварыць іх у "юношевоспитательное сословие". Пасля выгнання езуітаў з Расіі ў 1820 г. базыльянскаму ордэну было прапанавана замяніць езуітаў у сферы адукацыі. У той час ён яшчэ карыстаўся прыхільнасцю ўрадавага Пецярбурга і меў добрую рэпутацыю як ордэн, здольны "да годнага і дасканалага навучання моладзі … у адпаведнасці з сучасным станам навук"[93].

[92] Zasztowt L. Kresy. 1832–1864: Szkolnictwo na ziemiach litewskich i ruskich dawnej Rzeczypospolitej. Warszawa, 1997. S. 54.

[93] Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (Санкт-Пецярбург). Ф. 823. Воп. 3, спр. 1360, арк. 1–14.

З канца XVIII ст. уніяцка-базыльянская сістэма адукацыі, падтрыманая афіцыйнымі коламі Расійскай імперыі, атрымала значнае развіццё. Найперш рабіліся захады па стварэнню навучальных устаноў павышанага тыпу для падрыхтоўкі свецкага духавенства. У 1806 г. у Полацку адкрылі ***Беларускую семінарыю***, якая хутка стала аўтарытэтнай навучальнай установай. Да 1825 г. яе 13 гадаванцаў атрымалі доктарскую ступень[94]. У Лаўрышаве пачала працаваць ***Брэсцкая семінарыя***. Семінарыі пастаўлялі духоўныя кадры ў свае епархіі. У іх выкладалі высокаадукаваныя і вопытныя педагогі-прафесары, як правіла, з беларускай шляхты. У 1828 г. у Жыровіцах была створана ***Літоўская семінарыя*** для падрыхтоўкі новага пакалення святароў, якое б падтрымала збліжэнне і аб'яднанне Уніяцкай Царквы з Праваслаўнай. Вартыя даверу звесткі па грэка-ўніяцкаму ведамству, пададзеныя ў 1835 г. у Пецярбург, зафіксавалі 22 уніяцкія навучальныя ўстановы на тэрыторыі Беларусі, а ў іх 67 настаўнікаў і 1339 вучняў[95].

У 1803 г. пры Віленскім універсітэце была заснавана ***Галоўная семінарыя*** – першая і адзіная ў Вялікім Княстве Літоўскім вышэйшая навучальная ўстанова, якая рыхтавала з ліку найбольш здольных маладых людзей, што скончылі епархіяльныя семінарыі, кандыдатаў на вышэйшыя царкоўныя пасады. Віленская семінарыя была разлічана на 50 клірыкаў, якіх забяспечвалі жыллём, адзеннем і харчаваннем. На яе ўтрыманне штогод збіралася 15 тысяч рублёў з даходаў

[94] Описание документов архива западнорусских униатских митрополитов. Т. 2: 1701–1839. СПб., 1907. С. 720, 758.

[95] Извлечение из отчета по ведомству духовных дел православного вероисповедания за 1836 год. СПб.: Тип. Святейш. Правит. Синода, 1837. С. 66–67.

каталіцкіх і ўніяцкіх кляштараў, якія мелі нерухомую маёмасць і капітал.

Цяпер адукацыі, атрыманай у епархіяльнай семінарыі, было недастакова. Для атрымання больш высокіх пасад у Царкве і ордэне, для выкладання ў публічнай школе або навіцыяце стала абавязковым праходжанне курса навук у Галоўнай семінарыі або атрыманне ступені доктара тэалогіі ці права ў Віленскім універсітэце.

Навучанне ў семінарыі працягвалася чатыры гады і прадугледжвала вывучэнне свяшчэннага пісання, багаслоўя, царкоўнай гісторыі і права, царкоўных абрадаў, статута і спеваў, а таксама свецкіх навук: батанікі, земляробства, фізікі, хіміі, матэматыкі, гігіены, права, палітэканоміі, логікі, малявання, архітэктуры і інш. З моваў вывучаліся польская, лацінская, французкая або нямецкая, пры жаданні – іўрыт і абавязкова руская. Акрамя таго, усе клірыкі павінны былі слухаць курс навук у Віленскім універсітэце[96].

Семінарыя стаяла на высокім для таго часу навуковым узроўні. За час свайго існавання (1803–1833 г., з перапынкам у 1812–1815 г. у сувязі з французкім нашэсцем) яна выпусціла шэраг буйных царкоўных дзеячаў (Іосіф Сямашка, Васіль Лужынскі, Антоній Зубко, Плацыд Янкоўскі), якіх, на жаль, не навучыла шанаваць скарб сваёй веры, і знакамітых вучоных (славіст Міхал Баброўскі). Сярод выкладчыкаў былі выдатныя асобы – прафесары Ян Канты Хадані, Платон Сасноўскі, Анёл Доўгірд, Міхал Баброўскі. Семінарыя была закры-

[96] Рукапісны аддзел Навуковай бібліятэкі Вільнюскага ўніверсітэта. Ф. 13 Віленская акадэмія і ўніверсітэт, спр. 159, арк. 1–10 адв.; Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Украіны (Львоў). Ф. 201 Грэка-каталіцкая мітрапалічая кансісторыя ў Львове, воп. 4, спр. 1870, арк. 1–2, 5.

та праз год пасля таго, як перастаў існаваць Віленскі ўніверсітэт як кузня “нядобранадзейных” кадраў, пазбаўленых вернападданства расійскаму ўраду і апазіцыйна да яго настроеных.

У 1820-я г. узнік і ўсур’ёз прапрацоўваўся ***праект заснавання ўніяцкай акадэміі ў Полацку***. Ён быў падтрыманы ўрадам, які жадаў ізаляваць уніятаў ад пракаталіцкага і прапольскага Віленскага ўніверсітэта. Былі знойдзены немалыя сродкі – 28 тыс. руб., абсталяванне, бібліятэка; базай павінна была стаць Полацкая семінарыя. Акадэмія яшчэ не пачала дзейнічаць, а ўніяцкай моладзі ўжо забаранілі атрымліваць вышэйшую адукацыю па-за яе межамі. Але аўтары і арганізатары праекта хутка сцямілі, што стварэнне Царквой уласнага цэнтра асветы такога ўзроўню ўмацуе і скансалідуе ўніятаў і яшчэ больш аддаліць іх ад Праваслаўя. А гэта не адпавядала ўзятаму курсу на зліццё канфесій. Таму з другой паловы 1828 г. падрыхтоўка да адкрыцця акадэміі замарудзілася, а пасля паўстання 1830–1831 г. ад ідэі ўвогуле адмовіліся. Недавер ураду стаў галоўным фактарам, які не дапусціў заснавання гэтай установы.

Яскравай з’явай гісторыі адукацыі ў Беларусі канца XVIII – першай трэці XIX ст. сталі свецкія школы (вучылішчы) у Барунах, Беразвеччы, Брэсце, Віцебску, Вярбілаве, Жыровіцах, Лядах, Паддубісе і Талачыне, якія ўтрымліваліся базыльянскім ордэнам. Асобныя з іх мелі даволі вялікую колькасць вучняў – да 200–300 чалавек. Рэфармаваныя на аснове статута Адукацыйнай камісіі, вучылішчы давалі аб’ём ведаў, неабходны для паступлення ў вышэйшую навучальную ўстанову. У гэтым бачыцца імкненне Уніяцкай Царквы ісці

ў нагу з часам, захаваць уласную сацыякультурную ролю і больш эфектыўна працягваць сваю місію ў новых рэаліях эпохі. Змест і характар навучання ў такіх установах мала чым адрозніваўся ад школ свецкіх, хіба тым, што выкладалі тут настаўнікі-манахі. Ад гэтага, па словах аднаго з іх выхаванцаў, "сама навука нібы набывала святасць". Школьныя праграмы давалі веды па гісторыі Радзімы і мелі патрыятычную скіраванасць.

Якасць выхавання ў манастырскіх школах была больш высокай, чым у свецкіх навучальных установах. Як успамінаў пісьменнік Антон Адынец, менавіта школы розных ордэнаў у першай трэці XIX ст. пастаўлялі ў Віленскі ўніверсітэт кантынгент "самых добрасумленных і высокамаральных студэнтаў", якія потым папаўнялі шэрагі мясцовай інтэлігенцыі. Выпускнік Навагрудскай дамініканскай школы, беларускі і польскі паэт Уладзіслаў Сыракомля пісаў пра базыльянскія школы: *"Нашых дзядоў сцябалі старыя езуіты, нашых бацькоў секлі айцы піяры, а мы паспыталі базыльянскія розгі. Але няхай за гэтыя розгі ўшануюць іх нябёсы. Так здорава яны лупцавалі, калі было за што, але і любілі яны дзяцей сардэчна і шчыра, старанна настаўлялі іх у навуцы і веры і строга пільнавалі мараль – шмат каго дала нашаму краю іх уважлівая апека"*[97].

Праславілася выхаванцамі, якія буйнымі літарамі ўпісалі свае імёны ў гісторыю XIX ст., ***Барунская базыльянская школа.*** Многія з іх занялі высокія пасады ў органах дзяржаўнай улады і мясцовага кіравання, у царкоўнай іерархіі. Талент шэрагу выкладчыкаў і выпускнікоў Барунскай школы ўзышоў на навуковым га-

[97] Самусік А. Дзейнасць манаскіх ордэнаў ў галіне асветы на Беларусі ў першай трэці XIX ст. // Гісторыя: праблемы выкладання. 1998. № 1. С. 45.

рызонце: Антоні Вырвіч стаў прафесарам матэматыкі Віленскага ўніверсітэта, Вінцэнт Карчэўскі – ад'юнктам (памочнікам прафесара астраноміі), Антон Камінскі быў аўтарам работ па асновам геаграфіі і матэматыкі. Свой след у еўрапейскай літаратуры пакінулі Леанард Ходзька, Ігнацы Ходзька, Антон Адынец, Юльян Корсак.

Але з пачатку XIX ст. разгарэўся канфлікт паміж чорным і белым духавенствам, якое абвінавачіла базыльян ва ўзурпацыі адукацыйнай сферы. Манахі, абавязаныя плаціць падаткі на ўтрыманне Галоўнай семінарыі, сталі яе ворагамі[98]. У 1819 г. Брэсцкі капітул паставіў базыльянам у віну прыгнёт белага духавенства і нізкі ўзровень яго адукаванасці[99].

Эпілогам дзейнасці базыльянскіх і ўніяцкіх школ у Беларусі стала іх рэарганізацыя ў канцы 1820-х – 1830-я г. у праваслаўным духу, дыстанцыяванне моладзі ад кантактаў з рыма-католікамі і, нарэшце, закрыццё. Надзеі, якія царызм ускладаў на базыльян як на выхавацеляў маладога пакалення, прасякнутага вернападданіцкімі настроямі, не апраўдаліся. Вучонае манаства, наадварот, паралізоўвала намаганні ўраду па ўнутраным зліцці краю з імперыяй, прышчэплівала ўніяцкай моладзі ліцвінскі сепаратызм і мясцовы патрыятызм, які, аднак, нярэдка выяўляўся ў польскай форме. Імкненне базыльян "удержать направление умов в непонятную сторону, не согласно с мерами правительства"[100], узмацненне праз іх навучальныя ўстановы рэлігійнай і нацыянальнай самасвядомасці, апазіцыйных настрояў надало праблеме адукацыі ў Беларусі палітыч-

[98] Worotyński W. Seminarium Glównie w Wilnie. Cz. 1: Powstanie i pierwszy okres dziejów (1803–1816). Wilno, 1935. S. 201–202.

[99] Рукапісны аддзел Бібліятэкі Чартарыйскіх (Кракаў). Спр. 2023, арк. 7.

[100] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 3157, воп. 1, спр. 84, арк.13–13 адв.

ную афарбоўку. Пачынаецца выцясненне базыльян са сферы адукацыі, скасаванне іх кляштараў, што азначала змену ўрадавага курса ва "ўніяцкім пытанні", вырашэнне якога стала справай часу.

Імператарскім указам 1828 г. базыльянскія школы былі асуджаны на паступовае знішчэнне. У 1828–1836 г. былі закрыты для моладзі, якая жадала прысвяціць сябе свецкай кар'еры, навучальныя ўстановы ў Жыровіцах, Талачыне, Барунах, Вярбілаве, Беразвеччы, Лядах і інш. Іх перапрафілявалі на пастаўку персаналу выключна для Царквы. Змянілі мэту, змест і скіраванасць адукацыі – са сродку павышэння прэстыжу і культурнага ўзроўню Уніяцкай Царквы ператварылі ў сродак яе ліквідацыі і перавыхавання вернікаў "в видах" улады. У 1832 г. быў закрыты Віленскі ўніверсітэт, праз год – Галоўная семінарыя. Моладзі забаранілі выязджаць па навуку за мяжу і пераарыентавалі на атрыманне адукацыі ва ўніверсітэцкіх цэнтрах Расіі. Базыльяне, якія да нядаўняга часу з'яўляліся магутным рухавіком адукацыі ў Беларусі, былі поўнасцю выцеснены са сферы адукацыі.

***Такім чынам,*** стварэнне ўласнай сістэмы адукацыі, адпаведнай сваёй спецыфіцы і арыентаванай на патрэбы грамадства, стала адным з прыярытэтаў дзейнасці Уніяцкай Царквы з самага пачатку яе існавання. Яе найбольшая актыўнасць у гэтай сферы прыпадае на першую чвэрць XVII ст. Праз стварэнне сеткі навучальных устаноў на Радзіме і падрыхтоўку кадраў у каталіцкіх навучальных установах Рэчы Паспалітай і за мяжой Царква здолела выгадаваць новую генерацыю духавенства, якая ўтрымала Унію, умацавала Царкву і ўзняла яе прэстыж. Пры гэтым мела месца тэндэнцыя супрацьпаставіць "рускую" адукацыю езуіцкай, выдаткамі якой былі лацінізацыя і паланізацыя беларускай

моладзі. Найбуйнейшымі асветніцкімі цэнтрамі Уніі ў XVII ст. былі Вільня, Мінск, Быцень.

Другі этап адукацыйнай актыўнасці базыльян прыпадае на апошнюю чвэрць XVIII – першую трэць XIX ст., калі правільна знойдзенае Царквой месца ў новых рэаліях эпохі Асветніцтва, пераход у рукі базыльян школьнай справы езуітаў і ўрадавая падтрымка абумовілі вялікую і карысную ролю ўніяцка-базыльянскіх школ у развіцці адукацыі і асветы ў Беларусі.

На працягу XVII – першай трэці XIX ст. Царква на ўласныя сродкі стварыла рознатыповыя навучальныя ўстановы – ад пачатковых да вышэйшых школ, якія мелі розныя праграмы, але адпаведныя праграмам еўрапейскіх школ. Вялікая ўвага надавалася свецкім дысцыплінам; навучанне ў многім насіла філалагічны характар і мела патрыятычную скіраванасць Базыльянска-ўніяцкія школы прызначаліся для манаства, святароў і свецкай шляхецкай моладзі. У 1830-я г. Царква падышла да стварэня школ для дзяцей сялян і гараджан.

Педагогамі ў навучальных установах працавалі многія выдатныя людзі свайго часу, якія падрыхтавалі шмат вядомых царкоўных, культурных, грамадска-палітычных дзеячаў, вучоных і пісьменнікаў. Запрашэнне выкладчыкаў з-за мяжы, магчымасць атрымання адукацыі на Захадзе, карыстанне паслугамі езуітаў, набыццё замежнай літаратуры, а таксама пошукі падтрымкі адукацыйных захадаў ў Рыме спрыялі пашырэнню міжнародных культурных кантактаў Беларусі з краінамі Еўропы. На мяжы 1820-х – 1830-х г. уніяцкая сістэма адукацыі падверглася карэннай рэарганізацыі і была пераарыентаваная на падрыхтоўку духавенства да аб’яднання з Праваслаўем.

# Кніжная спадчына


ЛЕѮІКОНЪ

Сирѣчь

СЛОВЕСНИКЪ СЛАВЕНСКІЙ

Имѣющъ в себѣ,

Словеса первѣе Славенскія, Азбучныя, потомъ Полскія.

Благопотребный къ выразумѣнію Словесъ славенскихъ,

Обрѣтающихся въ Книгахъ Церковныхъ

Изображенъ.

Въ Тѵпографіи Монастыря Общежителнаго Супрасльскаго.

Року Божія ҂аѱкв. Мца Генваря дня иі.

*Кніжны помнік Беларусі. Лексикон Сиречь словесник славенский. Супрасль, 1722. Тытульны аркуш*

- *Узнікненне кнігадрукавання – цывілізацыйная рэвалюцыя*
- *Уніяцкае кнігадрукаванне як фактар культуры*
- *Віленская друкарня*
- *Супрасльская базыльянская друкарня*
- *Кнігапісанне*
- *Інтэлектуальны досвед чалавецтва на паліцах базыльянскіх бібліятэк*

## Узнікненне кнігадрукавання – цывілізацыйная рэвалюцыя

Чалавецтва доўга вынаходзіла спосабы перадачы інфармацыі. У глыбокай старажытнасці людзі свае думкі, творы, адкрыцці высякалі на камянях, выціскалі на гліняных плітах, выдрапвалі на бяросце, пісалі чарніламі на папірусе, пергаменце. Доўга ішоў пошук і прыладаў пісьма, каб гэту інфармацыю запісваць. Прымянялі зубіла, разец, завостраную палачку, гусінае пяро. Урэшце вынайшлі металічны шрыфт для друкавання кніг. Кожная новае вынаходства – пісьменства, друк, у XX ст. камп'ютар – уздымала грамадства на новую, больш высокую прыступку цывілізаванасці.

Поспехі эканомікі і гандлю, стварэнне ўніверсітэтаў і рост колькасці адукаваных людзей, адкрыццё бібліятэк і развіццё навук павялічылі попыт сярэднявечнай Еўропы на кнігу. Яе даў еўрапейцам – у тым выглядзе, як мы і сёння маем, – нямецкі майстар з горада Майнца ***Ёган Гутэнберг***. Вынаходствам у сярэдзіне 1440-х г. тэхналогіі множання кніг з дапамогай друкарскага варштата (станка) і наборнага шрыфту ён здзейсніў рэвалюцыю ў галіне перадачы інфармацыі.

Праз 20 гадоў новая тэхналогія трывала ўкаранілася ў краінах Заходняй і Цэнтральнай Еўропы.

Кнігадрукаванне хутка і глыбока пранікала ў жыццё людзей і мяняла іх свет, станавілася магутным стымулам развіцця ўсіх сфер чалавечай дзейнасці: ад эканомікі і дзяржаўнага кіравання да адукацыі і навукі. Гэта быў сапраўдны прарыў у тэхнічнай эвалюцыі і адно з найважнейшых дасягненняў чалавечай цывілізацыі, самае важнае вынаходства другога тысячагоддзя. Сучаснікі недарэмна назвалі яго "мастацтвам з усіх мастацтваў, навукай з усіх навук".

Справа Гутэнберга аказала выключнае ўздзеянне на культуру кожнага з еўрапейскіх народаў, у тым ліку беларусаў.

Беларусь заняла годнае месца ў гісторыі еўрапейскага кнігадруку дзякуючы ўраджэнцу Полацка ***Францыску Скарыне*** (каля 1490 – каля 1551), які паставіў найноўшую еўрапейскую тэхналогію друку на службу свайму народу. Ніхто да яго на вялізным абшары Усходняй Еўропы не дадумаўся "ціснуць" кнігі.

Гэта быў надзвычай наватарскі і адважны для першай паловы XVI ст. інтэлектуал. Сваім перакладам на родную мову і тыражаваннем Святога Пісання ён здолеў данесці Слова Божае і мудрасць многіх пакаленняў чалавецтва да шляхты і мяшчан Беларусі, да духавенства і свецкіх асоб, да людзей рознага этнічнага і сацыяльнага паходжання, дастатку, прафесіі, месца жыхарства. Скарына зрабіў кніжнае слова даступным для кожнага.

Яго выданні – не толькі бліскучыя ўзоры друкарскага майстэрства, але і важная асветніцкая з'ява. Яны спрыялі ўмацаванню хрысціянскіх асноў жыцця народа, садзейнічалі распаўсюджванню ідэй талерантнасці, вальнадумства, фарміраванню нацыянальнай

свядомасці. Сваім друкарскім пачынаннем Ф. Скарына адкрыў суайчыннікам перспектыву авалодання ўсёй духоўнай культурай, што назапасіла чалавецтва, і тым змяніў увесь свет беларусаў. Уключэнне кнігі ў іх культурную прастору і паўсядзённае жыццё адкрыла новую эпоху ў развіцці нашага народа.

***Францыск Скарына ўвёў беларускую мову ў рэлігійную сферу.*** Зроблены ім на працягу 1517–1519 г. пераклад Бібліі меў не толькі царкоўнае, але і агульнанацыянальнае значэнне. Ён пераламіў векавыя ўяўленні, быццам бы дзеля захавання святасці нельга перакладаць царкоўную Біблію на жывую мову. Беларускую мову ён замацаваў у гэтым літаратурным творы сусветнага значэння як раўнапраўную, "боскую" побач з класічнымі, агульнапрызнанымі, кананічнымі мовамі: лацінскай, грэчаскай, царкоўнаславянскай, на якіх, як раней лічылася, адзіна можна размаўляць з Богам. Скарына даказаў права беларускай мовы на "святасць" побач з кананічнымі мовамі і ў гэтым яго вялікая заслуга перад сваім народам. Біблейскія героі ў яго перакладах загаварылі "з беларускім акцэнтам, на такой царкоўнаславянска-беларускай трасянцы".

Дзякуючы таму, што Францыск Скарына замацаваў беларускія элементы ў Бібліі, яго паслядоўнікі Сымон Будны і Васіль Цяпінскі больш смела ўжывалі гэту мову ў канфесійнай літаратуры. Годнай пераемніцай справы Скарыны стала Уніяцкая Царква, якая пайшла па шляху дэмакратызацыі і беларусізацыі царкоўнаславянскай мовы – зближэння з народнай і ўзбагачэння беларускімі моўнымі рысамі.

Кнігі Скарыны хутка разышліся па Еўропе: на землях Беларусі, Украіны, Літвы, Расіі; распаўсюдж-

валіся ў Польшчы і іншых славянскіх краінах; часам траплялі ў вельмі аддаленыя дзяржавы. Як першадрукаваныя "рускія" кнігі яны прыцягвалі да сябе асаблівую ўвагу тых, хто цікавіўся або прафесійна займаўся літаратурай, кніжнай пісьменнасцю, кнігадрукаваннем. Як выданні Бібліі яны хвалявалі Царкву, выкарыстоўваліся духавенствам і свецкімі адукаванымі чытачамі з рознага сацыяльнага асяроддзя. Папулярнасці яго кніг садзейнічала іх мастацкае афармленне. Многіх чытачоў яны вабілі патрыятычнай накіраванасцю, гуманістычнымі і асветніцкімі ідэямі.

Беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар ***быў прыхільнікам "церковной единоты"***. Ён падкрэсліваў бессэнсоўнасць падзелу хрысціянства і надуманасць спрэчак аб першынстве паміж найвышэйшымі іерархамі Заходняй і Усходняй Царквы. У сваёй Прадмове да "Першага Паслання Паўла да Карынцянаў" ён пісаў пра велізарную грамадскую карысць ад усехрысціянскага адзінства[101].

Сёння ў бібліятэках і музеях свету захавалася звыш 520 Скарынавых выданняў. У іх – асобы рэжым захоўвання: пастаянная тэмпература, пэўная вільготнасць. Кошт такой кнігі сягае многія мільёны рублёў. Таму некаторыя з іх захоўваюцца нават у сейфах.

Узнікненне кнігадрукавання – найвышэйшае дасягненне беларускай культуры XVI ст. Яго калыскай стала Прага (1517–1519), а потым і Вільня (1522–1525). Спачатку друкарская справа Скарыны ў Вільні была

[101] Мальдзіс А. Францыск Скарына як прыхільнік "церковной единоты" // Полымя. 1990. № 8. С. 203–208; Саверчанка І. Aurea mediocritas. Кніжна-пісьмовая культура Беларусі: Адраджэнне і ранняе барока. Мінск, 1998. С. 91.

адзінкавай з'явай. Праз тры дзесяцігоддзі, у новых грамадска-палітычных і сацыяльных умовах, яго геніяльнае пачынанне было падхоплена і працягнута паслядоўнікамі. У 50-я – 70-я г. XVI ст. друкарскія варштаты запрацавалі ў Берасці, Нясвіжы, Лоску, Заблудаве, Цяпіне.

***Першая на тэрыторыі сучаснай Беларусі друкарня*** была створана ў 1550-я г. у Брэсце на хвалі Рэфармацыі. Яна дзейнічала ў 1550-я – 1570-я г. пад апекай канцлера Вялікага Княства Літоўскага, віленскага ваяводы і берасцейскага старосты Мікалая Радзівіла Чорнага і за гэты час выпусціла больш за 40 выданняў рознага зместу на польскай і лацінскай мовах. Сярод іх – ***Берасцейская (Радзівілаўская) Біблія*** – самая вялікая і багата аформленая беларуская друкаваная кніга XVI ст. Яна стала шэдэўрам кнігадрукарскага мастацтва і ўнікальным помнікам сусветнай культуры. Гэты фаліянт, як адзначыў Сымон Будны, было "не тое што насіць – вазіць цяжка".

Берасцейская Біблія лічыцца адным з найпрыгажэйшых выданняў свайго часу. Сёння ў бібліятэках Еўропы і Амерыкі знаходзіцца больш за 130 яе асобнікаў (пераважная большасць дэфектныя). Нацыянальная бібліятэка Беларусі ажыццявіла факсімільнае ўзнаўленне Берасцейскай Бібліі (2019). Створана 11 экземпляраў. Асобнік важыць 15 кг, мае 1500 старонак і каштуе 1,5 тысячы даляраў.

Надрукаваны ў 1562 г. ў Нясвіжы ***"Катэхізіс" Сымона Буднага*** стаў першым беларускамоўным творам, выдадзеным у межах сучаснай Беларусі. ***"Евангелле"***, якое ***Васіль Цяпінскі*** надрукаваў каля 1580 г. у сваім маёнтку Цяпіне (цяпер Чашніцкі раён

Віцебскай вобласці), было першым у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе выданнем на беларускай і царкоўнаславянскай мовах самай знакамітай кнігі Новага Запавета. У сваёй прадмове да Евангелля ён кінуў у твар беларускаму панству абвінавачанне ў *"заньядбанні своего славного езыка"*.

У ***Заблудаве*** Гродзенскага павета ў 1568–1570 г. друкавалі кнігі рускі першадрукар Іван Фёдараў і яго паплечнік, выхадзец з Беларусі ***Пётр Мсціславец***. Калі друкарня спыніла дзейнасць, Іван Фёдараў пераехаў ва Украіну, у Львоў, дзе паклаў пачатак украінскаму кнігадрукаванню. А Пётр Мсціславец пасяліўся ў Вільні, куды яго запрасілі заможныя беларускія купцы і грамадскія дзеячы Кузьма і Лука Мамонічы. На іх сродкі Мсціславец заснаваў у Вільні друкарню. Яна адрадзіла кірылічнае кнігадрукаванне (друк славянскім кірылічным шрыфтам) у сталіцы Вялікага Княства Літоўскага праз паўстагоддзя, як там спынілася выдавецкая дзейнасць Скарыны. З канца XVI ст. Вільня стала найбуйнейшым цэнтрам усходнеславянскага кнігадрукавання.

***Друкарня Мамонічаў*** мела важнае грамадскае і культурнае значэнне ў жыцці Беларусі, адыграла прыкметную ролю ў справе асветы, у далейшым развіцці беларускага кнігадрукавання. Яна атрымала афіцыйнае прызнанне ўладаў. Гэта была адзіная друкарня XVI–XVIII ст., якая тры разы атрымлівала каралеўскія прывілеі на права друку царкоўнарэлігійных і свецкіх выданняў. Яна выпусціла першыя ў беларускім кірылічным кнігадрукаванні выданні прававога характару. Сярод іх – Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. У канцы XVI – першай чвэр-

ці XVII ст. друкарня Мамонічаў выдавала кнігі для Уніяцкай Царквы.

Вядучую ролю ў беларускім кнігадрукаванні канца XVI – першай паловы XVII ст. адыгралі друкарні царкоўных брацтваў, праваслаўных, а потым і ўніяцкіх. Яны выкарыстоўвалі пераважна кірылічныя шрыфты, уласцівыя беларускай, рускай і ўкраінскай пісьменнасці, і друкавалі кнігі на зразумелай народу мове. Асноўным цэнтрам лаціна-польскага кнігадрукавання ў Вялікім Княстве Літоўскім была друкарня Віленскай езуіцкай акадэміі. Нягледзячы на ўзрастанне паланізацыі мясцовых феадалаў і часткі мяшчанства, у беларускім грамадстве адчуваўся першарадны ўплыў брацкіх кніг.

## Уніяцкае кнігадрукаванне як фактар культуры

З канца XVI ст. царкоўнае, брацкае, прыватнапрадпрымальніцкае кнігадрукаванне стала пастаянным фактарам культурнага жыцця Вялікага Княства Літоўскага, Беларусі. У гэты працэс актыўна ўключаецца Уніяцкая Царква. Яшчэ напярэдадні Берасця яе дзеячы адчулі вострую патрэбу ў адпаведных выданнях. Брэсцкі епіскап Іпаці Пацей выказваў шкадаванне, што пра старажытнасць унійнай традыцыі *“наши албо не ведают, албо не чытают, албо теж книг в Руском языку о том писаных у себе не мают”*[102]. Ідучы на Унію, епіскапат Кіеўскай мітраполіі агаварыў права

[102] Потей И. Уния альбо выклад преднейшых артыкулов ку зъодноченью Греков с костелом Рымским належащых // Памятники полемической литературы в Западной Руси. Птб., 1882. Кн. 2 (Русская историческая библиотека. Т. 7). С. 118.

ствараць друкарні для сваёй Царквы, што і было пацверджана каралеўскай граматай ад 2 жніўня 1595 г.: *“абы им было вольно друкарни свои мети”*[103].

Унія выклікала да жыцця ўнікальную для таго часу адкрытую літаратурную палеміку, якая ў найбольш актыўнай сваёй фазе працягвалася з поўвека (з 1590-х да 1640-х г.), і дала магутны штуршок развіццю літаратуры і друкавання на мяжы XVI–XVII ст. Многія з выдадзеных тады кніг былі пісаны на жывой беларускай мове, якая з другой паловы XVI ст. становіцца мовай літаратурнай.

Спачатку Уніяцкая Царква карысталася для набажэнства сваімі традыцыйнымі (візантыйска-праваслаўнымі) кнігамі. Уніяты пачалі тую багаслоўскую працу, якая засталася ў гісторыі не толькі як помнік азнаямлення лацінска-польскага свету з набыткамі грэка-візантыйскай царкоўнай культуры, але – шырэй – як пошук культурна-рэлігійнага кампрамісу. Унія нарадзіла арыгінальную літаратуру (багаслужбовую, багаслоўскую, чэццю) і стварыла адметныя тыпы кніг – двухмоўныя службоўнікі, памяннікі і інш[104]..

***Віленская друкарня***. Кніжныя патрэбы Царквы на першых парах забяспечвала друкарня прыхільных да Уніі беларускіх купцоў, выдаўцоў і грамадскіх дзеячаў Вялікага Княства Літоўскага Лукі і Кузьмы Мамонічаў, якая працавала ў Вільні ў 1583–1624 г. Яны абодва належалі да праваслаўнага брацтва Св. Трой-

---

[103] Documenta Unionis Berestensis Eiusque Auctorum (1590–1600) / Edit. A. Welykyj. Romae: Analecta Ordinis S. Basili Magni. Sectio III, 1970. С. 116.

[104] Гісторыя беларускай кнігі. Т. 1: Нікалаеў М. В. Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага. Мінск, 2009. С. 101, 260.

цы, а потым сталі ўніятамі. З 1602 г. на чале друкарні стаў Лявон, сын Кузьмы. Ужо ў 1595–1597 г. тут былі надрукаваны творы І. Пацея ў абарону царкоўнага адзінства і правамоцнасці берасцейскага акта: "Уния албо выклад преднейшых артыкулов ку зъодноченью греков с костелом римским належащых" (1595); "Справедливое описанье поступку и справы сынодовое и оборона згоды и единости съвершенное" (1597) і яго беларускамоўны пераклад кнігі Пятра Скаргі "Описанье и оборона събору руского берестейского" (1597), а таксама "Антирризис" (пасля 1599).

З 1600 г. друкарня выпускала, галоўным чынам, уніяцкую літаратуру. У 1601–1625 г. тут з'явілася 71 выданне, у тым ліку больш за 20 палемічных твораў, якія выйшлі з-пад пяра ўніяцкіх царкоўных дзеячаў Пятра Федаровіча, Іпація Пацея, Іллі Марахоўскага, Лявона Крэўзы, Іосіфа Руцкага, Антона Сялявы[105].

Друкарня Мамонічаў выдала па заказу Уніяцкай Царквы кнігу Святога Пісання – Евангелле (1600) і першыя візантыйска-славянскія літургічныя кнігі ў каталіцкай версіі: Служэбнік (1617, на сродкі Льва Сапегі) і Трэбнік (1618). Да гэтага часу ў літургічным ужытку ўніятаў былі кнігі праваслаўнага паходжання. Першапачаткова Вільня была асноўным пастаўшчыком уніяцкай кніжнай прадукцыі для Беларусі, а таксама Украіны.

Друкарскую эстафету Мамонічаў у XVII ст. падхапілі віленскія базыльяне. Пасля 1624 г. Лявон перадаў ордэну сваю друкарню. На яе базе ў XVII–XVIII ст., з перапынкам у 1692–1766 г., працавала Траецкая дру-

---

[105] Анушкин А. На заре книгопечатания в Литве. Вильнюс, 1970. С. 68–74.

карня. Яна валодала некалькімі варштатамі і камплектамі наборных шрыфтоў.

У 1620-я г. востра паўстала неабходнасць “поправы” і выдання царкоўных кніг у духу берасцейскага злучэння, бо ўніяты працягвалі карыстацца кнігамі праваслаўнага паходжання.

Першая вядомая кніга базыльянскай друкарні, створанай на базе Мамонічавай, – “Катэхізіс” – датуецца 1628 г. Але друкарскія намаганні віленскіх базыльян у XVII ст. былі малапаспяховымі, да таго ж падчас маскоўскай акупацыі 1655 г. быў знішчаны прэс. У гэтым стагоддзі яны выдалі яшчэ толькі адну кнігу – “малы” (няпоўны) “Служебник, или Литургикон” у 1691 г., пасля чаго друкарня спыніла сваю дзейнасць на 70 гадоў, верагодна, з-за беднасці Вільні на майстроў, *“в художестве типографии искусных, знающих и умеющих писания наша славенороссийская”*. А ў наступным годзе ўніяцкае кнігадрукаванне перамясцілася ў Супрасль.

Затое другі і апошні перыяд дзейнасці Траецкай друкарні, які прыпадае на 1767–1800 г., быў надзвычай плённым. Вядома пра 46 яе кірылічных выданняў (на мовах усходнеславянскіх народаў) гэтага часу[106]. Траецкія базыльяне выдавалі кнігі таксама на польскай і лацінскай мовах. Большасць іх выданняў складаюць багаслужэбныя і тэалагічныя кнігі. Цікава, што сярод іх былі пераклады і перадрук маскоўскіх выданняў сярэдзіны XVII ст.

Выдаваліся таксама панегірыкі і падручнікі (“Буквар славянскай мовы” 1767 і 1782 г., “Буквар поль-

[106] Кніга Беларусі. 1517–1917: Зводны каталог / Склад. Г. Я. Галенчанка і інш. Мінск, 1986. С. 19, 147–189.

скай мовы” 1783 г. і інш.), у эпоху Асветніцтва – і літаратурныя творы.

Вялікі “Лексікон геаграфічны” базыльяніна Іларыёна Карпіньскага (1766 г.) з’яўляецца першым такім выданнем у Вялікім Княстве Літоўскім. Ён утрымлівае не толькі важную геаграфічную і гістарычную інфармацыю аб краінах і народах Еўропы і іншых кантынентаў. Асаблівую каштоўнасць уяўляюць арыгінальныя звесткі пра ваяводствы, паветы, гарады, мястэчкі і нават вёскі Беларусі, Літвы, Польшчы. Навукова-асветніцкую вартасць гэтага выдання высока ацэньваюць сучасныя даследчыкі.

Паказчыкам прадукцыйнасці выдавецкай дзейнасці траецкіх базыльян і попыту на іх прадукцыю з’яўляецца функцыянаванне ў канцы XVIII ст. у Вільні іх кніжнай крамы. Гэта ўнікальная з’ява культуры таго часу, калі крамны гандаль толькі пачынаў развівацца ў Вялікім Княстве Літоўскім.

***Супрасльская базыльянская друкарня.*** Але вернемся ў другую палову XVII ст., калі яшчэ бракавала ўласных літургічных кніг, патрэбных для тысячаў храмаў. Кнігі, што паступалі з-за “схізматыцкай” мяжы, былі няпэўнымі дагматычнымі крыніцамі: або на грэчаскай мове, невядомай духавенству, або на зразумелай царкоўнаславянскай мове, але ўкладзеныя і надрукаваныя ў Маскве. А ўжыванне тэкстаў лацінскага абраду, паток якіх ішоў з захаду, вяло да лацінізацыі Царквы. У гэтым хутка зарыентаваўся новы мітрапаліт, ураджэнец Полаччыны Цыпрыян (Кіпрыян) Жахоўскі (1674–1693).

Гэта высокаадукаваны чалавек, доктар тэалогіі (толькі 4 з 15 уніяцкіх мітрапалітаў мелі гэту вучоную ступень), чые культуратворчыя заслугі перад сва-

ёй Царквой і беларускім грамадствам бясспрэчныя. *"Не хапае св. рускіх кніг – мшалаў, літургіі, меналогіі, трыфалогіі, псалтыроў, гімнаў …, нават аднастайных формулак … славянскімі літарамі"*, – пісаў Ц. Жахоўскі ў Рым у 1679 г..[107] Ён выступіў з ініцыятывай стварэння аўтарытэтнага выдавецкага асяродка для Уніяцкай Царквы. Пытанне аб вялікай патрэбе "друкарні рускай мовы" абмяркоўвалася на XXII кангрэгацыі базыльян (1686 г.). Адкрыць яе рашылі на ўласныя сродкі – прызначыць падатак з духавенства па 1 злотаму з чалавека[108].

Месцам для закладкі друкарні абралі Супрасльскі базыльянскі манастыр – буйны інтэлектуальны асяродак Вялікага Княства Літоўскага на тэрыторыі Гродзенскага павета. Адказным за друк быў прызначаны вучоны базыльянін Самуэль Піліхоўскі, пераведзены сюды з Быценьскага манастыра. Першая кніга супрасльскай друкарні – ***"Служебник, или Литургикон" (1692–1695)*** – пачала друкавацца ў Вільні, а была завершана ў Супраслі. Над яе афармленнем працаваў іскусны гравёр Лявонцій Тарасевіч, які ўпершыню ў гісторыі беларускай кірылаўскай кнігі выкарыстаў медзярыт. "Служэбнік" набраны чорнай і чырвонай фарбамі, меў шмат застаўак, гравюры. Яго тытульны ліст, аформлены ў выглядзе трыумфальнай брамы з выявамі Васіля Вялікага, Іаана Златавуста, Георгія Дваяслова, – адзін з самых высокамастацкіх у Беларусі.

Да канца XVII ст. выйшла яшчэ два выданні, абодва кірылічныя: "Житие Онуфрия, царевича

[107] Żochowski S. Unia Brzeska w Polsce XVII wieku: Monografia Ks. Cypriana Żochowskiego metropolity Calej Rusi i Arcybiskupa Połockiego (1635–1693). Brysbane- Londyn, 1988. S.157.

[108] Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. Вильна, 1867. Т. 2. С. 124.

перского” (1696 г.) – арыгінальны помнік беларускай агіяграфіі канца XVII ст., створаны базыльянінам Іосіфам Пяткевічам, і “Последование постригу” (1697 г.).

З пачатку XVIII ст. дзякуючы намаганням Льва Кішкі, супрасльскага архімандрыта (1709–1728), главы базыльянскага ордэна (1709–1713), а потым мітрапаліта (1714–1728), друкарня адрадзілася і пашырылася. З невялікай майстэрні з ігуменам на чале яна ператварылася ў буйную цэнтралізаваную мануфактуру, якую ўзначальваў прэфект (загадчык), з 15-ю і больш рабочымі.

“Ціснулі” кнігі самі манахі ды рамеснікі-друкары з ліку манастырскіх падданых. У 1710 г. на прыбыткі ад манастырскай гаспадаркі і самой друкарні заснавалі паперню – майстэрню па вытворчасці паперы. На пачатак XIX ст. было ўжо тры друкарскія варштаты. У 1710 г. Леў Кішка выклапатаў у манарха прывілей на права выдання ў Супраслі кніг на лацінскай, польскай і “рускай” мовах. У 1713 г. прывілей пацвердзілі ў Рыме з умовай, каб кнігі праходзілі папярэднюю цэнзуру вучоных мужоў і папскага нунцыя.

З узмоцненай нагрузкай друкарня пачала працаваць пасля Замойскага сабора 1720 г., які забараніў набываць багаслужэбныя кнігі старога ўзору, выдадзеныя ў Маскве. Для выкаранення абрадавай неаднастайнасці і недахопу літаратуры сабор даручыў мітрапаліту выправіць багаслужэбныя кнігі і, зацвердзіўшы іх у Рыме, друкаваць у Супраслі і прадаваць па належнаму кошту.

Атрыманае манапольнае права на выданне ў Вялікім Княстве Літоўскім літургічнай уніяцкай літаратуры новай рэдакцыі стварыла для друкарні спрыяльныя ўмовы, дазволіла пашырыць выдавец-

кую дзейнасць, павялічыць наклады. Быў пабудаваны кніжны склад і адкрыта кнігарня.

Выконваючы саборнае рашэнне, Леў Кішка арганізаваў выданне ў Супраслі за кошт манастыра ўніфікаванага для ўсёй Кіеўскай мітраполіі, для 10 тысяч цэркваў, "Служебника, или Литургикона" (1727–1732), які ўтрымліваў тэксты літургіі і іншых службаў "по чину святыя восточныя церкви". У яго афармленні ўдзельнічаў гравёр Лявонцій Тарасевіч.

Выдатным помнікам нацыянальнага пісьменства і кнігадруку з'яўляецца выдадзены на старабеларускай мове адной кнігай дапаможнік для святароў з катэхізісам для вернікаў "Собрание припадков краткое" Льва Кішкі (1722 г.). На працягу 1772–1796 г. тут таксама было выдадзена 60 назваў кніг па замове рускіх старавераў[109].

Умацаваць пахіснуты статус царкоўнаславянскай мовы была заклікана філалагічная літаратура: "Буквар языка славенского" (1715, 1727, 1754, 1761, 1792 г.), царкоўнаславянская "Азбука" (1781, 1788 г.), "Лексикон" (1722 г., перавыдаваўся ў 1751, 1756, 1804 г.) – двухмоўны царкоўнаславянска-польскі слоўнік рэлігійнай тэрміналогіі.

***"Лексікон" 1722 г.*** з'яўляецца адным з найбольш вядомых кірылічных выданняў Супрасльскай друкарні. Гэты твор невядомага аўтара-паліглота і дасведчанага лексікографа быў прызначаны для духавенства як слоўнік-дапаможнік па вывучэнню царкоўнаславянскай мовы. Звыш 100 гадоў "Лексікон" абслугоўваў

[109] Cubrzyńska-Leonarczyk M. Katalog druków supraskich. Warszawa, 1996; Cubrzyńska-Leonarczyk M. Oficyna supraska. 1695–1803: Dzieje i publikacje unickiej drukarni ojców bazylianów. Warszawa, 1993. S. 142, 182–183.

жыхароў пагранічча Вялікага Княства Літоўскага і Кароны.

За 100 гадоў існавання (1695–1803) Супрасльская друкарня выпусціла каля 500 назваў кніг. Толькі 35% іх складаюць рэлігійныя выданні для грамадскага і прыватнага набажэнства, творы маральна-павучальнага характару, казанні, гаміліі, жыцці святых, кантычкі, якія служылі справе ўмацавання чытачоў ва ўніяцкай веры і іх элементарнаму асветніцтву. Наклад кожнага выдання быў у сярэднім больш за тысячу асобнікаў, каб забяспечыць імі ўніяцкія храмы ўсёй Беларусі. Больш за палову супрасльскіх друкаў ніяк не звязана з мэтамі базыльянскага ордэна. Іх тэматыка і змест разнастайны: філасофскія, мастацкія творы, панегірыкі, падручнікі, юрыдычна-заканадаўчыя акты, працы па геаграфіі, гісторыі, медыцыне, сельскай гаспадарцы, практычныя парады і г.д. Супрасльскія "Календары польскія і рускія" 1714, 1717, 1722, 1732, 1734 г. былі першай масавай свецкай кніжкай ў Рэчы Паспалітай[110].

Выпуск ў другой палове XVIII ст. вялікай колькасці свецкай літаратуры, якая прапагандавала ў Беларусі здабыткі еўрапейскай культуры эпохі Асветніцтва,– адказ супрасльскіх базыльян на павевы часу. Асабліва дзіўным выдавецкі рэпертуар, як для манастырскай друкарні, стаў пры прэфекце Мялеціі Асухоўскім (1784–1792), які зразумеў грамадскія і культурныя змены свайго часу, ролю ў іх базыльян і паставіў свае веды і дзейнасць друкарні на карысць асветы ўсяго грамадства.

У апошнія два дзесяцігоддзі XVIII ст. друкарня выпусціла шмат "новай" літаратуры: працы Вальтэра

[110] Cubrzyńska-Leonarczyk M. Dziedzictwo Unii Brzeskiej: z dziejów oficyny wydawniczej OO Bazylianów w Supraślu (1695–1803). Warszawa–Białystok, 2007.

і іншых еўрапейскіх асветнікаў, творы вядучых паэтаў "польскага" Асветніцтва (Нарушэвіча, Карпіньскага і інш.), драматургаў (Багуслаўскага, Станіслава Шыманьскага), мемуары ўдзельніка Барскай канфедэрацыі К. Хаецкага і г.д.

Ніводная іншая манастырская друкарня не выдавала тады так шмат публіцыстыкі і палітычных прац, прысвечаных грамадска-палітычнай сітуацыі ў Рэчы Паспалітай і Вялікім Княстве Літоўскім у апошняй трэці XVIII ст. (творы Францішка Чапскага, Казіміра Канстанціна Плятэра, Станіслава Сташыца, паўстанцкія матэрыялы 1794–1975 г. і інш.), што сведчыць пра адкрытасць супрасльскіх базыльян да грамадства і іх зацікаўленасць лёсам Айчыны. Шэраг публікацый выйшаў на гербавай паперы з выявай Пагоні.

Па падліках даследчыка кніжнай культуры Беларусі Юрыя Лабынцава, каля 300 выданняў было надрукавана на польскай мове, што сведчыць пра пашыраную паланізацыю як самога выдавецкага асяродка, так і спажыўцоў яго прадукцыі, і больш за 120 – на кірыліцы, у тым ліку 60 беларускіх кніг. Апошнія адыгралі вялікую ролю ў развіцці нацыянальнай культуры канца XVII–XVIII ст. Калі ўлічыць, што на працягу XVIII ст. на тэрыторыі сучаснай Беларусі выйшлі адзінкавыя кірылічныя выданні (на царкоўнаславянскай мове), трэба прызнаць справядлівай выснову, што беларускае нацыянальнае кнігадрукаванне ў гэтым стагоддзі цалкам сканцэнтроўваецца ў сценах Супрасльскага манастыра[111]. Па колькасці друкаваных аркушаў кірылічных выданняў мелася значная пера-

[111] Лабынцев Ю. А. Кирилловское книгопечатание в Супрасле и его роль в развитии восточнославянских культур XVII–XVIII веков: автореф. дис. … канд. филол. наук. М., 1980. С. 7–8, 11.

вага над выданнямі лацінскага алфавіту[112]. Польска- і лацінамоўная кніга спрыяла распаўсюджванню на нашых землях набыткаў еўрапейскай навукі і культуры і далучэнню Беларусі да еўрапейскай супольнасці.

На фоне тагачаснай кніжнай прадукцыі супрасльскія выданні вылучаюцца імпазантнасцю, своеасаблівай манументальнасцю, дэкаратыўнасцю. Яны сталі творамі беларускага кніжнага мастацтва. Захаваныя ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі супрасльскія і віленскія выданні апошняй трэці XVIII ст. і праз два стагоддзі ўражваюць сваім паліграфічным афармленнем і дэкорам[113].

Вядомы імёны шэрагу супрацоўнікаў друкарні другой паловы XVIII ст.: мастак, прафесар жывапісу Антон Грушэцкі, гісер Аляксей Завадскі.

Супрасльская друкарня набыла шырокую вядомасць у Вялікім Княстве Літоўскім і за яго межамі. Яе друкі распаўсюджваліся праз кнігарні Вільні, Варшавы, Кракава, Познані, на кірмашах Зэльвы, Свіслачы і інш. Кнігі для старавераў ішлі ў Беларусь, Украіну, Польшчу, Малдавію, еўрапейскую Расію, Сібір, Сярэднюю Азію, Казахстан. Нездарма Кракаўская акадэмія хадайнічала аб тым, каб падпарадкаваць гэты выдавецкі асяродак сабе.

У апошнія гады XVIII ст. ва умовах Прусіі і Расіі друкарская справа базыльян трапіла ў неспрыяльныя ўмовы. Выдавецкая дзейнасць Супрасльскай друкарні рэзка скарачаецца з прычыны ўзросшай канкурэн-

[112] Гісторыя беларускай кнігі. Т. 1: Нікалаеў М. В. Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага. Мінск, 2009. С. 358.

[113] Часослов. Супрасль, 1772; Книга, глаголемая часослов. Супрасль, 1772; Часовник. Вильно: Тип. Троицкая, 1776; Книга, нарицаемая Златоуст. Супрасль, 1797; Книга, глаголемая Златоуст. Вильно, 1798.

цыі з боку каралеўскіх германскіх друкароў Кантэра і Апельбаўма. Усё рабілася дзеля яе выцяснення з гандлёвага рынку. У 1803 г. загадам прускіх уладаў збяднелы кляштар вымушаны быў прадаць друкарню з усім яе абсталяваннем беластоцкаму купцу Аарону. Друкарня ў Супраслі перастала існаваць.

Базыльянскі ордэн, які манапалізаваў у сваіх руках справу выдання кніг для патрэбаў Уніяцкай Царквы, арганізаваў на этнічных беларускіх і ўкраінскіх землях шэсць друкарняў: у Вільні, Супраслі, Мінску (працавала з 1790 г. як базыльянская, з 1793 (1797) г. належала губернскаму праўленню), Пачаеве, Львове і Уневе. Дзякуючы іх плённай працы базыльянскі ордэн займеў паважнае месца сярод іншых манаскіх арганізацый Рэчы Паспалітай, якія займаліся выдавецкай дзейнасцю. Росквіт уніяцкага кнігадрукавання прыпадае на XVIII ст. У канкрэтна-гістарычных умовах таго часу яно мела значэнне культурнага фактару.

У XVIII ст., калі закрываюцца праваслаўныя брацкія друкарні, беларускае кірылічнае кнігадрукаванне працягвае развівацца ва ўніяцкім асяроддзі. Больш таго, у ім нарадзіўся новы від рэлігійнай літаратуры, у якой кананічныя і літургічныя тэксты перададзены беларускай рэдакцыяй царкоўнаславянскай мовы, пачатак чаму паклаў яшчэ Францыск Скарына. Віленская і Супрасльская друкарні, а таксама ўніяцкія скрыпторыі рабілі гэтыя ўнікальныя помнікі беларускага пісьменства набыткам грамадскасці і нашай культуры.

Да пачатку XIX ст. народная, гутарковая (“простая”) беларуская мова (у вуснай і пісьмовай форме) не прызнавалася за паўнавартасную літаратурную мову. Выданнем кніг на гэтай мове базыльяне ўздымалі яе

прэстыж народні з мовамі царкоўнаславянскай і польскай. Выкарыстанне ў базыльянскіх друках народнай мовы сведчыла пра яе прысутнасць у царкоўным і грамадскім жыцці, адпавядала моўным і культурным чаканням чытачоў і спрыяла фарміраванню культурнай ідэнтычнасці ўніяцкай супольнасці на ўсходніх тэрыторыях Рэчы Паспалітай[114].

Выданні твораў антычных класікаў, разнастайных падручнікаў і дапаможнікаў, слоўнікаў, кніг па розных галінах ведаў з'яўляліся сродкам назапашвання інтэлектуальнага і інфармацыйнага патэнцыялу, які аб'ектыўна садзейнічаў агульнакультурнаму развіццю беларускага народа. Больш таго, базыльянская кніга стала адной з тых ніцяў, што звязвалі каштоўнасці беларускай, цэнтральна- і заходнееўрапейскай культур.

Будучы прадстаўнікамі інтэлектуальнай эліты Уніяцкай Царквы, манахі-базыльяне працай на ніве культуры, адукацыі, навукі засведчвалі сваю адкрытасць да новых ідэй, веру ў сілу розуму, цікавасць да грамадскіх спраў, высокія адукацыйныя і культурныя памкненні. Выдавецкая дзейнасць базыльян мела цывілізацыйнае вымярэнне. Яны дзейнічалі на памежжы дзвюх цывілізацый і, з аднаго боку, апелявалі да ўсходніх рэлігійных традыцый, а, з другога, прапагандавалі каштоўнасці заходняй (лацінскай) цывілізацыі. У выніку гэта прывяло да стварэння імі спецыфічнай "пасрэдніцкай" культуры, якая, у адрозненне ад рускаправаслаўнага ўплыву, не навязвала сваю адзіную схему цывілізацыйнага развіцця[115].

---

[114] Getka J. U progu modernizacji. Ruskojęzyczne drukarstwo bazyliańskie XVIII wieku. Lublin, 2019.

[115] Тамсама. S. 34, 273.

Штучныя абмежаванні і перашкоды для ўніяцкага друку з канца XVIII ст., з аднаго боку, і навязванне з захаду і з усходу сваіх літургічных тэкстаў, з другога, стварылі дэфіцыт "класічнай" для Уніяцкай Царквы літаратуры. Таму ў 1829 г. брэсцкі канонік Антон Сасноўскі хадайнічаў перад Сінодам дзеля падмацавання свайго абраду аб выдзяленні 400 рублёў срэбрам на выданне ў Віленскай базыльянскай друкарні трох тысяч асобнікаў малітоўніка "на дыялекце славянскім" на ўзор "старажытнай" уніяцкай кнігі і аб яго бясплатнай раздачы па епархіях[116].

Патрэбы царквы і яе навучальных устаноў у першай трэці XIX ст. забяспечвалі таксама ўкраінскія друкарні, найперш Пачаеўская, якая, аднак, апынулася пад прэсам расійскіх духоўных і свецкіх уладаў; і, у пэўнай меры, Полацкая езуіцкая друкарня. Але асноўны паток друкаванай прадукцыі па-ранейшаму ішоў з Вільні. Нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы, у якія з канца XVIII ст. папала іх друкарская справа, віленскія базыльяне да канца існавання "гістарычнай" Уніі забяспечвалі кнігай Царкву, вернікаў, выдавалі працы ў абарону сваёй веры.

У 1820-я г. кнігі набываліся ў прыватных друкарнях і кнігарнях Юзафа Завадскага і Францішка Морыца ў Вільні. А прадаваныя ў XIX ст. на кірмашах выданні беларускіх і ўкраінскіх базыльянскіх друкарняў былі разнесены па ўсёй Расійскай імперыі і сталі выкарыстоўвацца ў яе праваслаўных храмах, што ў 1825 г. усур'ёз устрывожыла Сінод[117].

---

[116] Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (Санкт-Пецярбург). Ф. 797, воп. 6, спр. 22703, арк. 1–2 адв.

[117] Тамсама. Ф. 797, воп. 6, спр. 22600, арк. 1–1 адв., 4.

## Кнігапісанне

Нягледзячы на тое, што з другой паловы XVI ст. кнігадрукаванне становіцца пастаянным фактарам беларускага культурнага жыцця, кніг не хапала. Асабліва гэта адчувала Уніяцкая Царква, пакуль не наладзіла іх стабільнае ўласнае выданне. Але нават магутнасцяў Віленскай і Супрасльскай друкарняў было недастаткова, каб насыціць храмы, базыльянскія бібліятэкі і свае навучальныя ўстановы ў Беларусі патрэбнай літаратурай. Гэты недахоп кампенсаваўся рукапіснай кнігай, якая яшчэ на працягу двух стагоддзяў была спадарожніцай друкаванай прадукцыі. Перапісцы падлягалі кнігі, неабходныя для паўсядзённага карыстання “інтэлігенцыі ў сутанах”, калі яна не мела адпаведнай друкаванай кніжкі.

Рукапісная кніжнасць пры ўніяцкіх царквах і базыльянскіх манастырах – цікавая і маладаследаваная з’ява беларускай культуры. ***Найбуйнейшымі кнігапіснымі цэнтрамі Беларусі былі Супрасль, Жыровіцы, Баруны.*** У той час як друкарні выпускалі кнігі масавага попыту шматтысячнымі накладамі, скрыпторыі выраблялі асабліва шыкоўныя заказныя або адсутныя на рынку “дэфіцытныя” кнігі.

У вытворчасці кнігі бралі ўдзел не толькі перапісчыкі, але пераплётчыкі, ілюстратары; часам ювеліры, якія выконвалі металічныя элементы абкладаў; ускосна – вытворцы паперы. Вядомы імёны ўніяцкіх кнігапісцаў XVII ст.: Феадосій і Цімафей Мароўскі з Жыровіцаў, Анастасій Свідэрскі і Гервасій Кішчыц з Супрасля, Паісій Сахоўскі з Барун, Антон Завадскі (Баруны, Жыровіцы), іераманах Іанікій

Жудра з Беразвечча, прасвітар пінскай кафедры Антоній Тараневіч і інш[118].

Багатая калекцыя помнікаў беларускага ўніяцкага кнігапісання XVII–XVIII ст. і сёння захоўваецца ў аддзелах рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі Польшчы ў Варшаве і бібліятэкі Вільнюскага ўніверсітэта. Гэта гістарычныя і тэалагічныя працы пра Унію, матэрыялы царкоўных брацтваў, памяннікі, помнікі ўніяцкай гімнаграфіі, багаслужэбныя кнігі, Евангеллі, Ірмалоі з тэкстамі царкоўных песень і нотамі, творы дзеячаў Царквы і інш. Адзін з такіх помнікаў XVII ст. – візантыйска-славянская літургія Св. Іаана Златавуста (паралельны царкоўнаславянскі і лацінскі тэкст) – быў выдадзены ў 1978 г. у Лондане[119].

Да пачатку XIX ст. уніяцкія друкарні так і не змаглі поўнасцю замяніць рукапісную кнігу. Аднак у XIX ст. кнігапісанне ў Беларусі зыходзіць з гістарычнай арэны.

## Інтэлектуальны досвед чалавецтва на паліцах базыльянскіх бібліятэк

Збіральнікамі і захавальнікамі кніжнай мудрасці здаўна былі рэлігійныя ўстановы. Свой уласны кніжны набытак стварыла і Уніяцкая Царква. Цягам двух стагоддзяў яна калекцыянавала выданні друкарняў Вялікага Княства Літоўскага і кніжныя веды іншых краін і народаў.

[118] Нікалаеў М. Палата кнігапісная: Рукапісная кніга на Беларусі ў X–XVIII стагоддзях. Мінск, 1993. С. 83, 87, 188, 194, 207, 225.

[119] The Pontifical Liturgy of Saint John Chrysostom: A manuscript of the 17th century in the Slavonic text and Latin translation / Edited by C. Sipovič. London: The Francis Skaryna Byelorussian Library and Muzeum, 1978. 205 p.

Манастыры ўсходняга абраду, што далучыліся да Уніі, пэўны час захоўвалі сваю “ўсходнасць” і іх бібліятэкі складаліся пераважна з кірылічных кніг духоўнага зместу. Стварэнне чыну святога Базыля Вялікага перавяло развіццё гэтых манастыроў на еўрапейскія (дакладней, лацінскія) “рэйкі”, што з часам адбілася на складзе іх бібліятэчных збораў[120].

Бібліятэкі служылі мэтам рэалізацыі асноўных кірункаў дзейнасці базыльянскага ордэна: пастырскай, асветніцка-адукацыйнай і навукова-літаратурнай. Яго праца рэгламентавалася спецыяльным статутам, распрацаваным Іосіфам Руцкім.

Манастырскі ўстаў патрабаваў стварэння бібліятэк з кніг, *“неабходных для заняткаў манахаў, для іх духоўнага ўдасканальвання і збаўлення вернікаў”*. Ігумен быў абавязаны клапаціцца пра іх папаўненне, арганізоўваць чытанне ўголас “душавыратавальных” кніг падчас трапезы і сходаў. Чытанне было абавязкам манахаў.

Бібліятэкі папаўняліся за кошт пакупкі, дарэння, абмену, завяшчання кніг. Хоць доступ да кніг меў замкнёны характар – карыстацца фондам мог толькі насельнік дадзенага манастыра – кола іх спажыўцоў было немалое: манахі, студэнты, духавенства і (радзей) свецкія асобы (мецэнаты, даследчыкі). Забаранялася выдаваць кнігі староннім людзям і выносіць іх за межы манастырскіх сцен. Затрымаць кнігу або таемна, без ведама архімандрыта, узяць яе было раўнасільна смяротнаму граху. Настаяцель павінен быў даваць свайму начальству справаздачу аб усіх кніжных набытках манастыра – дарунках, набытых на ўласныя або манастырскія грошы. Бібліятэкар – “вучоны законнік” – паві-

[120] Лаўрык Ю. Базыльянскія бібліятэкі // Наша вера. 2008. № 2. С. 57.

нен быў утрымліваць кнігі ў парадку, каталагізаваць іх, рэгістраваць выдачу. За халатнасць каралі.

***Найбуйнейшыя базыльянскія кнігасховішчы былі створаны ў Вільні, Супраслі і Жыровіцах***. Аднак у кожным манастыры мелася большая ці меншая бібліятэка – ад некалькіх дзясяткаў да некалькіх сотень тамоў. Уласныя кніжныя фонды стваралі ўніяцкія навучальныя ўстановы. Цэрквы звычайна бібліятэк не мелі, але кожная з іх мела патрэбу ў наборы багаслужэбных і чытальных кніг. Духоўныя іерархі і інтэлектуалы стваралі асабістыя бібліятэкі, склад якіх залежаў ад уласных навуковых, літаратурных, пісьменніцкіх інтарэсаў уладальнікаў: тэалагічных, філасофскіх, юрыдычных, гістарычных ці іншых.

Вядома, што Іосіф Руцкі ў 1613 г. перадаў віленскаму епіскапу са свайго кнігазбору "рускія кнігі" ("Пасольства ад духавенства і паноў рускіх да папы", "Абарона Берасцейскага сабора", "Размова дзвюх асоб рускай рэлігіі", "Абарона Фларэнційскага сабора" і інш.) і шэраг "кніг польскіх" ("Апалогія супраць Хрыстафора Філалета", "Аб прывілеях, наданых польскім каралямі Русі, якая прыняла св. унію" І. Пацея, і інш.). У 1631 г. у асабістай бібліятэцы турава-пінскага епіскапа Грыгорыя налічвалася 51 славянская і 39 лацінскіх кніг. Кнігі мітрапаліта Язафата Булгака (сярод іх Новы запавет у двух тамах на славянскай мове, Евангелле "рускай штатскай мовай", Псалтыр "рускімі вершамі") захоўвалася ў Ануфрэйскім манастыры (Мсціслаўскі павет). Асабістая бібліятэка славіста Міхала Баброўскага налічвала тысячу тамоў[121].

Базыльяне збіралі кнігі па самых розных галінах ведаў. Іх бібліятэкі мелі рэлігійныя выданні, што абу-

[121] Марозава С. В. Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1839 гады). Гродна, 2001. С. 114–115.

моўлівалася спецыфікай чытача, і свецкія друкаваныя выданні. Па агульнапрынятай схеме таго часу кнігі сістэматызавалі па наступных раздзелах: "Святое Пісанне. Пастановы Царквы, тлумачэнні", "Саборы, Святыя айцы, кананічнае права і тэалогія", "Царкоўная і грамадзянская гісторыя і геаграфія", "Творы манахаў", "Казанні", "Катэхізісы", "Жыцці святых і кнігі для набажэнства", "Працы па матэматыцы, фізіцы, філасофіі", "Прамовы, паэтычныя творы, граматычныя працы, слоўнікі", "Юрыдычныя, палітычныя, медыцынскія і перыядычныя працы".

Тыповымі для базыльянскай бібліятэкі былі матэрыялы збораў: Фларэнційскага, Трыдэнцкага, Замойскага; статут ордэна; палемічныя творы ў абарону сваёй веры ("Аб адзінстве Царквы Божай" Пятра Скаргі, "Абарона Фларэнційскага сабора" Іпація Пацея, "Saulus et Paulus" Якава Сушы, "Абарона рэлігіі грэка-рускай, з касцёлам рымскім аб'яднанай", "Пытанні і адказы супраць дысідэнтаў" і інш.); жыццяпісы святых (Ефрасінні, Язафата Кунцэвіча, базыльян); працы па гісторыі "рускай" царквы Ігната Кульчынскага, публікацыі ва ўшанаванне мясцовых абразоў ("Апісанне абраза найсв. Маці Божай Жыровіцкай" і інш.).

Неканфесійную частку бібліятэк складалі творы рымскіх класікаў, еўрапейскіх асветнікаў, слоўнікі і граматыкі, юрыдычная, філасофская, мастацкая літаратура, падручнікі, гістарычныя працы, навучальныя кнігі па прыродазнаўству, дакладных навуках, моваэнаўству, кнігі па медыцыне, трактаты прыкладнога значэння і інш.

Склад і змест базыльянскіх бібліятэк Беларусі з'яўляецца паказчыкам адукаванасці беларускага грамадства таго часу, гаворыць на карысць таго, што духавенства з акадэмічнай адукацыяй імкнулася даць

народу, моладзі зерні свецкай культуры. Базыльянскія бібліятэкі адыгралі станоўчую ролю ў захаванні, распаўсюджванні і перадачы наступным пакаленням еўрапейскіх культурных, навуковых, рэлігійных і ідэалагічных каштоўнасцей.

У XVII–XVIII ст. ішло рэгулярнае папаўненне базыльянскіх бібліятэк прадукцыяй друкарняў Вялікага Княства Літоўскага (базыльянскіх Віленскай і Супрасльскай; каталіцкіх выдавецтваў Вільні, Нясвіжа, Магілёва, Полацка; Гродзенскай каралеўскай), Украіны (Пачаева, Львова, Пярэмышля, Крамянца, Бердзічава, Уладзіміра), а таксама замежжа.

У XVIII ст. геаграфія кніжных паступленняў у базыльянскі бібліятэкі істотна пашыраецца. На беларускі кніжны рынак і на патрэбы Уніяцкай Царквы ў гэты перыяд працавалі друкарні Польшчы (Кракаў, Варшава, Каліш, Познань, Брунсберг (сучаснае Бранева), Люблін, Вроцлаў, Торунь, Чанстахоў, Сандамір, Ловіч), Італіі (Венецыя, Рым, Басана, Падуя, Ферара, Неапаль, Мілан, Балонья, Парма, Верона, Бергона і інш.). Базыльяне знаёміліся з выданнямі трох дзясяткаў друкарняў Германіі. У іх бібліятэках былі кнігі з Чэхіі, Аўстрыі, Францыі, Бельгіі, Даніі, Люксембурга.

Такая геаграфія выданняў – сведчанне шырокіх культурных сувязяў Уніяцкай Царквы Беларусі. Кніжны тавар паступаў сюды рознымі шляхамі: яго дастаўлялі купцы, дыпламаты, падарожнікі-арыстакраты, вандроўныя рамеснікі, яго атрымлівалі па царкоўных каналах, прывозілі нашы землякі – выхаванцы замежных навучальных устаноў і прадстаўнікі інтэлігенцыі.

Кніжны скарб, што месціўся на паліцах базыльянскіх бібліятэк, быў шматмоўны. Ад паловы да дзвюх трацін кніг былі на латыні – мове еўрапейскай навукі, культуры, асветы. Праз яе адукаванае беларускае гра-

мадства далучалася да культурных, рэлігійных і ідэалагічных каштоўнасцей Захаду. На другім месцы па колькасці друкаў стаялі польскамоўныя выданні як мясцовага паходжання, так і ўласна з Польшчы. Наяўнасць кніг на гэтых мовах, а таксама на мове нямецкай, французскай, грэчаскай, італьянскай, царкоўнаславянскай, рускай і інш. сведчыць пра добрую філалагічную падрыхтоўку чытача базыльянскіх бібліятэк – інтэлектуала ў манаскім абліччы. Звяртае на сябе ўвагу тое, што “руская” кніга (беларуская ці царкоўнаславянская ў беларускай рэдакцыі) – рэдкасць у манастырскіх кнігазборах XVIII–XIX ст., разлічаных на дэнацыяналізаваную эліту; затое яна – звычайная з’ява ва ўніяцкім храме, які працаваў з народам.

Базыльянскія бібліятэкі з’яўляюцца прыкладам дыфузіі і сінтэзу культур з яўным ухілам у бок заходнееўрапейскай. Інтэлектуальны досвед чалавецтва назапашваўся на іх паліцах. Праз кнігі адбывалася сувязь народаў і культур, праз кнігу Уніяцкая Царква ўводзіла Беларусь у сусветную супольнасць. У XVII–XVIII ст. духоўнае жыццё адукаванай часткі беларускага грамадства з уніяцкага асяроддзя знаходзілася пад моцным уплывам культурна-рэлігійных працэсаў, якія адбываліся ў Цэнтральнай і Заходняй Еўропе. Уплыў праваслаўнага рэгіёна Еўропы быў на яе нязначным.

Аналіз збораў базыльянскіх бібліятэк Беларусі дало падставы сфармуляваць наступныя палажэнні:

1. У пасляберасцейскія XVII–XVIII ст. мела месца найбольшая – у параўнанні з папярэднім і наступным стагоддзямі – адкрытасць беларускага грамадства да заходняга свету і яго інтэлектуальнага досведу.

2. Уніяцкая Царква спрыяла развіццю культурных, у тым ліку кніжных сувязяў Беларусі з яе блізкімі

і далёкімі заходнімі суседзямі, у той час як Праваслаўная Царква строга арыентавала на праваслаўны Усход.

3. Выклікае здзіўленне насычанасць базыльянскіх бібліятэк еўрапейскай кнігай і шырокая геаграфія выданняў ва ўмовах адсутнасці іх цэнтралізаванага забеспячэння літаратурай.

У першай трэці XIX ст. паток кніжнай прадукцыі з Захаду быў абмежаваны, а потым і зусім спынены, хоць яшчэ нейкі час паступаюць польскія выданні. Пачынаецца пераарыентацыя Беларусі на кніжны рынак Расіі, прадукцыя якога да гэтага часу ў базыльянскіх бібліятэках амаль адсутнічала. Пераважаюць кнігі з друкарняў былога Вялікага Княства Літоўскага, а таксама Пецярбурга і Масквы.

У другой трэці XIX ст. базыльянскія кнігазборы былі мэтанакіравана распатрошаны, рассеяны, знішчаны. Разам з кніжнымі фондамі скасаваных каталіцкіх ордэнаў яны сталі асновай бібліятэк навучальных устаноў этнічнай Беларусі, а таксама прыватных і дзяржаўных бібліятэчных збораў Расіі.

***Такім чынам***, падрыхтоўка, заключэнне Берасцейскай уніі і пачатак дзейнасці Уніяцкай Царквы далі магутны штуршок развіццю літаратуры і кнігадрукавання. Яе выдавецкая дзейнасць стала важным фактарам культурнага жыцця Вялікага Княства Літоўскага, Беларусі. Кніжныя патрэбы Царквы спачатку забяспечвала Віленская друкарня беларускіх купцоў і грамадскіх дзеячаў Вялікага Княства Літоўскага Лукі і Кузьмы Мамонічаў, якая з 1600 г. выпускала, галоўным чынам, уніяцкую літаратуру, а пасля 1624 г. была перададзена базыльянскаму ордэну.

З канца XVII ст. беларускае нацыянальнае кнігадрукаванне цалкам канцэнтруецца ў сценах Супрасльскага базыльянскага манастыра, які атры-

маў манапольнае права на выпуск у Вялікім Княстве Літоўскім літургічнай уніяцкай літаратуры. За 100 гадоў існавання Супрасльская друкарня (1695–1803) выдала каля 500 назваў кніг на царкоўнаславянскай, старабеларускай, рускай, польскай, лацінскай і літоўскай мовах. З іх больш за сотню назваў – кірылічныя. Над афармленнем кніг працавалі ўмелы гравёр Лявонцій Тарасевіч, прафесар жывапісу Антон Грушэцкі. Аздабленне друкаў уяўляе сабой арыгінальную з'яву мастацтва беларускай кірылічнай кнігі. Выданні Супрасльскай друкарні адыгралі значную ролю ў развіцці нацыянальнай культуры ў XVIII ст.

На паліцах манастырскіх, царкоўных і асабістых бібліятэк дзеячаў Уніяцкай Царквы назапашваўся інтэлектуальны досвед чалавецтва. Склад і змест базыльянскіх бібліятэк Беларусі сведчаць пра высокі ўзровень ведаў духавенства з акадэмічнай адукацыяй. Яны адыгралі станоўчую ролю ў перадачы пакаленням еўрапейскіх культурных, навуковых, рэлігійных і ідэалагічных каштоўнасцей. Праз кнігі адбывалася сувязь народаў і культур.



*Свята-Троіцкая царква ў Вольна, 1768 г.*



# Архітэктурная спадчына

- *Пачатак уніяцкага храмабудаўніцтва*
- *Архітэктурная спадчына барока*
- *Шэдэўры віленскага барока*
- *Помнікі драўлянага дойлідства XVIII – першай паловы XIX ст.*
- *1830-я г.: аб “неумножении без надобности” ўніяцкіх бажніц*

## Пачатак уніяцкага храмабудаўніцтва

Уніяцкая архітэктурная спадчына – асаблівая з'ява культуры Беларусі. Яна прадстаўлена культавымі будынкамі, якія заснаваны і пабудаваны Уніяцкай Царквой у XVII – першай палове XIX ст. або пабудаваны раней, але цалкам перароблены пасля перадачы іх уніятам і ў такім (або максімальна набліжаным) выглядзе захаваліся да нашага часу. У спіс аб'ектаў уніяцкай спадчыны звычайна не ўключаюць колішнія ўніяцкія храмы, наноў пабудаваныя праваслаўнымі ў непазнавальным выглядзе.

Спачатку перад Уніяцкай Царквой стаялі задачы, якія аб'ектыўна адсоўвалі мастацкія праблемы на задні план. Найважнейшыя з іх – фарміраванне, пашырэнне і развіццё ўласных структур – занялі амаль усё XVII ст. Канчатковае зацвярджэнне Царквы ў другой палове XVII ст. стварыла перадумовы для рашэння задач мастацкага характару.

Мастацкая культура новай канфесіі яскрава выявілася ў дойлідстве. Дойлідства ўніятаў прайшло тры перыяды развіцця: станаўленне (канец XVI–XVII ст.), росквіт (першая палова – сярэдзіна XVIII ст.) і трансфармацыя (канец XVIII ст. – першая палова XIX ст.). Кожны перыяд адрозніваўся сваімі характэр-

нымі аб'ёмна-планіровачнымі пабудовамі і мастацка-стылістычнымі рашэннямі. Галоўнымі фактарамі, якія ўплывалі на працэс фарміравання архітэктуры, былі прыярытэт дзяржаўнай канфесійнай палітыкі, арганізацыйная дзейнасць царкоўных уладаў, стылістычныя тэндэнцыі Заходняй Еўропы і (на апошнім этапе) Расійскай імперыі.

На першым этапе новых творчых павеваў у архітэктуры не ўзнікла. Пераход культавых пабудоў пад юрысдыкцыю ўніятаў не аказаў істотнага ўплыву на яе развіццё. Ды і сутыкненне ўнійных тэндэнцый з Праваслаўем было настолькі моцным, настолькі вычэрпвала сілы, што наўрад ці ў тым запале барацьбы маглі нарадзіцца новыя формы царкоўнай архітэктуры. На першым этапе Царква рамантавала, перабудоўвала ці ўносіла невялікія змены ў раней узведзеныя храмы, а ўласнае будаўніцтва было мінімальным.

Першымі крокамі Язафата Кунцэвіча як епіскапа віцебскага (1617) і архіепіскапа полацкага (1618–1623) было адраджэнне царкоўнага жыцця і аднаўленне храмаў. Яго клопатам былі "направлены" абвятшалыя Праабражэнскі і Прачысценскі храмы ў Віцебску. Быў адрамантаваны і аздоблены, фактычна нанова перабудаваны полацкі Сафійскі сабор, які моцна пацярпеў у пажары 1607 г. У 1645 г., калі ў Полацку ішоў працэс беатыфікацыі Язафата Кунцэвіча, мітрапаліт Антоній Сялява прапаноўваў пабудаваць для яго маўзалей.

З пачатку XVII ст. пачынаецца і ўласнае ўніяцкае храмабудаўніцтва. У архітэктуры Беларусі XVII–XVIII ст. сфарміраваліся два тыпы храмаў: 1) барочная базіліка з вежамі на фасадзе і 2) крыжова-купальны храм з вежамі або без іх.

У культавым будаўніцтве Уніяцкай Царквы двухвежавы фасад арганічна ўвайшоў у структуру трохне-

фавай крыжова-купальнай базілікі. Найбольш раннім з помнікаў такога роду з’яўляецца ***Успенскі сабор базыльянскага манастыра ў Жыровіцах***. Ён быў пабудаваны ў 1613–1650 г. на шчодрыя фундушы як галоўны храм манастыра базыльян.

Храм уяўляе сабой мураваную трохнефавую крыжова-купальную базіліку даўжынёй больш за 55 м, вышынёй каля 40 м з паўкруглай апсідай. Спачатку сабор быў пабудаваны ў стылі барока з дзвюхвежавым галоўным фасадам. У першай палове XIX ст. вежы былі разабраны, зменены купал – і сабор набыў рысы класіцызму. Цэнтральны купал падтрымліваюць масіўныя слупы ў храме.

Інтэр’ер сабора захаваў барочны характар. Галоўны дэкаратыўны элемент інтэр’ера – драўляны разны трох’ярусны іканастас у стылі барока, збудаваны каля 1730 г. (Г. Флікоп-Світа датуе яго 1676 г.). З 1990-х г. ішла замена старых барочных абразоў на сучасныя. У 2009 г. сем старадаўніх абразоў з іканастаса Успенскага сабора былі перададзены Жыровіцкім манастыром у Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь. Таксама з іканастаса была знята барочная драўляная разьба.

У выніку архітэктурна-будаўнічных работ на працягу XVII–XVIII ст. у Жыровіцах паўстаў цэлы архітэктурны комплекс.

Не пазней 1607–1608 г. у Мінску была пабудавана ўніяцкая царква Нараджэння Маці Божай на плацы, адведзеным для праваслаўнага храма, чаму і была пад яго забраная[122].

На працягу першай паловы XVII ст. У Мінску вялося будаўніцтва велічнага архітэктурнага ансамбля базыльянскіх манастыроў (мужчынскага і жаночага). Ён быў заснаваны ў 1616 г., фарміраванне завяршылася да 1650-х г. Манастырскі комплекс сінтэзаваў у сабе

[122] Горбік С. Хорам на Нямізе // Унія. 1990. № 2. С. 24.

рысы готыкі і рэнесансу. Яго галоўным элементам стала ***царква Святога Духа***, якая здзіўляла сучаснікаў прыгажосцю. У сваім завяшчанні 1651 г. мітрапаліт Антон Сялява прасіў пахаваць яго ў гэтай царкве. Два манастырскія карпусы, перабудаваныя ў XIX ст., захаваліся да нашага часу (на пл. Свабоды, 23, і вул. Энгельса, 1).

У 1795 г. абодва манастыры Св. Духа былі закрыты. У іх размясцілася рэзідэнцыя праваслаўнага архіепіскапа, а пазней гімназія. Царкву перадалі пад кафедральны Петрапаўлаўскі сабор. Перабудова 1840-х г. настолькі змяніла знешняе аблічча коплексу, што мастацтвазнаўца Мікола Шчакаціхін не змог распазнаць яго першааснову і лічыў самым нязграбным архітэктурным збудаваннем у горадзе. У 1937 г. эклектычны, аляпаваты храм, які ўсё ж захоўваў элементы канструкцыі XVII ст., быў разабраны. У пачатку 1990-х г. меркавалася аднаўленне гэтага найбольш значнага гісторыка-архітэктурнага помніка Мінска ў яго першапачатковым выглядзе[123].

У 2009–2011 г. будынак царквы Святога Духа быў адноўлены ў першапачатковым выглядзе сярэдзіны XVII ст. У ім размясцілася канцэртная зала дзіцячай філармоніі “Верхні горад”.

Вядома, што напярэдадні вайны Маскоўскай дзяржавы з Рэччу Паспалітай 1654–1667 г. у Мінску налічвалася 12 уніяцкіх цэркваў. У час вайны сетка ўніяцкіх парафій была моцна разбурана. На 1682 г. у Мінску засталося восем дзейных храмавых пабудоў[124].

[123] Дзянісаў У. М. Комплекс базыльянскіх манастыроў у Мінску // Помнікі старажытнабеларускай культуры: Новыя адкрыцці. Мінск, 1984. С. 118–126.

[124] Лісейчыкаў Д. В. Уніяцкія парафіі Мінска ў XVII–XIX стст. [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: https://niab.by/stat/lisejczyk_unijaminsk/ Дата доступу: 16.02.2023.

У 1654 г. на сродкі слонімскага маршалка Рыгора Трызны была пабудавана мураваная царква ў ансамблі Быценьскага базыльянскага манастыра, заснаванага ў 1640 г. (не захаваўся). У першай палове XVII ст. таксама былі пабудаваны ўніяцкія храмы ў Берасці, Кобрыне і вёсках Белая Царква (Талачынскі раён, Віцебская вобласць), Збірагі і Шумакі (Брэсцкі раён) і інш.

З канца XVII ст. і, галоўным чынам, у XVIII ст. сітуацыя ў храмабудаўніцтве мяняецца. На гэты час прыпадае росквіт уніяцкай архітэктуры, стварэнне ёй новых мастацкіх формаў.

## Архітэктурная спадчына барока

Барока – адзін з найбольш цікавых і плённых сусветных мастацкіх стыляў, які набыў у розных краінах выразныя нацыянальныя рысы. У яго станаўленні Беларусь ішла наперадзе іншых усходнеславянскіх народаў. Барока з'явілася першым агульнаеўрапейскім стылем у Беларусі, які, перапрацаваны ў адпаведнасці з мясцовымі будаўнічымі традыцыямі, склаўся ў арыгінальную школу. Хоць запазычаныя з Італіі архітэктурныя формы барока яшчэ доўга спалучаліся ў мясцовым дойлідстве з элементамі готыкі і рэнесансу.

Мастацкі стыль барока стаў дамінуючым у беларускім дойлідстве ў першай палове XVII ст. Ён панаваў тут у XVII–XVIII ст. Эпоха барока пакінула ў Беларусі багатую архітэктурную спадчыну. У гэтым стылі была пабудавана і большасць уніяцкіх храмаў у гарадах і мястэчках.

Барока характарызуецца імкненнем да празмернага дэкору і пампезнасці. Ён напоўнены вытанчанасцю, пышнасцю, складанасцю, тэатральнасцю.

Тыповыя рысы архітэктуры барока: складаныя, звычайна крывалінейныя лініі і формы; багацце дэталей; пазалочаная скульптура; яркія колеры; выкарыстанне ігры святла і цені; ярка распісаныя столі; маштабныя фрэскі; купалы грушападобнай формы (больш характэрныя для барока Усходняй Еўропы); вітыя калоны, якія стваралі ілюзію руху ўверх; наяўнасць мноства скульптур на фасадах і ў інтэр'ерах.

Пышнасцю ўбрання, уражлівымі формамі і памерамі збудаванняў Уніяцкая Царква ўмацоўвала свой аўтарытэт сярод вернікаў, да якіх звярталася праз архітэктуру.

У другой палове XVII – першай чвэрці XVIII ст. паўстаюць ***храмы ў Ружанах*** (закладзены ў 1675 г.), у ***Быцені*** (1673–1710) – адным з найбагацейшых і найбольш вядомых базыльянскіх манастыроў Вялікага Княства Літоўскага, ***у Віцебску***. Храмы ў Быцені і Віцебску вызначаліся маштабнасцю і выразнай арыгінальнай кампазіцыяй. Моцна пашкоджаны ў Першую сусветную вайну, ***Быценьскі сабор у гонар свяшчэннамучаніка Язафата*** (архіепіскапа Я. Кунцэвіча) быў канчаткова разбураны пасля Вялікай Айчыннай вайны. Ад велічнага некалі архітэктурнага ансамбля да нашага часу ацалела толькі малая Спаса-Праабражэнская царква, выгляд якой значна зменены, верагодна, у XIX ст.

У 1720 г. у Гродна пачалося будаўніцтва мураванай царквы і кляштара па праекту і пад кіраўніцтвам архітэктара Іосіфа Фантана III. Фінансаваў будоўлю ўніяцкі мітрапаліт Леў Кішка. ***Царква Раства Багародзіцы*** – крыжовакупальны храм з дзвюма вежамі і купалам на высокім барабане. У 1751 г. побач з ім завяршылася будаўніцтва манастырскага будынка.

## Шэдэўры віленскага барока

У 1730-я – 1770-я г. у сакральнай архітэктуры Вялікага Княства Літоўскага ў арэале пашырэння Брэсцкай царкоўнай уніі рапаўсюдзілая разнавіднасць стылю барока. У мастацтвазнаўстве яна вядомая пад назвай "віленскае барока" і неафіцыйнай назвай – ***"уніяцкае барока"***. Гэта позняе барока завуць таксама ***"беларускае барока"***. Новы стыль сфарміраваўся на тэрыторыі Віленскага біскупства, якое з 1387 г. ахоплівала амаль усе парафіі Беларусі і Літвы, апроч Берасцейскага ваяводства. Глебай для ўзрастання мастацкіх прынцыпаў гэтага стылю стала Уніяцкая Царква.

Архітэктурным творам віленскага барока ўласцівыя вытанчанасць і вертыкалізм прапорцый, скульптурная пластычнасць фасадаў і інтэр'ераў, маляўнічасць, складанасць сілуэта і стройнасць, якую надавалі збудаванням шмат'ярусныя ажурныя вежы, фігурныя франтоны і хвалістыя фасады. Ад сталага беларускага барока XVII ст. з яго стрыманасцю, масіўнасцю і глыбокай унутранай экспрэсіяй віленскае барока адрознівалася дынамізмам, лёгкасцю, свабодай.

Віленскае барока створана на аснове творчага сінтэзу ўсходніх і заходніх мастацкіх уплываў, з улікам традыцый мясцовага дойлідства, а таксама літургічных патрабаванняў і канфесійнай сімволікі як каталіцкай, так і праваслаўнай галін хрысціянскага культу. Гэта абумовіла яркую нацыянальную адметнасць віленскага барока, якое выступае як самабытны мастацкі феномен у кантэксце агульнаеўрапейскага мастацтва. Найбольш ярка нацыянальная адметнасць стылю выявілася ў архітэктуры ўніяцкіх храмаў[125].

---

[125] Габрусь Т. В. Сакральнае дойлідства Беларусі: 1000-гадовая спадчына. Мінск, 2014. С. 12.

Важнае значэнне ў змене царкоўнай архітэктуры Вялікага Княства Літоўскага адыграў ***Фларыян Грабніцкі, полацкі ўніяцкі архіепіскап (1719–1762), мітрапаліт кіеўскі (1748–1762)***, які перабудаваў за ўласны кошт шэраг найбольш значных святынь на тэрыторыі сваёй епархіі.

Ідэя кампрамісу паміж супрацьлеглымі тэалагічнымі запатрабаваннямі ў архітэктоніцы ўніяцкіх храмаў гэтага перыяду, асабліва полацка-віцебскага рэгіёна, абумоўлена ідэалагічнай праграмай полацкага архіепіскапа Ф. Грабніцкага. У пабудове ўніяцкіх цэркваў па заходніх узорах варта бачыць не жаданне паланізаваць беларусаў, а імкненне ўніяцкай іерархіі мадэрнізаваць свае "старамодныя", простыя і суворыя, на фоне эфектнай барочнай архітэктуры, святыні адпаведна духу часу, "ушляхетніць" іх – зняць са сваёй канфесіі імідж беднай "хлопскай" царквы і ўзняць яе прэстыж.

Росквіт беларускага барока звязаны з творчасцю таленавітага архітэктара ***Яна (Іагана) Крыстафа Глаўбіца***, які на працягу 30 гадоў (1737–1767) працаваў у Беларусі і Літве ў культавым і палацавым дойлідстве. Найбольш значная яго пабудова – уніяцкая ***царква Святой Сафіі ў Полацку*** (1738–1750, разам з Б. Касінскім). Яна збудавана на месцы святыні XI ст., узарванай у 1710 г. па загаду Аляксандра Меншыкава – прыбліжанага рускага цара Пятра I.

Новы велічны храм стаў першым архітэктурным творам, у якім цалкам і паслядоўна ўвасоблены эстэтычныя характарыстыкі віленскага барока. Сваёй нязвыклай, невядомай да гэтага часу зграбнасцю, вытанчанасцю і вертыкальнай струмяністасцю ён зрабіў яркае ўражанне на сучаснікаў.

Па заказу Ф. Грабніцкага ў 1744 г. Я. Глаубіц выканаў праект мітрапалічага палаца ў Струні ля Полацка.

Распаўсюджванню стылістычнай плыні віленскага барока садзейнічала дзейнасць аднаго з яго родапачынальнікаў у Вялікім Княстве Літоўскім, ***беларускага архітэктара італьянскага паходжання Іосіфа Фантана III*** (1700? – пасля 1755), а таксама ***беларуса Аляксея Асікевіча***.

Новыя рысы яскрава выявіліся ў культавых пабудовах уніятаў: Успенскім саборы (1715–1743) і Васкрасенскай царкве (1740-я – 1750-я г.) у Віцебску, цэрквах і манастырах базыльян у Беразвеччы ў Глыбокім Віцебскай вобласці (1756–1763), у Барунах (1747–1757), Вольна (1768), Талачыне (1769–1779), Багаяўленскай і Крыжаўзвіжанскай цэрквах у Жыровіцах (1769) і інш. У каталіцкім будаўніцтве другой паловы XVIII ст. мастацкія характарыстыкі віленскага барока таксама знайшлі ўвасабленне, хоць для каталіцкіх храмаў гэтага перыяду былі характэрныя больш груваткія манументальныя формы.

Найбуйнейшым дасягненнем архітэктуры віленскага барока ў Беларусі з характэрнай для яго ілюзіяй руху, узлёту, хвалістасці, скіраванасцю духоўнай энергіі матэрыі ўверх стаў ***Успенскі сабор у Віцебску***. Ён пабудаваны ў 1715–1743 г. па праекце і пад кіраўніцтвам архітэктара Іосіфа Фантана III замест драўлянай бажніцы і кляштара, узведзеных базыльянамі ў 1682 г. на месцы гібелі Я. Кунцэвіча і знішчаных агнём у 1708 г.

У 1804 г. аблічча царквы, перададзенай у праваслаўнае ведамства, было зменена: над алтарнай часткай паставілі масіўны купал на барабане; скла-

даныя барочныя франтоны фасадаў замянілі на строгія трохкутныя. У 1913 г. Імператарская археалагічная камісія дала дазвол на рэстаўрацыю храма, бо палічыла яго каштоўным культурна-гістарычным помнікам. У 1937 г. храм быў узарваны сапёрнай брыгадай. У 2010 г. Успенскі сабор у Віцебску аднавілі.

Здабыткамі архітэктуры віленскага барока стала ***Васкрасенская царква ў Віцебску***, узведзеная ў 1740-я – 1750-я г. Мяркуюць, што яе архітэктарам быў Іосіф Фантана, які збудаваў у Віцебску Успенскі сабор. Галоўны фасад храма мае складаную хвалістую паверхню. Яго ўпрыгожваюць дзве трохпавярховыя вытанчаныя вежы. Паміж вежамі – двух'ярусны барочны франтон, у XIX ст. заменены на больш нізкі, класічны. Храм быў узарваны ў 1936 г. і адноўлены ў пачатку XXI ст. у пачатковым барочным выглядзе.

Вяршыняй віленскага барока (шэдэўрам ракако, паводле доктара мастацтвазнаўства Анатоля Кулагіна) з'яўляецца ***Петрапаўлаўская царква базыльян у Беразвеччы*** (Глыбоцкі раён Віцебскай вобласці), узведзеная ў 1756–1763 г. "дыктатарам" гэтага вытанчанага стылю Янам Глаубіцам. Пры агульнай традыцыйнай структуры – трохнефавая двухвежавая базіліка – збудаванне мела смелы і наватарскі вобраз. Будаўнічы матэрыял тут нібы размяк і паплыў хвалямі выпуклых і ўвагнутых крывых – будынак здаецца нібы выліты, вылеплены з нейкай пластычнай масы. Пашкоджаны ў Вялікую Айчынную вайну, храм быў канчаткова разбураны ў 1960-я г.

Адным з найбольш дасканалых узораў віленскага барока з'яўляецца касцёл ***Святых Апосталаў Пятра і Паўла ў вёсцы Баруны*** (Ашмянскі раён Гродзенскай вобласці). Ён быў узведзены ў 1747–1757 г. як уніяц-

кая царква (на месцы згарэлага храма, пабудаванага ў 1692 г.) па праекце і пад кіраўніцтвам манаха Барунскага базыльянская манастыра, архітэктара Аляксея Асікевіча. Храм быў дабудаваны ў 1760–1770 г. У 1778–1793 г. побач з ім ўзвялі двухпавярховы мураваны манастырскі будынак.

У 1768 г. у вёсцы ***Вольна*** (Баранавіцкі раён, Брэсцкая вобласць) базыльяне пабудавалі на фундуш мясцовага шляхціча Дамаслоўскага мураваную ***царкву Святой Тройцы***, адпаведную архітэктурнай эстэтыцы віленскага барока. З 1839 г. і ў наш час яна дзейнічае як праваслаўная царква.

***Пакроўская царква ў Талачыне*** (1769, 1779) – твор архітэктуры віленскага барока, мастацкае аблічча якога было зменена ў выніку надбудовы купалоў-цыбулін.

Новае рашэнне вонкавага аб’ёму і інтэр’ера, не ўласцівае ні праваслаўным, ні каталіцкім культавым будынкам, выкарыстана ў ***Жыровіцкай Крыжаўзвіжанскай царкве*** (1769) – храме-кальварыі, які імітуе шлях Хрыста на Галгофу. Грацыёзнасць прапорцый, эфектнасць вытанчанай архітэктурнай пластыкі, стройнасць сілуэту дазваляюць залічыць яго да найбольш гарманічных твораў культавай архітэктуры віленскага барока ў Беларусі.

***Багаяўленская царква ў вёсцы Жыровіцы*** (1769) – адна са святыняў, што ўваходзіць у спіс культурных славутасцей Беларусі. Невялікая ў сярэдзіне цэркаўка цікавая афармленнем галоўнага двух’яруснага фасада: фігурны франтон; за кошт паўкалон, выцягнутых угару, царква візуальна здаецца вышэй, чым ёсць. Цяпер яе ўпрыгожвае купал у форме цыбуліны – элемент, характэрны для псеўдарускага архітэктурнага кірунку.

Уніяцкія і каталіцкія храмы будаваліся ў асноўным на сродкі мецэнатаў з магнатэрыі, шляхты, духавенства, заможных мяшчан. Такіх храмаў, мяркуюць, у XVIII ст. на землях Вялікага Княства Літоўскага было створана і перабудавана каля сотні.

Здабыткамі архітэктуры віленскага барока з'яўляюцца таксама Пакроўскі сабор базыльянскага манастыра ў Оршы, узведзены на сродкі аршанскага старосты Я. Лянкоўскага ў 1768–1774 г.; базыльянская царква ў Васілішках (1769 г.) і інш.

Назапашаная перасычанасць позняга барока і ракако мудрагелістасцю і ірацыянальнасцю прывяла да з'яўлення ў еўрапейскай архітэктуры новага напрамку – наступіў класіцызм з яго "высакародным лаканізмам". Час панавання класіцызму ў архітэктуры Беларусі – другая палова XVIII – першая палова (сярэдзіна) XIX ст. У другой палове XVIII ст. архітэктура Уніяцкай Царквы пачынае набываць формы, пераходныя ад барока да класіцызму. Такі пераход намячаецца ва Успенскім саборы ў Віцебску і Петрапаўлаўскай царкве ў Ружанах, пабудаванай у 1762–1779 г. саксонскім дойлідам Янам Бэкерам.

Многія творы віленскага барока, у тым ліку сапраўдныя шэдэўры стылю, былі знішчаны ў XIX–XX ст. непасрэдна або пры актыўным спрыянні ўладаў Расійскай імперыі і СССР.

## Помнікі драўлянага дойлідства XVIII – першай паловы XIX ст.

Унікальным культурным феноменам Беларусі з'яўляецца драўлянае сакральнае дойлідства розных хрысціянскіх канфесій. Яно стала агульнай культур-

най спадчынай беларускага народа. Асноўную частку трыдыцыйнага драўлянага храмабудаўніцтва XVII–XVIII ст. складала ўніяцкае царкоўнае дойлідства[126].

Абсалютная большасць уніяцкіх храмаў – гэта драўляныя вясковыя пабудовы, сярод якіх, аднак, таксама было шмат архітэктурна адметных[127]. Драўляныя цэрквы будаваліся, як правіла, мясцовымі цеслярамі і ў XVII ст. мала адрозніваліся ад праваслаўных. У XVIII ст. культавае драўлянае дойлідства развіваецца па двух кірунках. Першы прадстаўлены помнікамі з выразна выяўленымі мясцовымі традыцыямі, што ідуць ад народнага жылля. Для другога характэрная цесная сувязь са стылем барока, які ў значнай меры захапіў і народнае драўлянае дойлідства.

Адметнай асаблівасцю ***нацыянальнага "нізавога", ці драўлянага, барока***, як характарызуе яго доктар мастацтвазнаўства, гісторык архітэктуры Тамара Габрусь, з'яўляецца цесная ўзаемасувязь тэхнічнага і эстэтычнага бакоў, выразная мастацкая трактоўка натуральных якасцей дрэва, блізкасць да этнічнага адчування сусветнай гармоніі і светаўспрыняцця ў цэлым. Асноўнымі сродкамі мастацкай выразнасці традыцыйных беларускіх драўляных храмаў былі маналітнасць і пластычнасць форм, суладдзе і дынаміка геаметрыі ліній і плоскасцей, адсутнасць дробнага дэкору, стварэнне прасторавага ансамбля, што аптычна павялічвала маштаб камерных збудаванняў адносна

[126] Габрусь Т. В. Драўлянае хрысціянскае храмабудаўніцтва Беларусі. Мінск, 2020. С. 24.

[127] Былыя ўніяцкія храмы Беларусі [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: https://m.vk.com/album-1687893_162386620. Дата доступу: 15.02.2023; Спіс помнікаў уніяцкай архітэктурнай спадчыны ў Беларусі [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/Спіс_помнікаў_уніяцкай_архітэктурнай_спадчыны_ў_Беларусі. Дата доступу: 15.02.2023.

на акаляючага асяроддзя. Лаканізм, нават аскетызм мастацкіх дэкаратыўных сродкаў кампенсаваўся гарманічнай выразнасцю прапорцый і рытма аб'ёмаў, пластыкай гонтавага пакрыцця і маляўнічай кампазіцыяй вянчаючых мас, што выяўляла паслядоўную эвалюцыю стылю барока[128].

Да нашага часу не дайшло ніводнага драўлянага храма, пабудаванага раней за XVII ст. Ды і ад XVII ст. ацалелі лічаныя ўзоры драўлянага храмабудаўніцтва. Прычыны – складаная сацыяльная гісторыя Беларусі, шматлікія пажары і войны, ад якіх неаднаразова цярпелі гарады і вёскі, ды адносная нядоўгавечнасць дрэва як будаўнічага матэрыялу. Тыя нямногія храмы, якія датуюцца XVII ст., пазней былі неаднаразова істотна перабудаваныя. Новыя драўляныя цэрквы звычайна ўзводзілі на старым "намоленым" месцы, на падмурку папярэдняй святыні. Значна болей ацалела драўляных храмаў XVIII ст. Звычайна гэта былі ўніяцкія цэрквы, на долю якіх прыпадала каля 90% драўляных царкоўных пабудоў таго часу[129]. Да нашага часу ацалела таксама шмат драўляных уніяцкіх храмаў першай паловы XIX ст.

У сваім грунтоўным выданні ***"Сакральнае дойлідства Беларусі: 1000-гадовая спадчына"*** яе даследчыца, доктар мастацтвазнаўства ***Тамара Габрусь*** называе, характарызуе і прыводзіць фотаздымкі ***310 лепшых мураваных і драўляных помнікаў апошняга тысячагоддзя***, якія дайшлі да нашага часу і з'яўляюцца шэдэўрамі сакральнай архітэктуры.

---

[128] Габрусь Т. В. Драўлянае хрысціянскае храмабудаўніцтва Беларусі. Мінск, 2020. С. 281.

[129] Габрусь Т. В. Сакральнае дойлідства Беларусі: 1000-гадовая спадчына. Мінск, 2014. С. 18; яе ж: Драўлянае хрысціянскае храмабудаўніцтва Беларусі. Мінск, 2020. С. 31.

Сярод іх прыводзіцца інфармацыя пра ***56 помнікаў (18%), пабудаваных як уніяцкія*** (падлік наш). Гэта 19 мураваныя храмаў і 37 драўляных шэдэўраў, якія праз стагоддзі цудам уцалелі да нашых дзён[130]. У табліцы, складзенай намі на аснове кнігі Т. Габрусь, пералік помнікаў даецца ў храналагічным парадку іх узвядзення.

***Помнікі ўніяцкай сакральнай архітэктуры***[131]

| **Храм** | **Населены пункт** | **Год пабудовы** |
|---|---|---|
| | ***Мураваныя храмы*** | |
| Успенскі сабор | Жыровіцы | 1628–1650 |
| Царква Нараджэння Багародзіцы | Гродна | 1726–1751 |
| Сафійскі сабор | Полацк | 1738–1750 |
| Царква Яна Хрысціцеля | в. Вішнявец, Стаўбцоўскі р-н Мінскай вобл. | 1742 |
| Успенская царква | в. Новы Свержань, Стаўбцоўскі р-н Мінскай вобл. | 1743 |
| Успенскі сабор | Віцебск | 1743–1785 |
| Касцёл Святых Пятра і Паўла | в. Баруны, Ашмянскі р-н Гродзенскай вобл. | 1747–1753 |
| Васкрасенская царква | Віцебск | 1740-я – 1750-я |
| Троіцкая царква | в. Вольна, Баранавіцкі раён Брэсцкай вобл. | 1751–1768 |
| Пакроўская царква | Талачын Віцебскай вобл. | 1769–1796 |
| Яўленская царква | Жыровіцы | 1769 |
| Крыжаўзвіжанская царква | Жыровіцы | 1769 |
| Петрапаўлаўская царква | Ружаны, Пружанскі р-н Брэсцкай вобл. | 1762–1779 |

[130] Габрусь Т. В. Сакральнае дойлідства Беларусі: 1000-гадовая спадчына. Мінск, 2014. С. 373–448.

[131] Тамсама.

| | | |
|---|---|---|
| Дзмітрыеўская царква | в. Шчорсы, Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл. | 1767–1776 |
| Пакроўская царква | в. Вялікая Ліпа, Нясвіжскі р-н Мінскай вобл. | 1773 |
| Дабравешчанская царква | в. Малыя Ляды, Смалявіцкі р-н Мінскай вобл. | 1794 |
| Спаса-Праабражэнская царква | в. Ракаў, Валожынскі р-н Мінскай вобл. | 1790–1793 |
| Касцёл Найсвяцейшай Дзевы Марыі | в. Сігневічы, Бярозаўскі р-н Брэсцкай вобл. | 1795 |
| Успенская царква | в. Пярковічы, Драгічынскі р-н Брэсцкай вобл. | 1805 |
| ***Драўляныя храмы*** | | |
| Царква Святой Параскевы Пятніцы | в. Збірагі, Брэсцкі р-н | 1610 |
| Спаса-Праабражэнская царква | в. Порплішча, Докшыцкі р-н Віцебскай вобл. | 1627, 1794 |
| Троіцкая царква | в. Бездзеж, Драгічынскі р-н Брэсцкай вобл. | 1637, 1784 |
| Юр’еўская царква | в. Сінкевічы, Лунінецкі р-н Брэсцкай вобл. | пачатак XVIII ст. |
| Царква Нараджэння Багародзіцы | в. Ляхаўцы, Маларыцкі р-н Брэсцкай вобл. | 1713 |
| Царква Яна Хрысціцеля | в. Маціевічы, Жабінкаўскі р-н Брэсцкай вобл. | 1720 |
| Царква Нараджэння Багародзіцы | в. Востраў, Пінскі р-н Брэсцкай вобл. | 1720 |
| Юр’еўская царква | г. Давыд-Гарадок, Столінскі р-н Брэсцкай вобл. | 1724–1726 |
| Мікалаеўскай царква | в. Вялікія Сяхновічы, Жабінкаўскі р-н Брэсцкай вобл. | 1727 |
| Царква Святой Параскевы Пятніцы | в. Чарнаўчыцы, Брэсцкі р-н | 1733 |
| Вазнясенская царква | в. Гарадзец, Кобрынскі р-н Брэсцкай вобл. | 1735 |
| Царква Нараджэння Багародзіцы | в. Вавулічы, Драгічынскі р-н Брэсцкай вобл. | 1737 |
| Пакроўская царква | в. Покры, Брэсцкі р-н | 1739 |

| | | |
|---|---|---|
| Царква Святой Параскевы Пятніцы | в. Дзівін, Кобрынскі р-н Брэсцкай вобл. | 1728–1740 |
| Пакроўская царква | в. Дзеткавічы, Драгічынскі р-н Брэсцкай вобл. | 1740 |
| Дабравешчанская царква | в. Жытомля, Гродзенскі р-н | 1743 |
| Петрапаўлаўская царква | в. Вялікія Жухавічы, Карэліцкі р-н Гродзенскай вобл. | 1745 |
| Петрапаўлаўская царква | в. Гарадзішча, Камянецкі р-н Брэсцкай вобл. | 1748 |
| Мікалаеўскай царква | г. Кобрын, Брэсцкая вобл. | да 1750 |
| Троіцкая царква | в. Вайская, Камянецкі р-н Брэсцкай вобл. | 1751–1775 |
| Царква Нараджэння Багародзіцы | в. Ахова, Пінскі р-н Брэсцкай вобл. | 1758 ці 1786 |
| Званіца (царква не захавалася) | г.п. Шарашова, Пружанскі р-н Брэсцкай вобл. | 1760 |
| Юр’еўская царква | в. Валавель, Драгічынскі р-н Брэсцкай вобл. | 1766 |
| Мікалаеўскай царква | в. Латыгаль, Вілейскі р-н Мінскай вобл. | 1771 |
| Пакроўская царква | в. Ганчары, Лідскі р-н Гродзенскай вобл. | 1774 |
| Міхайлаўская царква | в. Сцяпанкі, Жабінкаўскі р-н Брэсцкай вобл. | 1780 |
| Міхайлаўская царква | в. Асаўцы, Столінскі р-н Брэсцкай вобл. | 1780 |
| Ануфрыеўская царква | в. Агароднікі, Воўчынскі сельсавет, Камянецкі р-н Брэсцкай вобл. | 1782 |
| Царква Нараджэння Багародзіцы | в. Ляскавічы, Іванаўскі р-н Брэсцкай вобл. | 1783 |
| Царква Святой Параскевы Пятніцы | в. Жабчыцы (пас. Садовы), Пінскі р-н Брэсцкай вобл. | 1788 |
| Петрапаўлаўская царква | в. Галынка, Клецкі р-н Мінскай вобл. | 1788–1789 |

| | | |
|---|---|---|
| Царква Святой Параскевы Пятніцы | в. Опаль, Іванаўскі р-н Брэсцкай вобл. | 1796 |
| Успенская царква | в. Лаўрышава, Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл. | 1798 |
| Спаса-Праабражэнская царква | в. Хаціслаў, Маларыцкі р-н Брэсцкай вобл. | 1799 |
| Мікалаеўская царква | в. Кажан-Гарадок, Лунінецкі р-н Брэсцкай вобл. | 1814–1818 |
| Ільінская царква | в. Бялавічы, Івацэвіцкі р-н Брэсцкай вобл. | 1838 (на месцы ўніяцкай ўніяцкай царквы 1630 г.) |
| Царква Святой Параскевы Пятніцы | Баражное, Столінскі р-н Брэсцкай вобл. | 1884 (на падмурку ўніяцкай ўніяцкай царквы XVII ст.) |

Больш поўнае ўяўленне пра захаваныя да нашага часу помнікі ўніяцкага сакральнага драўлянага дойлідства дае ***манаграфія Тамары Габрусь "Драўлянае хрысціянскае храмабудаўніцтва Беларусі"*** 2020 года выдання. На XIV Нацыянальным фестывалі архітэктуры (2021) гэта кніга прызнана лепшай публікацыяй ў галіне архітэктуры, горадабудаўніцтва і дызайну. Гэта вынік даследавання Тамарай Габрусь ***418 драўляных храмаў розных хрысціянскіх канфесій, пабудаваных у асноўным у XVII–XVIII ст.*** Не для ўсіх цэркваў указана іх першапачатковая канфесійная прыналежнасць (верагодна, з прычыны недахопу інфармацыі гістарычных крыніц). ***116 храмаў з ліку апісаных і ахарактарызаных у манаграфіі называюцца заснаванымі як уніяцкія***[132] (падлік

[132] Габрусь Т. В. Драўлянае хрысціянскае храмабудаўніцтва Беларусі. Мінск, 2020. С. 80–285, 302–310.

наш). Гэта статыстыка цалкам упісваецца ў высноў Т. Габрусь, што асноўную частку трыдыцыйнага драўлянага храмабудаўніцтва Беларусі XVII–XVIII ст. складала ўніяцкае царкоўнае дойлідства.

Прыводзім спіс помнікаў драўлянага ўніяцкага храмабудаўніцтва XVII – першай паловы XIX ст., складзены намі на аснове названай манаграфіі Т. Габрусь. Іх сістэматызацыя ў табліцы праведзена па геаграфічнаму прынцыпу – па абласцях і населеных пунктах у алфавітным парадку. Пазначаны храмы, якія да нашых дзён не ўцалелі.

### *Помнікі драўлянага ўніяцкага храмабудаўніцтва XVII – першай паловы XIX ст*[133]*.*

| **Населены пункт** | **Храм** | **Год пабудовы** |
|---|---|---|
| ***Брэсцкая вобласць (60 храмаў)*** | | |
| Агароднікі, Камянецкі р-н | Ануфрыеўская царква | 1782 |
| Арэпічы, Жабінкаўскі р-н | Пакроўская царква | 1761 |
| Асаўцы, Столінскі р-н | Міхайлаўская царква | 1648/1780 |
| Ахова, Пінскі р-н. | Царква Нараджэння Багародзіцы | 1758 ці 1786 |
| Беражное, Столінскі р-н | Царква Святой Параскевы Пятніцы | 1884 (на падмурку ўніяцкай царквы XVIII ст.) |
| Бездзеж, Драгічынскі р-н | Троіцкая царква | 1637, 1784 |
| Бялавічы, Івацэвіцкі р-н | Ільінская царква | 1838 (на месцы ўніяцкай царквы 1630 г.) |
| Вавулічы, Драгічынскі р-н | Царква Нараджэння Багародзіцы | 1737 |
| Валавель, Драгічынскі р-н | Юр’еўская царква | 1766 |

[133] Тамсама. С. 80–285.

| | | |
|---|---|---|
| Востраў, Пінскі р-н | Царква Нараджэння Багародзіцы | 1720/1869 |
| Вуйвічы, Пінскі р-н | Ільінская царква | 1788/1937 |
| Вялікая Каўпеніца, Баранавіцкі р-н | Царква Яна Хрысціцеля | 1781 |
| Вялікія Сяхновічы, Жабінкаўскі р-н | Мікалаеўскай царква | 1727 |
| Вялікія Чучавічы, Лунінецкі р-н | Пакроўская царква | 1846–1852/1908 |
| Гарадзец, Кобрынскі р-н | Вазнясенская царква (ва Уніі з 1735) | ?/1633/1735/1799 |
| Гарадзішча, Камянецкі р-н | Петрапаўлаўская царква | 1748 |
| Гарадная, Столінскі р-н | Троіцкая царква | XVIII ст./1930-я |
| Галоўчыцы, Драгічынскі р-н | Крыжаўзвіжанская царква | 1766 |
| Гнеўчыцы, Іванаўскі р-н | Царква Святой Параскевы Пятніцы | 1802 |
| Гошчава, Івацэвіцкі р-н | Крыжаўзвіжанская царква | XVIII ст./1838 |
| Дабраслаўка, Пінскі р-н | Троіцкая царква | 1758 |
| Давыд-Гарадок, Столінскі р-н | Юр’еўская царква | 1724–1726 |
| Дарапеевічы, Маларыцкі р-н | Царква Нараджэння Багародзіцы | 1671/1902 |
| Дастоева, Іванаўскі р-н | Ільінская царква | 1798 |
| Дзеткавічы, Драгічынскі р-н | Пакроўская царква | 1740/1869 |
| Дзівін, Кобрынскі р-н | Царква Святой Параскевы Пятніцы | 1728–1740 |
| Дзмітравічы, Камянецкі р-н | Спаса-Праабражэнская царква | 1786 |
| Дружылавічы, Іванаўскі р-н | Мікалаеўская царква | 1777/XIX ст. |
| Дубок, Брэсцкі р-н | Ільінская царква | 1772/1863 |
| Жабчыцы (пас. Садовы), Пінскі р-н | Царква Святой Параскевы Пятніцы | 1788 |

| | | |
|---|---|---|
| Збірагі, Брэсцкі р-н | Царква Святой Параскевы Пятніцы | 1610/1866 |
| Здзітава, Жабінкаўскі р-н | Мікітаўская царква (пры Уніі – Нараджэння Багародзіцы) | 1502/1787/1904 |
| Кажан-Гарадок, Лунінецкі р-н | Мікалаеўскай царква | 1814–1818 |
| Кобрын, Брэсцкая вобл. | Мікалаеўскай царква | да 1750 |
| Крошын, Баранавіцкі р-н | Уніяцкая царква | 1623 |
| Лелікава, Кобрынскі р-н | Царква Святога Зміцера Салунскага | XVIII ст. |
| Лешча. Манастыр Успення Божай Маці пад Пінскам | Успенскі сабор | 1746 |
| Ліпнікі, Драгічынскі р-н | Успенская царква | 1792 |
| Лісоўчыцы, Камянецкі р-н | Царква Яна Хрысціцеля | XVIII/XIX ст. |
| Ляскавічы, Іванаўскі р-н | Царква Нараджэння Багародзіцы | 1626/1783 |
| Ляхаўцы, Маларыцкі р-н | Царква Нараджэння Багародзіцы | 1713 |
| Марочна, былы Пінскі павет (сучасная Украіна) | Царква Святой Параскевы Пятніцы | 1787 |
| Махро, Іванаўскі р-н | Петрапаўлаўская царква | 1792/XIX–XX ст. |
| Маціевічы, Жабінкаўскі р-н | Царква Яна Хрысціцеля | 1720/XIX ст. |
| Моладава, Іванаўскі р-н | Вазнясенская царква | 1752/1894 |
| Новая Папіна, Драгічынскі р-н | Спаса-Праабражэнская царква | 1723/1810 |
| Олтуш, Маларыцкі р-н | Спаса-Праабражэнская царква | 1783 |
| Опаль, Іванаўскі р-н | Царква Святой Параскевы Пятніцы | 1796 |

| | | |
|---|---|---|
| Падлессе, Ляхавіцкі р-н | Свята-Духаўская царква | да 1793 |
| Паніквы, КамянецкІ р-н | Успенская царква | 1791/1912 |
| Покры, Брэсцкі р-н | Пакроўская царква | 1739 |
| Пружанскі р-н | Царква “Старая каля ляхаў” | сярэдзіна XVIII ст. |
| Стрэльна, Іванаўскі р-н | Царква Святога Аляксандра Неўскага | 1800/1816 |
| Сцяпанкі, Жабінкаўскі р-н | Міхайлаўская царква | 1780/1858 |
| Хацілаў, Маларыцкі р-н | Спаса-Праабражэнская царква | 1799 |
| Хмелева, Жабінкаўскі р-н | Спаса-Праабражэнская царква | 1725/1771 |
| Чарнаўчыцы, Брэсцкі р-н | Царква Святой Параскевы Пятніцы | 1733/1866 |
| Чарнякава, Бярозаўскі р-н | Мікалаеўская царква | 1725 |
| Шарашова, Пружанскі р-н | Званіца (царква не захавалася) | 1760 |
| Яромічы, Кобрынскі р-н | Міхайлаўская царква | 1784–1787 |
| ***Віцебская вобласць (12 храмаў)*** | | |
| Бачэйкава. Бешанковіцкі р-н | Царква ўніяцкая | 1675 |
| Віцебск | Ільінская царква | 1746 |
| Вялец, Глыбоцкі р-н | Пакроўская царква | XVIII ст. |
| Іўева, Докшыцкі р-н | Царква | XVIII ст. |
| Кавалі, Глыбоцкі р-н | Успенская царква | 1774 |
| Кемешаўцы, Докшыцкі р-н | Пакроўская царква | 1675/XIX ст. |
| Лявонпаль, Міёрскі р-н | Троіцкая царква | 1774–1789 |
| Сітцы, Докшыцкі р-н | Юр’еўская царква | 1774 |
| Смаляны, Аршанскі р-н | Спаса-Праабражэнская царква | 1774–1778 |

| | | |
|---|---|---|
| Стайкі, Невельскі р-н, Пскоўская вобласць, Расія | Юр'еўская царква | XVIII ст. |
| Порплішча, Докшыцкі р-н | Спаса-Праабражэнская царква | 1627/1794 |
| Шатрова (Князь-Шатрова), Верхнядзвінскі р-н | Царква | XVIII ст. |
| ***Гомельская вобласць (4 храмы)*** | | |
| Белая Сарока, Нараўлянскі р-н | Мікалаеўская царква | 1750/1869 |
| Людзяневічы, Жыткавіцкі р-н | Міхайлаўская царква | 1755/1912 |
| Мазыр | Царква Святой Параскевы Пятніцы | XVIII ст. |
| Міхалкі, Мазырскі р-н | Царква Нараджэння Багародзіцы | XVIII ст. |
| ***Гродзенская вобласць (13 храмаў)*** | | |
| Алекшыцы, Бераставіцкі р-н | Царква на могілках | XVIII ст. |
| Вострава, Слонімскі р-н | МІхайлаўская царква | XIX ст. |
| Вялікія Жухавічы, Карэліцкі р-н | Петрапаўлаўская царква | 1745 |
| Ганчары, Лідскі р-н | Пакроўская царква | 1774 |
| Голдава, Лідскі р-н | Царква Нараджэння Багародзіцы | 1795 |
| Дзятлава | Спаса-Праабражэнская царква | 1672/XIX ст. |
| Жыровіцы, Слонімскі р-н | Юр'еўская царква | XVIII ст. |
| Жытомля, Гродзенскі р-н | Дабравешчанская царква | 1743 |
| Лаўрышава, Навагрудскі р-н | Успенская царква | 1798 |
| Лаша, Гродзенскі р-н | Мікалаеўская царква | 1822 |
| Машуковічы, былы Навагрудскі павет | Уніяцкая царква. | 1653 |

| | | |
|---|---|---|
| Мірацічы, Карэліцкі р-н | Міхайлаўская царква | 1680 |
| Рось, Ваўкавыскі р-н | Троіцкая царква | XVIII ст. |
| ***Мінская вобласць (27 храмаў)*** | | |
| Альковічы, Вілейскі р-н | Касцёл Звеставання Дзевы Марыі | 1754 |
| Бараўцы, Вілейскі р-н | Царква Яна Прадцечы | 1769 |
| Беларучы, Лагойскі р-н | Успенская царква | XVIII ст. |
| Васільчыцы, Капыльскі р-н | Успенская царква | XVIII/XIX ст. |
| Ворсічы (паводле анатацыі на фота В, Ластоўскага), Старадарожскі р-н | Царква | XVIII ст. |
| Галынка, Клецкі р-н | Петрапаўлаўская царква | 1788–1789 |
| Гірэвічы, Валожынскі р-н | Царква | XVIII ст. |
| Дабрынёва, Дзяржынскі р-н | Царква Нараджэння Багародзіцы | XVIII ст. |
| Залужжа, Стаўбцоўскі р-н | Юр'еўская царква | 1768 |
| Засулле, Стаўбцоўскі р-н | Спаса-Праабражэнская царква | канец XVIII ст. |
| Іжа, Вілейскі р-н | Царква Іосіфа Абручніка | 1795 |
| Ізбішча, Лагойскі р-н | Успенская царква | XIX ст. |
| Княгінін, Мядзельскі р-н | Троіцкая царква | 1772 |
| Комсічы, Капыльскі р-н | Царква Нараджэння Багародзіцы | XVIII/XIX ст. |
| Латыгаль, Вілейскі р-н | Мікалаеўская царква | 1771 |
| Межная Слабада, Клецкі р-н | Царква Яна Хрысціцеля | XIX/XX ст. |
| Мсціж, Барысаўскі р-н | Крыжаўзвіжанская царква | 1649 |
| Пагост, Дзісненскі павет (цяпер БярэзІнскІ р-н) | МІкалаеўская царква | 1775 |

| | | |
|---|---|---|
| Палачаны, Маладзечанскі р-н | Касцёл Найсвяцейшай Дзевы Марыі | 1738 |
| Прусы, Салігорскі р-н | Васкрасенская царква | 1772 |
| Прылукі, Мінскі р-н | Троіцкая царква | 1740 |
| Савічы, Капыльскі р-н | Троіцкая царква | XVIII ст./1839 |
| Семежава, Капыльскі р-н | Свята-Пакроўская царква | 1720 |
| Стары Свержань, Стаўбцоўскі р-н | Царква Нараджэння Багародзіцы | 1770 |
| Судча, былы Пінскі павет Мінскай губерні (цяпер Украіна) | Царква | 1663/XVIII ст. |
| Урэчча, Любанскі р-н | Прачысценская царква | XVIII ст. |
| Яршэвічы, Валожынскі р-н | Вазнясенская царква | XVIII ст. |

Сярод выдатных твораў традыцыйнай беларускай драўлянай архітэктуры – царква Святога Мікалая ў Кажан-Гарадку, Пакроўская царква ў в. Покры (Брэсцкі раён), Спаса-Праабражэнская царква ў в. Порплішча (Докшыцкі раён), Крыжаўзвіжанская царква ў в. Гошчава (Івацэвіцкі раён), Спаса-Праабражэнская царква ў в. Олтуш і Спаса-Праабражэнская царква ў в. Хацiслаў (абедзьве Маларыцкі раён), царква Святой Параскевы Пятніцы ў в. Дзівін (Кобрынскі раён), Мікалаеўская царква ў в. Сцяпанкі (Жабінкаўскі раён) і інш. Яны ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Адной з самых адметных драўляных цэркваў Беларусі з’яўляецца ***былая ўніяцкая (цяпер праваслаўная) царква Святога Мікалая ў Кажан-Гарадку*** (Лунінецкі раён, Брэсцкая вобласць). Яна пабудавана ў 1814–1818 г. ва ўнікальным для драўлянага дойлідства “палескім стылі” з элементамі барока.

Храм складаецца з пяці зрубаў, пастаўленых па крыжы. Сярэдні зруб вылучаецца аб'ёмам, вышынёй і завяршаецца купалам. Чатыры іншыя зрубы таксама маюць купалы на вяршынях. Усё гэта стварае завершаную карціну пяцікупальнага храма. Завяршальныя часткі выкананы ў стылі барока. Акрамя рысаў стылю барока, храму ўласцівыя прыёмы традыцыйнага дойлідства Палесся. У 1876 г. над уваходам у царкву была ўзведзена званіца. У гэтым абліччы храм захаваўся да нашага часу. Звонку ён пазбаўлены якіх бы там ні было яркіх дэкаратыўных элементаў.

Ніводзін з сямі купалаў царквы ў Кажан-Гарадку не глядзіць вертыкальна ў неба – сказаліся асаблівасці будаўніцтва, а таксама рэканструкцыя 1956 г. з заменай падмурка. Па прычыне прасядання грунту пад цэнтральнай часткай храма адбыўся нахіл цэнтральнай вежкі ў бок званіцы. З-за крэну царкву Святога Мікалая ў народзе называюць “Пізанская царква”.

Досыць багатае ўнутранае ўбранне царквы: шматлікія скульптурныя кампазіцыі, не характэрныя праваслаўным храмам. Шэдэўрам мясцовых майстроў з'яўляецца двух'ярусны пазалочаны іканастас. У царкве захаваліся іконы XVIII ст.: “Тройца новазапаветная” і “Архістратыг Міхаіл”.

На працягу стагоддзяў драўлянае дойлідства разам з маляўнічым ландшафтам фарміравалі эстэтычны густ народа. З пакалення ў пакаленне перадаваўся досвед цеслярскага майстэрства. Драўляныя святыні не ўражваюць складанасцю і мудрагелістасцю форм, але зачароўваюць дзіцячай шчырасцю сваіх стваральнікаў і задушэўнай лірычнасцю. На жаль, гэту даўніну і сапраўдную прыгажосць шмат дзе ўжо замянілі выкрутасістыя храмы XIX–XXI ст., якія не маюць пад сабой

глыбокай этнічнай традыцыі. А многія святыні зменены да непазнавальнасці непрафесійнымі перабудовамі, якія замянілі стыль барока на стыль "барака"[134].

## 1830-я г.: аб "неумножении без надобности" ўніяцкіх бажніц

Уніяцкае культавае будаўніцтва актыўна працягвалася ў першай трэці XIX ст., але дзяржаўная палітыка стрымлівання Уніяцтва абумовіла адсутнасць грандыёзных будоўляў, мастацка-архітэктурных навацый і шэдэўраў, якія ведала папярэдняе стагоддзе. Ужо ў 1797–1798 г. магілёўскі праваслаўны епіскап Афанасій прапанаваў ураду забараніць будаўніцтва новых уніяцкіх храмаў і капліц. 31 мая 1819 г. быў выдадзены ўказ аб "неумножении без надобности" ўніяцкіх цэркваў паблізу грэка-расійскіх храмаў. На яго падставе ў 1829 г. быў разабраны храм у Бабруйску, узведзены васьмю гадамі раней.

Будаўніцтва ў той час таксама было масавым, але зводзілася яно да ўзвядзення новых бажніц там, дзе ў іх адчувалася патрэба: на месцы спаленых, знішчаных ў 1812 г., старых і непрыдатных храмаў. Рамантавалі абвятшалыя храмы. Матэрыялы набываліся і работы выконваліся на сродкі прыхаджан, за кошт даходаў базыльянскіх кляштараў, на ахвяраванні мясцовай шляхты. У 1810 г. была пабудавана царква ў Веліжы, 1816 г. – у Плешчаніцах, 1824 – у Сянно, 1830 – Вілейцы і г.д.

200 жыхароў мястэчка Любавічы (Бабінавецкі павет) "понуждали" мясцовых базыльян пабудаваць ім

[134] Габрусь Т. В. Драўлянае хрысціянскае храмабудаўніцтва Беларусі. Мінск, 2020. С. 289–290.

царкву замест далучанай у 1795 г. да Праваслаўя. Але зрабіць гэта не дазволілі сціплы манастырскі фундуш ды перашкоды магілёўскага епархіяльнага начальства. У 1814 г. сялян у іх хадайніцтве перад уладамі падтрымаў быхаўскі маршалак Крогер, які меў намер разам з базыльянамі пабудаваць у мястэчку каменны храм[135].

З 1830 г. ва ўніяцкае храмавае будаўніцтва ўнеслі "карэктывы" – дазвалялася будаваць толькі згодна з планамі і фасадамі, установленымі для грэка-расійскіх цэркваў. А потым і наогул ствараюцца штучныя перашкоды для будаўніцтва – забарона на ўзвядзенне, перабудову, рамонт, асвячэнне драўляных бажніц і капліц без дазволу ўраду і губернскага начальства. Вось чаму аказаліся марнымі масавыя прашэнні аб дазволе на заснаванне новых бажніц, якімі сяляне, гараджане, духавенства і шляхта хацелі кампенсаваць страту сваіх цэркваў на карысць Праваслаўя. Падобныя хадайніцтвы паступалі ў адпаведныя інстанцыі нават у 1839–1842 г., і такое будаўніцтва вялося ў Воўчыне, Камянцы, Кобрыне, Воўпе. За ўзвядзенне святынь без ведама ўладаў каралі, як і за новапабудаваныя "без патрэбы" храмы (у вёсцы Прыхабы Магілёўскай губерні, сяле Цяланічы, у ваколіцах горада Сянно, у вёсцы Крупчыцы і інш.).

Па стану на 1837 г. Уніяцкая Царква мела 673 парафіі ў Літоўскай епархіі і 554 парафіі ў Беларускай епархіі[136]. Усе яны былі скасаваныя ў 1839 г.

---

[135] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 2617, воп. 1, спр. 134, арк. 2–13.

[136] Radwan M. Carat wobec kościoła greckokatolickiego w zaborze rosyjskim. 1796–1839. Roma–Lublin, 2001. S. 215–346.

***Такім чынам,*** у першай палове XVII ст. уніяцкае будаўніцтва ў асноўным зводзілася да перабудовы і рамонту старых храмаў. Актыўнае ўласнае будаўніцтва пачалося з канца XVII ст. Яго росквіт прыпаў на XVIII ст. Храмы будаваліся ў асноўным на сродкі мецэнатаў з ліку магнатаў, шляхты, духавенства і заможных гараджан. Толькі Віцебск, па словах полацкага архіепіскапа Смарагда, *“найгалоўнейшы і наймацнейшы Уніяй горад ва ўсёй Расіі”*, меў напярэдадні яе скасавання больш за 15 багатых мураваных храмаў[137].

Уніяцкая Царква спрыяла распаўсюджанню еўрапейскага стылю барока і “пераклала” яго на ўласную архітэктурную мову пад назвай віленскае, ці ўніяцкае, барока. Яго пашырэнню спрыяла дзейнасць у Беларусі архітэктараў: італьянца Фантана III, паляка Яна Крыштафа Глаубіца, беларуса Аляксея Асікевіча. Будаўнічая дзейнасць Царквы пакінула пасля сябе шэраг архітэктурных шэдэўраў непераўзыйдзенага гісторыка-культурнага значэння і высокай мастацкай каштоўнасці. Помнікамі, выкананымі ў стылі віленскага барока, Беларусь увайшла ў гісторыю еўрапейскай архітэктуры.

1839 год паставіў кропку на ўніяцкім храмабудаўніцтве.

---

[137] Шавельский Г. Последнее возсоединение с православною церковію уніатов Белорусской епархии (1833–1839 гг.). СПб., 1910, приложение, с. 27.



*Абраз “Тры свяціцелі” (“Выбраныя Святыя Васіль Вялікі, Рыгор Багаслоў, Іаан Златавуст”) з царквы г. п. Шарашова Пружанскага р-на Брэсцкай вобл. Створаны да 1725 г. Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь*

# Жывапісная спадчына

- *Традыцыя шанавання старажытных святынь*
- *Уніяцкі абраз – з’ява беларускай нацыянальнай культуры*
- *Іканаграфічны рэпертуар уніяцкага жывапісу*
- *Мастакі, якія распісвалі ўніяцкія храмы і малявалі для іх абразы*

## Традыцыя шанавання старажытных святынь

Як пераемніца беларускага Праваслаўя з яго візантыйска-славянскай традыцыяй Уніяцкая Царква з павагай ставілася да старажытных хрысціянскіх святынь Беларусі.

Старажытная ***мінская ікона Божай Маці (Мінская Адзігітрыя)***, якая захоўваецца ў кафедральным Свята-Духавым саборы беларускай сталіцы, – надзвычай шанаваная рэліквія і адначасова каштоўны твор мастацтва. На працягу вось ужо паўтысячагоддзя яна лічыцца заступніцай горада.

Паводле падання, гэты цудатворны абраз у 988 г. прывёз з Корсуня (Візантыйская імперыя), што ў Крыме, хрысціцель Русі, вялікі кіеўскі князь Уладзімір. Да канца XV ст. рэліквія знаходзілася ў Кіеве. Падчас спусташальнага набегу на Кіеў у 1482 г. крымскія татары хана Менглі-Гірэя садралі з іконы каштоўныя аздобы і кінулі яе ў Днепр. Аднак яна не патанула і неўзабаве (1500 г.) явілася вернікам у Менску на рацэ Свіслачы.

Прыкметная сваімі вялікімі памерамі (140х105 см) Мінская Адзігітрыя дайшла да нас у выглядзе XVII ст., калі была перамалявана ў манеры, характэрнай для ўніяцкага сакральнага жывапісу. Аднак па меркаван-

ню мастацтвазнаўцаў, грунтаваным на выніках рэнтгенаўскага даследавання, мінскі абраз Божай Маці мог быць напісаны ў XIV–XV ст. Легенду пра яго кіеўскае паходжанне і цудоўнае з'яўленне на Свіслачы, якая бескрытычна перавандроўвае з кнігі ў кнігу, звязваюць з уніяцкім перыядам гісторыі манастыра Святога Духа, які быў заснаваны базыльянамі ў 1616 г. Бо раней, у XVI ст., у Менску бытавала зусім іншая версія пра паходжанне іконы, прычым нелегендарнага характару. З'яўленне ж легенды адносіцца да XVII ст.; упершыню яна зафіксавана ў літаратуры ў 1670-я г.[138]

Гісторыя з'яўлення і шанавання абраза Мінскай Адзігітрыі не перастае хваляваць даследчыкаў. Нядаўна імі былі выказаны новыя гіпотэзы. Паводле адной з версій, абраз падарыла саборнай царкве Менска жонка вялікага князя літоўскага Аляксандра Ягелона, дачка маскоўскага князя Алена Іванаўна ў перыяд паміж 1495 і 1506 г. Ключавым аргументам у гэтым абгрунтаванні з'яўляецца згадка ў 1597 г. уніяцкім мітрапалітам Міхаілам Рагозай *"образа Пречыстое, которы образ надала славное и святое памети королевое Олена"*. Вялікая княгіня славілася на землях Літвы і Беларусі сваёй мецэнацкай дзейнасцю. Сярод іншага яна абдорвала храмы рознымі каштоўнымі рэчамі. Сувязь менскай іконы з Аленай Іванаўнай можа ўказваць на маскоўскае паходжанне рэліквіі[139].

Аўтары другой версіі, якую грунтуюць на судовым дакуменце 1510 г., дапускаюць, што ікону прывёз у Менск са Смаленска адзін з менскіх святароў – настаяцель царквы Успення Прачыстай Багародзіцы Фёдар. У Смаленску пэўны час праходзіла яго пастыр-

[138] Мікульскі Ю. М. Гісторыя іконы Божай Маці Менскай (да XVIII ст.) // Беларуская даўніна. Вып. 1. Мінск, 2014. С. 60–66.
[139] Тамсама. С. 67–72.

скае служэнне. Вярнуўся ён у 1435 ці 1436 г. з шанаванай іконай (ці яе спісам). Гэта найбольш верагодная дата з'яўлення іконы Багародзіцы ў Менску. Да 1616 г. яна знаходзілася ў саборнай царкве[140].

У 1616 г. па распараджэнні ўніяцкага мітрапаліта Іосіфа Руцкага абраз быў урачыста перанесены ў царкву базыльянскага манастыра Святога Духа, перабудаваную са струхлелага драўлянага праваслаўнага храма. Сам мітрапаліт быў ініцыятарам пераносу. Сваё рашэнне ён матываваў крытычным станам саборнага храма і самой іконы. Базыльянскі манастыр Святога Духа неўзабаве зрабіўся галоўным уніяцкім асяродкам Менска, пры ім была створана семінарыя, збіралася бібліятэка. Яго пачынаюць падтрымліваць заможныя менчукі – прадстаўнікі гарадской вярхушкі, якая прыняла Унію; самі манахі, сярод якіх было нямала прадстаўнікоў мясцовых заможных родаў.

Абраз Божай Маці змясцілі ў галоўным алтары. З пераносам у базыльянскую царкву ён набыў другое жыццё. У саборнай царкве да яго быў даволі абмежаваны доступ, цяпер абраз стаў больш даступным гараджанам.

Абраз быў стары і абшарпаны. Менскія базыльяне адрэстаўравалі яго, вырабілі новы аклад са срэбра *"коштом своим болей ниж на 500 золотых"*[141]. Недзе ў XVII ст. (як паказвае мастацтвазнаўчы аналіз) перамалявалі абраз адпаведна правілам сваёй Царквы. Заможныя мяшчане, духавенства сталі ахвяраваць на ікону значныя сродкі. У 1660 г. настаяцель мана-

---

[140] Груша А., Палехаў С. Святар Фёдар і яго ікона Багародзіцы. Новыя звесткі аб паходжанні Мінскага абраза Божай Маці? // Беларускі гістарычны часопіс. 2021. № 5. С. 3–9.

[141] Описание документов архива западнорусских униатских митрополитов. Т. 1: 1470–1700. СПб., 1897. С. 257.

стыра Святога Духа Варлаам Казінскі ў сваім завяшчанні адпісаў на ікону даволі вялікую суму – 15 тысяч злотых і надаў на яе шэраг сваіх каштоўных рэчаў (некалькі срэбных ліхтароў, напрастольны пазалочаны крыж, срэбную кадзільніцу, вялікі срэбны крыж з машчамі Св. Язафата) ды рызы з каштоўных тканін. У 1733 г. архімандрыт Аўгусцін Любянецкі ахвяраваў 1000 талераў на стварэнне ў храме капэлы, якая падчас набажэнства спявала бы перад іконай гімны ва ўшанаванне Багародзіцы. Такія шчодрыя ахвяраванні сведчаць, што людзі дзякавалі іконе Менскай Багародзіцы за многія цуды[142].

Больш за два стагоддзі абраз Мінскай Божай Маці знаходзіўся пад апекай базыльян і з’яўляўся прадметам гонару мінчан, аб’яднаных у царкоўнае брацтва. Ён быў прадметам усеагульнага пакланення, прыцягваючы да сябе прадстаўнікоў розных канфесій: рыма-католікаў, уніятаў, праваслаўных. На дзень Св. Тройцы ў горадзе звычайна ладзілася працэсія з гэтай іконай. Менскія базыльяне прыкладалі намаганні для пашырэння культу Багародзіцы. Прыкметай яго ўмацавання стаў распаўсюд у XVIII ст. шэрагу копій іконы.

Прыблізна ў першай палове – сярэдзіне XVII ст., на хвалі ўздыму жанру сказанняў пра іконы, ва ўніяцкім асяродку ў менскім манастыры Св. Духа паўстала легенда аб яўленні іконы Менскай Багародзіцы на Свіслачы ў 1500 г. Яе паходжанне не выпадкова звязвалася з Кіевам. Паводле легенды, Менск атрымаў далёка не шараговую, а адну з галоўных кіеўскіх рэліквій. І атрымаў ён ікону з найстаражытнейшага рускага храма – Дзесяціннай царквы, куды яна нібыта

---

[142] Мікульскі Ю. М. Гісторыя іконы Божай Маці Менскай (да XVIII ст.) // Беларуская даўніна. Вып. 1. Мінск, 2014. С. 77–78.

была ўкладзена самім хрысціцелем Русі князем Уладзімірам, – цэнтральнай асобай у гістарычнай свядомасці русінаў, ужо з часоў Сярэднявечча шанаванай Царквой як святы. Таму, паводле базыльянскай легенды, абраз Менскай Багародзіцы прэтэндаваў на званне адной з найкаштоўнейшых ікон старажытнай Русі. Атрымліваючы рэліквію разбуранага крымскімі татарамі Кіева, Менск пераймаў славу і благачэсце былой рускай сталіцы. Сярод гарадоў рускіх ён удастоіўся выключнай Божай ласкі, бо менавіта тут вырашыў застацца знакаміты абраз ўсерускага значэння. Матыў аб "незнішчальнасці" ікон быў папулярным у сказаннях XVII ст. А сказанні аб "вандраваннях" ікон часта станавіліся важнай часткай палітычнай ідэалогіі, якая прапагандавала стварэнне новых палітычна-рэлігійных цэнтраў і фарміравала іх вобраз. Легенду пра цудоўнае яўленне іконы мінскія базыльяне ўвялі ў тагачасную літаратуру ды выдавалі друкам апісанні яе цудаў[143].

Легенду пра менскую ікону Багародзіцы яе даследчык Юрый Мікульскі лічыць неабходным разглядаць не толькі як рэлігійны твор, але і як важную крыніцу да вывучэння самасвядомасці тагачаснага беларускага грамадства ды гісторыі ідэй. Пры гэтым ён заўважае, што менскія базыльяне не маглі не ведаць, што ўкладчыкам іконы Менскай Багародзіцы была вялікая княгіня Алена, бо гэта інфармацыя бытавала тады ў горадзе. У тагачасных сказаннях аб іконах рэальная гісторыя нярэдка даволі зграбна сумяшчалася з цудоўным яўленнем абраза, пры гэтым імя сапраўднага ўкладчыка захоўвалася. Легенда базыльян павышала значэнне іх сакральнай рэліквіі, узмацняла гістарычную і рэлігійную вагу Менска. У гэтым

[143] Тамсама. С. 79, 82–83.

заключалася ідэйнае значэнне іх падання. Менская ікона фігуруе ў рыма- і грэка-каталіцкай літаратуры XVII–XVIII ст. У праваслаўнай літаратуры ўсякая інфармацыя аб ёй адсутнічае ажно да XIX ст. Прычынай, на думку Ю. Мікульскага, было не толькі адабранне менскай іконы ў праваслаўных, але, відаць, і не надта вялікая яе папулярнасць (у адрозненне, напрыклад, ад Жыровіцкай іконы). У праваслаўнай традыцыі рэліквія набыла большае значэнне толькі з XIX ст., калі пасля вялікага перапынку вярнулася да праваслаўнай канфесіі. Але да таго часу памяць аб укладзе іконы вялікай княгіняй Аленай Іванаўнай ужо забылася, а таму была перанята ўніяцкая легенда пра цудоўнае яўленне абраза[144].

Спрадвечнае шанаванне мінскай іконы Божай Маці ў цяперашняй сталіцы Беларусі надае ёй статус адной з галоўных рэліквій краіны. Але яна адносіцца да ліку найбольш старажытных і каштоўных не толькі ў маштабах Беларусі, але і ўсёй гістарычнай Русі.

Найвялікшай рэліквіяй уніятаў быў цудатворны ***абраз Маці Божай Жыровіцкай***, знойдзены, паводле народнага падання, у 1470 г. на дзічцы. Сярод беларускіх цудатворных ікон Жыровіцкая – адзіная, высечаная ў камені. Выява Багародзіцы з дзіцяткам на руках выразана на невялічкай (5,6 х 4,4 см) авальнай каменнай пласціне з яшмы памерам з дзіцячую далонь, апаленая пажарам і крыху трэснутая ад агню і часу. Гэта самая маленькая з марыйных ікон (абразоў Маці Божай). Але ў гэтым маленькім абразку заключана вялізная сіла, якая стагоддзямі аб'ядноўвае ўсіх хрысціян Беларусі.

[144] Мікульскі Ю. М. Гісторыя іконы Божай Маці Менскай (да XVIII ст.) // Беларуская даўніна. Вып. 1. Мінск, 2014. С. 83, 86.

На месцы з'яўлення іконы была пабудавана драўляная, пазней мураваная царква ў гонар Багародзіцы. Вакол храма ўтварылася паселішча. Быў заснаваны манастыр (каля 1520 г. паводле царкоўнага падання; самая ранняя згадка – у дакуменце, датаваным 1578 г.[145]). Да іконы, якая праславілася сярод вернікаў сваімі цудамі, сталі прыходзіць людзі.

У часы Уніі мястэчка Жыровіцы ператварылася ў адзін з найбуйнейшых цэнтраў духоўнага жыцця Вялікага Княства Літоўскага і Беларусі. Манахі-базыльяне ўзвялі ў Жыровіцах вялікі манастырскі комплекс з мураваных храмаў барочнай архітэктуры і шырока распаўсюдзілі культ Маці Божай. У другой палове XVII ст. жыровіцкая ікона была добра вядомая і шанаваная сярод вернікаў, а манастыр стаў адным з галоўных месцаў паломніцтва ў Рэчы Паспалітай. Нават у манархаў склалася традыцыя прыязджаць пакланіцца жыровіцкаму абразу напярэдадні важных падзей у жыцці дзяржавы.

Слава пра жыровіцкую ікону разнеслася далёка па свеце. У XVII–XVIII ст. з яе былі зроблены копіі для цэркваў Валнянскага, Ражанскага і іншых базыльянскіх манастыроў. Копіі пачалі з'яўляцца нават у замежных краінах. Найбольш вядомыя сярод спісаў – дзве цудатворныя іконы, якія сёння належаць уніятам і католікам.

Адна з іх знаходзіцца ў базыльянскай царкве Святых мучанікаў Сяргея і Вакха ў Рыме, якая служыла рэзідэнцыяй афіцыйных прадстаўнікоў кіеўскіх мітрапалітаў пры Апостальскай сталіцы. Гэта ікона-фрэска. Даследчыкі мяркуюць, што яе ў першай палове XVII ст.

---

[145] Бубнов П. Милости Источник. Жировичская чудотворная икона Божией Матери и Жировичская Успенская обитель в 1470–1618 гг. Жировичи, 2020. С. 41, 46, 51–52.

напісаў на сцяне царквы нейкі манах-базыльянін, які прыехаў з Жыровіцаў. Сваім творам ён хацеў паказаць Рыму, якую каштоўную рэліквію маюць Вялікае Княства Літоўскае і Карона Польская.

Па прашэсці прыкладна праз 80 гадоў, у 1718 г., гэту ікону-фрэску выявілі ў царкве Сяргея і Вакха пад слоем тынкоўкі падчас рэстаўрацыйных работ. Культ Жыровіцкай цудатворнай іконы Багародзіцы (Мадонны дэль Паскола) стаў пашырацца сярод жыхароў Рыма, рэгістраваліся выпадкі аздараўлення і заступніцтва. Пакланіцца абразу прыбывалі нават вернікі аддаленых парафій – Пармы, Балонні. Колькасць паломнікаў няўхільна расла. Таму ў 1719 г. на загад Папы Клімента XI фрэску выразалі са сцяны і перанеслі ў царкву. Шанаванню знакамітага беларускага цудатворнага абраза на Захадзе шмат паспрыяў ***гісторык Уніяцкай Царквы, манах-базыльянін Ігнат Кульчынскі***[146], які жыў у першай палове XVIII ст. Гэта ікона шануецца там да нашага часу. Царкву Святых Сяргея і Вакха ў Рыме дагэтуль у народзе называюць царквой Багародзіцы (Мадонны дэль Паскола). Слава Жыровіцкага цудатворнага абраза ўзрасла і на беларускіх землях пасля знаходкі яго копіі ў Рыме ў 1718 г.

У 2018 г., падчас святкавання 300-годдзя адшукання ў Рыме копіі Жыровіцкай іконы Найсвяцейшай Багародзіцы, Першаіерарх Украінскай Грэка-Каталіцкай Царквы Святаслаў абвясціў гэту ікону галоўнай святыняй украінцаў у Італіі. Ён сказаў: *"Тут, у Рыме, манах маляваў гэтую ікону як асабістую малітву. Мабыць, ён намаляваў на гэтай іконе плач і слёзы ўкраінскай*

[146] Крот А. Культ Маці Божай Жыровіцкай у творах айца Ігната Кульчынскага // Хрысціянства у гістарычным лёсе беларускага народа: у 2 ч. Ч. 1. 2009, Гродна, 2009. С. 205–208.

*зямлі, малітву аб міры на нашай зямлі. Малітву за тых, хто апынуўся за межамі роднай зямлі”.*

Другая версія Жыровіцкай цудатворнай іконы – гэта ***мастацкая копія рымскай іконы-фрэскі, напісаная на палатне ў першай палове XVII ст.*** і дасланая з Рыма ў Жыровіцы (дзе яна захоўвалася да 1915 г.). Улічваючы вялікую колькасць ацаленняў, якія адбываліся перад іконай Багародзіцы ў Жыровіцах і ў Рыме, там было вырашана ўскласці на галаву Боганемаўляці Ісуса і Багародзіцы ў Жыровіцах у царкве айцоў базыльянаў Кіеўскай мітраполіі залатыя кароны. Гэта была першая цудатворная ікона ў гісторыі Кіеўскай мітраполіі, Беларусі, каранаваная папскімі каронамі.

***Каранацыя іконы*** адбылася 19 верасня 1730 г. Гэты было маштабнае дзяржаўнае і царкоўнае свята з літургіямі, пропаведзямі, філасофскімі дыспутамі, якое доўжылася восем дзён. У Жыровіцы прыбылі мітрапаліт Афанасій Шаптыцкі са шматлікім духавенствам, прадстаўнікі ўсіх базыльянскіх кляштараў Літоўскай правінцыі, мноства магнатаў, шляты і простага люду з розных куткоў Беларусі, Літвы, Украіны, Польшчы. Пілігрымамі былі перапоўнены не толькі Жыровіцы і Слонім, але і ўсё наваколле, дзе наладзілі палаткі і навесы. Урачыстасці дастаўкі карон, іх перадачы базыльянам, уласна каранацыі іконы суправаджалася красамоўнымі вітаннямі ад выкладчыкаў базыльянскіх школ, элегантнымі прамовамі, набажэнствамі, працэсіямі, боем званоў, стрэлам гармат, музыкай, якая гучала з царкоўных вежаў, брамаў, узгоркаў, ілюмінацыямі – ўсё мястэчка ззяла агнямі. У гонар каранацыі былі выбіты ад імя мітрапаліта, а таксама Геранімам Радзівілам залатыя і срэбныя медалі. Іх раздавалі прысутным. Відавочца пісаў пра незвы-

чайны эмацыйны ўздым тых, каму пашчасціла гэтыя дні быць у Жыровіцах[147].

Рымскія кароны і старажытнае аздабленне цудатворнай іконы беражліва захоўвалі базыльяне, а пасля 1834 г. – праваслаўныя манахі. У 1915 г., перад акупацыяй тэрыторыі Беларусі войскам кайзераўскай Германіі, жыровіцкая святыня і іншыя царкоўныя рэліквіі былі эвакуяваны ў Маскву. Пасля Рыжскай дамовы 1921 г. абраз цудам вярнуўся ў Жыровіцы, хоць і страціў свае аздобы. Пасля доўгай і складанай гісторыі ён цяпер знаходзіцца і ўшаноўваецца ў касцёле Святога Андрэя ў Слоніме. На працягу стагоддзяў перад гэтай цудатворнай іконай маліліся грэка-каталікі, рыма-каталікі, праваслаўныя. Гэта традыцыя працягваецца і жыве ў нашы дні. Абраз Маці Божай Жыровіцкай у Слоніме стаў адной з галоўных хрысціянскіх святынь беларускага народа і сімвалам адзінства хрысціян.

Арыгінал жыровіцкага абраза Маці Божай, з'яўленне якога паданне адносіць да XV ст., сёння ўваходзіць у лік 100 найбольш шанаваных праваслаўных ікон і захоўваецца ў іканастасе Успенскага сабора – галоўнага храма праваслаўнага Жыровіцкага манастыра ў Слонімскім раёне Гродзенскай вобласці. Пакланіцца цудатворнаму абразу і прасіць яго заступніцтва на працягу стагоддзяў з усіх куткоў Беларусі і іншых краін прыязджаюць хрысціяне-пілігрымы розных канфесій – праваслаўныя, грэка-каталікі, рыма-каталікі.

У 2020 г. у Беларусі адзначалася 550-годдзе здабыцця цудатворнай Жыровіцкай іконы Божай Маці і 500-годдзе заснавання Жыровіцкага манастыра.

---

[147] Ярашэвіч А. Каранацыя Жыровіцкага абраза Маці Божай 8 (19) верасня 1730 г. // Наша вера. 2010. № 4. С. 13–17.

Такім чынам, найбольш вядомымі з'яўляюцца тры выявы Жыровіцкай іконы Маці Божай, якія праславіліся цудамі: каменная, якая цудоўным чынам з'явілася ў XV ст. і знаходзілася ў Жыровіцах; ікона-фрэска з базыльянскага касцёла Святых мучанікаў Сяргея і Вакха ў Рыме; мастацкая копія рымскай іконы-фрэскі, напісаная на палатне, якая цяпер ушаноўваецца ў касцёле Святога Андрэя ў Слоніме.

Мястэчка Баруны (Ашмянскі павет Гродзенскай вобласці) і заснаваная ў ім у канцы XVII ст. (1692 г.) уніяцкая царква і манастыр славіліся прывезенай сюды базыльянамі ***іконай Маці Божай Барунскай***, чуткі аб цудах якой хадзілі па ўсяму Вялікаму Княству Літоўскаму[148]. Першапачаткова ікона належала манаху-базыльяніну, ігумену полацкага манастыра Язафату Бражыцу. Ён падарыў яе Мікалаю Песляку, заснавальніку Барунскага манастыра базыльян. Упершыню абраз згадваецца ў 1705 г. Мітрапаліт Леў Кішка прысвяціў яго цудам кнігу, выдадзеную ў 1712 г. Супрасльскай базыльянскай друкарняй (было перавыданне 1742 г.).

Існуе тры версіі паходжання абраза Барунскай Божай Маці: 1) гэта помнік візантыйскага пісьма; 2) з'яўляецца творам старажытнарускага пісьма візантыйскага тыпу; 3) мае італьянскае паходжанне ці пераймание італьянскім узорам. Абраз быў упрыгожаны каштоўнымі камянямі, залатымі ланцужкамі, жамчужынамі, пярсцёнкамі, медальёнамі, крыжыкамі, срэбнымі пласцінкамі. Вядома некалькі спісаў з яго.

У пачатку XIX ст. гэты абраз быў адным з самых шанаваных на Віленшчыне і Гродзеншчыне. Яго лёс

[148] Boruńska Ikona Matki Bożej // Chomik P. Kult Ikon Matki Bożej w Wielkim Księstwie Litewskim w XVI–XVIII wieku. Białystok, 2003. S. 118–131.

пасля 1839 г. дакладна не высветлены. Па адной з версій, у 1839 г. базыльяне ў прадбачанні роспуску свайго ордэна і закрыцця кляштара, перадалі абраз на захаванне адной сям'і, а ў касцёле змясцілі яго дакладную копію. У 1922 г. абраз вярнуўся дадому і быў змешчаны ў Барунскім касцёле на ранейшым месцы, дзе знаходзіцца і цяпер. Па іншай версіі, магчыма, цяпер у Барунах знаходзіцца толькі яго копія. Паводле вусных звестак, арыгінал загінуў падчас Другой сусветнай вайны з-за непрыдатных умоваў захоўвання.

Абраз, які сёння знаходзіцца ў храме Святых Пятра і Паўла ў Барунах, – адна з самых шанаваных хрысціянскіх святынь Беларусі.

Уніяцкая Царква беражліва ставілася да старажытных абразоў, працягвала ім жыццё. Асабліва шанавала святыні агульнанацыянальнага значэння, развівала іх культ. Але паступова Царква прыступае да ўласнай іканатворчасці, якая развівалася на стыку візантыйска-"рускай" і заходнееўрапейскай традыцый. Не адмаўлялася ніводная з гэтых культурных мадэляў – яны творча сінтэзаваліся. На аснове гэтага сінтэзу стваралася самастойная і адметная з'ява іканапісу – уніяцкі абраз. Ён стаў непаўторнай з'явай беларускай нацыянальнай культуры.

## Уніяцкі абраз – з'ява беларускай нацыянальнай культуры

Візантыйскія мастацкія ўплывы, якія ў X–XIV ст. з'яўляліся магутным творчым стымулам развіцця ўсходнеславянскага іканапісу, у XVI–XVII ст. з-за жорсткай рэгламентацыі іканапісных канонаў пераўтварыліся ў тормаз, які закрыў мастакам доступ

да жывога і непасрэднага ўспрымання жыцця. Чым болей нейтралізоўваліся на мясцовай глебе візантыйскія ўплывы, тым хутчэй ішоў працэс станаўлення нацыянальных школ жывапісу. Калі на кананічных тэрыторыях Маскоўскага патрыярхату кампазіцыйная пабудова праваслаўных абразоў была закансервавана пастановай памеснага (Стоглавага) сабора 1551 г., то ўніяцкі абраз праявіў вялікую здольнасць да развіцця. Берасцейская унія стала пераломным момантам у працэсе далейшай эвалюцыі іканапісу.

Разыходжанне беларускага мастацтва з класічным візантынізмам пачалося задоўга да 1596 г. Заключэнне Уніі спрыяла яго набліжэнню да формаў заходнееўрапейскага, у першую чаргу, італьянскага мастацтва. У той жа час Унія не ператварала добраахвотны характар традыцыйных культурных сувязяў з каталіцкім Захадам у наўмысныя ці прымусовыя ўплывы. Зблізжэнне ўніяцкага сакральнага жывапісу з мастацтвам Захаду адбывалася не за кошт адмовы ад свайго і набыцця чужога – візантыйская першаснова беларускага мастацтва не знікла. З візантыйскай канцэпцыі іконы беларускія майстры перанялі надзвычай высокую адухоўленасць вобразаў, але адмовіліся ад іх прынцыповай адхіленасці і архаізацыі жывапіснай манеры[149].

Выдзяляюцца тры ***этапы развіцця ўніяцкага іканапісу***: 1) ранняеўніяцкае мастацтва (канец XVI – першая палова XVII ст.); 2) барочны перыяд (сярэдзіна XVII – першая палова XVIII ст.); 3) позні ўніяцкі перыяд (другая палова XVIII – пачатак XIX ст.).

[149] Глушакова Т. И. Религиозная живопись Беларуси позднего средневековья как объект социально-философского анализа (16–17 вв.): автореф. дис. … канд. филос. наук. Минск, 1993. С. 13–14.

У ранніх беларускіх уніяцкіх абразах (канец XVI – першая палова XVII ст.) яшчэ не выяўляюцца відавочныя адступленні ад візантыйскіх іканаграфічных канонаў. Таму іх нельга адрозніць ад праваслаўных. Найперш пераймаліся тыя рысы і ідэі ўсходняга і заходняга рэлігійнага жывапісу, якія найбольш адпавядалі менталітэту маладога беларускага этнасу.

Да першага перыяду можна аднесці дзясятак абразоў памежжа XVI–XVII ст., тры з якіх – “Старазапаветная Тройца”, “Нараджэнне Маці Божай”, “Успенне” – дапушчальна звязаны з імем грэчаскага майстра Пятра Аркудзія.

Адметнае месца ў манументальным жывапісе Беларусі першай паловы XVII ст. займаюць роспісы Успенскага сабора Жыровіцкага манастыра. У сувязі з перабудовай XIX ст. яны захаваліся толькі фрагментарна, але гэта не перашкаджае ўбачыць у іх значныя помнікі старабеларускага жывапісу. Адзін з найбольш удалых твораў – кампазіцыя “Новазапаветная Тройца”.

У першай палове XVII ст. беларускае сакральнае мастацтва нібы паварочваецца тварам да рэчаіснасці і ў ёй шукае крыніцы натхнення, пачынае ўбіраць у сябе свецкія рысы. Больш жывапісная прапрацоўкай складак адзення, смелым спалучэннем колераў, новымі падыходамі ў прапісцы лікаў уніяцкі абраз сярэдзіны XVII ст. адрозніваецца ад старажытнарускага жывапісу, які знаходзіўся ў арбіце магутнага візантыйскага ўплыву. Адметнай рысай уніяцкага мастацтва з’яўляецца імкненне да арнаментыкі, узорыстасці.

У XVII ст. узрастае падзел усяго беларускага жывапісу ў межах заходнееўрапейскай і старажытнарускай традыцый. Калі першы кірунак адпавядаў прагрэсіўнаму развіццю культуры, узбагачаў айчын-

нае мастацтва новымі дасягненнямі, то другі ўсё больш выказваў яго архаічныя з'явы. З сярэдзіны стагоддзя мастакі ўсё актыўней працуюць у манеры, тыповай для заходнеўрапейскага жывапісу[150].

У другой палове XVII ст. візантыйская традыцыя парушаецца. Не трэба думаць, што яна церпіць паразу і паступова зыходзіць ў народную культуру. Не, праваслаўная іканаграфія ва ўніяцкіх абразах паступова эвалюцыянуе пад уплывам эстэтыкі барока, хоць шматвяковыя царкоўныя традыцыі не дазвалялі лёгка пераносіць заходнія ўплывы на іканапіс.

З сярэдзіны XVII ст., на другім этапе развіцця ўніяцкага іканапісу (сярэдзіна XVII – першая палова XVIII ст.), у ім адчуваецца моцны ўплыў стылю барока. Пад уздзеяннем барока ў абраз прыходзіць этнаграфізм, натуральнасць чалавечых перажыванняў, востра схопленыя і перададзеныя жыццёвыя сітуацыі, імкненне да манументальнасці. Уніяцкі жывапіс другой паловы XVII ст. валодае большай арыгінальнасцю, творчай самабытнасцю і выразнасцю. У гэты перыяд адбываецца працэс актыўнага фарміравання і развіцця нацыянальнай школы іканапісу.

Найбольш характэрным для другога этапа развіцця ўніяцкага мастацтва з'яўляецца нарастанне дэмакратызму, які праявіўся ва ўзмацненні народнага ўплыву на сакральны жывапіс. Уніяцтва, якое ператварылася ў веравызнанне сацыяльных нізоў, нарадзіла надзвычай дэмакратычнае мастацтва жывапісу. Гэтаму садзейнічала і тое, што Уніяцкая Царква не надта клапацілася аб захаванні іканаграфічных канонаў, якія ў XVIII ст. ператварыліся ў тормаз развіцця

[150] Лазука Б. А. Гісторыя мастацтваў: Вучэбны дапаможнік. Мінск, 1996. С. 282–283.

рэалістычных тэндэнцый. Адсюль і вольная інтэрпрэтацыя традыцыйных біблейскіх сюжэтаў мастакамі – выхадцамі пераважна з простага народа. Зразумелая простаму гледачу мова ўніяцкіх абразоў забяспечвала іх уплыў на вернікаў.

***Сакральны дэмакратызм*** знайшоў мноства розных формаў выражэння. Увесь пантэон хрысціянскіх святых набывае кранальныя фальклорныя рысы. Ніколі раней аблічча прарокаў, святых і нават Маці Божай на набывалі такога падкрэслена простанароднага, часам грубаватага характару. Але гэта грубае мастацтва захоўвае высокародную чысціню вобразаў, усхваляванасць і паэтычнасць[151]. Пры ўвядзенні шматлікіх этнаграфічных, бытавых дэталяў у ікону XVII ст. не страчвалася ўзнёсласць і высокая адухоўленасць вобразаў.

Настойлівыя спробы беларускіх майстроў пэндзля XVII ст. перанесці біблейскія падзеі ў абставіны мясцовага асяроддзя, звыклыя воку вернікаў, былі відавочным парушэннем канону. Культуролаг Тарэса Глушакова схільная бачыць у гэтым не прафесійную некампетэнтнасць і правінцыйнасць жывапісцаў, але *"жывапісны эквівалент нацыянальнай сістэмы мыслення"* – імкненне наблізіць свой народ і зямлю да сакральнай гісторыі, увесці ў беларускі абраз побач з агульначалавечым і нацыянальнае[152].

Ва ўніяцкім сакральным жывапісе выдзяляюць дзве плыні: высокапрафесійная і народная. Таленавітыя мастакі з народа ў сваёй працы арыентаваліся

---

[151] Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. Т. 2: Другая палова XVI – канец XVIII стагоддзя. Мінск, 1988. С. 151.

[152] Глушакова Т. И. Религиозная живопись Беларуси позднего средневековья как объект социально-философского анализа (16–17 вв.): автореф. дис. … канд. филос. наук. Минск, 1993. С. 18.

на ўласны, блізкі да фальклорнага, досвед інтэрпрэтацыі біблейскіх сюжэтаў. Пад уплывам барока, пры свабодным стаўленні да канонаў, з-пад іх пэндзля нараджаліся іканаграфічныя наватворы, у якіх сялянскае жыццё ўзнімалася да значнасці сакральнага быцця[153].

Ва ўніяцкім іканапісе другой паловы XVII–XVIII ст. вобраз жанчыны напаўняецца новым, больш глыбокім псіхалагічным зместам. Узнікае вялікая колькасць новых рэдакцый выяў мясцовых "Адзігітрый", "Замілаванняў", якія шматразова вар'іраваліся і перапрацоўваліся. Разам яны стваралі своеасаблівую паэму аб жанчыне-маці.

Амаль цалкам знікаюць сляды кананічнага ўмоўнага тыпажу, а сцвярджаецца вобраз рэальнай жанчыны, надзеленай багатым унутраным светам і сілай пачуццяў[154]. Выявы на іконах Божай Маці ў беларускіх майстроў вагаліся ад сціплых, простых сялянскіх тыпаў, якія здолелі спалучаць арыстакратычную вытанчанасць з простанароднай непасрэднасцю, да Мадоннаў еўрапейскага тыпу. Гэтыя творы адлюстравалі народнае ўяўленне аб ідэале жанчыны.

Абраз Маці Божай Замкавай, устаноўлены ў 1654 г. ва ўніяцкай Барыса-Глебскай царкве ў Наваградку, уславіў у сваёй знакамітай паэме "Пан Тадэвуш" Адам Міцкевіч, чыё дзяцінства прайшло ва ўніяцкім асяроддзі. З гэтым абразом звязана яго цудоўнае вяртанне да жыцця. Яго, смяротна хворага хлопчыка,

[153] Вакар Л. У. Барочная экспрэсія ўніяцкага народнага абраза (Стылістычны аналіз абразоў з вёскі Латыгава) // Брэсцкай царкоўнай уніі – 400: Матэрыялы міжнар. навук. канф. Брэст, 1997. С. 59–63.

[154] Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. Т. 2: Другая палова XVI – канец XVIII стагоддзя. Мінск, 1988. С. 155.

прынеслі да Божай Маці, пасля чаго ён ачуняў. Ва ўступе да паэмы паэт пісаў:

*Святая дзева, што бароніш …*
*Наш слаўны Навагрудак з добрым верным людам,*
*Як мне жыццё ў дзяцінстве ты вярнула цудам…*

Пра духоўнае прасвятленне, якое зведвалі вернікі ў малітвах да гэтай іконы, распавядаецца ў кантычцы “Хваласпеў найсвяцейшай Панне Марыі, цудамі слыннай у абразе Наваградскім пад аховаю кс. Базыльянаў вякуючай”, якую ў 1817 г. выдалі віленскія базыльяне. У 1839 г. цудатворны абраз Маці Божай Замкавай быў перанесены з уніяцкай бажніцы ў праваслаўную царкву. У 1915 г. яго вывезлі ў Расію. Далейшы лёс невядомы[155].

Мастацтвазнаўца Элеанора Вецер, якая даследавала іканапіс XVIII ст. заходняга Палесся, дзе амаль усе сяляне і гараджане былі ўніятамі, прыйшла да наступнай высновы. Адносная незалежнасць мастацкага асяроддзя гэтага рэгіёна ад буйных рэлігійных цэнтраў з іх строгімі правіламі, адсутнасць кантролю і прымусу абумовіла шырокае пранікненне ў іканапіс народнай эстэтыкі, дэмакратызацыю сакральнага ўніяцкага мастацтва і яго непасрэдную сувязь з народнымі вытокамі. Такімі з’яўляюцца абразы Маці Божай Холмскай, Раства Багародзіцы, Маці Божай Барунскай, абраз Варвары Пакутніцы работы Яна Васілевіча з Кобрына і інш[156]..

XVIII ст. стала часам росквіту ўніяцкага сакральнага мастацтва. Да канца гэтага стагоддзя яно да-

---

[155] Кемпфі А. Аб “Сталічным Навагрудку” і аб Навагрудскай Божай Маці замкавай // Спадчына. 1991. № 1. С. 21–24.

[156] Вецер Э. І. Рэльефныя абразы як прыклад адлюстравання народных густаў у культавым мастацтве // Помнікі старажытнабеларускай культуры: Новыя адкрыцці. Мінск, 1984. С. 42–43.

ходзіць да ўласнай канонатворчасці – выпрацоўвае ўласныя каноны. Сталі з’яўляцца абразы з узаемавыключнымі сюжэтамі як для Праваслаўя, так і для Каталіцызму. Гэта добра ілюструе абраз “Дабравешчанне” са святочнага раду Шарашоўскага іканастаса. На падобных каталіцкіх іконах Арханёл бласлаўляе Марыю лілеяй, на праваслаўных – рукой. У дадзеным выпадку – і тым, і другім.

Іканастас з Шарашова найбольш яскрава і выразна раскрывае рысы беларускага жывапісу другой паловы XVIII ст. Простанародны тыпаж, канкрэтнасць у перадачы адзення ўніяцкіх святароў, бытавых дэталяў збліжаюць яго з творамі свецкага жывапісу і сведчаць аб развіцці рэалізму ў жывапісе гэтага часу. Такім з’яўляецца абраз “Выбраныя святыя Васіль Вялікі, Рыгор Багаслоў, Іаан Златавуст”[157]. Аднак новыя даследаванні (Н. Трыфанава, Г. Флікоп-Світа) дазваляюць весці гаворку пра больш ранні перыяд стварэння шарашоўскага іканастаса – другая палова XVII – першая чвэрць XVIII ст.

У XVIII ст. моцна фалькларызуецца прафесійнае мастацтва і адначасова адбываецца ўсплёск нізавой культуры – народнага іканапісу і прымітыву. Надзвычай шырокае распаўсюджанне ***фалькларызацыя жывапісу*** атрымлівае з сярэдзіны стагоддзя. Увядзенне ў ікону бытавых дэталей, з’яў паўсядзённага жыцця спрыялі парушэнню кананічнасці ікон, што ў выніку прыводзіла да страты адметных мастацкіх якасцей іканапісу, ператварала іконы ў творы народнапрымітыўнага зместу і своеасаблівыя жанравыя карціны на біблейскія сюжэты (“Раство Хрыстова” з вёскі

[157] Тэмперны жывапіс Беларусі канца XV–XVIII стагоддзяў у зборы Дзяржаўнага мастацкага музея БССР: Каталог. Мінск, 1986. С. 23, 24.

Латыгава Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці, 1746 г.; і інш.). Творы народнага барока (народнага прымітыву) часам не вельмі прафесійныя з пункту погляду акадэмічнай граматы, але яны звычайна кранаюць жыццесцвярджэннем, чалавечнасцю і цеплынёй. Яго вобразы не спрасціліся – яны набылі дзіўную непасрэднасць і натуральнасць. Трансфармацыя культавага жывапісу ў народныя формы спрыяла зберажэнню нацыянальнай самабытнасці жывапісу[158].

Найбольш плённым у мастацкіх адносінах з'яўляецца другі напрамак у развіцці іканапісу XVIII ст. – арыентацыя, засваенне і творчая перапрацоўка заходнееўрапейскіх традыцый[159].

Нягледзячы на тое, што ў XVIII ст. аблічча ўніяцкіх храмаў змянілася ў бок збліжэння з Рымска-Каталіцкім Касцёлам, дэкаратыўны роспіс іх інтэр'ераў (сцен, слупоў, столі) нёс уплыў беларускага нацыянальнага мастацтва. Тут выкарыстоўваліся арнаментыка і мастацкія кампазіцыі, распаўсюджаныя ў народнай творчасці, ва ўпрыгожванні хатняга начыння.

У XVIII ст. адбываюцца змены ў дэкаратыўным афармленні царкоўнага інтэр'ера, звязаныя з культавымі новаўвядзеннямі. Назіраецца тэндэнцыя да "зварочвання" радоў іканастасаў, адмовы мясцовых майстроў ад маштабных формаў. На паўночных і паўднёвых сценах храмаў на фоне калон пачынаюць майстраваць алтары. У некаторых цэрквах наогул адмаўляюцца ад іканастаса і аддаюць перавагу алтару. У бажніцах з'яўляюцца фератроны – двухбаковыя пераносныя іконы, упрыгожаныя разьбой, скульпту-

[158] Іканапіс Заходняга Палесся XVI–XIX стст. Мінск. 2002. С. 164–165, 273.

[159] Лазука Б. А. Гісторыя мастацтваў: Вучэбны дапаможнік. Мінск, 1996. С. 354–355.

рай, рамай. Побач з традыцыйнымі абразамі на дрэве з'яўляюцца помнікі, напісаныя алейнымі фарбамі на палатне. Візітатары храмаў адзначалі абразы розных стыляў: візантыйскага, італьянскага; і рознага пісьма: мясцовага, грэчаскага, маскоўскага, акадэмічнага.

Будучы цэнтрам духоўнага жыцця сваёй парафіі, кожны ўніяцкі храм з'яўляўся месцам канцэнтрацыі і захавання твораў сакральнага мастацтва. Знакамітыя абразы ў багатых манастырах і буйных гарадскіх храмах упрыгожваліся чаканымі абкладамі з каштоўных металаў і больш сціплай пазалочанай латуні, якія асабліва распаўсюдзіліся на поўдні і захадзе Беларусі ў XVIII ст. Беларускія майстры мелі вялікую схільнасць да сінтэзу мастацтваў. Асаблівая павага аказвалася іконам, якім прыпісвалася цудадзейная сіла.

## Іканаграфічны рэпертуар уніяцкага жывапісу

Жывапіс Грэка-Каталіцкай Царквы прадстаўлены багатым іканаграфічным рэпертуарам. Найбольш тыповыя для ўніяцкага жывапісу – вобразы Багародзіцы, Ісуса Хрыста, Апосталаў, Прарокаў, Прайцоў, сюжэты царкоўных святаў.

Асноўную групу алтарных твораў уніяцкіх цэркваў складаюць разнастайныя абразы Божай Маці. Вялікая колькасць марыйных выяў спісаны з еўрапейскіх Мадоннаў. Шанаваліся Божая Маці Чанстахоўская, Жыровіцкая, Бялыніцкая, Будслаўская, Барунская, Мінская, Пачаеўская, Навагрудская (замкавая) і інш. Ва ўніяцкіх храмах было шмат спісаў з гэтых цудадзейных абразоў. Вядомы твор "Божая Маці

Бялыніцкая” сярэдзіны XVII ст. з’яўляецца адным з даволі ранніх узораў грэка-каталіцкага алтарнага мастацтва (зараз захоўваецца ў Музеі старажытнабеларускай культуры). Шырока былі прадстаўлены алегарычныя выявы Дзевы Марыі: Каранаванне Божай Маці, Апека Божай Маці. Адной з пашыраных выяў багародзічнай іканаграфіі з’яўляецца “Божая Маці Смуткуючая”[160].

Іканаграфія Хрыста ва ўніяцкім жывапісе прадстаўляе яго ў вобразе Збавіцеля. З сюжэтных кампазіцый, якія адпавядаюць пэўным эпізодам з гісторыі хрысціянства, – найчасцей Дабравесце, Нараджэнне Хрыстова,Ператварэнне (Праабражэнне), Узнясенне, Укрыжаванне, Успенне, Узвядзенне Святога Крыжа, Уваскрасенне. Асабліва пашыраны сюжэт для ўніяцкіх алтароў – Укрыжаванне[161].

Адным з найбольш пашыраных сюжэтаў уніяцкага жывапісу з’яўляецца Тройца Новазапаветная.

Побач з гістарычна складзенымі тыпамі Хрыста, Святой Тройцы, Маці Божай уніяцкія храмы ўкамплектоўваліся іконамі-партрэтамі святых. Выявы святых былі папулярнымі ва ўніяцкім жывапісе. Былі пашыраны выявы агульнахрысціянскіх святых: Св. Пятра і Паўла, Св. Васіля Вялікага, Св. Ануфрыя Пустэльніка, Св. Яна Багаслова, Св. Яна Хрысціцеля, Св. Арханёла Міхаіла, Св. Юрыя Змеяборца, Св. Варвары, Св. Параскевы). Сярод шанаваных Уніяцкай Царквой святых – тыя, што былі кананізаваныя Праваслаўнай Царквой (Св. Мікалай, Св. Барыс і Глеб, Св. Антоній Пячэрскі і інш.); мясцовыя праваслаўныя (Ефрасіння Полацкая); каталіцкія святыя (Св. Антоній Падуан-

[160] Флікоп-Світа Г. А. Іканастасы і алтары грэка-каталіцкіх храмаў Беларусі XVII – першай трэці XIX ст. Мінск, 2021. С. 243–250.
[161] Тамсама. С. 257–258.

скі, Св. Францішак Асізскі, Св. Францішак Ксаверый, Св. Ігнацій, Св. Казімір, Св. Ян Непамук), уніяцкія святыя (Язафат Кунцэвіч). Да ліку найбольш шанаваных святых жанчын у Грэка-Каталіцтве належыць Св. Параскева, у гонар якой было асвечана шмат храмаў[162].

Вобразам уніяцкага жывапісу, як і традыцыйнаму сакральнаму мастацтву Беларусі ў цэлым, уласцівыя веліч, адухоўленасць, кранальная чалавечнасць, мяккасць, дабрыня, унутраная прасветленасць. Цікавасць жывапісцаў да распрацоўкі характараў і перадачы псіхалогіі вяла да таго, што іканапіс набываў рысы партрэтнага жанру[163].

## Мастакі, якія распісвалі ўніяцкія храмы і малявалі для іх абразы

У XVII–XVIII ст. існавалі ***іканапісныя школы і майстэрні ў Брэсце, Віцебску, Гродна, Мінску, Магілёве, Гомелі і інш***. У Жыровіцах у XVII ст. працавала жывапісная майстэрня. У XVIII ст. тут дзейнічала школа выяўленчага мастацтва, у якой навучалі разьбе па дрэву, іканапісу, роспісу храма. Яе кіраўнікам быў Міхаіл Клімовіч. Вядомы і некаторыя з яго вучняў: Іван, Міхаіл, Баян, Георгій[164].

Сярод мастакоў, якія распісвалі ўніяцкія храмы і малявалі для іх абразы, вядомы Вікенцій (у 1635–1645 г. працаваў у Супраслі), маляр Міхальскі (у 1727 г. за 300 злотых пазалаціў алтар Барунскай царквы),

[162] Флікоп-Світа Г. А. Іканастасы і алтары грэка-каталіцкіх храмаў Беларусі XVII – першай трэці XIX ст. Мінск, 2021. С. 250–251.

[163] Іканапіс Заходняга Палесся XVI–XIX стст. Мінск. 2002. С. 5–6, 168, 174, 273, 280.

[164] Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. Т. 2: Другая палова XVI – канец XVIII стагоддзя. Мінск, 1988. С. 134.

Шымон Урублеўскі (у 1737 г. залаціў вялікі алтар і скульптуру ў Барунах), Алімпій Сідаровіч (у 1784 г. афармляў алтар у Барунах), Шаталовіч (у 1772 г. размаляваў Крыжаўзвіжанскую царкву ў Жыровіцах) і інш., жыровіцкі майстар Нікадзім Прачыцкі (Пранчыцкі) (у 1750 г. напісаў ікону "Цуд Юр'я")[165].

Мітрапаліт Цыпрыян Жахоўскі апекаваў мастацкі род Тарасевічаў, што дало імпульс для з'яўлення шматлікіх каштоўных прац абодвух гравёраў: Аляксандра і Лявона. Сам Жахоўскі быў двойчы партрэтаваны Аляксандрам. З уніяцкім акружэннем былі звязаны і іншыя творы гэтага мастака: два адбіткі Маці Божай Холмскай, партрэт заступніка Уніі Язафата Бражыца[166].

Вядомы базыльянскі жывапісец другой паловы XVIII ст. Антон Грушэцкі, які ў 1760-я г. стаў прафесарам Кракаўскай акадэміі. Ён двойчы адбыў навіцыят у Супраслі, у 1778 г. прэтэндаваў на пасаду настаяцеля гэтага манастыра, у 1798 г. там жа памёр. Ён аздабляў палац Тызенгаўза ў Гродна, пісаў абразы для каралеўскай галерэі, супрацоўнічаў з Супрасльскай друкарняй, ствараў алтарныя карціны[167].

Для напісання абразоў для новага іканастаса царквы вёскі Журавічы (цяпер Рагачоўскі раён Магі-

---

[165] Тэмперны жывапіс Беларусі канца XV–XVIII стагоддзяў у зборы Дзяржаўнага мастацкага музея БССР: Каталог. Мінск, 1986. С. 188, 191, 193, 194, 195; Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. Т. 2: Другая палова XVI – канец XVIII стагоддзя. Мінск, 1988. С. 134.

[166] Cubrzyńska-Leonarczyk M. Oficyna supraska. 1695–1803: Dzieje i publikacje unickiej drukarni ojców bazylianów. Warszawa, 1993. S. 16.

[167] Cubrzyńska-Leonarczyk M. Oficyna supraska. 1695–1803: Dzieje i publikacje unickiej drukarni ojców bazylianów. Warszawa, 1993. S. 70–71; Ryszkiewicz A. Malarz Antoni Gruszecki vel Dombrowski, bazylianin z Suprasla // Rocznik Białostocki. 1967. T. VII. S. 105–132.

лёўскай вобласці) у 1779 г. быў запрошаны “майстар жывапіснага мастацтва”, выхадзец з Расіі Рыгор Мядзведзкі[168].

Быў завалены царкоўнымі заказамі знакаміты мастак першай паловы XIX ст. Валенцій Ваньковіч, які ў 1839 г. з’ехаў за мяжу, у тым ліку каб ад іх пазбавіцца. Паходзіў з сям’і ўніяцкага святара з Улы (Лепельскі павет) Іван Хруцкі, які ў 1838 г. напісаў партрэт апошняга ўніяцкага мітрапаліта Язафата Булгака[169].

***Такім чынам***, у выніку амаль 250-гадовай дзейнасці Уніяцкай Царквы быў створаны магутны пласт нацыянальнай культуры ў выглядзе сакральнага жывапісу. Беларуская жывапісная спадчына XVII–XVIII ст. складаецца пераважна з уніяцкіх абразоў. Уніяцкі іканапіс пазбаўлены застыласці і дагматызму – яму ўласцівыя кампазіцыйная і стылістычная рухомасць, мабільнасць. У сярэдіне XVII ст. ён знайшоў свой стыль ў кампрамісе ўсходняга і заходняга мастацтва. Пастулова ішло нарастанне сакральнага дэмакратызму. Уніяцкі абраз – яркая з’ява беларускай школы іканапісу. Ён надзіва адухоўлены, глыбока гуманістычны і чалавечны, непаўторны па зместу і вобразна-эмацыйнаму ладу. Яго вобразам уласцівыя не столькі духоўная сіла і стойкасць, колькі мяккасць, дабрыня і ўнутраная прасветленасць.

[168] Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (Санкт-Пецярбург). Ф. 823, воп. 2, спр. 2292, арк.1–3.

[169] Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. Т. 2: Другая палова XVI – канец XVIII стагоддзя. Мінск, 1988. С. 73, 76, 80.



# Скульптурная спадчына

- *Пластыка ў арганізацыі храмавага інтэр’ера*
- *“Высокае барока” ў скульптуры*
- *Уніяцкая скульптура “нізавога барока”*



*Укрыжаванне, XIX ст. (грэка-каталіцкая традыцыя). Дрэва (дуб, ліпа), фарба. Разьба*

## Пластыка ў арганізацыі храмавага інтэр'ера

Засвойваючы еўрапейскую мастацкую культуру, Уніяцкая Царква ўзяла ў свой арсенал скульптуру і спрыяла развіццю і ўзбагачэнню гэтай галіны мастацтва Беларусі новымі рысамі. Скульптуры належала галоўная роля ў арганізацыі інтэр'ера ўніяцкага храма ў адрозненне ад Праваслаўнай Царквы, якая не прызнавала аб'ёмных выяў біблейскіх персанажаў, чым стрымлівала развіццё пластыкі.

Найбольш запатрабаваным матэрыялам для скульптуры былі дрэва і стук (гіпс – сумесь вапны, пяску, мармуровай крошкі і клею), радзей – камень. Сакральную скульптуру можна падзяліць на дзве групы: культавага прызначэння і мемарыяльная (надмагільная). Уяўленне пра ўклад Уніяцкай Царквы ў развіццё мастацтва пластыкі даюць яе нешматлікія ацалелыя помнікі.

Асноўная частка жывапісных і скульптурных твораў размяшчалася ў алтарах, якія ствараліся ва ўніяцкіх храмах Беларусі ўжо ў XVII ст. Алтары багата аздабляліся дэкаратыўнай разьбой, якая часта пакрывалася пазалотай. Такія архітэктурна-скульптурныя алтарныя комплексы з'яўляюцца прыкладам сінтэзу мастацтваў. Яны ўражвалі пышнасцю і хараством,

стваралі ў храме ілюзію заможнасці. Рэльефная пазалочаная разьба на калонах стварала раслінны арнамент са спіральна размешчанымі парасткамі вінаграднай лазы з гронкамі і ўкампанаванымі ў іх чалавечымі фігуркамі, фігуркамі або гарэльефнымі галоўкамі анёлаў, херувімаў наверсе калон. Багаты дэкор са скульптурнымі выявамі святых і пазалочанай разьбой па дрэву быў шырока выкарыстаны ў афармленні алтароў Праабражэнскай царквы ў вёсцы Порплішча (Докшыцкі раён), пабудаванай у 1627 г., у інтэр’ерах цэркваў у Княжыцах, Быцені і інш[170].

***Найбольш плённым для ўніяцкай скульптуры было XVIII ст.*** Яна тады нават адсунула на другі план манументальны жывапіс. Першая палова XVIII ст. – перыяд росквіту скульптуры барока. У 1730-я – 1770-я г. пануе стыль ракако. Ён выяўляецца ў мудрагелістай і ўскладнёнай ляпніне інтэр’ераў цэркваў. Вытанчаныя формы, шматлікія складкі і зломы адзення, якія развяваюцца, нібы трапечуцца на ветры, ускудлачаныя валасы, тэмпераментныя рухі, тэатральныя паставы і жэсты робяць скульптуру ракако непаўторнай. Часам ракако ў мастацтве Беларусі пераплятаецца з барока, якое трымалася да канца XVIII ст.

Уніяцкія храмы, якія ў гэты час інтэнсіўна будаваліся ў Беларусі, з’яўляліся заказчыкамі скульптуры. Таксама і старыя храмы, што пацярпелі ад пажараў і войнаў, выраблялі новыя алтары. Разьбяры, скульптары, цесляры выконвалі інтэр’еры адзінага напрамку і характару.

Найбольшае пашырэнне атрымалі Хрысталагічныя скульптуры: Укрыжаванне, “Хрыстос убічаваны”, або Хрыстос ля слупа, а таксама статуя Хрыстос На-

[170] Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. Т. 2: Другая палова XVI – канец XVIII стагоддзя. Мінск, 1988. С. 81, 181.

зарэй, якая ілюструе сюжэт з Бібліі, калі Ісуса прывялі да Понція Пілата – Ісус паўстае ў статычнай позе ў поўны рост са звязанымі вяроўкай рукамі. Акрамя разнастайных Хрысталагічных скульптур у алтарах часам асноўнае месца займалі статуі Багародзіцы або некаторых святых: Св. Яна Непамука, Св. Апосталаў Пятра і Паўла.

Беларуская храмавая скульптура развівалася ў XVIII ст. па дзвюх лініях. Адна з іх арыентавалася на заходнееўрапейскае барока. Другая лінія ўяўляла сабой “нізавое барока”, якое спалучала рысы высокага мастацтва і фальклору. Выключэнне складалі храмы Турава-Пінскай епархіі на Палессі, дзе і ў сярэдзіне XVIII ст. – першай палове XIX ст. фігуратыўных выяў наогул не было.

## “Высокае барока” ў скульптуры

З пачатку XVIII ст. і асабліва з 1730-х г. алтары ўніяцкіх храмаў ускладняюцца ў сілуэце, павялічваюцца ў памерах, насычаюцца фігурнай і архітэктурнай пластыкай, становяцца больш багатымі, жывапіснымі і ўражальнымі. Вялікія алтары і алтарныя комплексы з’яўляюцца сінтэтычным відам мастацтва, які спалучае манументальную, дэкаратыўную і архітэктурную пластыку, жывапіс, дэкаратыўную разьбу. Для іх стварэння прыцягваліся мастакі і майстры розных прафесій: архітэктары, скульптары, сталяры, разьбяры, мастакі.

Цікавы барочны інтэр’ер са скульптурнымі алтарамі быў выкананы ў Барунах. Над яго афармленнем працавалі разьбяры Фрэдэрык Квячур з Мінска, які ў 1739 г. прыбыў у Баруны; Дыянізі Ванькоўскі з Мін-

ска, Іосіф Васількоўскі з Валожына, сталяры Павел Якавіцкі і Цесількевіч, мастакі Міхальскі і Сымон Урублеўскі[171].

Вытанчанасцю, грацыёзнасцю і святочнай параднасцю вылучаліся скульптурныя выявы ў Сафійскім саборы ў Полацку, Троіцкай царкве ў вёсцы Вольна, базыльянскай царкве ў Барунах. Багаты інтэр'ер, які спалучаў пластыку, жывапіс і дэкаратыўную разьбу, мелі царква Святога Іосіфа ў віцебскім базыльянскім манастыры, Ражанская царква ў Слонімскім павеце, храмы Святой Тройцы ў Кобрыне і вёсцы Шарашова Пружанскага павета і інш.

Група майстроў-разьбяроў у сярэдзіне XVIII ст. працавала над комплексам скульптур апосталаў у царкве вёскі Нягневічы (Навагрудскі раён Гродзенскай вобласці). Адзін з іх выразаў статую евангеліста Марка. Мясцовы майстар Іосіф Астапчык у 1818 г. стварыў скульптурны ансамбль у Мікалаеўскай царкве вёскі Кажан-Гарадок (ля Лунінца), у якім па-свойму інтэрпрэтаваў узоры барока[172].

Ва Уніяцкай Царкве склаўся тып скульптурнай выявы пакутніка за веру Язафата Кунцэвіча з сякерай, уваткнутай у галаву. Такая статуя, у прыватнасці, была ў саборы Святой Сафіі ў Полацку. Менавіта каля яе, будучы ў 1705 г. у Полацку, рускі цар Пётр I распа-

[171] Рукапісны аддзел Навуковай бібліятэкі Вільнюскага ўніверсітэта. Ф. 4, спр. 25667, арк. 2; спр. 25674, арк.19; спр. 25689, арк. 1–1 адв.; Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. Т. 2: Другая палова XVI – канец XVIII стагоддзя. Мінск, 1988. С. 298; Флікоп-Світа Г. А. Іканастасы і алтары грэка-каталіцкіх храмаў Беларусі XVII – першай трэці XIX ст. Мінск, 2021. С. 53–55.

[172] Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. Т. 2: Другая палова XVI – канец XVIII стагоддзя. Мінск, 1988. С. 306–307; Лявонава А. К. Старажытная беларуская скульптура. Мінск, 1991. С. 179, 185.

чаў канфлікт з мясцовымі базыльянамі, які каштаваў ім жыцця[173].

## Уніяцкая скульптура "нізавога барока"

Другая лінія развіцця ўніяцкай скульптуры знаходзілася пад уплывам народных густаў і ўяўляла сабой "нізавое барока", якое спалучала рысы высокага мастацтва і фальклору. Другая тэндэнцыя найбольш ярка праявілася ў правінцыйных храмах, аддаленых ад буйных цэнтраў, дзе творчасць мясцовых майстроў стварыла ўласны стыль, трансфармавала традыцыйнае рэлігійнае мастацтва ў фальклорна-этнаграфічныя вобразы.

Драўляная скульптура "нізавога барока", створаная цэхавымі рамеснікамі і прафесійна непадрыхтаванымі аўтарамі – манахамі або скульптарамі-партачамі – і арыентаваная на нізы грамадства, не прэтэндавала на пышнасць, вонкавае ўражанне і эфект і вызначалася вялікай стылістычнай свабодай. Для беларускай драўлянай пластыкі мясцовага "нізавога" барока ўласцівыя адмова ад містычнай экзальтацыі на карысць здаровага аптымізму, цікавасць да ўнутранага стану персанажаў, лаканізм пластычнай мовы. Характэрнымі рысамі былі невялікія памеры скульптуры, знешне грубаватыя формы, дэфармацыя фігуры, частак цела (вялікая галава ў параўнанні з тулавам, каржакаватыя постаці, па-мужыцку вялікія кісці рук), экспрэсіўныя выразы твару з яркай праявай пачуццяў

[173] Полацкія пакутнікі: Збор дакумантаў / Укладаньне й апрацоўка М. Баўтовіча. Полацак, 2000. 86 с.; Марозава С. В., Марозаў С. П. Полацкая трагедыя 1705–1710 гадоў // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы IV Міжнароднай навуковай канферэнцыі; Полацк, 23–24 кастрычніка 2002 г. Полацк, 2003. С. 174–181.

і настрояў (стомлены, задуменны, заклапочаны), простанародны тыпаж з канкрэтнымі зямнымі рысамі.

У XVIII ст. у народна-прымітыўнай скульптуры вымалёўваюцца асобныя тэмы, сюжэты (“Распяцце”, “Хрыстос ля слупа”), найбольш папулярныя святыя (Юрый, Пётр, Павел, Марк, Ян Непамук). Асабліва экспрэсіўнымі ў народных майстроў атрымліваліся шматлікія выявы Хрыста – смуткуючага, прывязанага да слупа, закатаванага.

Дэмакратычныя тэндэнцыі яшчэ больш яскрава прасочваліся ў статуях, якія ўстанаўліваліся на могілках, у капліцах, пры дарогах. Мноства капліц, крыжоў і статуй уражвала прыезжых у Беларусь расіян у сярэдзіне XIX ст. Паказваючы хрысціянскіх святых у абліччы, падобным і зразумелым для сябе, народныя майстры па сутнасці дэміфалагізавалі многія вобразы святых, нізводзячы іх да зямных сімвалаў сацыяльных пакутаў народа[174].

Скасаванне ў 1839 г. Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 г. і ліквідацыя Уніяцкай Царквы прывялі да рэзкага зніжэння попыту на драўляную пластыку і да знішчэння многіх твораў уніяцкай сакральнай скульптуры.

***Такім чынам,*** спектр творчасці мясцовых скульптараў і разьбяроў у XVIII ст. быў вельмі шырокі – ад выдатных і высокапрафесійных твораў да твораў, блізкіх народнаму мастацтву. З уніяцкім мастацтвам звязана інтэнсіўнае развіццё скульптуры “нізавога барока”.

---

[174] Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. Т. 2: Другая палова XVI – канец XVIII стагоддзя. Мінск, 1988. С. 195.

# ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНАЯ СПАДЧЫНА



Інтэр'ер Сафійскага сабора ў Полацку, 1738–1750 г. Сучасны выгляд

- *Храм як месца канцэнтрацыі твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва*
- *Вырабы людвісарства. Званы*
- *Творы ювелірнага мастацтва. Абклады кніг і абразоў*
- *"Беларуская рэзь"*
- *Іканастасы*

## Храм як месца канцэнтрацыі твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва

***Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва*** (ад лац. deco – упрыгожваю) – гэта творчасць па стварэнні па-мастацку аформленых рэчаў практычнага, утылітарнага прызначэння (ювелірныя вырабы, дробная скульптура, мэбля, посуд, мастацкае шкло, дэкаратыўныя тканіны, адзенне і інш.). Важным напрамкам развіцця дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі ў XII – першай палове XIX ст. быў выраб прадметаў культавага прызначэння і для афармлення інтэр'ера храмаў. У храмах знаходзілася шмат такіх твораў: прадметы мастацкага ткацтва (плашчаніцы, харугвы, паясы, дываны, пакрывалы, ручнікі), ювелірныя вырабы (крыжы, келіхі, манстранцыі (манстрацыі), прывескі для абразоў і інш.), чаканка (абклады (шаты) абразоў і кніг), ліццё па металу (падсвечнікі) і інш. Звычайным атрыбутам храма быў звон. Гэтыя рэчы выраблялі з розных матэрыялаў (метал, камень, кераміка, драўніна, шкло, косць, тэкстыль) і ў разнастайных тэхніках выканання (ліццё, чаканка, коўка, разьба, інкрустацыя, роспіс, ткацтва, пляценне, вышыўка і г.д.).

Творцамі прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва былі майстры-рамеснікі. Сярод іх вылуча-

юцца тыя, хто працаваў на патрэбы княжых двароў, цэркваў і манастыроў, на горад і рынак. Работа старажытных рамеснікаў вызначалася ўніверсальнасцю. Ім былі даступныя не толькі разнастайныя спосабы і тэхнікі апрацоўкі матэрыялаў, але здольнасць часам аб'яднаць у адной асобе ювеліра, скульптара, гравёра, разьбяра, каваля з паспяховым валоданнем прыёмамі іх працы. На змест, форму, дэкор і тэхналогію вырабаў уплывалі патрабаванні заказчыкаў.

## Вырабы людвісарства. Званы

Вялікую частку твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва складаюць ***вырабы з металу.*** У рабоце выкарыстоўваліся розныя металы і сплавы: мясцовай вытворчасці, як жалеза, і прывазныя – медзь, бронза, волава, латунь, свінец, срэбра, золата. Іх апрацоўкай займаліся майстры розных прафесій: кавалі, зброй-нікі, канвісары (спецыялісты па апрацоўцы волава), людвісары (майстры адліўкі вырабаў з бронзы: званоў, гармат; а таксама дробных бытавых і царкоўных вырабаў: ліхтароў, падсвечнікаў, крыжоў і г.д.), ювеліры.

На XVI–XVII ст. у Вялікім Княстве Літоўскім прыпадае росквіт ***людвісарства*** – рамеснай вытворчасці, звязанай з адліўкай і апрацоўкай прадметаў з бронзы, медзі, латуні – званоў (звонаціцейная справа), гармат, скульптур, прадметаў побыту. У XIX ст. з развіццём металургічнай вытворчасці гэта мастацтва прыйшло ў заняпад.

Неад'емнай часткай жыцця людзей былі званы. Па іх гуках вызначалі пару дня. Яны звалі ў царкву, суправаджалі багаслужэнне. Званы даносілі вяскоўцам і гараджанам урачыстасць, трывогу, хваляванні, жалобу. Іх адлівалі мясцовыя майстры з бронзы, во-

лава і медзі. Для званоў будавалі званіцы, куды падвешвалі ад аднаго да пяці званоў розных памераў, строяў і назваў. Да званоў ставіліся паважліва, часам ім надавалі імёны.

Патрэба ў званах не абмяжоўвалася культавай сферай. Іх размяшчалі на гарадскіх ратушах, уязных брамах, замкавых і фальваркавых званіцах. Яны адыгрывалі важную грамадска-бытавую ролю: паведамлялі аб падзеях, здарэннях, выконвалі абрадавыя функцыі (ахоўныя, пахавальныя, вясельныя звоны) і функцыі засцерагальныя (мяцельныя, асадныя звоны), шырока выкарыстоўваліся ў судовых і навучальных установах, у побыце (дзвярныя і пакаёвыя званы). Акрамя гэтага яны мелі і сацыяльнае значэнне, будучы важнай часткай урачыстасцяў пры сустрэчы пераможцаў, ганаровых асоб, высокіх царкоўных іерархаў.

Урэшце званы былі важным аб’ектам ахвяраванняў, фундацый. Таму на многіх званах змяшчалі тэксты (завяшчанні, эпітафіі), дату стварэння, прозвішча аўтара, а некаторым надавалі нават уласнае імя. Вядома аб існаванні звоналіцейных майстэрань у Жыровіцкім базыльянскім манастыры, а таксама ў гарадах Нясвіжы, Крычаве, Полацку, Віцебску, Лагойску, Дзісне, Слуцку.

## Творы ювелірнага мастацтва. Абклады кніг і абразоў

Найбольш запатрабаваным, а таму і распаўсюджаным відам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з’яўлялася ***ювелірная справа, або злотніцтва*** – выраб рэчаў з каштоўных металаў. Асартымент вырабаў быў вельмі багаты: ад царкоўнага начыння да ўпры-

гожванняў уласнага ўжытку. Вялікую долю складалі прадметы культавага прызначэння: разнастайныя літургічныя прадметы і посуд (алтарныя крыжы, даразахавальніцы, манстранцыі (манстрацыі), даранасіцы, кадзілы, дыскасы, пацiры), абклады абразоў і кніг.

Прыёмы работы ювеліраў былі разнастайнымі і складанымі. Загатоўкі, асобныя часткі вырабаў кавалі або адлівалі ў формы. Затым наступала чарга іх дэкаравання. У іх аздобе прымяняліся розныя тэхнікі: чаканка, гравіроўка, насечка, чарненне, зярненне, залачэнне, цісненне. Былі вядомыя і такія складаныя тэхналогіі, як філігрань і эмаліраванне.

Творам ювелірнага мастацтва з’яўляецца абклад – дэкаратыўная аздоба абразоў і пераплёту рукапісных і друкаваных кніг. Вядомы раскошныя абклады кніг з выкарыстаннем металічных дэталяў з золата або срэбра, каштоўных камянёў у дадатак да звычайных пераплётных матэрыялаў для вокладак (скура, аксаміт ці іншая тканіна). Абклад для ікон найчасцей рабілі з пазалочанай медзі або срэбра, арнаментавалі чаканкай, філігранню, чарненнем, эмалямі, упрыгожвалі каштоўнымі камянямі.

На тэрыторыі Беларусі найбольшае пашырэнне абклад ікон атрымаў у XVII–XIX ст. Значнымі мастацкімі цэнтрамі, дзе ствараліся абклады, былі Вільня, Магілёў, Мінск, Пінск, Слуцк і інш. У XVII ст. абкладам найчасцей аздаблялі шанаваныя ці цудатворныя хрысціянскія абразы: “Маці Божай Жыровіцкай”, “Маці Божай Будслаўскай”, “Маці Божай Брэсцкай”, “Маці Божай Мінскай”, “Маці Божай Лагішынскай”, “Маці Божай Кангрэгацкай” (з Гродна) і інш. Абклады многіх абразоў, асабліва тых, якія лічыліся цудадзейнымі, у розныя часы дапаўняліся дадатковымі элементамі: каронай, німбам, зоркамі, накладкамі на рамы

(ланцужкі, пярсцёнкі, пацеркі, фігурныя плакеткі з гравіраванымі выявамі). Аздабленне ў 1730 г. базыльянамі іконы Жыровіцкай Божай Маці прысланымі з Рыма залатымі каронамі з каштоўнымі камянямі, (каранацыя іконы) праходзіла як маштабнае дзяржаўнае і царкоўнае свята Вялікага Княства Літоўскага *(гл.: Жывапісная спадчына. Традыцыя шанавання старажытных праваслаўных святынь).*

Найбольш вядомымі з'яўляюцца срэбныя і пазалочаныя абклады да абразоў "Маці Божая Адзігітрыя" з касцёла ў вёсцы Будслаў (мяжа XVI–XVII ст.), "Маці Божая Вастрабрамская" (Вільня, XVII ст.) "Маці Божая Адзігітрыя" (вёска Бездзеж Драгічынскага раёна, другая палова XVII ст.), "Маці Божая Бялыніцкая" (XVIII ст.), "Маці Божая Адзігітрыя Смаленская" (Дзісна, XVIII ст.), "Пакланенне вешчуноў" (Дрысвяты, XVIII ст.) і інш.

Пералічаныя тут у якасці прыкладаў вядомыя абразы адносяцца пераважна да рыма-каталіцкай спадчыны, некаторыя – да праваслаўнай спадчыны. Абразы ў металічных шатах былі фактычна ў кожнай уніяцкай бажніцы. Захавалася іх, на жаль, не так шмат.

## "Беларуская рэзь"

У Беларусі, багатай лесам, дрэва ўжывалася для ўзвядзення жылля і абсталявання інтэр'ера, з яго майстравалі транспартныя сродкі і прылады працы, выраблялі прадметы побыту і культу, посуд. Такі шырокі дыяпазон вырабаў з гэтага даступнага і ўніверсальнага матэрыялу выклікаў шырокую разнастайнасць яго апрацоўкі. Дрэва секлі, пілавалі, свідравалі, стругалі, дзяўблі, тачылі, абпальвалі, таніравалі, рас-

пісвалі, фарбавалі, паліравалі, лакіравалі; вырабы ўпрыгожвалі разьбой, роспісам, выпальваннем, інкрустацыяй.

Найбольш складаны від апрацоўкі драўніны – аб'ёмная разьба. Яшчэ яе называюць скульптурнай. Для разьбы выбіралі цвёрдае дрэва: дуб, бук, кедр, піхту. Да XV–XVI ст. манументальна-дэкаратыўная разьба была нескладаная – кампазіцыі часта ствараліся простым малюнкам: геаметрычныя фігуры, лісце раслін, малюнкі звяроў і птушак. З XVII ст. на першае месца выходзіць высокарэльефная, скульптурная, ажурная разьба. У высокарэльефнай разьбе малюнак выпрацоўваецца як бы аддалена ад агульнага фону – выпуклая частка выявы ўзвышаецца над плоскасцю. У гэтым выглядзе практычна няма плоскіх паверхняў. Рэльефная разьба – гэта працаёмкі від разьбы, які патрабуе вялікага вопыту і ўмення.

XVII ст. лічыцца перыядам росквіту мастацкай апрацоўкі дрэва, асабліва разнастайных відаў разьбы. Ёй упрыгожвалі інтэр'еры культавых пабудоў (іканастасы, алтары); яна стала неад'емнай часткай аздобы свецкіх будынкаў, жылля (пакрывала сценавыя панэлі, мэблю, дзверы і столі). Шырокаму распаўсюджанню пышнай накладной і скразной разьбы па дрэве ў аздобе інтэр'ераў садзейнічалі стыль барока, а таксама палітыка Каталіцкай і Уніяцкай Цэркваў, накіраваная на стварэнне выразнага і па-мастацку дзейснага асяроддзя храма.

Беларускія майстры рэльефнай разьбы стваралі сапраўдныя шэдэўры. Пад іх разцом бервяно пераўтваралася ў пышны раслінны арнамент з выявамі гронак, жывёл, птушак і людзей. Аб'ёмная залачоная разьба іканастасаў часам нагадвала карункавы ўзор. "Беларуская рэзь" прынесла інтэр'еру царквы аб'ём ды стала, па сутнасці, малой скульптурай раслінных формаў.

Калі сонечныя промні скрозь вокны храма падалі на пазалочаную сусальным золатам паверхню разьбы, здавалася, што плёскаецца агонь.

Вывезеныя падчас вайны 1654–1667 г. беларускія майстры і ў Маскву прынеслі аб'ёмную, ажурную, высокарэльефную рэзь і з XVII ст. аздаблялі ёй храмы і палацы Рускай дзяржавы. Іх творчасць аказала вялікі ўплыў на рускае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

Майстэрства беларускай рэзі дасягнула росквіту на мяжы XVII–XVIII ст. і захоўвалася да пачатку XIX ст.

## Іканастасы, алтары

***Іканастас*** – гэта агароджа, якая аддзяляе алтарную частку храма ад малітоўнай залы. Іканастас складаецца з аднаго ці некалькіх ярусаў абразоў, размешчаных у вызначанай паслядоўнасці на гарызантальных бэльках – цяблах. Іканастасны чын (ярус, рад) – гарызантальны шэраг абразоў, сфарміраваны з выяў пэўных сюжэтаў, аб'яднаных агульнай ідэяй.

У цэнтры іканастаса знаходзяцца двухстворкавыя дзверы – ***Царская брама.*** Падчас літургіі праз Царскую браму ў галоўны алтар увaходзў святар і выносіў адтуль да вернікаў Святыя Дары. Гэтыя сакральныя дзверы – найбольш выразны з пункту гледжання эстэтыкі элемент іканастаса. Іканастас уяўляе сабой сінтэз мастацтваў, спалучае разьбу па дрэву і жывапіс. Высокамастацкія Царскія вароты былі ў Шарашоўскай царкве на Брэстчыне (па інвентару 1809 г.)[175], гродзенскай Барыса-Глебскай і іншых цэрквах.

---

[175] Рукапісны аддзел Нацыянальнай бібліятэкі Польшчы (Варшава). Спр. 7828, арк. 59 адв.

У Беларусі іканастас вядомы з XV ст. Яны існавалі ў праваслаўных і ўніяцкіх храмах. Эпохай росквіту беларускага іканастаса сталі XVII–XVIII ст. Эстэтыка барока прывяла да змены аблічча іканастаса. Пад уплывам новых тэндэнцый свайго часу іканастасы эвалюцыянавалі ад суцэльнай сцяны, складзенай з абразоў, да архітэктурнага твора. З 1630-х – 1640-х г. іканастасы ўскладняюцца ў сілуэце, узбагачаюцца дэкорам. Тут выкарыстоўваюцца калоны, пілястры, разьбяныя дэталі, пазалота. Ужо ў сярэдзіне XVII ст. іканастас уяўляў сабой архітэктурны твор малых форм са складанай структурай, мноствам элементаў і дэкаратыўнага аздаблення. Найбольш распаўсюджанымі былі адна- і двух’ярусныя іканастасы з мясцовым і апостальскім радамі, трох’ярусныя – з мясцовым, апостальскім і прарочым радамі. Высокія іканастасы былі раскошай, даступнай толькі багатым прыходам. Чатырох-, пяці-, шасціярусныя іканастасы сустракаюцца рэдка. Поўным лічыўся іканастас у тры чыны: мясцовы, апостальскі, прарочы.

Выраб іканастаса, яго шматлікіх разьбяных дэталей, царскай брамы, абразоў – рэч даволі дарагая і працаёмкая. Над імі працавалі выдатныя прафесіяналы, магчыма, нават лепшыя ў свой час майстры. Аб’ёмная скразная і накладная разьба іканастасаў вызначала мастацкае аблічча большасці ўніяцкіх храмаў на тэрыторыі Беларусі. У той жа час у прыходскіх цэрквах адначасова з высокамастацкімі творамі існавалі зусім сціплыя сакральныя аб’екты. Усё залежала ад заможнасці прыхода або фундатараў.

На працягу XVII–XVIII ст. ва Уніяцкай Царкве, з аднаго боку, працягвалі развівацца рэлігійныя практыкі на падмурку, закладзеным яшчэ ў даўній-

ны перыяд. З іншага боку, паступова пачалі праяўляцца працэсы лацінізацыі, якія прывялі да выпрацоўкі тых адметнасцей, што мелі месца толькі ва Уніяцкай Царкве. Станаўленне новай канфесіі, фарміраванне яе адметных рысаў у значнай ступені праявілася і ў афармленні ўнутранай прасторы ўніяцкіх храмаў. Унія праз візуальныя формы і пэўныя маркёры (іканастасы і алтары) імкнулася выпрацаваць і засведчыць сваю адметнасць[176].

***Эвалюцыя ўнутранай прасторы храмаў*** адбывалася пад уздзеяннем цэлага шэрагу прычын: тэмпы фарміравання ўніяцкіх епархій (позняе ўтварэнне епархій, дзе працягвалі масава існаваць праваслаўныя прыходы; павольны, не актыўны перавод храмаў ва Унію абумовілі захаванне доўгі час усходняга прынцыпу ўладкавання аблічча сакральнага інтэр'ера); геаграфічны фактар (адносная ізаляванасць цэркваў Палесся з-за непраходных балот стрымлівала працэсы лацінізацыі); свядомая дзейнасць святароў па захаванні рэлігійнай ідэнтычнасці ў памежных з Польшчай заходніх рэгіёнах і – аб'ектыўна – імкненне да выпрацоўкі адметных рысаў Уніі; эканамічна-побытавыя фактары (адсутнасць у царквы сродкаў для ўсталявання іканастаса, выраб якога быў справай даволі дарагой і працаёмкай; адсутнасць у мясцовасці майстроў – сталяроў і іканапісцаў; адсутнасць строгіх патрабаванняў да аздаблення ўнутранай царкоўнай прасторы; уплыў фундатараў і калятараў-каталікаў, якія ахвяравалі бакавыя алтары (найчасцей у гонар свайго нябеснага патрона)[177].

[176] Флікоп-Світа Г. А. Іканастасы і алтары грэка-каталіцкіх храмаў Беларусі XVII – першай трэці XIX ст. Мінск, 2021. С. 7.
[177] Тамсама. С. 299–300.

У XVIII ст. Уніяцкая Царква адмаўлялася ад праваслаўна-візантыйскай традыцыі ўстаноўкі іканастасаў. Яны былі заменены алтарамі на ўзор каталіцкіх. Практыка ўсталявання прысценных алтароў запазычана з Рымска-Каталіцкай Царквы.

***Прысценныя алтары*** сталі з'яўляцца ва ўніяцкіх храмах у другой палове XVII ст. Яны маглі размяшчацца паабапал галоўнага алтара або ў малітоўнай зале ў яе розных месцах – па перыметры сцен, ля слупоў храма. З часам практыка іх усталявання стала амаль усеахопнай. Сцяна, да якой прыстаўляўся алтар, упрыгожвалася жывапісам, скульптурай. Алтар уяўляў сабой архітэктурны твор, якому ў эпоху барока былі ўласцівыя пышнасць і мастацкая выразнасць. Гэта маглі быць драўляныя ці мураваныя алтары з самай разнастайнай аздобай: ад даволі сціплых да мудрагелістых і складаных канструкцый з калонамі, пілястрамі, антаблементам, разьбой, скульптурай і жывапісам. Алтары выконваліся пераважна ў стылі барока, з канца XVIII ст. у іх назіраюцца рысы класіцызму.

Для ўніяцкіх храмаў выраблялі таксама ***фератроны*** – алтарыкі для нашэння падчас працэсій. Гэта столік з усталяванай над ім рамай, у якой змяшчалася двухбаковая жывапісная выява. Іх выраб звычайна фінансавалі брацтвы. Фератроны дэкаравалі скульптурай, фігуркамі анёлаў і херувімаў, пышнай і мудрагелістай аздобай, ажурнымі завіткамі. Таксама ў цэрквах існавалі іншыя рэчы для нашэння: харугвы, крыжы, абразы. Да нашага часу ў музеях і храмах краіны захавалася каля дзясятка колішніх уніяцкіх фератронаў пераважна з захаду Беларусі. Яны былі масавай з'явай, акрамя Турава-Пінскай епархіі. На

адным баку фератрона была выява Божай Маці, а на другім – напрастольны сюжэт, найчасцей – гэта Ісус Хрыстос, Св. Мікалай, Св. Юрый Змеяборац, Св. Арханёл Міхаіл, Тройца Новазапаветная.

Стаўленне да старых звычаяў абсталявання інтэр'ера храма было розным у розных рэгіёнах Вялікага Княства Літоўскага. У Турава-Пінскай епархіі быў устойлівым і доўгі час захоўваўся ўсходні тып інтэр'ера. Тут амаль паўсюдна захоўваліся іканастасы. Іншая сітуацыя назіралася ў храмах Кіеўскай архіепархіі, дзе ўжо ў канцы XVIII ст. назіраўся лацінскі тып інтэр'ера.

У храмах заходняга тыпу свяцілішча было адкрытым – не закрывалася ад вачэй вернікаў агароджай. Пастулова пад уплывам каталіцкіх традыцый уніяцкія храмы пачынаюць пазбаўляцца ад атрыбутаў Праваслаўя, у тым ліку іканастасаў. Віма (частка храма, дзе знаходзіцца прастол) у большасці грэка-каталіцкіх цэркваў у XVIII ст. ужо была адкрытай.

Выключэннем з'яўлялася Палессе (Бабруйскі, Глускі, Рагачоўскі дэканаты), дзе і ў канцы XVIII ст. было даволі шмат храмаў з іканастасамі. Затое ў Мінскім і Навагрудскім афіцыялатах яшчэ за сто гадоў да гэтага ў цэрквах пераважаў заходні тып інтэр'ера. Прамежкавае становішча займалі Уладзіміра-Брэсцкая епархія і Полацкая архіепархія, дзе назіраўся пераважна сінтэзны тып інтэр'ера: пры значнай захаванасці іканастасаў устанаўліваліся і алтары, хоць у Полацкай архіепархіі мела месца пэўная стракатасць і неаднастайнасць і праяўляліся розныя тэндэнцыі[178].

За часы Уніі дзесьці спосаб арганізацыі сакральнага інтэр'ера змяніўся цалкам і набыў выгляд,

[178] Флікоп-Світа Г. А. Іканастасы і алтары грэка-каталіцкіх храмаў Беларусі XVII – першай трэці XIX ст. Мінск, 2021. С. 299.

уласцівы касцёлу. У 1780-я г. ідзе актыўны працэс пераабсталявання царкоўных інтэр'ераў на лацінскі лад – уніяты імкнуліся паказаць праз знешнія формы адметнасць сваёй канфесіі. Магчыма, гэтымі ж фактарамі тлумачыцца і адваротная з'ява – у памежных рэгіёнах з Польшчай значная частка храмаў мела ўсходнехрысціянскі тып інтэр'ера. Меліся таксама і цэрквы, якія фактычна да канца існавання гэтай канфесіі захоўвалі грэчаскі спосаб арганізацыі інтэр'ера, праўда, з пэўнымі запазычаннямі з каталіцкай традыцыі, такімі, напрыклад, як фератроны – пераносныя "алтарыкі", якія выкарыстоўваліся падчас працэсій. Паводле звестак Паўла Баброўскага, у 1830-я г. у 80 з 800 цэркваў Літоўскай епархіі яшчэ ўцалелі старажытныя іканастасы[179].

Аднак у значнай колькасці храмаў назіраліся не "чыстыя" тыпы інтэр'ераў: на грэчаскі ці лацінскі лад, а змешаныя, для якіх было характэрна спалучэнне іканастасаў і прысценных алтароў[180]. Значнай частцы храмаў была ўласціва адначасовая наяўнасць іканастасаў, галоўнага алтара, бакавых алтароў і фератронаў. Менавіта гэты варыянт абсталявання сведчыць пра ўзнікненне ў рэчышчы Уніі адметнай формы суіснавання грэчаскіх і лацінскіх традыцый.

Як сцвярджае мастацтвазнаўца Г. Флікоп-Світа, ***самы стары беларускі ўніяцкі драўляны іканастас захаваўся*** ва Успенскай царкве Жыровіцкага манастыра. Яго стварэнне яна датуе 1676 г., абвяргаючы існуючую версію пра стварэнне ў 1730-я г. ***Адзін з самых маладых уніяцкіх іканастасаў*** быў змай-

[179] Бобровский П. И. Подготовка реформ в русской греко-униатской церкви (1803–1827 г.). СПб., 1889. С. 72.

[180] Флікоп-Світа Г. А. Іканастасы і алтары грэка-каталіцкіх храмаў Беларусі XVII – першай трэці XIX ст. Мінск, 2021. С. 8.

страваны напярэдадні скасавання гэтай канфесіі – у царкве Св. Ганны ў г. Стоўбцы Мінскай вобласці.

Перыяд пераводу цэркваў у Праваслаўе перажылі далёка не ўсе сакральныя творы. У выніку пераабсталявання грэка-каталіцкіх цэркваў на ўсходнехрысціянскі лад самабытныя ўніяцкія інтэр'еры, якія фарміраваліся на працягу папярэдніх двух стагоддзяў, былі знішчаны, бо "*не соответствовали благолепию православного храма*". Пры падрыхтоўцы да скасавання Уніі ў 1830-я г. былі знішчаны атрыбуты "лацінства": бакавыя алтары, арганы, амвоны. Працягвалі існаваць толькі тыя атрыбуты, якія не супярэчылі правілам Праваслаўнай Царквы. Былыя прысценныя алтары былі ў лепшым выпадку перароблены пад півоты.

З канца XVIII ст. традыцыя ўсталявання іканастасаў была адноўлена, але тады яшчэ не стала паўсюднай з'явай. Масавая ўстаноўка іканастасаў пачалася ў сярэдзіне 1830-х г. Але тады ў спешцы і пад адміністрацыйным ціскам іх нарабілі "неблаговидными" і нават брыдкімі. У 1837 г. па загаду Сінода архітэктар Апалон Шчадрын распрацаваў праект "самага простага і таннага іканастаса" для бедных цэркваў, які адпавядаў правілам Грэка-Расійскай Царквы. Яго было загадана прымаць за ўзорны пры пераабсталяванні ўніяцкіх храмаў Беларусі[181]. Так што іканастас як самабытная з'ява існаваў і ў праваслаўных, і ва ўніяцкіх цэрквах Беларусі да 1840-х г. Іканастасы, створаныя па зацверджаных тыпавых праектах, пакідалі ў аздабленні толькі асобныя самабытныя дэкаратыўныя элементы.

[181] Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (Санкт-Пецярбург). Ф. 797, воп. 7, спр. 23264, арк.1–5.

Яшчэ ў канцы 1920-х г. у храмах Віцебска, Магілёва, Мсціслава, Оршы захоўваліся разьбяныя пазалочаныя іканастасы другой паловы XVII ст. Але ў пачатку 1930-х г. яны былі знішчаны савецкай уладай. У заходняй частцы Беларусі ў перыяд дзяржаўнага атэізму працэс знішчэння "прадметаў рэлігійнага культу" адбываўся ў 1960-я г. У гэты час сховішчам для твораў сакральнага мастацтва часам станавіліся музеі. ***Адзіны колішні ўніяцкі храм, у якім цяпер можна пабачыць самы пашыраны варыянт інтэр'ера, – касцёл у Барунах.***

## Царскія Брамы, выкананыя ў тэхніцы саломапляцення

З познеўніяцкім перыядам звязана развіццё яшчэ аднаго віда дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва – пляценне з саломкі. У гэтай тэхніцы, незвычайнай для вырабу царкоўнага начыння, былі выкананы Царскія Брамы – сакральныя дзверы, якія з'яўляліся галоўным, цэнтральным кампазіцыйным і дэкаратыўным акцэнтам іканастаса.

Сёння вядома пра існаванне пяці саламяных Царскіх Брам, з якіх захаваліся тры: з вёскі Вавулічы Драгічынскага раёна, вёскі Лемяшэвічы Пінскага раёна і вёскі Ляскавічы Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Усе яны паходзяць з Палесся і створаны сялянскімі майстрамі для аздаблення іканастасаў сваіх сціплых вясковых цэркваў.

У стварэнне такіх брам укладалася карпатлівая марудная і працяглая праца. Найважнейшым сродкам эмацыйнага ўздзеяння саламянай Царскай Брамы на прысутных у храме быў яе колер – колер саспелага жыта, які асацыяваўся з сапраўдным золатам і нада-

ваў саламяным карункам каштоўнасць. Такім чынам майстры свядома імітавалі пазалоту царкоўных іканастасаў і дарагога культавага начыння. Залатыя саламяныя карункі разам з устаўкамі ў плеценыя дэталі рознакаляровых тканін глядзеліся вельмі эфектна.

Гэтыя ўнікальныя творы адносяцца да лакальнай традыцыі саломапляцення, якая існавала на Палессі, і сведчаць пра яе высокі мастацкі і тэхнічны ўзровень. Яны паўсталі на аснове народных традыцый выкарыстання прыёмаў пляцення з саломкі ў аздабленні бедных сялянскіх цэркваў у глыбінным Палессі, дзе мясцовыя святары і вернікі, незалежна ад змены рэлігійных патрабаванняў, маглі спадзявацца пераважна на свае сілы, сціплыя наяўныя сродкі і ўласныя творчыя здольнасці і магчымасці.

Усе ранейшыя даследчыкі датавалі саламяныя Царскія Брамы (за выключэннем Вавуліцкай) другой паловай XVIII ст. і трактавалі як спадчыну Уніяцкай Царквы. Аднак навейшыя даследаванні прымаюць за час іх стварэння апошнія гады існавання Уніі – 1834–1836 г., калі ў рэчышчы новага курса рэлігійнай палітыкі ажыццяўлялася пераабсталяванне інтэр’ераў уніяцкіх храмаў у адпаведнасці з усходнім абарадам. Іх пераабсталяванне, вяртанне да праваслаўных традыцый у практыцы грэка-каталіцкага багаслужэння пачалося яшчэ да афіцыйнага скасавання Уніі ў Расійскай імперыі. Іканастасы тады рабілі мясцовымі намаганнямі, у сітуацыі нястачы царкоўных грошай, чым і можна патлумачыць выкарыстанне ў іх аздабленні самага таннага і даступнага матэрыялу – саломкі[182].

[182] Лабачэўская В. А. Мастацтва дзеля славы Божай: саламяныя іканастасныя вароты і царкоўна-культавыя прадметы. Мінск, 2018. С. 28–66, 87–99; Флікоп-Світа Г. А. Іканастасы і алтары грэка-каталіцкіх храмаў Беларусі XVII – першай трэці XIX ст. Мінск, 2021. С. 126–128.

Новая храналагічная атрыбуцыя робіць спрэчным аднясенне саламяных Царскіх Брам выключна да ўніяцкай традыцыі. Аднак не падлягае сумневу, што гэтыя ўнікальныя творы, што паўсталі ў пераломны перыяд зменаў на беларускіх землях улады і веры, увабралі ў сябе багаты папярэдні досвед народнай мастацкай апрацоўкі саломы, разуменне яе харастваі сялянскіх традыцый ужывання гэтага простага матэрыялу для аздаблення храмаў і стварэння разнастайных царкоўных атрыбутаў, якія існавалі на Палессі ў папярэднія часы, прынамсі, у перыяд панавання Уніі – XVII–XVIII ст[183].

Саламяныя Царскія Брамы з іканастасаў вясковых цэркваў, якія, адноўленыя рэстаўратарамі, захаваліся да нашых дзён, з'яўляюцца мастацкімі шэдэўрамі сусветнага маштабу. Яны захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі і Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі. Гэтыя сакральныя прадметы – унікальная самабытная, выключна беларуская мастацкая з'ява.

[183] Лабачэўская В. А. Мастацтва дзеля славы Божай: саламяныя іканастасныя вароты і царкоўна-культавыя прадметы. Мінск, 2018. С. 98–99.

# Музычная спадчына


ІРМОЛОЙ

*Супрасльскі Ірмалой, 1598–1601 г. Самы ранні помнік праваслаўнай і ўніяцкай музычнай культуры Вялікага Княства Літоўскага на старабеларускай мове. Першая старонка*

- *Храм як асяродак музычнага прафесіяналізму*
- *Помнікі музычнай культуры*
- *Арганная культура Царквы*

## Храм як асяродак музычнага прафесіяналізму

***Музыка*** (ад грэчаскага musike – мастацтва муз) – адно з найвялікшых мастацтваў ды істотны фактар уплыву на грамадства. Яна вельмі важная ў жыцці чалавека. І пры гэтым уплывае на яго, не выкарыстоўваючы слоў і візуальных вобразаў. Здавалася бы, просты набор гукаў здольны перанесці чалавека ў іншую рэальнасць, натхніць у руху да сваёй мэты, узняць настрой, прымусіць плакаць ці смяяцца і нават дапамагчы пераносіць боль. Гучанне музычных інструментаў выклікае спагаду, гатоўнасць да самаахвяравання, пачуццё суму або адчуванне шчасця, аб’ядноўвае слухачоў у адзіным эмацыйным парыве, робіць мацнейшымі іх пачуцці.

Музыка можа перадаваць людзям такія ідэі як свабода, прыгажосць, улада ці каханне, добра і зло; выхоўвае пачуццё нацыянальнага гонару. Песня ж вучыць народ, кліча яго да дзеяння, вядзе ў бой за свае правы, за волю.

Развіццё прафесійнага музычнага мастацтва ў Беларусі першапачаткова было звязана з рэлігійным жыццём. Музыка як моцны сродак эмацыйнага ўздзеяння на людзей з’ўлялася важным элементам

культавага абраду і храм, дзе яна гучала, станавіўся асяродкам музычнага прафесіяналізму. У Беларусі ў сілу яе геапалітычнага становішча сіуснавалі розныя канфесіі і ўсе яны – ад хрысціянства да іўдазму ды ісламу – мелі свае музычныя традыцыі і адыгралі пэўную ролю ў станаўленні музычнага мастацтва Беларусі.

Разам з хрысціянствам на беларускія землі прыйшла візантыйская і балгарская царкоўная музыка, якую прыстасавалі да мясцовых умоў. Вынікам злучэння візантыйскай і славянскай традыцый стаў ***знаменны распеў.*** Яго музычныя гукі запісваліся ў ***рукапісных нотных зборніках – ірмалоях*** (ад слова “ірмас” – завязка) з дапамогай пэўных сімвалаў – “знамёнаў”, кручкоў (адсюль і назва распеву). Знаменны распеў выконваўся невялікім саставам пеўчых, мужчынскімі тэмбрамі галасоў (звычайна – бас, барытон), ва ўнісон і без музычнага суправаджэння, у свабодным рытме і без падзелу на такты. У XV ст. на беларускіх землях фарміруецца мясцовы тып “знаменнага распеву”.

Ва ўлонні Праваслаўнай Царквы развівалася, галоўным чынам, мастацтва спеваў, паколькі вакальная музыка, у якой голас вяршэнствуе або раўнапраўны з інструментамі, была часткай набажэнства. Спачатку (прыкладна да XVI ст.) у Праваслаўнай Царкве чуліся толькі ***аднагалосныя спевы (манодыя)***. Пазней, да XVII ст., у Беларусі складваецца новы тып царкоўнай і свецкай музыкі – ***шматгалосныя харавыя спевы па партыях (партэсныя спевы, партэсы)***. Праваслаўныя партэсныя спевы не мелі інструментальнага суправаджэння ў адрозненне ад каталіцкіх і ўніяцкіх, якія выконваліся з удзелам музычных інструментаў.

Партэсныя спевы адыгралі вялікую ролю ў развіцці прафесійнага мастацтва, у фарміраванні жанраў кантаты, гімна, канта.

З XVI ст. у Беларусі развіваецца кантавая культура спеваў. ***Кант – гэта свецкая харавая бытавая песня-гімн***. Канты бяруць вытокі ад старажытных гімнаў і ўрачыстых песнапенняў паганскіх (дахрысціянскіх) часоў. Для кантаў характэрныя разнастайнасць тэматыкі, куплетная форма і трохгалосныя спевы, адсутнасць музычнага суправаджэння. ***Кант на рэлігійны сюжэт называецца "псалм" (псальм).*** Канты ствараліся звычайна ў духоўных навучальных установах. Іх аўтары – святары, прафесары, студэнты. Духоўныя канты (псалмы) фіксаваліся ў ***ранніх рукапісных зборніках – канцыяналах, багагласніках, катэхізісах***.

У канцы XIV ст. у Беларусі з'явілася ***каталіцкая музыка.*** Яна была неад'емным кампанентам лацінскага абраду і развівалася ў рэчышчы еўрапейскай музычнай традыцыі. Каталіцкая Царква спрыяла развіццю інструментальных відаў музыкі. Кожны з каталіцкіх манаскіх ордэнаў, што дзейнічалі ў Беларусі (францысканцы, дамініканцы, піяры, кармеліты, брыгіткі, езуіты і інш.), меў сваю культурную і адукацыйную "праграму", якая ўлічвала магчымасці музыкі як моцнага эмацыйнага сродку ўздзеяння на вернікаў. Музычнае афармленне каталіцкага набажэнства складалася з ***грыгарыянскага харалу*** (рэлігійныя спевы на лацінскай мове), вакальна-харавых твораў a cappella, інструментальных, у тым ліку арганных кампазіцый, рэлігійных песень. Каталіцкая Царква культывавала ў Беларусі ***арганную музыку:*** месы, рэквіемы і інш. Найбольш шырокае распаўсюджанне

сярод музычных інструментаў у касцёлах набыў арган. У XVI–XVII ст. гэты інструмент гучаў у касцёлах Берасця, Ружанаў, Пінска, Паставаў ды іншых гарадоў.

З XVI ст. адбываецца росквіт каталіцкай музычнай традыцыі ў Беларусі. Музыка стала абавязковым прадметам у навучальных каталіцкіх установах усіх узроўняў. Вядучая роля ў музычна-адукацыйнай дзейнасці належала ордэну езуітаў – самаму магутнаму сярод каталіцкіх манаскіх ордэнаў. Цэнтрам каталіцкай музыкі з'яўлялася Віленская езуіцкая акадэмія. У ёй працавалі еўрапейскія адукаваныя кампазітары і музыканты.

Значны ўплыў на фарміраванне музычна-прафесійнага мастацтва Беларусі аказаў пратэстантызм, які прыйшоў сюды ў сярэдзіне XVI ст. пад уплывам ідэй Рэфармацыі, што ахапілі значную частку мясцовай арыстакратыі. Пратэстанцкая Царква была элітарнай у Вялікім Княстве Літоўскім, але яе музычныя традыцыі былі вельмі дэмакратычныя – харал выконвалі самі прыхаджане, а не прафесійныя музыканты, як у каталіцкіх храмах.

Распаўсюджванню музычнага мастацтва Пратэстанцкай Царквы садзейнічалі друкаваныя зборнікі ***канцыяналы – першыя ў Беларусі нотадрукі***. Яны выдаваліся ў друкарнях Берасця, Нясвіжа, Вільні і іншых гарадоў ("Берасцейскі канцыянал", 1558 г.; "Нясвіжскі канцыянал", 1563 г.).

З канца XVI ст. у Беларусі фарміруецца ***ўніяцкая музычная традыцыя***, бо музыка была важным элементам культавага абраду Уніяцкай Царквы. Царква захавала старажытныя праваслаўныя пеўчыя традыцыі, якія ўзбагаціла заходнімі элементамі і ўвядзеннем у свой рытуал інструментальнай музыкі.

Музычна-літургічная практыка Уніяцкай Царквы складалася з традыцыйнай старажытнай манодыі (знаменны распеў), шматгалосных харавых кампазіцый (партэсных спеваў, ці партэсаў), інструментальнай музыкі і простых напаўфальклорных песень у выкананні вернікаў ***(“Багагласнікі”*)**.

У канцы XVII–XVIII ст. у шэрагу культавых пабудоў ***былі ўстаноўлены арганы, іх разнавіднасці (пазітыў, рэгал), заведзены іншыя струнныя, духавыя, ударныя музычныя інструменты***. Уніяцкі храм стаў свайго роду канцэртнай залай, дзе вернікі далучаліся да прафесійнай музычнай культуры. Папулярнымі былі шматгалосныя поліфанічныя гімны, арганная музыка, а таксама пакладзеныя на музыку візантыйскія літургічныя тэксты – канты. ***Найбуйнейшымі цэнтрамі ўніяцкай музыкі ў XVII і XVIII ст. былі Супрасль, Жыровіцы, Вільня.***

Прафесійных музыкантаў і спевакоў рыхтавалі навучальныя ўстановы, заснаваныя Царквой. Навука царкоўных спеваў вывучалася практычна ў кожнай пачатковай манастырскай школцы. Музыка выкладалася ў некаторых базыльянскіх школах і як спецыяльны прадмет, і як агульнаадукацыйны. Пасля засваення першапачатковага курса вучні праходзілі практыку ў царкоўных капэлах. Спецыяльная музычная бурса існавала ў Жыровіцах. Да 1831 г. арганістаў рыхтавалі ў семінарыі пры Віленскім універсітэце.

Храмы і манастыры канцэнтравалі вакол сябе музычна-выканальніцкія настаўніцкія і творчыя сілы. Пры культавых установах працавалі кампазітары, вакалісты, інструменталісты, выкладчыкі і музычныя майстры. Людзі з музычнай адукацыяй і талентам цаніліся Царквой. Найлепшыя музыканты звычайна

гуртаваліся ў вялікіх цэрквах і манастырах. Царкоўныя музыкі паходзілі з мясцовага насельніцтва – мяшчан, шляхты, сялян. Вядомы беларускія царкоўныя музыкі XVII–XVIII ст. Фёдар Семяновіч, інак Феафіл, Антоній Кішчыц і інш. Найбольшае распаўсюджанне атрымала прафесія арганіста. Кампазітар Багуслаў Згірскі напісаў музыку для школьнай драмы "Цыцэрон" (Жыровіцы, 1752 г.). Кампазітарская творчасць у XVII–XVIII ст. развівалася пад уплывам і ў рэчышчы мастацкага стылю барока.

З канца XVIII ст., пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, развіццё беларускай царкоўнай музыкі, якая захоўвала свае лакальныя асаблівасці, уключаецца ў рэчышча расійскага багаслужэбнага (літургічнага) спеву. У храмах загучалі кананічныя ўстаўныя песнапенні, зацверджаныя Сінодам.

У XIX ст. уніяцкая музычная традыцыя прайшла два этапы. Да канца 1820-х г. актуальнымі заставаліся мадэлі афармлення набажэнстваў, выпрацаваныя ў папярэднія стагоддзі. На працягу канца 1820-х – 1839 г. праводзілася актыўная кампанія па знішчэнню ўсіх уласцівых выключна ўніятам музычных традыцый: сваіх распеваў, інструментальнай, у прыватнасці, арганнай музыкі.

## Помнікі музычнай культуры

Пеўчыя традыцыі Уніяцкай Царквы адлюстроўюць ***ірмалоі*** – рукапісы і нотныя друкі XVII–XVIII ст. царкоўных гімнаў з Супрасля і Жыровіцаў.

Самы ранні помнік праваслаўнай і ўніяцкай музычнай культуры – ***Супрасльскі ірмалой,*** складзены ў 1598–1601 г. у Супрасльскім манастыры пеўчым Багданам Анісімавічам, родам з Пінска. Ён змяшчае

святочныя песнапенні царкоўнага гадавога кола, што былі ў шырокім побыце пеўчай практыкі XV–XVI ст. На працягу XVII ст. рукапіс шматразова папаўняўся, дапісваўся. Пасля таго, як Ірмалой трапіў у збор Кіева-Пячорскага манастыра, ён аказаў прыкметны ўплыў на ўкраінскую музычную праваслаўную традыцыю.

Рукапіс добра захаваўся і складаецца з 576 аркушаў (1130 старонак). Ён напісаны беларускім скорапісам, некаторыя старонкі – грэчаскай мовай. Супрасльскі ірмалой з'яўляецца найбольш ранім беларускім узорам з пяцілінейнымі еўрапейскімі нотамі. Рукапіс упрыгожаны мініяцюрамі, застаўкамі, ініцыяламі.

Адным з найбольш цікавых помнікаў беларускай прафесійнай музычнай культуры з'яўляецца рукапісны ірмалой іераманаха Тарасія, які ён пачаў пісаць у Мінску, працягваў у Вільні і завяршыў у Жыровіцах у 1643 г. Рукапіс утрымлівае арыгінальны беларускі знаменны супрасльскі распеў (мова яго – царкоўнаславянская з беларусізмамі) з яркім і самабытным меладычным матэрыялам[184].

Выдатным помнікам музычнай культуры XVII ст. з'яўляецца ***"Полацкі сшытак" (Астрамечаўскі рукапіс)*** – зборнік свецкай і царкоўнай музыкі, папулярнай у свой час на беларускіх землях. Гэта рукапіс на 64 старонках, які ўключае 210 вакальных і інструментальных твораў. Сярод іх шматгалосыя канты і псалмы на старабеларускай, царкоўнаслаўянскай і польскай мовах, сольная і ансамблевая інструментальная музыка, арганныя кампазіцыі, танцы заходнееўрапейскага, мясцовага і польскага паходжання і інш. Творы

[184] Касцюкавец Л. П. Беларускі рукапісны ірмалой // Помнікі мастацкай культуры Беларусі: Новыя даследаванні. Мінск, 1989. С. 149–154.

ўяўляюць сабой арыгінальнае спалучэнне мясцовага творчага прафесіяналізму з напаўфальклорнымі традыцыямі з італьянскімі і французскімі ўплывамі. Творы запісаны на пяці лінейках круглымі італьянскімі нотамі, якія ляглі ў аснову сучаснай нотнай граматы. Яны маглі выконвацца рознымі інструментамі.

Зборнік выйшаў з беларускага асяроддзя, хоць аўтары музыкі і песень засталіся ананімнымі. Ён быў складзены ў 1630-х – 1650-х г., хоць некаторыя творы датуюцца канцом XVI ст. Месцам стварэння рукапісу была вёска Астрамечава непадалёку ад Берасця, ва ўніяцкай царкве якой знаходзіўся гэты зборнік. Хутчэй за ўсё рукапіс належаў клавіяцымбалісту ці арганісту, які выкарыстоўваў яго ў сваёй выканальніцкай практыцы. Каля 1680 г. музычны зборнік быў пераплецены пад адной вокладкай разам з уніяцкім малітоўнікам, які выкарыстоўваўся ў Астрамечаўскай царкве[185]. У нейкі час (не раней другой чвэрці XVIII ст.) рукапіс стаў належаць полацкаму епіскапу.

У 1962 г. даследчык беларускай культуры Адам Мальдзіс знайшоў гэты ўніяцкі малітоўнік у бібліятэцы Ягелонскага ўніверсітэта ў Кракаве (Польшча), дзе ён быў пазначаны як "Астрамечаўскі". Старажытныя нотныя запісы расшыфраваў польскі музыказнаўца Ежы Голас, які вярнуў з забыцця некалькі музычных твораў. На іх аснове была створана грампласцінка, якая стала даволі вядомай. Цікавасць да яе праявілі польскія і беларускія выканаўцы і музычныя калектывы.

Першым беларускім выканаўцам твораў знакамітага зборніка ў 1980 г. стаў ансамбль старажытнай музыкі "Кантабіле", які дзеля брэндавай раскруткі прапанаваў з рэкламнымі мэтамі даць нотнаму сшытку

[185] Гісторыя беларускай кнігі. Т. 1: Нікалаеў М. В. Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага. Мінск, 2009. С. 296.

загаловак "Полацкі сшытак". Гэта ўмоўная назва замацавалася, увайшла ў абіход. У хуткім часе зборнікам зацікавіліся іншыя ансамблі. Выкананне твораў з Полацкага сшытка прынесла вялікую папулярнасць шэрагу музычных калектываў ("Кантабіле", "Харошкі", "Стары Ольса", камерны хор "Віват") і сольных артыстаў. Узоры яго старажытнай музыкі служаць крыніцай натхнення для сучасных кампазітараў.

Даследчыкі і выканаўцы высока ацэньваюць гэты музычны зборнік. Яго называюць унікальным рукапісным нотным зборнікам старадаўняй беларускай барочнай музыкі XVI–XVII ст., яркім узорам нацыянальнай кантавай культуры, феноменам беларускага музычнага мастацтва XVII ст., нацыянальнай славутасцю, *"якая акрэсліла ўваход Беларусі ў еўрапейскую культурную прастору"*. Некаторыя даследчыкі лічаць неабходным перайсці да сапраўднай назвы ўнікальнага зборніка – "Астрамечаўскі рукапіс".

Адзін з першых выканаўцаў твораў зборніка, заслужаны артыст Беларусі Віктар Скорабагатаў выказаў шкадаванне, што цудоўны велічны кант з гэтага рукапісу ў апрацоўцы беларускага кампазітара Вячаслава Кузняцова не стаў нацыянальным гімнам Рэспублікі Беларусь. Паводле слоў В. Скорабагатава, творы з рукапісу сталі своеасаблівым *"музычным генетычным кодам беларускага народа ў свеце"*, як музыка Ёгана Баха для немцаў і Антонія Вівальдзі для італьянцаў.

У XVI–XIX ст. у Беларусі і Украіне былі пашыраны рукапісныя і друкаваныя зборнікі папулярных напаўфальклорных праваслаўных і ўніяцкіх і песнапенняў – ***Багагласнікі.*** Яны прызначаліся для спявання падчас багаслужэння, хроснага ходу і дома на святы. Уключалі беларускія і ўкраінскія духоўныя псалмы і канты,

лацінскія гімны, польскія кантычкі, календы, пастаралькі і інш. У багагласніках былі песні да розных рэлігійных святаў, прысвячэнне Хрысту, некаторым дням царкоўнага календара, апосталам, пакутнікам і інш.

Існавала вялікая колькасць рукапісных багагласнікаў з рыфмаванымі тэкстамі на старабеларускай мове. Вядомы запісаныя лацінкай жыровіцкія багагласнікі XVII ст. Але яны не захаваліся ў асноўным з-за праследу Уніяцкай Царквы ў Расійскай імперыі. Найбольш ранні друкаваны багагласнік, што дайшоў да нашага часу, выдадзены ў 1790 г. у Пачаеве (Украіна) на царкоўнаславянскай, лацінскай і польскай мовах са значнай колькасцю беларусізмаў і ўкраінізмаў. Ён стаў асновай багагласнікаў XIX – пачатку XX ст., якія друкаваліся ў Пецярбургу, Кіеве, Львове, Вільні, Гродна.

***Багагласнікі*** – каштоўныя помнікі самабытнай, інтэрнацыянальнай па сваіх вытоках, народнай у аснове кантавай культуры. Сотнямі распаўсюджаныя на Беларусі ўніяцкія Багагласнікі, у аснове якіх былі старажытныя папулярныя песні, карысталіся ўвагай народа і праз дзесяцігоддзі пасля скасавання Уніі[186].

У 1799 г. Супрасльская друкарня выдала “Набожныя песні...” – збор папулярных песень, званых “кантычкамі”. Сярод іх – калядны цыкл (46 тэкстаў), песні аб Жыровіцкай Божай Маці, якія сталі народнымі песнямі[187]. У 1817 г. у Вільні былі выдадзены “Набожныя песні на ўрачыстыя святы, паводле парадку касцёла св. рымска-каталіцкага, на цэлы год сабраныя і з дазволу начальства з дадаткам новых песень пера-

---

[186] Хойнацкий А. Ф. Западнорусская церковная ўнія в ея богослуженіи и обрядах. Кіев, 1871. С. 368, 389.

[187] Cubrzyńska-Leonarczyk M. Oficyna supraska. 1695–1803: Dzieje i publikacje unickiej drukarni ojców bazylianów. Warszawa, 1993. S. 147.

друкаваныя". Сярод іх – ***"Песня аб вядомай цудамі найсвяцейшай дзеве Марыі на наваградскім абразе, які аберагаўся ксяндзамі базыльянамі"***. Гэтыя кантычкі высока ацаніў сусветна вядомы паэт Адам Міцкевіч: *"Падобна, ніводзін народ не можа пахваліцца такім зборам як кантычкі польскія… Пададзеныя ў іх пачуцці, менавіта пачуцці міласці і пашаны маці Божай да свайго сына, Бога, такія далікатныя, такія чыстыя, такія нябесныя, што тлумачыць іх прозай значыла б зневажаць святасць…"*[188].

## Арганная культура Царквы

***Арган*** – гэта клавішны духавы музычны інструмент, адзін з самых старажытных музычных інструментаў ва ўсёй гісторыі сусветнай культуры і самы вялікі у свеце. За значны памер, асаблівасці гуку і тэмбру яго ***называюць "каралём інструментаў"***. На працягу многіх стагоддзяў арган з'яўляўся асноўным (а часта і адзіным) музычным інструментам, які актыўна выкарыстоўваўся ў царкоўна-багаслужбовай практыцы амаль усіх краін Заходняй Еўропы і Паўночнай Амерыкі. Ён і сёння выкарыстоўваецца ў набажэнствах каталікаў і пратэстантаў. Самы стары дзеючы арган знаходзіцца ў Швейцарыі і датуецца першай паловай XV ст. У перыяд позняга Адраджэння (з 1530-х г. па 1590-я – 1620-я г.) і ў эпоху барока (апошняя трэць XVI ст. – амаль усё XVIII ст.). арганабудаванне ў Заходняй Еўропе набыло небывалы размах.

Дзякуючы гістарычнаму ўваходжанню беларускіх зямель у еўрапейскую культурную прастору, арганнае будаўніцтва, выканальніцтва і творчасць раз-

[188] Marjanski S. Unicka Matka Boska Nowogrodzka zamkowa na czele "Pana Tadeusza". Lwów, 1898. S. 10–11.

гортваліся тут сінхронна з аналагічнымі музычнымі працэсамі Еўропы, дзе арган быў звязаны з літургіяй. Беларусь стала самым усходнім “фарпостам” бытавання аргана ў храмавым асяроддзі. Гэты інструмент гучаў тут у каталіцкіх, пратэстанцкіх, уніяцкіх святынях – айчынная арганная культура мела поліканфесійны характар.

Станаўленне арганнай культуры Беларусі прыпадае на XVI ст. У гэты час узмацняюцца культурныя кантакты з краінамі Еўропы, пранікаюць і засвойваюцца формы мастацкага жыцця вядучых цэнтраў эпохі Адраджэння, найперш Італіі і Германіі. Беларусь на стагоддзі стала сапраўднай краінай арганаў. Велічныя “каралі інструментаў” будаваліся ў храмах, а таксама ў замках, палацах магнатаў-меламанаў і з’яўляліся атрыбутам княжацкага побыту. Яны ўзводзіліся ў гарадах, былі ледзь не ў кожнай вёсцы і мястэчку. Ужо ў XVI ст. арганы існавалі ў Берасці, Гродна, Мінску і Нясвіжы.

У XVII ст., эпоху барока, адбываецца інтэнсіфікацыя айчыннага арганабудаўніцтва, што адпавядала тэндэнцыям еўрапейскай музычнай культуры. Гэта вынік пашырэння Контррэфармацыі і актывізацыі сувязяў з Усходняй Прусіяй, найперш Кёнігсбергам (Крулеўцам) і Гданьскам (Данцыгам), адкуль запрашалі майстроў і экспартавалі большасць інструментаў. У 1611–1615 г. быў пабудаваны вялікі арган для касцёла езуітаў у Нясвіжы.

***Адным з самых буйных і лепшых арганаў Беларусі XVII ст. лічыцца інструмент Жыровіцкага базыльянскага манастыра*** на 80 рэгістраў. Ён з’явіўся ў канцы гэтага стагоддзя і стаў першым арганам сярод уніяцкіх храмаў Беларусі.

Пераход да выкарыстання музыкі ў багаслужэбнаабрадавай практыцы Уніяцкай Царквы адбыўся не адразу, хоць ужо ў 1621 г. базыльянская кангрэгацыя ў Лаўрышаве разглядала пытанне аб ужыванні музыкі і спеваў у багаслужэнні[189]. Масавае ўвядзенне арганаў у храмы адбываецца пасля Замойскага сабора 1720 г., які санкцыянаваў выкарыстанне музыкі ва ўніяцкім набажэнстве.

Ёсць сведчанне 1695 г. паплечніка брэсцкага епіскапа Льва Заленскага, што ў мітрапалічай царкве ў Вільні *"аргана няма, бо ён у нашым абрадзе не ўжываецца"*[190]. Затое ў 1777 г. адна з сучасніц, якая наведала віленскую Троіцкую царкву, была здзіўлена, калі замест чаканых спеваў пачула там арганную музыку[191]. Вільня стала цэнтрам арганнай культуры ў Вялікім Княстве Літоўскім, росквіт якога прыпадае на XVIII ст.

***XVIII ст. – "залаты век" арганнай культуры Беларусі.*** З 1730-х – 1740-х г. устаноўка арганаў у храмах розных канфесій становіцца абавязковай нормай. Арган быў не толькі неабходным удзельнікам літургічнай дзеі, але і адной з дамінантаў храмавага інтэр'ера. У гэты час фарміруецца Віленская арганабудаўнічая школа, закладзеная майстрамі з Крулеўца. Для ўзвядзення вялікіх, "амбіцыйных" інструментаў у Беларусь запрашалі вядомых арганных майстроў з-за мяжы. У вялікіх храмах у Полацку, Будславе, Бялынічах ды іншых гарадах і мястэчках усталёўва-

[189] Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. Вильна, 1900. Т. 12. С. 21.

[190] Описание документов архива западнорусских униатских митрополитов. Т. 1: 1470–1700. СПб., 1897. С. 392.

[191] Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. Вильна, 1874. Т. 10. С. 318.

юцца інструменты, упрыгожаныя скульптурай і дэкаратыўнай разьбой. Яны сталі гонарам айчыннага арганабудаўніцтва.

Унікальнай з’явай гісторыі беларускай музыкі стала арганная культура Уніяцкай Царквы. Масавае выкарыстанне арганаў у 1720–1836 г. ва ўніяцкіх храмах адбывалася ў кантэксце росквіту арганнай культуры ў Еўропе і Беларусі. Наяўнасць арганаў ва ўніяцкіх храмах характэрная толькі для тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага, Беларусі і не ўласцівая Украіне, якая пасля Люблінскай уніі ўвайшла ў склад Польскага каралеўства.

Легендарным стаў інструмент, усталяваны ў базыльянскім манастыры ў Жыровіцах. У XVIII ст. арганы ўпрыгожылі ўніяцкія храмы ў Полацку, Браславе, Барунах, Гродна, Ружанах, Супраслі.

У гарадскіх храмах будаваліся пераважна вялікія арганы, у мястэчках і вёсках – звычайна ***невялікія арганы або пераносныя арганчыкі – пазітывы***. Арган уяўляў сабой цэлае архітэктурнае збудаванне і прыўносіў у культавы інтэр’ер адчуванне ўрачыстасці і свята. Моцай і шматфарбнасцю гучання, разнастайнымі выканальніцкімі магчымасцямі ён упрыгожваў літургію, якая вабіла шмат слухачоў. Гэты музычны інструмент, нават калі маўчаў, быў эмацыйна значным.

Устаноўка аргана ў адбудаваным у 1750 г. полацкім Сафійскім саборы надала хараства інтэр’еру храма. Два арганы меў Супрасльскі манастыр: вялікі ў царкве і пазітыў у капліцы. У 1764 г. згадваецца мясцовы арганіст Касцецкі. У 1779 г. быў пабудаваны арган для мінскай царквы Св. Духа. Невялікі арганік на 7 галасоў размяшчаўся на хорах гродзенскай Барыса-Глебскай царквы. Арган граў, згодна з інвентаром 1791 г., у браслаўскай царкве. Захаваўся кан-

тракт 1794 г. барунскіх базыльян з капельмайстрам Міхаілам Хеткевічам, жыхаром мястэчка, які абавязаўся за пэўную плату грацъ на аргане імшу, гадзінкі, літуанію, акафісты; раніцай і вечарам паводле даўняга звычаю іграць на трубе, суправаджаць музыкай адкрыццё абраза Божай Маці. У 1813 г. патрабаваў рамонту стары пазітыў у царкве Дабрыгорскага манастыра. У 1822 г. на сродкі прыхаджан і дабрачынцаў быў збудаваны арган на 12 галасоў для Ражанскай царквы (Слонімскі павет)[192].

Арганістаў рыхтавала семінарыя пры Віленскай акадэміі. У першай трэці XIX ст. ***ва ўніяцкіх храмах Беларусі працавалі арганісты*** Дон Алексі (Сероцін), Вінцэнт Шаржановіч (Сялец). Арганіст Сухавіцкага касцёла Міхаіл Барысевіч *“быў у Ракаве базыльянамі навучаны ігры на аргане”*. У канцы XVIII – пачатку XIX ст. арганісты працавалі ў манастырах Пустынскім (Мсціслаўскі павет), Дабрыгорскім і Ушацкім (Лепельскі павет), Талачынскім (Капыскі павет), Беразвецкім, у мінскай Троіцкай царкве і іншых культавых установах. Вядомым спецыялістам па рамонту гэтых інструментаў быў віленскі “арганмайстар” Антон Гурыновіч[193].

Выпускныя ўрачыстасці ў Барунскай базыльянскай школе завяршаў прыгожы рытуал з адкрыццём цудадзейнага абраза, спевамі і гучаннем аргана. Усе – бацькі, настаўнікі, вучні – падалі на калені і пакорна схілялі галовы. “*Пеў хор чыстых добрых дзіцячых галасоў. Колькі сэрцаў адразу, малітваў у той час узносілася да Бога, колькі надзей усялялася ў сэрца,* – успамінае выхаванец гэтай школы Ігнат Ходзька. – *Алтар зачы-*

[192] Марозава С. В. Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1839 гг.). Гродна, 2001. С. 139–140.
[193] Тамсама. С. 141.

*няўся. Гучаў марш. Усе выходзілі з царквы і раз'язджаліся. Баруны заставаліся пустымі і глухімі"*[194].

Распаўсюджванне арганаў спрыяла развіццю прафесійнай музычнай культуры Беларусі, а ўніяцкае духавенства адыграла важную ролю ў далучэнні да яе народа. На хвалі рэфармавання ў 1830-я г. Уніяцкай Царквы з мэтай збліжэння і – у перспектыве – зліцця з Рускай Праваслаўнай Царквой пачаўся ***дэмантаж арганаў.*** Да 1837 г. толькі ў Літоўскай епархіі іх было дэмантавана 117[195].

Забарона ў XIX ст. на будаўніцтва новых і рэлігійная канверсія існуючых каталіцкіх і ўніяцкіх храмаў прывяла да крызісу арганабудаўніцтва і заняпаду створаных раней інструментаў. Тым не менш, гэта стагоддзе выявіла многіх выдатных асоб арганнага мастацтва Беларусі, сярод якіх – кампазітар Станіслаў Манюшка. У Вільні, Бялынічах і Мінску дзейнічалі тады навучальныя ўстановы, што рыхтавалі арганістаў.

У 1880-я г. у арганную культуру Беларусі пранікаюць новыя, рамантычныя тэндэнцыі – арган выходзіць за межы храма і становіцца канцэртным інструментам.

***Такім чынам,*** у XIV–XVIII ст. развіццё прафесійнай музычнай культуры Беларусі было цесна звязана і шмат у чым вызначалася спецыфікай рэлігійнага жыцця. Суіснаванне і спалучэнне розных музычна-рэлігійных плыняў стварыла музычна-канфесійны плюралізм, які надаў беларускай музычнай культуры асобае багацце і шматаблічнасць.

---

[194] Chodzko I. Boruny. Wilno, 1925. S. 53–54.

[195] Ліхач Т. У. Музыка ва ўніяцкіх храмах Беларусі пачатку XIX ст. // Весці Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. 2010. № 16. С. 56.

Уніяцкая Царква сфарміравала ўласную музычную традыцыю, узбагаціўшы старажытныя праваслаўныя пеўчыя традыцыі ўвядзеннем у свой рытуал інструментальнай музыкі, і стала важным цэнтрам развіцця прафесійнага музычнага мастацтва. Найбольш шырокае распаўсюджанне сярод музычных інструментаў атрымаў арган. Яго масавае ўвядзенне ў храмы адбываецца пасля Замойскага сабора 1720 г. Узмоцнены шляхам увядзення музыкі эстэтычны бок багаслужэння стаў “прыемнай асаблівасцю” ўніяцкай веры для беларускага народа. Абрыў гэтай традыцыі ў 1833–1839 г. не толькі нанёс удар па гэтай галіне культуры, але і балюча закрануў народныя пачуцці.




*Фрагмент партытуры “Плач прарока Ераміі” кампазітара Багуслава Згірскага, прэфекта манастыра базыльянаў у Вільні, стваральніка музыкі да спектакляў базыльянскага школьнага тэатра*

# Школьны тэатр

- *Школьная драма як элемент адукацыйнай сістэмы базыльян*
- *Інтэрмедыі*

## Школьная драма як элемент адукацыйнай сістэмы базыльян

***Тэатр*** – гэта відовішчны від мастацтва, які перадае мастацкую задуму праз сцэнічныя дзеянні акцёраў перад гледачамі і адлюстроўвае сваю эпоху. Ён уяўляе сабой сінтэз розных мастацтваў: літаратуры, музыкі, харэаграфіі, вакалу, выяўленчага мастацтва і інш.

Яскравай з'явай у гісторыі беларускага сцэнічнага мастацтва канца XVI–XVIII ст. стаў ***школьны тэатр***. Такую назву ён атрымаў, бо развіваўся выключна ў школьных сценах. Гэта былі запазычаныя з заходнееўрапейскіх узораў тэатральныя паказы, заснаваныя на п'есах, напісаных пераважна педагогамі мясцовых навучальных устаноў у пазнавальных, дыдактычных, выхаваўчых і прапагандысцкіх мэтах.

Узнікненне і распаўсюджанне школьнага тэатра на тэрыторыі Беларусі звязана найперш з дзейнасцю ордэна езуітаў. У 1570 г. яны паказалі ў Вільні першае ў Вялікім Княстве Літоўскім тэатральнае прадстаўленне сіламі вучняў. Такія прадстаўленні сталі даваць у піярскіх, дамініканскіх, базыльянскіх, праваслаўных брацкіх і нават пратэстанцкіх школах.

***Школьная драматургія*** была элементам выхаваўчай сістэмы – яна дапамагала навучэнцам лепш разумець і асвойваць вучэбныя прадметы, вучыла іх

прамоўніцкаму майстэрству, выпрацоўвала смеласць і дыкцыю, вучыла жэстыкуляцыі і мiмiцы.

Акцёрамі былі вучні, якіх навучалі сцэнічнаму мастацтву настаўнікі рыторыкі, а спектаклі давалі магчымасць прадэманстраваць свае здольнасці ў красамоўстве. Характэрнай рысай гэтых прадстаўленняў была вялікая колькасць удзельнікаў. Самі "акторы", відаць, глядзелі на сваю "творчасць" хутчэй як на частку вучэбнай праграмы, школьную прынуку, чым як на мастацкую працу.

Спачатку для школьных драм бралі сюжэты з Бібліі, жыццяў святых, легенд; пазней стала дамінаваць гістарычная і бытавая тэматыка. Спектаклі мелі рэлігійна-маралізатарскі, панегірычны характар. Яны былі заклікаць выхоўваць навучэнцаў у духу дабрадзейнасці, патрыятызму і любові да навукі. Яны ўсхвалялі высокія маральныя ўчынкі і асуджалі чалавечыя заганы. У рэпертуары пераважалі пастаноўкі на польскай і лацінскай мовах. Спектакль быў цудоўным відовішчам з музыкай, песнямі, танцамі. Спектаклі найчасцей ставіліся на царкоўныя святы ці ў дні важных палітычных падзей. Гэтыя прадстаўленні называліся містэрыямі (ад лац. misterium – таямніца, сакрамент).

Прадстаўленні адбываліся ў школьных памяшканнях або на плошчы перад храмам. Інсцэнізаваныя арацыі і дыспуты вучняў у прысутнасці сваіх бацькоў-гледачоў былі звычайнай формай экзамену ў канцы навучальнага года. Часам ладзіліся масавыя тэатралізаваныя шэсці ў гонар таго ці іншага святага і вучні, падобна сярэднявечным манахам, выступалі ў касцюмах і масках. Сцэнічнай пляцоўкай тады станавілася вуліца, што вяла да храма, а залай – яе абочыны і вокны будынкаў.

Уніяцкія шэсці і працэсіі, што выплюхваліся з храмаў на вуліцы і плошчы ў рэлігійныя святы, ператвараліся ў поўнамаштабныя тэатралізаваныя дзеі. Яны сталі часткай народнай культуры.

***У XVIII ст. існавалі два базыльянскія школьныя тэатры: у Наваградку (1761–1765) і Жыровіцах (1751–1765).*** Аўтарамі і пастаноўшчыкамі былі выкладчыкі, якія распрацоўвалі пройдзены матэрыял у драматычнай форме, выканаўцамі – вучні. Ставіліся п'есы па матывах жыццяў святых, алегорыі на антычныя тэмы – драмы, камедыі, трагікамедыі, дэкламацыі на лацінскай і польскай мовах.

## Інтэрмедыі

Каб прывабіць гледачоў да школьных драматычных пастаноў, да абавязковай часткі, выкананай на латыні ці польскай мове, сталі дадаваць ***інтэрмедыі – невялікія вясёлыя сцэнкі на бытавыя тэмы на беларускай мове, якія выконваліся паміж дзеямі і мелі сатырычную накіраванасць***. Інтэрмедыі на ўніяцкай школьнай сцэне засноўваліся на мясцовым рэпертуары і адлюстроўвалі думкі і настроі простых людзей, абуджалі ў народзе пачуццё чалавечай годнасці і нацыянальнай свядомасці. Іх аўтарамі былі самі школьнікі, блізкія да свайго сацыяльнага асяроддзя, якія добра ведалі народныя звычаі і абрады, у дасканаласці валодалі вобразнай гутарковай мовай.

Тут ужо дзеючымі асобамі былі не богі, каралі, святыя ці антычныя героі. У большасці інтэрмедый цэнтральнымі персанажамі з'яўляліся выхадцы з простага народа: сяляне, карчмары, папы і ксяндзы, адстаўныя салдаты, цыганы, яўрэі, рамеснікі. Асабліва прывабным падаваўся ў інтэрмедыях вобраз белару-

скага селяніна, чалавека разважлівага і дасціпнага, здольнага знайсці выйсце з любой сітуацыі. Хаця ў некаторых беларуска-польскіх інтэрмедыях ён быў прадстаўлены ў карыкатурным выглядзе, паказаны малакультурным, а часам нават грубым.

У адрозненне ад падмосткаў езуіцкага тэатра, дзе цёмны, нязграбны, прымітыўны мужык, як правіла, станавіўся аб'ектам насмешак і павучанняў, ва ўніяцкіх інтэрмедыях ён надзяляўся станоўчымі якасцямі: розумам, знаходлівасцю, дасціпнасцю. Паказваўся разумнейшым і больш высакародным чым "вучоны пан" і амаль заўсёды выклікаў павагу і сімпатыю. Некаторыя творы мелі выразны сацыяльны падтэкст.

Арганізатары спектакляў не пярэчылі супраць інтэрмедый, бо шматактныя рэлігійна-маралізатарскія драмы хутка стамлялі, а інтэрмедыі на вострыя сацыяльныя і бытавыя тэмы выклікалі вялікую цікавасць. На спектаклях прысутнічалі настаўнікі, бацькі, мецэнаты школы. Асабліва ўрачыстым быў спектакль, што даваўся ў канцы навучальнага года. Ён успрымаўся як падзея культурнага жыцця ўсяго горада.

Сярод уніяцкіх тэатраў Беларусі найбольшай вядомасцю карыстаўся жыровіцкі. У 1751 г. тут была выканана польска-беларуская ўніяцкая інтэрмедыя "Сляпы, кульгавы, потым пан і селянін". У ёй сцвярджалася асветніцкая ідэя аб натуральнай роўнасці ўсіх саслоўяў. У 1752 г. жыровіцкія шкаляры паказалі лацінскую трагедыю "Цыцэрон" у апрацоўцы мясцовага аўтара Самуіла Навіцкага. Музыку да яе напісаў прэфект віленскага кляштара базыльян Багуслаў Згірскі.

Прафесар Адам Мальдзіс, які выявіў шэраг каштоўных беларускіх літаратурных і музычных твораў XVI–XVIII ст., знайшоў у Львове рукапісны зборнік

***“Дыялогі і інтэрмедыі школ у Жыровіцах і Бучачы”***[196], датаваны 1751 г. У жыровіцкіх сцэнках парадзіравалі павятовыя соймікі, на якіх прамоўцы выступалі на “мазурскім” і “русінскім” (беларускім) дыялектах, высмейвалі пакланенне чужаземным звычаям, асуджалі шляхецкую анархію ў Рэчы Паспалітай сярэдзіны XVIII ст.

Паступова інтэрмедыі адасабляліся ад зместу школьнай драмы і набывалі характар самастойных мастацкіх камедыйных твораў, якія часта выконваліся самастойна. Іх адасабленню ад школьнай драмы садзейнічалі семінарысты, якія падчас канікулаў вандравалі па вёсках і мястэчках і ставілі спектаклі, дэманструючы набытае ў школьных сценах “мастацтва”. Перад вясковай публікай яны разыгрывалі не лацінскія драмы з незразумелымі народу персанажамі з антычнай міфалогіі ці здарэннямі з жыцця святых, а беларускія інтэрмедыі.

Прыстасаваныя да густаў сваіх гледачоў, прасякнутыя іх рэлігійнымі і палітычнымі інтарэсамі, інтэрмедыі разыходзіліся далёка за школьныя парогі і траплялі на прыдатную глебу для свайго бытавання і развіцця. Паказам у лёгкай жартаўлівай форме народнага жыцця, водгукам на бягучыя падзеі, народнай гутарковай мовай і гумарам інтэрмедыі здабывалі папулярнасць у публікі і атрымлівалі шырокае распаўсюджванне.

У канцы XVIII ст. традыцыя школьных спектакляў прыйшла у заняпад.

---

[196] Мальдзис А. И. Жировичи как центр литературной жизни // Христианизация Руси и белорусская культура. Минск, 1988 [машинопись]. С. 271.



*Царква Святых Пятра і Паўла ў Беразвеччы, 1756–1763.*
*Разбурана ў 1960-я г.*
*Справа – яе камп’ютарная рэканструкцыя*
*ў сучаснай забудове*



# Лёс культурнай спадчыны Царквы ў XIX ст.

- *Рэвізія ўніяцкага культурна-абрадавага комплексу ў Расійскай імперыі*
- *Разбурэнне і перамяшчэнне бібліятэчна-дакументальных калекцый*
- *Рэарганізацыя царкоўнага інтэр'ера і пераабсталяванне храмаў*
- *Жывапіс іншакультурнага паходжання – на змену творам аўтэнтычнага беларускага іканапісу*
- *Антыарганная кампанія*
- *Скульптура – ахвяра палітыкі "разлатынівання"*
- *"Выпраўленне" сакральнай архітэктуры*
- *Новыя святы, абрады, імёны і моўныя рэаліі*
- *Ганенні на ўніяцкую кнігу*
- *Знішчэнне і "перастварэнне" спадчыны*

## Рэвізія ўніяцкага культурна-абрадавага комплексу ў Расійскай імперыі

На працягу 1596–1839 г. працай дзесяці пакаленняў беларусаў былі створаны самабытныя культурна-рэлігійныя каштоўнасці, звязаныя з дзейнасцю Уніяцкай Царквы. Яны сталі часткай нашай нацыянальнай культурнай спадчыны.

Уключэнне Беларусі ў склад Расійскай імперыі у канцы XVIII ст. прадвызначыла лёс Уніі. Рэлігійная канверсія ў дачыненні да новых суб'ектаў імперыі – традыцыйны кірунак яе палітыкі. Духоўная пераарыентацыя Беларусі на хрысціянскі Усход, замацаваная ўзмацніць палітычнае аб'яднанне з Расіяй, суправаджалася жорсткай рэвізіяй уніяцкага культурна-абрадавага комплексу, бо ўніяцкія кнігі, святы, спевы, адзенне, прадметы культу падтрымлівалі "дух адчужэння ад Расіі".

Таму перайначвалася або нішчылася ўсякая мясцовая даўніна, не падобная па стылі да расійскай. Усемагчымымі сродкамі прымусу, ад інтэлектуальнага да фізічнага, выціскалася народжаная Уніяй аўтэнтычная культура беларусаў. Вызваленае месца запаўнялася культурнымі каштоўнасцямі расійскага Праваслаўя, якія фарміравалі ў беларускага народа і адпаведную самасвядомасць. Пры гэтым пераследавалася не толь-

кі рэлігійная мэта – выкараненне ўніяцкай традыцыі. Размова ішла аб перапісванні нашай гісторыі на новую, у якой памяці пра Унію не знайшлося б месца.

***Пачатак наступу на культурны набытак Уніі быў пакладзены ў другой палове 1820-х г.***, калі ў афіцыйных пецярбургскіх колах з'явіўся намер умацаваць рускую народнасць і праваслаўную веру за кошт уніятаў, якіх у заходніх губернях імперыі налічвалі каля 1,5 мільёнаў. Стратэгію дзяржаўнай палітыкі адносна Уніі вызначыла сумнавядомая ***запіска 1827 г. імператару члена ўніяцкага дэпартамента рымска-каталіцкай калегіі (Санкт-Пецярбург) Іосіфа Сямашкі.*** Ён прапанаваў праект рэформ па збліжэнні і далучэнні Уніяцкай Царквы да Праваслаўя. З таго часу кар'ера Іосіфа Сямашкі пачала хутка прасоўвацца па службовай лесвіцы, а паралельна гэтак жа хутка ішоў заняпад кіраванай ім Уніяцкай Царквы. Паўстанне 1830–1831 г. адтэрмінавала падаўленне Уніі. Наступ на яе перайшоў у актыўную фазу ў 1833–1834 г.

Пачалі з ліквідацыі базыльянскіх манастыроў – культурных асяродкаў краю – з іх навучальнымі ўстановамі, бібліятэкамі, архівамі. Закрыццём імператарскімі загадамі 1828–1835 г. вучылішчаў ў Жыровіцах, Брэсце, Талачыне, Віцебску, Вярбілаве, Беразвеччы, Лядах, Барунах, Паддубісе была разгромлена базыльянская сістэма свецкай адукацыі.

## Разбурэнне і перамяшчэнне бібліятэчна-дакументальных калекцый

***У 1830-я – 1870-я г. былі распатрошаны і рассеяны або знішчаны ордэнскія кнігазборы, назапашаныя базыльянамі за два стагоддзі***. Найбольш каштоўныя з іх "носьбіты новай культуры" перадалі

ў Пецярбург, другія падзялілі паміж свецкімі школьнымі бібліятэкамі, расійскімі публічнымі бібліятэкамі і Віленскай духоўнай семінарыяй. Частка рукапісных і друкаваных кніг пайшла на продаж як антыкварыят або як макулатура, “непатрэбныя” прызначаліся на спаленне.

У 1860-х – 1870-х г. прайшлі чарговыя чысткі царкоўных і манастырскіх бібліятэк. Больш за тысячу тамоў бібліятэкі гродзенскіх базыльян трапіла тады ў Віленскую публічную бібліятэку. Пры перамяшчэнні разбураліся сістэмы манастырскіх калекцый, пашкоджваліся і раздзіраліся кнігі. Яшчэ ў 1866 г. 40 тысяч тамоў кніг базыльянскіх манастыроў валяліся на падлозе ці былі хаатычна раскладзены па паліцах у сховішчы Віленскай публічнай бібліятэкі. Бібліятэка Полацкай семінарыі – больш за 10 тысяч тамоў – у 1900 г. па загаду Сінода была вывезена ў Кіеўскую духоўную акадэмію.

Найкаштоўнейшую калекцыю беларускіх ды іншых славянскіх рукапісных і друкаваных кніг прафесара Віленскага ўніверсітэта Міхала Баброўскага купіў памешчык Трамбіцкі. Пасля смерці Трамбіцкага яна дасталася бібліятэцы графаў Замойскіх у Варшаве і амаль цалкам загінула ў пажарах 1939 і 1944 г. Другая частка калекцыі Міхала Баброўскага трапіла ў бібліятэку Акадэміі навук у Пецярбургу.

У час ліквідацыі Уніяцкай Царквы ***бясследна знікалі, раскрадаліся, распыляліся, разыходзіліся па сотнях рук, вывозіліся архівы епархій, манастыроў, прыходаў***, якія захоўвалі дакументы не толькі канфесійна-маёмаснага характару, але і па гісторыі рэгіёнаў, народаў, культур. Адны дакументальныя калекцыі былі вывезены ў Пецярбург, другія перададзены ва ўласнасць мясцовых губернскіх уста-

ноў і ў публічныя бібліятэкі, трэція трапілі ў прыватныя калекцыі.

Яшчэ ў 1819 г. пачаў паляваць за старажытнымі ўніяцкімі рукапісамі з царкоўных сховішчаў расійскі дзяржаўны дзеяч, граф Мікалай Румянцаў, вядомы таксама як мецэнат, калекцыянер, заснавальнік Румянцаўскага музея, які ён стварыў на аснове сваёй прыватнай калекцыі кніг, манет, рукапісаў і іншых этнаграфічных і гістарычных матэрыялаў. Уніяцкія дакументы тады можна было лёгка набыць у букіністычных магазінах, часам яны прадаваліся проста на вагу. Нямала рарытэтаў з былых уніяцкіх цэркваў і манастыроў набылі члены Віленскай археаграфічнай камісіі, Віленская публічная бібліятэка, расійскія і мясцовыя гісторыкі і калекцыянеры Пётр Гільтэбрант, Пётр Бяссонаў, Іван Карнілаў, Ксенафонт Гаворскі і інш.

За калекцыянаванне “ўніятыкі” прафесара Жыровіцкай семінарыі ***Паўла Дабрахотава*** новыя духоўныя ўлады абвінавацілі ў неправаслаўных поглядах. З пераводам семінарыі ў Вільню ў 1845 г. ён пераправіў туды і частку жыровіцкага архіва. У 1870-я г. вялікую калекцыю манускрыптаў, дакументаў і старадрукаў вывез у Пецярбург. У 1907 г. яна была перададзена на дзяржаўнае захоўванне ў Акадэмію навук, дзе знаходзіцца і цяпер[197].

У 1845 г. быў перададзены Сіноду *“для належнага захоўвання адпаведна важнасці яго”* багаты ***Архіў уніяцкіх мітрапалітаў*** з дакументамі, пачынаючы з 1470 г. Паперы Тадулінскага манастыра захоўваюцца сёння ў Нацыянальным гістарычным архіве Рэспублікі Беларусь у Мінску. А колькі манастырскіх кніжных

[197] Колекція та архів епископа Павла Доброхотова; уклад. В. І. Ульяновський. Київ, 1992. 220 с.

і дакументальных багаццяў было тады расфарміравана, перавезена, страчана, спарахнела ў скляпах і на гарышчах, папсавана пацукамі, спалена.

Разбурэнне ўніяцкіх кніжна-дакументальных багаццяў працягвалася да другой паловы XX ст. Перад зносам царквы ў сяле Жукаў Барок гару тоўстых счарнелых рукапісных і друкаваных кніг з вокладкамі, упрыгожанымі залачонымі крыжамі, звезлі ў райцэнтр Стоўбцы, дзе па распараджэнні аддзела культуры спалілі. Чатыром качагарам, якія працавалі пазменна, іх хапіла на месяц на распал печаў у гарадской лазні. Перад разбурэннем драўлянай царквы ў вёсцы Насілава Маладзечанскага раёна, якая прастаяла тры стагоддзі, яе багаты архіў і бібліятэку згрузілі на падводу, вывезлі і знішчылі.

Шмат манастырскіх духоўна-мастацкіх скарбаў у XIX ст. было расцягнута па свеце. У 1837 г., калі з Пецярбурга прыйшоў загад скасаваць Маравільскі кляштар (у Клімавіцкім павеце Магілёўскай губерні), базыльяне дазволілі суседнім памешчыкам вывозіць з манастырскага саду дрэвы, разбіраць каменныя пабудовы, а драўляныя ламалі на дровы і спальвалі. У той мітусні бясследна знік цудадзейны абраз Божай Маці ў срэбным акладзе[198].

Да 1835 г. з 81 манастыра базыльян, што трапілі ў 1830–1831 г. у няміласць да ўладаў, было скасавана 36, кожны з якіх быў больш-менш значным духоўна-культурным асяродкам мясцовага, рэгіянальнага або і дзяржаўнага значэння[199].

---

[198] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 1297 Канцылярыя генерал-губернатара віцебскага, магілёўскага і смаленскага. Воп. 1, спр. 10423, арк. 1, 8, 9 адв., 17.

[199] Киприанович Г. Я. Жизнь Иосифа Семашки, митрополита литовского и виленского и воссоединение западно-русских униатов с православною церковию в 1839 г. Вильна, 1893. С. 69.

## Рэарганізацыя царкоўнага інтэр’ера і пераабсталяванне храмаў

З 1834 г. пачаўся новы этап у суровай паслядоўнасці ліквідацыі Уніі і знішчэння яе атрыбутыкі. Зыходзячы з тэзіса, што толькі Праваслаўная Царква захоўвае абраднасць у недатыкальнасці і першароднай чысціні, пачалі прыводзіць “у аднастайнасць” з ёй уніяцкія рытуалы. Духавенству і вернікам пачалі ўнушаць, што ўніяцкія кнігі, святы, песні, прадметы культу ўкраліся ў храмы і абрады з-за чужога замежнага ўплыву, унеслі ў іх “беспарадкі” і “непрыстойныя” рознагалоссі з Грэка-Расійскай Царквой. Аргументамі пра лацінізацыю і паланізацыю Уніяцкай Царквы імкнуліся падарваць давер да яе народа.

Прынятая ***7 лютага 1834 г.*** па волі манарха ***пастанова*** прадугледжвала ўвядзенне ў багаслужэнне ва ўніяцкія храмы спеўнікаў і служэбнікаў, надрукаваных у Маскве, устанаўленне іканастасаў, аднаўленне ўсходніх абрадаў і выкараненне лацінскіх запазычанняў у абсталяванні і афармленні царквы, у абрадах, кнігах, адзенні і начынні. Выцясненне адных прадметаў культу з царкоўнага ўжытку і замена іх іншымі, адаптаванымі да праваслаўна-расійскіх узораў, адбываліся пад пільным кантролем свецкіх уладаў і паліцэйскім наглядам. Нядбайнасць у выкананні гэтай пастановы пагражала духавенству пакараннем.

***Спачатку шараговае духавенства байкатавала ўвядзенне ўсходніх абрадаў і рэарганізацыю царкоўнага інтэр’ера***. У Беларускай епархіі гэта рэформа сустрэла больш моцнае супрацьдзеянне. Тады пад пагрозай пазбаўлення прыхода святароў абавязалі даць распіску аб адказнасці за пераабсталяванне храмаў. Але яны, нягледзячы на прымус, пад рознымі

зачэпкамі (беднасць фундушаў, адсутнасць царкоўных грошай, уласная старасць і хваробы), пры спрыянні мясцовых благачынных, ухіляліся ад збудавання іканастасаў. Адмаўляліся аздабляць свае храмы праваслаўнымі іконамі, спасылаючыся на адсутнасць сродкаў і жывапісцаў; не давалі знішчаць лаўкі, арганы, званочкі.

Спосабам зломy непакорных святароў былі эпітымія ў Жыровіцах, утрыманне там у холадзе і голадзе, паніжэнне або зняцце з пасады. Найбольш упартых высылалі ў расійскія губерні. Абшарнікаў абавязалі ўнесці патрэбную суму на рэарганізацыю храмаў, але тыя адмаўляліся ад такой ўспамогі. Салідарнасць са святарамі праяўляла чынавенства мясцовага паходжання. З-за супраціву святароў, прыхаджан і паноў пераабсталяванне храмаў зацягвалася. Тады ў ход пайшла паліцыя.

Найперш вонкавыя змены ў храме – з'яўленне іканастасаў, выдаленне арганаў, нязвыклыя рытуалы – балюча ўздзейнічалі на людзей. На іх фоне не мелі такога ўздзеяння больш істотныя змены, якія, аднак, не кідаліся ў вочы, – падпарадкаванне Царквы Сіноду і выхад з-пад папскай юрысдыкцыі, рашэнне Полацкага сабора.

## Жывапіс іншакультурнага паходжання – на змену творам аўтэнтычнага беларускага іканапісу

Ішлі гады. Цэнтралізаванае знішчэнне помнікаў Уніі працягвалася.

У пераабсталяваных храмах не было месца ўніяцкім іконам. Старыя абразы, якія "псавалі" сцены царквы (як у Быцені), палілі. Знішчэнню падлягалі творы

нізавога сакральнага мастацтва. Тыя ўніяцкія абразы, якія мелі вялікую культурную каштоўнасць, часткова перараблялі або цалкам загрунтоўвалі фарбай і замалёўвалі нанова. Улік знішчаных помнікаў жывапісу ніхто не вёў. Несумненна, іх колькасць вылічалася тысячамі.

Усе іконы мясцовага паходжання з Мікалаеўскай царквы ў Полацку ў канцы 1830-х г. былі “перароблены жывапіснай работай … па абраду грэка-расійскай царквы”. Пяць старажытных карцін “найлепшага, высокага жывапісу” адправілі ў Пецярбург, у Акадэмію мастацтваў, “для выпраўлення … з найвышэйшым майстэрствам”[200]. У 1864 г. рэктар Полацкай духоўнай семінарыі павесіў у зале і аўдыторыях партрэты ўніяцкіх дзеячаў Кірылы Тарлецкага, Іпація Пацея, Фларыяна Грабніцкага і інш., з уздыхам усхваляючы іх заслугі перад навучэнцамі: *“Вось гэта былі ўладыкі, сапраўдныя крулікі”*. Але на наступны год па распараджэнні начальніка краю гэтыя карціны з семінарыі прыбралі[201].

Знішчэннем уніяцкага начыння і абразоў, вырабленымі ў спешцы іканастасамі – адводзілася ўсяго некалькі месяцаў – парушылі цэласнасць і гармонію ў храмах, збяднілі іх інтэр’ер, на дзесяцігоддзі асудзілі яго на ўбоства, прымітыўнасць і нядобраўпарадкаванасць. У 1837 г. па заказу Сінода расійскі архітэктар А. Ф. Шчадрын падрыхтаваў праект “самага простага і таннага іканастаса” для бедных цэркваў.

Як пісаў даследчык пасляўнійнага стану Літоўскай епархіі М. Ізвекаў, тое, што была наспех зроблена падчас уз’яднання, уражвала прымітыўнасцю. Іканастасы

---

[200] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 1297, воп. 1, спр. 9106, арк. 28 адв., 29 адв., 152 адв., 179–180.

[201] Миловидов А. Заслуги графа М. Н. Муравьева для православной церкви в Северо-Западном крае. Харьков, 1900. С. 42.

часта ўяўлялі сабой брыдкую нефарбаваную перагародку з дошак, якая не мела ніводнай іконы. Там, дзе і меліся абразы, жывапіс на іх быў агідны і не адпавядаў святасці намаляваных вобразаў. А на некаторых іканастасах былі вельмі старыя ўніяцкія абразы[202].

Недахоп абразоў, якімі замянялі выкінутыя і знішчаныя ўніяцкія іконы, стала самай вялікай праблемай беларускіх цэркваў з 1838 г. На час кампаніі пераабсталявання храмаў у Беларусь выклікалі тэхнікаў і жывапісцаў з Расіі. Да працы прыцягваліся і мясцовыя мастацкія сілы, але іх не хапала.

Патрэбы беларускіх храмаў у творах сакральнага жывапісу і іншых прадметах культу часткова задавальняліся з Расіі за кошт царкоўных, памешчыцкіх, сялянскіх грошай, ахвяраванняў рускіх дабрачынцаў. У 1841 г. багаты памешчык падарыў Васілю Лужынскаму, калі той падарожнічаў з крыжом Ефрасінні Полацкай па Маскве і Пецярбургу, 900 абразоў на дрэве, напісаных нейкім мастаком-акадэмікам. Іх размяркавалі па цэрквах усёй Беларусі[203]. Так месца твораў аўтэнтычнага беларускага жывапісу, падвергнутых масаваму знішчэнню ў другой палове 1830-х г., паступова замяняў рэлігійны імпарт з Расіі. Гэта былі творы “маскоўскага жывапісу” з выявамі, галоўным чынам, расійскіх святых. Ужо тады святары білі трывогу наконт адсутнасці ў святынях мясцовых абразоў.

***У пачатку 1860-х г. іканапісанне строга рэгламентавалі***. Былі распрацаваны тыпавыя чарцяжы іканастасаў для экс-уніяцкіх і новапабудаваных пра-

[202] Извеков П. Д. Исторический очерк состояния православной церкви в Литовской епархии за время с 1839–1889 г. М., 1899. С. 370, 387–389, 392–394.

[203] Записки Василия Лужинского, архиепископа полоцкого. Казань, 1885. С. 207.

васлаўных храмаў. Калі іканастас па абраным узоры не маглі вырабіць на месцы, яго трэба было заказваць у Пецярбургу. Іконы да іх таксама належала заказваць у сталіцы імперыі. Пісаць абразы на месцах дазвалялася толькі "добрым, выключна з рускіх, іканапісцам". Яны былі абавязаны капіраваць абразы з міністэрскіх узораў, а не займацца "самавольствам"[204].

***Такім чынам***, у 1830-х г. была штучна перарвана і спынена ранейшая традыцыя ў развіцці сакральнага жывапісу, якая склалася ў папярэднія два стагоддзі ў сувязі з функцыянаваннем Уніяцкай Царквы. З нашай зямлі тады быў вымыты такі магутны пласт сакральнага жывапісу, што на кампенсацыю страт пайшлі дзесяцігоддзі, – і ў 1860-я г. у Беларусі адчувалася патрэба ў абразах. Той жывапіс, што заняў яго месца, меў, як правіла, іншакультурнае паходжанне. Часцей за ўсё гэта былі адносна танныя і даступныя абразы рамеснай, часам фабрычнай вытворчасці, якія паходзілі з Расіі. ***Другая трэць XIX ст. стала "пераломным" этапам у развіцці беларускага сакральнага мастацтва***.

Культурным рабаваннем Беларусі было адбіранне, вываз ці знішчэнне культавага начыння, створанага беларускім народам і адрознага ад створанага ў Расіі. Па загадзе І. Сямашкі ў Жыровіцы былі дастаўлены манстрацыі, прызнаныя "непатрэбнымі". Медныя манстрацыі перадавалі ў Пецярбург, срэбныя – пераплаўлялі ў злiткі і таксама адпраўлялі ў сталіцу імперыі ў абмен на царкоўныя кнігі і начынне, "аднастайнае" з тымі, што мелі храмы Расіі. Сума, асігнаваная на заснаванне Полацкай уніяцкай акадэміі,

[204] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродна. Ф. 1, воп. 22, спр. 1417, арк. 3 адв. – 4, 5–5 адв.

была выдаткавана тады на набыццё багаслужэбных кніг маскоўскага друку і выраб іканастасаў, з-за чаго ад ідэі адкрыцця акадэміі канчаткова адмовіліся.

Раптоўная змена дэкору храма і цырымоній, выдаленне святароў прывялі ў стан шоку масы вернікаў, чыя вера ў XIX ст. трымалася на аўтарытэце духавенства і народным традыцыяналізме, Людзі не маглі зразумець, чаму тое, што яшчэ ўчора шанавалася, лічылася святым, угодным Богу, сёння знішчаецца, забараняецца. Але "просталюдзін" зразумеў, што "ламаюць веру"[205]. Шляхта ўспрымала курс Мікалая I на знішчэнне Уніі як помсту цара за нядаўні мяцеж. Рэакцыя ўніятаў на змены ў многім вызначалася пазіцыяй святара. Людзі прыслухоўваліся да яго, калі ён свядома і добраахвотна прымаў Праваслаўе і пераконваў сваю паству ў неабходнасці змен у храме, у форме і змесце набажэнства, пры ўмове, што не былі з ім у канфліктных адносінах. Але прыхаджане апазіцыйна настроенага святара бурна рэагавалі на ўсе спробы злому іх традыцый.

Адны пераставалі наведваць сваю царкву пасля ўстаноўкі ў ёй іканастаса і ішлі ў суседні храм, дзе яшчэ захаваўся ранейшы інтэр'ер. Часам справа даходзіла да разбурэння рамы, падрыхтаванай для іканастаса. Як заўсёды ў такіх выпадках, на месца "надзвычайнага здарэння" прыбывалі чыноўнікі і ад імя губернатара даводзілі сялян да розуму. Калі не дапамагалі настаўленні на розум, паліцыя пераконвала сваімі метадамі.

---

[205] Рукапісны аддзел Нацыянальнай бібліятэкі Расіі. Ф. 52, спр. 25, арк.16.

## Антыарганная кампанія

Яшчэ ў 1829 г. было забаронена ўстанаўліваць у цэрквах арганы, бо яны неўласцівыя грэчаскаму багаслужэнню. Рашучы наступ на гэты музычны інструмент, які выклікаў пачуццё рэлігійнага ўздыму, пачаўся ў 1834 г., калі тры епіскапы на сваім пасяджэнні вырашылі сярод мерапрыемстваў, прызначаных ліквідаваць абрадавыя адрозненні паміж уніятамі і праваслаўнымі, увесці ў Беларускай і Літоўскай епархіях расійскія малебныя спевы.

Першай ахвярай новых рэлігійных павеваў паў жыровіцкі арган – гонар мясцовых базыльян. ***У 1835–1836 г. была разгорнута кампанія па дэмантажу арганаў.*** З 1836 г. быў установлены трохмесячны тэрмін для продажу або разборкі (знішчэння) арганаў. Арганісты падлягалі выдаленню з царквы.

Але справа ішла марудна, бо людзі не хацелі развітвацца з арганамі. На сакавік 1836 г. у храмах Літоўскай епархіі яшчэ заставалася 86 гэтых музычных інструментаў. З другой паловы года іх ужыванне было цалкам забаронена, а ***да канца 1836 г. арганы зусім былі выведзены з ужытку***. Літоўскі епіскап І. Сямашка ганарыўся тым, што дзякуючы яго дзейнасці да 1837 г. у Літоўскай епархіі было дэмантавана 117 арганаў[206].

Сяляне, якія з дзяцінства прывыклі да музыкі ў храме, пераставалі яго наведваць, калі царква станавілася "глухой". Бацюшка, прызначаны ў 1836 г. са Смаленшчыны ў новаправаслаўны прыход вёскі

[206] Ліхач Т. У. Музыка ва ўніяцкіх храмах Беларусі пачатку XIX ст. // Весці Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. 2010. № 16. С. 56.

Расоны (Полацкі павет), прывабліваў сялян у перахрышчаны храм з дапамогай таннай сівухі. Але ўсё сапсавала гэта “арганная кампанія”. Калі святар клікаў сялян на абедню, яго пыталі: *“А на варгане повинны б гратсь?”* На што ён адказаў: *“Не, некому, детуньки, некому … Почекайте! Я привезу от Полотьска органиста…”*. Ён і сам разумеў, што хлусіць, – так навучыў яго вопытны ў такіх справах протаіерэй Капяевіч. Але з тых часоў ніхто не прыходзіў да яго на абедню, бо “варган молчит”. А ад вербнай нядзелі *“пошло по маслу. Прихожане уважили Казенную Палату, которая стала их угощать лучше … – палками”*[207].

У 1839 г. развіталіся з Уніяй жыхары Супрасля. Перад разборкай арганаў і бакавых алтароў царкву, адкрытую днём і ноччу, запаўняў натоўп людзей. Без перапынку ігралі на арганах. Некалькі дзён люд крыжам ляжаў у святыні. У царкве і на манастырскім надворку гучна разносілася песня, якую людзі са слязьмі спявалі ў апошні раз[208].

Пазбаўленне беларускіх уніятаў велічнай музыкі, сугучнай настрою набажэнства, стала адной з памылак “уз’яднання” – частка вернікаў “знайшла сабе духоўную ўцеху ў велічным касцёле з гучным арганам”[209]. Прычыну заняпаду Праваслаўя ў заходніх губернях Расійскай імперыі з абвяшчэннем маніфеста 1905 г. праваслаўныя іерархі ўбачылі ў *“бессознательном тяготении к католичеству бывших униатов ради*

[207] На униатском приходе // Чтения в императорском обществе истории и древностей российских при Московском университете. М., 1910. Кн. 1. 1909. Ч. 2. С. 4–6.

[208] Далматов Н. Супрасльский благовещенский монастырь. Историко-статистическое описание. СПб., 1892. С. 415.

[209] Извеков П. Д. Исторический очерк состояния православной церкви в Литовской епархии за время с 1839–1889 г. М., 1899. С. 381.

*громкозвучного органа”*[210]. Гучалі нават прапановы выправіць памылку, зробленую 70 гадоў таму, і дапусціць у багаслужбовую практыку беларускай Царквы музыку – *“прыемную асаблівасць старадаўняй веры беларусаў”, скасаваную без іх волі і згоды*[211].

У другой трэці XIX ст. выкараняліся любімыя ва ўніяцкім асяроддзі духоўныя народныя песні.

Уніяцкая арганная культура Беларусі – маладаследаваны музычны феномен Усходняй Еўропы. Пра яе вядома, галоўным чынам, толькі па фактах маштабнага знішчэння гэтых музычных інструментаў у 1830-я г. Знішчэнне па ініцыятыве літоўскага епіскапа, пазней мітрапаліта Іосіфа Сямашкі пісьмовай спадчыны ўніятаў – спаленне на працягу 1841–1857 г. у Жыровіцах і Вільні ўніяцкіх кніг – пазбавіла вучоных магчымасці ўсебаковага вывучэння музычнай спадчыны Уніяцкай Царквы.

## Скульптура – ахвяра палітыкі “разлатынівання”

Ахвярай палітыкі “разлатынівання” стала скульптура – Праваслаўе не прызнае аб’ёмных выяў біблейскіх персанажаў. Ляпны дэкор і статуі святых, “неадпаведныя правілам грэка-расійскай рэлігіі”, разбівалі, драўляную скульптуру распілоўвалі, спальвалі. Але ўкараніць такія навацыі ў людскую свядомасць было нялёгка. Рэшткі ўніяцкай атрыбутыкі (старыя

[210] Грыгор’ева В. Уніяцкая вера і рэлігійная свядомасць беларусаў (другая палова XIX – пач. XX ст.ст.) // Наш Радавод. Кн.7: Матэрыялы міжнар. навук. канф. “Гістарычная памяць народаў Вялікага княства Літоўскага і Беларусі. XIII–XX ст.”, Гродна, 3–5 ліпеня 1996 г. Гродна, 1996. С. 394.

[211] Голос православного из литовско-белорусского края // Церковный вестник. 1906. № 35, 36, 39, 44, 47, 48. С. 1541.

абразы, драўляныя статуі ды інш.) зберагаліся ў шматлікіх новаправаслаўных храмах да канца XIX ст., што выклікала незадавальненне новых духоўных уладаў ды расійскіх чыноўнікаў.

Полацкі епіскап Сава, які вызначыўся спальваннем царкоўнай скульптуры ды распілоўваннем уніяцкіх распяццяў, нават трапіў у анекдот: На абедзе для высокапастаўленых асобаў адзін з іх выказаў шкадаванне, што не прыбыў уладыка. *“Ён не можа,* – адказалі яму, – *заняты вельмі важнай справай”. “Якой такой справай?” “Спасіцелю ногі распілоўвае”.*

Частка ўніяцкай маёмасці (іконы, прадметы культу, царкоўная вопратка, харугвы, кнігі) была вывезена ў суседнія касцёлы і там захоўвалася, пакуль у 1863 г. і на іх не пачаўся наступ. Любая знойдзеная там рэч з адзнакамі ўсходняй абраднасці магла стаць падставай для пераўтварэння касцёла ў царкву. Таму ксяндзы сталі знішчаць “кампраментуючыя” рэчы – палілі іх.

Яшчэ ў пачатку XX ст. у царкоўных званіцах, склепах, у пыле і брудзе, у спарахнелых шафах і скрынях знаходзілася шмат розных старажытных рэчаў: драўляныя скульптуры, кнігі, абразы, падсвечнікі. Частка іх трапіла ў зборы царкоўна-археалагічных музеяў Віцебска, Мінска, Магілёва, Смаленска, у беларускі музей у Вільні. Іх ратаванню і захаванню садзейнічаў беларускі гісторык з Віцебска Аляксандр Сапуноў. Выключна яго намаганнямі ўдалося выратаваць 10 масляных партрэтаў уніяцкіх мітрапалітаў і архіепіскапаў, выкінутых з Полацкай семінарыі. Заснаваны ім разам з беларускім этнографам Еўдакімам Раманавым Віцебскі царкоўна-археалагічны музей,

у сілу аб’ектыўных прычын, ператварыўся, па сутнасці, ва ўніяцкае старажытнасховішча[212].

Але нават канцэнтрацыя ў музеях не заўсёды ратавала помнікі ўніяцкай сакральнай культуры ад знікнення і гібелі. Каб забяспечыць экспанатамі музей у Смаленску, у пошуках старажытнасцяў ператрэслі царкоўныя рызніцы, званіцы, скляпы. Калі высветлілася, што смаленскі епіскап Пётр прадаў частку рэчаў, прызначаных для музея, у тым ліку за мяжу, была прызначана рэвізія. У ноч напярэдадні рэвізіі музей згарэў. Частку рэчаў уратавалі ад агню пажарныя, але шмат іх, найбольш старадрукаў і рукапісаў, загінула ў полымі[213].

Незайздросным аказаўся і лёс саміх храмаў. Пераасвячэнне царквы ў праваслаўную для ўніяцкага насельніцтва было раўназначна яе страце – яе тут жа цураліся, а пастыр станавіўся зусім чужым. У далейшым вернікі праяўлялі абыякавасць да лёсу храма, шляхціцы сабаціравалі яго рамонт і добраўпарадкаванне, нягледзячы на пагрозу высылкі ўглыб Расіі.

Тое “ўз’яднаўчае” ліхалецце, паўторанае ў 1860-я – 1870-я г. у беларускім Падляшшы, знайшло адлюстраванне ў народнай паэзіі:

*Клапатлівая айчына заліваецца слязамі.*
*Успомніце, уніты, што рабілі з вамі*
*У той час, калі рускі ўрад у нашу веру ўкрочыў*
*І цэрквы нашы войскамі аточыў.*
*Найперш арганы з цэркваў забралі*
*І потым крыжы ўніз паскідалі.*

[212] Хмельницкая Л. В. Эволюция взглядов А. П. Сапунова на проблему самоопределения белорусов // Литва – Русь – Беларусь: Проблемы национального самосознания в историографии и культурологии. М., 1977. С. 128–129.

[213] Смаленец А. Да стацьці В-ста “Аб паленьні кніг на Беларусі” // Крывіч. 1924. № 2. С. 32–33.

*А калі ўжо крыжы з цэркваў скінулі,*
*То свае купалы зараз жа паставілі.*
*А калі ўжо купалы свае паставілі,*
*То зараз алтары святыя выкінулі.*
*А калі ўжо алтары святыя выкінулі,*
*То свае іканастасы рускія паставілі.*
*А калі паставілі свае іканастасы,*
*То не хацелі хадзіць да іх уніяты*[214].

## “Выпраўленне” сакральнай архітэктуры

Палітычная і канфесійная пераарыентацыя беларускіх зямель з іх далучэннем да Расійскай імперыі прывялі да карэнных змен у традыцыях будаўніцтва. У першай палове XIX ст. айчыннае сакральнае драўлянае дойлідства трапіла пад актыўнае ўздзеянне прафесійнай мураванай архітэктуры рускага класіцызму, а пазней – псеўдарускага стылю. Эстэтыка класіцызму і рэтраспектыўнага візантыйска-рускага стылю былі спосабам духоўнай асіміляцыі насельніцтва так званага “Северо-Западного края”.

Пачалася ***мэтанакіраваная змена культавай архітэктуры ў бок адмаўлення яе мясцовых асаблівасцяў і ўніфікацыі з расійскім храмавым дойлідствам***. Распараджэннем Кабінета міністраў ад 4 снежня 1830 г. новыя храмы належала будаваць па ўзору грэка-расійскіх цэркваў. Старыя таксама перабудоўваліся ў маскоўска-візантыйскім стылі. Адмысловай пераробцы падвергліся полацкі сабор Св. Мікалая (адным з першых, у 1836 г.), Жыровіцкая і многія іншыя ўніяцкія святыні, якія, зменены да непазнавальнасці, і сёння стаяць на нашай зямлі.

Пасля скасавання Уніі ў 1839 г. і пераводу ў Праваслаўе грэка-каталіцкіх храмаў большасць з іх

[214] Рукапісны аддзел Ягелонскай бібліятэкі (Кракаў). Спр. 6958 / IV, арк. 221–222.

у выніку перабудоў страціла аўтэнтычныя рысы як у архітэктоніцы, так і ў дэкаратыўным вырашэнні. Але і аўтэнтычныя праваслаўныя беларускія цэрквы, якія вызначаліся мастацкай своеасаблівасцю, не задавальнялі артадаксальнае Праваслаўе і траплялі пад “пересоздание” ў псеўдарускім стылі. У 1858–1862 г. толькі ў Магілёўскай губерні было “капитально исправлено” 16 мураваных і 192 драўляныя цэрквы. Па Мінскай губерні былі зацверджаны праекты перабудовы 100 храмаў, якія атрымалі новую канфесію і новы мастацкі вобраз. Гэты моцны ідэалагічны ўплыў стаў адным з матываў нацыянальна-вызваленчага паўстання 1863–1864 г., пасля задушэння якога працэс перабудовы яшчэ больш актывізаваўся[215].

У 1863 г. Міністэрства дзяржаўных маёмасцей прызнала нездавальняючым папярэдняе культавае будаўніцтва ў заходніх губернях з яго аднастайнасцю і ўбоствам і запатрабавала зрабіць для іх праекты цэркваў больш разнастайнымі і адпаведнымі мясцовым умовам.

У адпаведнасці з праграмай мерапрыемстваў генерал-губернатара Міхаіла Мураўёва па *“водворению и преобладанию в Северо-Западном крае русской народности”* пачалася новая хваля перабудовы былых уніяцкіх храмаў з мэтай змены іх “касцёльнага” выгляду, *“каб яны нават у сваіх прыватных праявах нічым не адрозніваліся ад вялікарускіх цэркваў”*[216]. Да канца XIX ст. толькі ў Гродзенскай губерні ў псеўдарускім стылі было ўзведзена 400 новых цэркваў, якія атрымалі гаворачую назву “мураўёўкі”, і рэканструя-

[215] Габрусь Т. В. Драўлянае хрысціянскае храмабудаўніцтва Беларусі. Мінск, 2020. С. 283.

[216] Описание церквей и приходов Минской епархии: I. Минский павет. Минск, 1878. С. 129; Миловидов А. Заслуги графа М. Н. Муравьева для православной церкви в Северо-Западном крае. Харьков, 1900. С. 40.

ваны 63 старыя храмы. На царкоўнае будаўніцтва былі накіраваны сродкі, атрыманыя ад інсургентаў у выглядзе штрафаў і кантрыбуцый[217].

***Рэтраспектыўна-рускі (псеўдарускі) стыль*** імітаваў формы царкоўнага дойлідства Маскоўскай Русі XVI–XVII ст. Асноўнымі рысамі гэтага стылю з'яўляліся чатырохчасткавая кампазіцыя з трыма ўваходамі, арыентаванымі па баках свету, высокія шатры, цыбулістыя галоўкі, падкрэсленая масіўнасць кубападобнага асноўнага зруба і вежы-званіцы з востраверхім шатром, няўнасць трапезнай, багаты разьбяны дэкор. Усяго гэтага ніколі не было ў шматвяковай традыцыі храмабудаўніцтва на беларускіх землях. Прымусова перанесены на беларускую глебу з мэтай вяртання "к святоотеческой вере", у храмабудаўніцтва краіны з іншай культурнай і рэлігійнай гісторыяй, візантыйска-рускі стыль стаў "шавіністычна ангажыраваным псеўдагістарычным стылем"[218]. Ён кардынальна мяняў выпрацаваны пакаленнямі майстроў-дойлідаў мастацкі вобраз помнікаў і дэфармаваў эстэтычны густ беларускай нацыі.

## Новыя сьвяты, абрады, імёны і моўныя рэаліі

Выганялася з Царквы яе галоўная каштоўнасць – ***беларуская мова***, якую замянялі на рускую. На валоданне ею шараговым духавенствам звярталася асаблівая ўвага. Царскім указам ад 16 снежня 1839 г. прыходскім праваслаўным святарам Беларусі і Украіны прадпісвалася, каб яны *"па магчымасці чы-*

[217] Габрусь Т. В. Драўлянае хрысціянскае храмабудаўніцтва Беларусі. Мінск, 2020. С. 283.
[218] Габрусь Т. В. Сакральнае дойлідства Беларусі: 1000-гадовая спадчына. Мінск, 2014. С. 13–14.

*талі ў цэрквах у нядзельныя і святочныя дні казанні простай агульназразумелай мовай”*. Але гэта паслабленне беларускай мове цяжка ўзгадняецца з распараджэннем І. Сямашкі ад 1840 г. забяспечыць святароў Літоўскай епархіі ўзорнымі пропаведзямі на рускай мове, каб маглі *“ў сваіх павучаннях на простанародных тамашніх гаворках дапасоўвацца да агульнага духу рускай мовы”*[219].

Выкараняўся звычай даваць пры хрышчэнні імёны святых, шанаваных Уніяцкай Царквой. Святароў абавязалі ***называць прованароджаных толькі імёнамі, уключанымі ў праваслаўныя святцы.*** У 1843 г. перайменавалі вучняў Літоўскай семінарыі, чые імёны не ўпісваліся ў дазволеныя расійскія праваслаўныя нормы.

Нягледзячы на адміністрацыйны ціск, у апошняй трэці XIX ст. у шэрагу праваслаўных цэркваў заходніх раёнаў Беларусі таемнасці хрышчэння, вянчання, пахавальны абрад выконваліся паводле ўніяцкага звычаю, а дзецям давалі традыцыйныя імёны. У канцы 1880-х г. “пячатку уніі насіла на сабе” насельніцтва Гродна і яго ваколіцаў, у пачатку 1890-х у хатах захоўваліся ўніяцкія абразы і адзначаліся свае святы (напрыклад, Св. Язафата), паводле ўніяцкага звычаю хрысцілі дзяцей[220].

Адмене падлягалі ***святы***, якіх няма ў Праваслаўнай Царкве. Замест запазычанага ў каталікаў свята Божага Цела, да якога ўніяты мелі асаблівую прыхільнасць, прыдумалі і ўвялі новае свята ў памяць уз’яднання ўніятаў.

---

[219] Записки Иосифа, митрополита Литовского. Т. 3. СПб., 1883. С. 496–497.

[220] Извеков П. Д. Исторический очерк состояния православной церкви в Литовской епархии за время с 1839-1889 г. М., 1899. С. 276, 428-429, 434.

У 1889 г. у Беларусі была арганізавана маштабная афіцыйная царкоўная імпрэза з палітычным падтэкстам – ***святкаванне 50-й гадавіны Полацкага сабора 1839 г.*** Яна мела на мэце ўзмацненне пазіцый Праваслаўнай Царквы і манархіі, апраўданне падзелаў Рэчы Паспалітай і ліквідацыі Уніі. Для святкавання наўмысна выбралі 8 чэрвеня – дзень свята Божага Цела, каб нівеляваць, змазаць, зменшыць яго першапачатковае значэнне і замяніць сваёй урачыстасцю.

У буйныя гарады краю на свята прыбыло шмат важных гасцей: прадстаўнікі ўладаў, царкоўныя іерархі. Асноўнымі цэнтрамі святкавання сталі Полацк – месца ліквідацыі Уніі і Брэст – месца яе стварэння. Галоўныя ўрачыстасці разгортваліся ў Сафійскім саборы, дзе ў 1839 г. адбываўся царкоўны сабор. 7–8 чэрвеня ў храмах ішлі багаслужэнні, бесперапынна званілі званы, прыхаджанам раздавалі прапагандысцкія брашуры, крыжыкі, абразкі, адбываліся хросныя хады па галоўных вуліцах гарадоў. У навучальных установах, вайсковых частках, дваранскіх сходах адбываліся святочныя сходы, гучалі антыўніяцкія прамовы, чыталі спецыяльную гістарычную літаратуру, выступалі ваенныя аркестры, ладзіліся ўрачыстыя абеды, вячэры, банкеты[221].

Улады хацелі прыцягнуць экс-уніятаў да святкавання сваёй урачыстасці і стварыць эфект масавасці, усесаслоўнасці, аднадушнасці мерапрыемства. Аднак сярод мясцовага насельніцтва папулярнасць святкавання “юбілею далучэння ўніятаў да праваслаўя” была сумнеўнай. Таму масавасць у буйных гарадах

[221] Романов С. Празднование ликвидации Брестской церковной унии в городах и местечках Беларуси (вторая половина XIX – начало XX вв.) // Белорусский исторический обзор. 2020. № 4 (1). С. 107–134.

забяспечвалася за кошт ваенных, якімі былі наводненыя беларускія губерні, і навучэнцаў мясцовых навучальных устаноў.

## Ганенні на ўніяцкую кнігу

З пачаткам наступу на Унію пад прэсам знішчальнай машыны апынуліся помнікі ўніяцкай кніжнай культуры – крыніцы іншавер'я і разнадумства, да якіх афіцыйная Расія ставілася вельмі падазрона. З канца XVIII ст. пачынаецца інтэнсіўнае, цэнтралізаванае насычэнне беларускіх земляў кніжнай прадукцыяй расійскіх друкарняў, якая пачынае выцясняць і ўніяцкую кнігу. Абмежаванні на распаўсюджанне ўніяцкай кнігі і беспярашкоднае забеспячэнне сінадальнымі выданнямі – два бакі культурна-нацыянальнай і рэлігійнай палітыкі царызму ў Беларусі.

Паколькі малітоўнікі і іншага роду ўніяцкія кнігі на царкоўнаславянскай мове сталі разносіцца па ўсёй Расіі ў вялікай колькасці і нават пачалося іх выкарыстанне ў праваслаўным набажэнстве, Сенат указам ад 27 чэрвеня 1826 г. забараніў іх продаж на кірмашах і наогул у тых месцах, дзе няма ўніяцкіх цэркваў[222]. Пастановай ад 7 лютага 1834 г. уніяцкае духавенства абавязалі карыстацца толькі служэбнікамі і кнігамі малітоўных спеваў, надрукаванымі ў маскоўскай сінадальнай друкарні, каб замяніць *"памылковыя, рознага друку царкоўныя кнігі, у якіх даўно перакручана славянская мова"*[223].

Увядзенне новых служэбнікаў, змест якіх разыходзіўся з традыцыйным, збянтэжыла духавенства,

[222] Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (Санкт-Пецярбург). Ф. 797, воп. 6, спр. 22600, арк.1–2, 4, 7–7 адв.

[223] Рукапісны аддзел Нацыянальнай бібліятэкі Расіі. Ф. 52, спр. 25, арк. 9–9 адв.

устрывожыла народ. Канфіскацыя ўніяцкіях кніг і замена іх маскоўскімі выданнямі выклікала найбольшы супраціў духавенства. З месцаў пачалі паступаць калектыўныя пратэсты. Першы меў месца ў Навагрудку ў 1834 г. Ад імя 57 святароў, якія сабраліся на сустрэчу з І. Сямашкам, епіскапу было прадстаўлена пісьмовае прашэнне – вызваліць іх ад выкарыстання ў набажэнстве маскоўскага служэбніка і пакінуць малітоўнік віленскага выдання[224].

Нават у імператарскім акружэнні ў Пецярбургу з трывогай ставіліся да замены ўніяцкіх кніг – асцерагаліся, што супраціў можа выйсці з-пад кантролю[225]. Каб прадухіліць выбух незадаволенасці, бязлітасна каралі нязгодных і ізалявалі лідараў супраціву.

У канцы 1835 г. себежскае (17 чалавек), лепельскае (18 чалавек), чашніцкае, бешанковіцкае і дрысенскае духавенства адмовілася прыняць прысланыя кнігі. Тады пачалі канфіскоўваць уніяцкія служэбнікі і іншыя кнігі, “каб зусім нідзе старых не было”. Іх звазілі ў Полацк[226]. Але пры чарговай рэвізіі полацкі архіепіскап пераканаўся, што многія святары так і не развіталіся са старадрукамі, а новыя кнігі байкатуюць.

У 1838 г. паданне на імя цара накіравала духавенства Беласточчыны[227], а таксама 111 святароў Беларускай епархіі, якія хадайнічалі аб уладкаванні друкарні для выдання ўніяцкіх набажэнскіх кніг і прапаноўвалі

---

[224] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 1297, воп. 1, спр. 7815, арк.117; Lencyk W. The Eastern Catholic Church and Czar Nicholas I. Romae – New York, 1966. P. 62, 65–66.

[225] Киприанович Г. Я. Жизнь Иосифа Семашки, митрополита литовского и виленского и воссоединение западно-русских униатов с православною церковию в 1839 г. Вильна, 1893. С. 79.

[226] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 1297, воп. 1, спр. 7815, арк. 137–137 адв., 147–149, 163 адв., 167–168 адв., 199 адв., 202 адв.–203, 212 адв., 222.

[227] Lencyk W. The Eastern Catholic Church and Czar Nicholas I. Romae–New York, 1966. P. 65–71.

самі выдаткаваць грошы на гэтыя патрэбы[228]. Але нават шлях лаяльных просьбаў на карысць Уніі быў непрымальны для царызму. Падпісантаў прымушалі замаўчаць высылкай, дэпартацыяй, зняволеннем.

Паколькі шараговае духавенства Літоўскай епархіі масава не жадала развітвацца са сваімі кнігамі, у 1834 г. было загадана: адабраць з цэркваў усе старыя кнігі пачаеўскага, віленскага і супрасльскага друку і выслаць у Жыровіцы[229]. 18 чэрвеня 1839 г. Літоўская кансісторыя выдала пастанову аб зняцці служэбнікаў мінулага друку з ужытку. Іх звазілі ў Жыровіцы. Ужо ў жніўні ўзнікла праблема: што з імі рабіць? Вырашылі: спаліць, пакінуўшы па 1–2 асобнікі кожнага выдання для бібліятэкі епархіяльнай семінарыі[230]. Спальванне ў манастырскіх печах было марудным спосабам іх знішчэння, да таго ж частка кніг раскрадалася. Таму ў 1844 г. І. Сямашка загадаў вынесці кнігі на манастырскі двор і спаліць іх на вогнішчы адразу. За тры гады так было спалена 2000 кніг[231].

Але сотні прыхільных да Уніі беларускіх святароў у трэцяй чвэрці XIX ст. служылі па выратаваных ад знішчэння супрасльскім, пачаеўскім і львоўскім трэбніках. Уніяцкай кнігай даражылі, ёй аддавалі перавагу перад праваслаўным трэбнікам апошняй рэдакцыі[232].

---

[228] Шавельский Г. Последнее возсоединение с православною церковию униатов Белорусской епархии (1833–1839 гг.). СПб., 1910. С. 285.

[229] Смаленец А. Да стацьці В-ста "Аб паленьні кніг на Беларусі" // Крывіч. 1924. № 2. С. 31.

[230] Записки Иосифа, митрополита Литовского. Т. 3. СПб., 1883. С. 526, 598.

[231] Смаленец А. Да стацьці В-ста "Аб паленьні кніг на Беларусі" // Крывіч. 1924. № 2. С. 32.

[232] Хойнацкий А. Ф. Западнорусская церковная унія в ея богослуженіи и обрядах. Кіев, 1871. С. 40–41, 213–215.

Таму 30 мая 1852 г. Сенат распарадзіўся канчаткова зняць з ужытку ўніяцкую літаратуру. У 1853–1855 г. паўтары тысячы асобнікаў, тады яшчэ сабраных па цэрквах і манастырах, былі спалены. Але ў 1865 г. мітрапаліт Іосіф звяртаў увагу Сінода на выкарыстанне даўно забароненых кніг. Таму іх знішчэнне ў 1860-я г. працягвалася[233].

Маюцца звесткі, што нават на мяжы XIX–XX ст. уніяцкія кнігі, якія да таго часу сталі рэліквіямі, скупляліся, тады ўжо за вялікія грошы, і таксама нішчыліся ганіцелямі Уніі[234]. У зводным каталогу "Кніга Беларусі. 1517–1917" вучонымі Беларусі зарэгістравана ўсяго 99 захаваных супрасльскіх друкаў са шматсоценных накладаў і 48 выданняў віленскіх базыльян[235].

Ацалелыя рукапісныя і друкаваныя ўніяцкія кнігі беларускага паходжання захоўваюцца сёння ў Вільнюсе (Бібліятэка імя Урублеўскіх Акадэміі навук Літвы, бібліятэка Вільнюскага ўніверсітэта), Санкт-Пецярбургу (бібліятэкі Расійскай Акадэміі навук і Санкт-Пецярбургскага аддзялення Інстытута гісторыі), Маскве (Расійская дзяржаўная бібліятэка, Дзяржаўны гістарычны музей, Расійскі дзяржаўны архіў старажытных актаў), у Польшчы (збор Чартарыйскіх у Кракаве, бібліятэкі Варшавы, Курніка, Вроцлава, Познані) і ў нязначнай колькасці – у Мінску (Нацыянальная бібліятэка Беларусі) і Гродна (Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей).

[233] Записки Иосифа, митрополита Литовского. Т. 2. СПб., 1883. С. 617; Извеков П. Д. Исторический очерк состояния православной церкви в Литовской епархии за время с 1839–1889 г. М., 1899. С. 418, 421; В-ст (Ластоўскі В.). Паленьне кніг на Беларусі // Крывіч. 1924. № 1. С. 61.

[234] Rusin, Moskal i Polak czyli kościoł unicki a Schizma. Poznań, 1873. S. 78.

[235] Кніга Беларусі. 1517–1917: зводны каталог. Мінск, 1986.

Літаральна выпаліўшы помнікі Уніі, пачалі гаварыць, што яна, акрамя паланізацыі, нічога з сабой не прынесла.

## Знішчэнне і "перастварэнне" спадчыны

Такім чынам, культурная спадчына Уніяцкай Царквы ў значнай ступені была страчана не натуральным шляхам, а ў выніку мэтанакіраванага знішчэння або "перастварэння". За два-тры дзесяцігоддзі былі зруйнаваны або перароблены да непазнавальнасці сакральныя помнікі (храмы, абразы, скульптура, музыка, святы, абрады, кнігі і інш.), створаныя ў папярэднія два з паловай стагоддзі.

Уніяцкі культава-абрадавы комплекс аказаўся прынцыпова несумяшчальным з каштоўнасцямі расійскага Праваслаўя і стаў ахвярай практычнай рэалізацыі ў Беларусі тэзы аб прыярытэце Расіі ў развіцці сапраўдна-хрысціянскай культуры. Самадзяржаўнасінодавая палітыка ўніфікацыі, нівеляцыі разам з русіфікацыяй царкоўна-рэлігійных структур Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. прывяла да страты ўніяцкімі культавымі інстытутамі сваіх асаблівасцяў і пераўтварэння іх у пашыральнікаў "истинно российской веры", якая ў дачыненні Беларусі стала адной з праяў расійскай вялікадзяржаўнай палітыкі.

Рэнегацтва мясцовых уніяцкіх саноўнікаў спарадзіла зняважлівыя адносіны да роднай старасветчыны, якая або вывозілася на ўсход, або нішчылася на месцы. На іх, а таксама на царызм і Сінод, які стаяў у яго на службе, падае вялікі цяжар гістарычнай адказнасці за ўчынены вандалізм, якім абярнулася наўмысная "чыстка" культуры.

У 1830-я – 1850-я г. адбылося вымыванне значнага пласту беларускай культуры, звязанага з дзейнасцю

Уніяцкай Царквы. Уніяцкія абразы, кнігі, скульптуры ды іншыя рэчы – сёння рэдкія і ўнікальныя экспанаты ў музеях і бібліятэках Беларусі. Не менш рэдкая з'ява ў нашым паўсядзённым жыцці – беларуская мова, названая адным з ідэолагаў заходнерусізма Ксенафонтам Гаворскім "униатским наречием".

Канфлікт культур і падаўленне ўніяцкай рэлігійнай традыцыі, якая пранікала ўсе сферы людскога жыцця, выклікалі шокавы стан у беларускім грамадстве. Навязванне іншакультурных сакральных знакаў сустрэла супраціў у розных слаях насельніцтва. Сялянства больш актыўна адстойвала вонкавыя формы культу (абрады, начынне), а духавенства – яе ўнутраны змест, зафіксаваны ў кнігах. Таму выкараненне "даўніны" расцягнулася на дзесяцігоддзі. Каштоўнасці, якія ўдалося зберагчы, працягвалі выкарыстоўвацца і шанавацца тайнымі прыхільнікамі Уніі ў сярэдзіне – другой палове XIX ст.

Даследчык культурнай спадчыны Уніяцкай Царквы Беларусі Аляксандр Суша сцвярджае, што асноўнай прычынай знішчэння гэтай спадчыны з'яўляецца знікненне самой Царквы і няздольнасць гэтай спадчыны ў поўнай меры інтэгравацца ў сістэму каштоўнасцей і сферу выкарыстання новых уладальнікаў. Знікненне носьбіта традыцыі не магло не выклікаць частковай ці поўнай яе страты. Найбольш пацярпела пасля ліквідацыі Уніі яе нематэрыяльная (духоўная) спадчына: музычная творчасць, абраднасць, інтэлектуальнае і манаскае жыццё і інш. Матэрыяльная культурная спадчына (кнігі, помнікі архітэктуры, элементы храмавага інтэр'ера і інш.) захавалася значна лепш.

А. Суша не схільны вінаваціць у знішчэнні значнай колькасці культурных каштоўнасцей, якія засталася пасля знікнення Уніяцкай Царквы, Праваслаўную і Каталіцкую Цэркы, як і дзяржаўныя структуры.

На яго думку, наадварот, можна казаць, што пераход часткі гэтай спадчыны да новых уладальнікаў станоўча паўплывала на яе захаванне, бо яна засталася ў іх руках і працягвала карыстацца попытам, г.зн. працягнула сваё існаванне. Тыя ж каштоўнасці, што не былі запатрабаваны, прыходзілі ў заняпад, нішчыліся, знікалі з народнай памяці[236].

З'яўленне Уніі і народжанай ёй культуры гістарычна дэтэрмінавана, а іх ломка і разбурэнне – гвалтоўны і штучны працэс, які абярнуўся непапраўнымі разбуральнымі наступствамі для нацыянальнай культуры, вымываннем яе магутнага пласта.

---

[236] Суша А. А. Культурная спадчына грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі ў XIX–XX ст.: інтэграцыя ў сістэму каштоўнасцей і сферу ўжытку новых уладальнікаў // Хрысціянства у гістарычным лёсе беларускага народа: зб. навук. арт. У 2 ч. Ч. 1. Гродна, 2009. С. 343–348.

# Грэка-Каталіцкая Царква
# як “месца памяці”



*Малітва Папы перад рымскай копіяй Жыровіцкай іконы Маці Божай. 11 студзеня 2023 г.*

- *“Мемарыяльная эпоха” – кантэкст адраджэння Беларускай Грэка-Каталіцкай Царквы*
- *Гістарычная памяць і “месцы памяці” Уніі*
- *Юбілейныя даты гісторыі Уніі*
- *Архівы, музеі – “інстытуты памяці” пра Унію*
- *Сакральныя святыні*

## “Мемарыяльная эпоха” – кантэкст адраджэння Беларускай Грэка-Каталіцкай Царквы

Час, у які мы жывем, вядомы французскі гісторык П’ер Нора назваў эпохай сусветнай перамогі памяці, ***“мемарыяльнай эпохай”***. Народы Афрыкі, Лацінскай Амерыкі і Еўропы, якія выйшлі з-пад прыгнёту таталітарных рэжымаў XX ст. (фашызм, камунізм ці проста дыктатура), звярнуліся да сваёй даўняй, традыцыйнай памяці, якую гэтыя рэжымы адабралі, разбурылі ці сказілі на сваю карысць. Адваёва ўласнага мінулага стала для многіх народаў неабходным кампанентам сцвярджэння ўласнай ідэнтычнасці. Нарадзілася ідэя нацыянальнай памяці.

З падзеннем Берлінскай сцяны і знікненнем Савецкага Саюза надышоў момант “здабыцця памяці” ва Усходняй Еўропе. Усе сацыяльныя, этнічныя, рэлігійныя групы зведалі глыбокае змяненне стаўлення да мінулага і ў сусветным маштабе паўстаў і расквітнеў культ спадчыны. Формы гэтай змены разнастайныя: крытыка існуючых версій гісторыі і вяртанне выцесненых старонак гістарычнага працэсу; аднаўленне слядоў знішчанага або адабранага мінулага; бурнае развіццё мемарыяльных мерапрыемстваў; юрыдычнае звядзенне рахункаў з мінулым; рост колькасці

ўстаноў і зброі памяці: музеяў, архіваў, бібліятэк, калекцый, камп'ютарных каталогаў, банкаў даных, храналогіі і г.д.[237]

Сусветнае панаванне памяці, росквіт культу спадчыны П'ер Нора тлумачыць яшчэ адным феноменам – разбурэннем адзінства гістарычнага часу "мінулае – сучаснасць – будучыня". "Паскарэнне гісторыі" ўсё больш хутка адсоўвае, аддаляе ад нас мінулае, стварае эфект адчування страты. А нявызначанасць, непрадказальнасць будучыні накладвае на сучаснасць з яе небывалымі тэхнічнымі магчымасцямі "доўг памяці" і захавання рэшткаў мінулага[238].

Наступствам росквіту памяці стала ўсё больш інтэнсіўнае выкарыстанне мінулага – палітычнае, турыстычнае, камерцыйнае, рэзкі ўздым мемарыяльных мерапрыемстваў. Другім наступствам з'яўляецца страта гісторыкамі традыцыйнай манаполіі на інтэрпрэтацыю мінулага – яны вымушаны дзяліць сваю прафесію і гонар устанаўліваць факты, звяртацца з доказамі, надзяляць ісцiннасцю з суддзёй, палітыкам, заканадаўцам, са сродкамі масавай інфармацыі[239].

З геапалітычнымі зменамі на карце Еўропы, звязанымі з распадам СССР, яго народы сталі пільна ўглядацца ў сваю гісторыю, у тым ліку ў яе канфесійны складнік. На зломе XX–XXI ст. з падзеннем атэізму на постсавецкім абшары адбылося імклівае рэлігійнае адраджэнне, узрастанне ролі рэлігіі ў розных сфе-

---

[237] Нора П. Всемирное торжество памяти // Неприкосновенный запас. 2005. № 2 [Электронны рэсурс] // Журнальный зал. Русский толстый журнал как эстетический ресурс. Рэжым доступу: https://magazines.gorky.media/nz/2005/2/vsemirnoe-torzhestvo-pamyati.html. Дата доступу: 10.02.2023.

[238] Тамсама.

[239] Тамсама.

рах жыцця грамадства і вяртанне ёй ролі актыўнага "фактару гісторыі". У той час і на тэрыторыі Беларусі шмат у чым адбудаваўся той рэлігійны ландшафт, які фарміраваўся на працягу стагоддзяў. Сучасны канфесійны склад Беларусі – гэта не стыхійны наватвор постсавецкага часу, але хутчэй адноўленая дасавецкая паліфанія рэлігійных традыцый, прысутнасць якіх на нашых землях абумоўлена гістарычна. Асэнсаванне сучаснай рэлігійнай сітуацыі звязана з памяццю і не можа быць вырвана з гістарычнага кантэксту.

На хвалі глабальных і рэгіянальных працэсаў "мемарыяльнай эпохі" вярнулася з паўтаравекавога небыцця і заняла сваю нішу ў канфесійнай структуры Беларусі Грэка-Каталіцкая Царква. Яна вярнулася пасля забароны 1839 г., ганенняў, дыскрэдытацыі. Здавалася, была зусім выкрэслена са старонак гісторыі і з памяці беларусаў. Вяртанне адбылося на глебе пераасэнсавання мінуўшчыны і абуджэння гістарычнай памяці ў асяроддзі студэнтаў ды інтэлігенцыі Мінска і іншых гарадоў Беларусі. З канца 1980-х г. ва ўмовах лібералізацыі грамадскага і рэлігійнага жыцця ў гэтым асяроддзі ўзнікае, усё больш узмацняецца (калі высветлілася, што продкі былі ўніятамі) цікавасць да Уніяцкай Царквы, з'яўляецца імкненне да яе аднаўлення і легальнай дзейнасці. Несумненны ўплыў аказаў факт адраджэння Украінскай Грэка-Каталіцкай Царквы.

У 1990 г. у Беларусі сталі ствараецца суполкі вернікаў-уніятаў: у Мінску, Гомелі, Маладзечне, Магілёве, Полацку, Віцебску, Гродна, Брэсце, Лідзе, Івацэвічах, Баранавічах. Найбольш актыўна працэс іх стварэння спачатку ішоў на ўсходзе і ў цэнтры Беларусі. Першую групу вернікаў склала інтэлігенцыя,

якая прыйшла да Царквы ў пачатку 1990-х г. на хвалі захаплення беларускай духоўнай культурай, – грамадскія і палітычныя дзеячы, людзі культуры – мастакі, пісьменнікі, а таксама навукоўцы, універсітэцкія выкладчыкі. Частка вядомых дзеячаў беларускага нацыянальнага адраджэння дэманстратыўна перайшла ва Уніяцтва. З тых часоў Унія многімі ўспрымаецца як канфесія для нацыянальна-свядомых беларусаў. У некаторым сэнсе гэта, сапраўды, так і ёсць. Лічыцца нормай, што грэка-каталікі з’яўляюцца людзьмі грамадска актыўнымі.

Такім чынам, Беларуская Грэка-Каталіцкая Царква мае два вымярэнні: гэта і гістарычная спадчына, і дзень сённяшні – жывы гістарычны факт. Яна – паўнапраўны доўгажыхар Беларусі. Пазіцыянуе сябе як Царква з 400-гадовай гісторыяй, лічыць сваёй гістарычнай місіяй працягваць традыцыю маста паміж хрысціянскім Усходам і Захадам і ўмацоўвае ўласную эклезіяльную ідэнтычнасць. Досвед адраджэння Грэка-Каталіцкай Царквы засведчыў, што перадаваная праз пакаленні гістарычная памяць з’яўляецца магутнай сілай.

## Гістарычная памяць і “месцы памяці” Уніі

Сёння катэгорыя ***“гістарычная памяць”*** – адна з найбольш запатрабаваных у гуманітарнай сферы. Гэта сукупнасць ведаў, меркаванняў, адзнак, перакананняў і ўяўленняў аб мінулым. Пад гістарычнай памяццю таксама разумеюць працэс арганізацыі, захавання і ўзнаўлення мінулага досведу, які фарміруецца пасродкам спецыфічных сацыяльна-культурных дзеян-

няў і практык. Гістарычная памяць выбарачная. Яна акцэнтуе ўвагу на падзеях і асобах мінулага, значных і актуальных для сучаснасці і будучыні. Гістарычная памяць праяўляецца ў звычках, ладзе жыцця, культуры, у стаўленні да іншых народаў, палітычных перавагах, імкненні да незалежнасці. Яна з’яўляецца важным элементам нацыянальнай бяспекі і фактарам нацыянальнай ідэнтычнасці. З паняццем гістарычнай памяці цесна звязана паняцце “гістарычная свядомасць” – усведамленне асобай, групай людзей, народам сувязі сучаснасці з мінулым і будучыняй і свайго становішча ў часе, свайго месца і ролі ў гісторыі.

Адрозніваюць гістарычную памяць асабістую і калектыўную (сацыяльную); навуковую і звычайную (паўсядзённую); камунікатыўную (набываецца ў паўсядзённай камунікацыі) і культурную (сама сабой не распаўсюджваецца, а мае патрэбу ў спецыяльным клопаце і падвяргаецца кантролю).

Гісторыя існуе толькі адна (гісторыя Беларусі, гісторыя Украіны і інш.), а калектыўных памяцей можа быць некалькі. Калектыўная памяць – гэта ўяўленне аб мінулым, якое падзяляецца і канструіруецца членамі сацыяльнай группы. Калектыўнай памяці ўласцівыя наступныя прыкметы: сумесны характар (падзяляецца групай); носіць характар азнаменавання (святкаванне памятных дат); эмацыйнасць і значнасць успамінаў; актуальнасць для сучаснай сітуацыі, патрэбаў цяперашняга часу; калектыўнае выцясненне, забыццё, амнезія (траўматычных элементаў калектыўнай памяці) і інш. Асноўнай функцыяй калектыўнай памяці з’яўляецца падтрыманне групавой ідэнтычнасці. У кожнай групы – свая гіста-

рычная памяць. Постаці і факты мінулага ў памяці груп адрозніваюцца.

Уяўленні грамадства аб самім сабе і сваёй гісторыі, успаміны пра мінулае канцэнтруюцца ў “месцах памяці”. Іх галоўная функцыя – захаванне калектыўнай памяці. ***“Месца памяці”*** – гэта не толькі фізічнае, геаграфічнае месца, але і сімвалічнае. Яно ўвасабляе ў сабе адзінства духоўнага і матэрыяльнага, спалучае тры аспекты: матэрыяльны (напрыклад, архіў), сімвалічны (напрыклад, хвіліна маўчання) і функцыянальны (тэстамент, школьны падручнік і г.д.)[240]. “Месцамі памяці” могуць стаць людзі, падзеі, прадметы, будынкі, манументы, храмы, кнігі, дакументы, песні, традыцыі, цырымоніі, рытуалы, легенды, эмблемы, святы, урачыстасці ў гонар людзей або падзей, прамовы, геаграфічныя кропкі, акружаныя асаблівай сімвалічнай аўрай, і г.д.

Гістарычная Унія (1596–1839 г.) пакінула мноства слядоў: бачных (кнігі, творы выяўленчага мастацтва, помнікі архітэктуры і інш.) і нябачных (музычныя творы; наш вобраз думак і пачуццяў; рытуалы і звычаі, якія трымаюцца на больш старажытных пластах). ***“Месцы памяці” Уніяцкай Царквы*** – гэта з’явы і падзеі царкоўна-рэлігійнага жыцця (Берасцейскі сабор 1596 г., Замойскі сабор 1720 г. і г.д.), царкоўныя дзеячы (Іпацій Пацей, якога называюць “архітэктарам Берасцейскай уніі”, “атлант Уніі” Іосіф (Язэп) Руцкі, Святы Язафат Кунцэвіч, Фларыян Грабніцкі і інш.) і звязаныя з імі мясціны (Брэст, Навагрудак, Струнь).

[240] Путилова Е. Концепция “мест памяти”, или актуальность коммеморативной бдительности истории (на примере произведения П. Нора “Франция-память”) [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.cogita.ru/a.n.-alekseev/kontekst/koncepciya-abmest-pamyatibb. Дата доступу: 10.02.2023.

Гэта храмы (полацкі Сафійскі сабор, Барунскі касцёл і інш.) і манастыры (Лаўрышаўскі, Жыровіцкі і інш.). Гэта геаграфічныя назвы населеных пунктаў, якія выклікаюць устойлівую асацыяцыю з Уніяй (Антопаль, Свержань, Поразава). “Месцамі памяці” з’яўляюцца сакральныя рэліквіі (іконы, статуі, прадметы культу).

Сярод асабліва шанаваных “месцаў памяці” Уніі – ***вёска Баруны ў Ашмянскім раёне Гродзенскай вобласці***, адзін з гістарычных цэнтраў Уніі ў Беларусі. Тут у сярэдзіне XVIII ст. была пабудавана ўніяцкая царква, прыгожая сваёй архітэктурай віленскага барока. Царква была вядомая цудатворнай іконай Маці Божай Барунскай, а таксама базыльянскай школай для свецкай моладзі, заснаванай ў эпоху Асветніцтва. Цяпер Барунскі касцёл Святых Пятра і Паўла – цэнтр мясцовай рымска-каталіцкай парафіі. У навейшай гісторыі Уніі Баруны вядомыя як месца, дзе рэальныя абрысы набыла ідэя адраджэння Беларускай Грэка-Каталіцкай Царквы.

У 1979–1990 г. святаром у Барунскім касцёле служыў беларускі рэлігійны і грамадскі дзеяч Ян Матусевіч. З 1988 г. ён, будучы сябрам праўлення Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны, адным з першых у БССР стаў здзяйсняць набажэнствы на беларускай мове. Пры ім Баруны сталі месцам паломніцтва інтэлігенцыі і моладзі з усёй Беларусі. Ян Матусевіч хрысціў многіх маладых людзей, якія ставілі пытанне аб аднаўленні ў Беларусі Грэка-Каталіцкай Царквы.

12 лістапада 1989 г. у Барунах адзначаўся дзень памяці Святога Язафата Кунцэвіча. У багаслужэнні (па лацінскім абрадзе) прыняла ўдзел група моладзі і інтэлігенцыі з Мінска. Гэта мерапрыемства з’яўляец-

ца першай публічнай акцыяй грэка-католікаў у Беларусі. У пачатку 1990 г. гэтыя маладыя людзі заснавалі студэнцкае аб'яднанне "Унія" і пачалі працу над першым грэка-каталіцкім часопісам "Унія" (выдаваўся ў 1990–1991 г.). Адным з іх заснавальнікаў быў Сяргей Абламейка.

## Юбілейныя даты гісторыі Уніі

Важнай падзеяй у жыцці Беларускай Грэка-Каталіцкай Царквы стала ***400-годдзе Брэсцкай царкоўнай уніі***, якое прыйшлося на 1996 год. Юбілей актуалізаваў тэму Уніі ў навуцы і грамадстве. Навуковыя канферэнцыі, прысвечаныя гэтай даце, прайшлі тады ў шэрагу краін. Яны па-новаму асэнсоўвалі духоўна-культурны патэнцыял царкоўнага саюза 1596 г. Юбілей павысіў цікавасць да гісторыі Уніі ў грамадстве. Рэаліямі навейшага часу стала прызнанне Берасцейскай уніі адной з найбуйнейшых падзей усходнееўрапейскай царкоўнай гісторыі і важнай часткай беларускай нацыянальнай гісторыі, прызнанне факта колькаснага дамінавання ўніятаў (каля 80% насельніцтва) на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII ст. Атрымаў навуковае прызнанне значны ўплыў Уніі на рэлігійнае і нацыянальна-культурнае аблічча Беларусі і яе ўклад у мастацтва найцікавейшымі ўзорамі жывапісу, скульптуры, дойлідства.

Святкаванне памятных дат і юбілеяў актуалізуе гістарычную памяць пра падзеі ды дзеячаў Уніі ды з'яўляецца важным фактарам фарміравання нацыянальнай і рэлігійнай ідэнтычнасці беларускіх грэка-католікаў. Такімі былі Год памяці Берасцейскай царкоўнай уніі ў яе 420-я ўгодкі (снежань 2015 – снежань 2016), агульнацаркоўная акцыя "Месяц малітвы

за Беларусь” (кастрычнік 2016), экуменічная малітоўная сустрэча з пратэстантамі (2022), 100-годдзе вяртання цудадзейнага абраза Маці Божай Суцяшальніцы засмучаных у Баруны (2022) і інш.

***425-й гадавіне Берасцейскай уніі*** прысвяцілі навуковы сімпозіум (2021). На ім разглядаліся дзве вялікія тэмы, якія звязвалі даўнюю гісторыю з сучаснасцю: “Эклезіялагічныя аспекты Берасцейскай уніі” і “У пошуках сучаснай мадэлі царкоўнай еднасці”.

У 2017 г. адзначалася ***400-годдзе дзейнасці манахаў-базыяльнаў на беларускіх землях***. У грэка-каталіцкіх суполках краіны прайшлі розныя мерапрыемствы: урачыстыя багаслужэнні, выступленні даследчыкаў перад вернікамі, курсы для семінарыстаў і інш.

У Баранавічах тады адбылася Міжнародная навуковая канферэнцыя “Мітрапаліт Язэп Вельямін-Руцкі і яго рэформа ўсходнеславянскага манаства. Служэнне Ордэна базыльянаў на беларускіх землях, 1617–2017”. У ёй удзельнічалі духоўныя асобы, грэка-католікі, краязнаўцы з розных гарадоў. Навукоўцы з Беларусі, Украіны, Польшчы ды Італіі абмяркоўвалі на канферэнцыі пытанні рэформы ўсходняга манаства пасля падпісання Берасцейскай уніі; біяграфію, радавод, дзейнасць знакавай постаці Ордэна базыльянаў мітрапаліта Язэпа Руцкага; гісторыю базыльянаў на беларуска-ўкраінскіх землях, найперш іх асветніцкую, выдавецкую і навуковую дзейнасць. З выступлення польскага гісторыка Р. Дабравольскага, у прыватнасці, вынікала, што базыльяне ў 1795–1839 г. моцна спрычыніліся да ўмацавання беларускай свядомасці.

Вялікай пашанай у беларускіх грэка-католікаў карыстаецца Святы Язафат Кунцэвіч. Яму прысвечаны

дні памяці Св. Язафата ў Беларусі. Памяць аб ім зберагаецца ў Вене, Празе, Рыме. Адзначаліся 100-годдзе пераносу рэліквій Св. Язафата (2016) з польскага горада Бяла-Падляска ў Вену (Аўстрыя), 50-годдзе (2013) іх пераносу ў Рым, перадача беларускім грэка-католікам рэліквіі Св. Язафата з Рыма (2016). Адбылася пілігрымка ў Рым з нагоды 150-годдзя кананізацыі Св. Язафата (2017). Юбілейныя святкаванні; мерапрыемствы, прымеркаваныя да памятных дат, надаюць гістарычнай памяці пра Унію новае дыханне.

У 2022 г. грэка-католікі святкавалі ***500-годдзе выдання першага друкаванага малітоўніка на роднай мове***. Ім з'яўляецца "Малая падарожная кніжка", якую Францыск Скарына надрукаваў у 1522 г. у Вільні. Гэта першая друкаваная кніга ў Вялікім Княстве Літоўскім. У ёй сабраны псалмы і тэксты розных малітваў для вернікаў. Прыхільнік "церковной единоты" Скарына[241] нёс сваім землякам Божае слова на зразумелай ім мове.

Тэолагам, гісторыкам і ўсім, хто цікавіцца духоўнай спадчынай Беларусі, дапаможа зразумець філасофскія погляды першадрукара, яго этыку, генезіс яго патрыятызму праца Уладзіміра Паўловіча, выдадзеная да 500-годдзя выхаду ў свет "Малой падарожнай кніжкі"[242]. Яна створана на аснове аналізу прадмоў, напісаных Скарынай да выдадзеных ім кніг Бібліі.

Міжканфесійныя сустрэчы; пілігрымкі, з якіх штогадовай традыцыяй стала пілігрымка ў памяць

---

[241] Мальдзіс А. Францыск Скарына як прыхільнік "церковной единоты" // Полымя. 1990. № 8. С. 203–208.

[242] Паўловіч У. С. Францішак, мілы Скарына: да 500-годдзя выхаду ў свет выдання "Малая падарожная кніжыца" (22 студзеня 1522 г.). Мінск, 2022.

полацкай трагедыі 1705 г.[243] з Віцебска ў Полацк, да Сафійскага сабора, з удзелам грэка-католікаў з усёй Беларусі; урачыстыя літургіі; малітвы і спевы; парафіяльныя святы; мастацкія выставы і прэзентацыі кніг; шанаванне цудатворных абразоў – усё гэта таксама з’яўляецца асэнсаваннем шляху Уніі даўжынёю ў 425 гадоў; сведчаннем таго, што жыве памяць пра гісторыю Царквы і сама Царква жыве.

## Архівы, музеі – “інстытуты памяці” пра Унію

**Архівы.** Дакументальную памяць па гісторыі Уніі захоўваюць архівы. У нашай краіне – гэта Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (Мінск) і Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродна. У Мінску такія дакументы сканцэнтравана ўтрымліваюцца найперш у фондах рэлігійных устаноў. Адным з іх з’яўляецца фонд 3245 “Беларуская грэка-ўніяцкая кансісторыя”[244]. Пра лёс Царквы ўсходняй і цэнтральнай Беларусі ў часы Расійскай імперыі распавядаюць шматлікія дакументы фонда 1297 “Канцылярыя генерал-губернатара віцебскага, магілёўскага і смаленскага”. Жыццё Царквы ў першай палове XIX ст. на захадзе Беларусі адлюстроўваюць дакументы гродзенскага архіва (фонд 1 “Канцылярыя гродзенскага губернатара” і інш.).

[243] Марозава С. В., Марозаў С. П. Полацкая трагедыя 1705–1710 гадоў // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы IV Міжнароднай навуковай канферэнцыі; Полацк, 23–24 кастрычніка 2002 г. Полацк, 2003. С. 174–181.

[244] Фондовый каталог государственных архивов Республики Беларусь. НИАБ ф. 3245. Рэжым доступу: http://fk.archives.gov.by/fond/110281/

Багатая і разнастайная інфармацыя пра Унію ў Беларусі змяшчаецца таксама ў найбуйнейшых архівах і бібліятэках (у аддзелах рукапісаў) краін Усходняй і Цэнтральнай Еўропы – у Літве (Вільнюс), Украіне (Львоў), Расіі (Масква, Санкт-Пецярбург), Польшчы (Варшава, Кракаў).

Галоўным месцам дакументальнай памяці пра Унію з'яўляецца знакаміты ***Архіў уніяцкіх мітрапалітаў***. Гэта вялікі комплекс разнастайных крыніц, які ўтварыўся ў выніку дзейнасці мітрапалічай канцылярыі. Ён фарміраваўся на тэрыторыі Беларусі, Літвы, Украіны і ўключыў пэўную колькасць больш ранніх крыніц з XV ст.

Уніяцкая Царква надавала асаблівую значнасць архівам цэркваў і манастыроў, старажытным дакументам – сведчанням іх гісторыі ды канфесійнай прыналежнасці. Назапашванне і зберажэнне старажытных крыніц і матэрыялаў бягучага справаводства стала адной з важных сфераў яе дзейнасці на ніве культуры і гістарычнай навукі.

Ужо сучаснікі разумелі вялікую каштоўнасць архіва ўніяцкіх мітрапалітаў у канфесійным, культурным, маёмасным і іншых сэнсах і перыядычна вялі работы па разбору, сістэматызацыі і ўліку яго дакументаў. Высокі ўзровень арганізацыі архіўнай справы абумовіў добрую захаванасць дакументальнай спадчыны Уніяцкай Царквы. Нашы далёкія адукаваныя продкі ўмелі цаніць і берагчы дакументальныя скарбы, бо разумелі іх каштоўнасць.

Праўда, падчас войнаў, паўстанняў, рабаванняў, пажараў частка дакументальнай спадчыны Царквы была знішчана і страчана, а гістарычныя катаклізмы канца XVIII–XIX ст. раскідалі яе па свеце. У 1845 г. Архіў уніяцкіх мітрапалітаў быў перададзены ў Сінадальны архіў Рускай Праваслаўнай Царквы.

Велізарная яго частка цяпер захоўваецца ў Расійскім дзяржаўным гістарычным архіве ў Санкт-Пецярбургу, у фондзе № 823 пад назвай “Канцылярыя мітрапаліта грэка-ўніяцкіх цэркваў”. У гэтым фондзе сабрана 5850 адзінак захоўвання (архіўных спраў), якія ахопліваюць прамежак часу ад 1470 па 1871 год[245].

Архіў уніяцкіх мітрапалітаў – значны па памерах і важнасці комплекс дакументаў. Гэта адзін з нешматлікіх буйных архіваў, што дайшлі да нас ад эпохі Вялікага Княства Літоўскага. Ён утрымлівае багатую і разнастайную інфармацыю не толькі канфесійнага характару, але і па гісторыі рэгіёнаў, народаў, культур.

Са знішчэннем у 1839 г. Уніяцкай Царквы і адыходу ў нябыт першых пакаленняў яе спадкаемцаў сацыяльныя функцыі захаваных дакументальна-архіўных комплексаў змяніліся – яны сталі гістарычнымі крыніцамі і былі пастаўлены на службу навуцы. Архіў уніяцкіх мітрапалітаў дастаткова запатрабаваны даследчыкамі канфесійнай гісторыі Усходняй Еўропы XVI–XIX ст. і яго інфармацыйны патэнцыял яшчэ далёка не вычарпаны. Час узмацняе навуковую каштоўнасць гэтага архіва.

Уяўленне пра змест і склад яго дакументаў дае археаграфічнае выданне “Описание документов архива западнорусских униатских митрополитов”, якое падрыхтаваў на мяжы XIX–XX ст. царкоўны гісторык і архівіст, дзеяч Рускай Праваслаўнай Царквы Сцяпан Рункевіч родам з Гродзенскай губерні. Гэта анатаваны спіс дакументаў у іх храналагічным парадку[246].

---

[245] Российский государственный исторический архив. Фонд 823 Канцелярия митрополитов греко-униатских церквей. Описи. Рэжым доступу: https://fgurgia.ru/object/441117

[246] Описание документов архива Западнорусских униатских митрополитов. Т. 1: 1470–1700. СПб., 1897. 502 с.; Т. 2: 1701–1839. СПб., 1907. 1631 с.

Ён мае вялікае значэнне для асвятлення царкоўнай гісторыі Беларусі, аднак даўно стаў рарытэтам.

Каб даць у рукі сучасных даследчыкаў канфесійнай гісторыі Беларусі ключы да пошуку інфармацыі ў архівах Расіі, Літвы і Украіны, Беларускі навукова-даследчы інстытут дакументазнаўства і архіўнай справы разам з Беларускай Грэка-Каталіцкай Царквой, зацікаўленай у грунтоўным і аб'ектыўным даследаванні ўласнай гісторыі, выдалі тры даведнікі дакументаў па гісторыі Царквы XV–XIX ст. пад агульнай назай "Архіў уніяцкіх мітрапалітаў"[247].

Прыведзеныя ў даведніках архіўныя сігнатуры (кароткія звесткі пра дакумент і яго архіўны "адрас") спрашчаюць даследчыкам доступ да інфармацыі дакументаў і даюць магчымасць рабіць іх адбор паводле неабходнай тэматыкі. Праўда, гаварыць пра інфармацыйную адкрытасць і даступнасць для беларускіх даследчыкаў самога Архіва ўніяцкіх мітрапалітаў, вывезенага яшчэ ў XIX ст. у Пецярбург, не прыходзіцца: далёка па адлегласці, не танна фінансава, а да таго ж складана ва ўмовах, калі на практыцы расійскія архівы працягваюць функцыянаваць у рамках ахоўнай стратэгіі з тэндэнцыяй да ўзмацнення рэжыму закрытасці і абмежаванняў доступу. Аднак даследчы-

[247] Архіў уніяцкіх мітрапалітаў: Дакументы па гісторыі царквы ў Беларусі XV–XIX стст. у фондзе "Канцылярыя мітрапаліта грэка-уніяцкіх цэркваў у Расіі": даведнік. Мінск-Полацк, 1999. 386 с. https://pawet.net/library/history/bel_history/_rhist/0050/архіў_уніяцкіх_мітрапалітаў._т._1.html; Архіў уніяцкіх мітрапалітаў: Дакументы па гісторыі царквы ў Беларусі XVI–XX стст. у фондах гістарычных архіваў Украіны: даведнік. Мінск-Полацк, 2001. 162 с. https://pawet.net/library/history/bel_history/_rhist/0050a/архіў_уніяцкіх_мітрапалітаў._т._2.html; Архіў уніяцкіх мітрапалітаў. Дакументы да гісторыі царквы ў Беларусі XVI–XX стст. у фондах гістарычных архіваў Літвы і Расіі: даведнік. Мінск-Полацк, 2005. 166 с. https://pawet.net/library/history/bel_history/_rhist/0051/архіў_уніяцкіх_мітрапалітаў._т._3.html

каў, якія прысвячаюць сябе вывучэнню гісторыі Уніі, гэта не спыняе.

Архіў уніяцкіх мітрапалітаў з’яўляецца рэлігійна-культурным набыткам беларускага народа[248]. Ён сам стаў прадметам даследавання. Навукоўцы вывучаюць гісторыю яго фарміравання, лёс, змест і склад дакументаў. Яму прысвячаюць артыкулы, кнігі[249], дысертацыі.

Архівы, музеі, бібліятэкі называюць інстытутамі памяці. Дакументальная памяць – галоўны аб’ект дзейнасці архіваў. Архіў уніяцкіх мітрапалітаў з’яўляецца сховішчам дакументаў – сведкаў мінулага, пастаўляе інфармацыю для гістарычных даследаванняў і сваім удзелам у канструяванні вобразу мінулага выступае мадэратарам гістарычнай свядомасці і нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў, гэта значыць, выконвае функцыі інстытута памяці.

**Музеі.** Асяродкамі захоўвання, выкарыстання і распаўсюджвання рэтраспектыўнай інфармацыі з’яўляюцца таксама музеі. Але ў адрозненне ад архіваў яны не проста фарміруюць вобраз мінулага. Яны яго эмацыйна зараджаюць і робяць адчувальным, г.зн. уключаюць больш тонкія механізмы ўспрымання інфармацыі і ўплыву на гістарычную свядомасць і памяць чалавека.

Захаваныя ўніяцкія сакральныя рэліквіі XVII – першай паловы XIX ст. (помнікі іканапісу, скульптуры,

[248] Иванов Ю. Н. “Архив западнорусских униатских митрополитов” как религиозно-культурное достояние белорусского народа // Сучасныя праблемы дакументазнаўства, архівазнаўства і археаграфіі: матэрыялы навук.-практ. канферэнцыі. Мінск, 2007. С. 155–161.

[249] Пазднякоў В. С. Архіў праваслаўных і грэка-каталіцкіх мітрапалітаў Вялікага Княства Літоўскага ў XVI–XVIII стст. (гісторыя, структура, склад). Мінск, 2014. 330 с.

дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва) захоўваюцца ў розных музеях краіны і прыватных зборах: у калекцыі аддзела старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, у Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеі-запаведніку, Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі, Гродзенскім дзяржаўным музеі гісторыі рэлігіі, музеі-галерэі "Янушкевічы" ў Ракаве[250].

***Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі*** – адзіны музей у Беларусі, які спецыялізуецца на вывучэнні і адлюстраванні гісторыі рэлігій і канфесій. Адна з яго 13-ці экспазіцыйных залаў – "Уніяцкая Царква і культура на беларускіх землях у канцы XVI – канцы XVIII ст." – была адкрыта ў 2012 г. Яна адлюстроўвае важнейшыя этапы, працэсы і знакавыя падзеі ў гісторыі Царквы і яе ўклад у культуру Беларусі. У экспазіцыі прадстаўлены копіі дакументаў, карта-схема ўніяцкіх епархій у XVII–XVIII ст., выявы выбітных дзеячаў Уніі (Іпацій Пацей, Іосіф Руцкі, Міхал Баброўскі, Язафат Булгак і інш.). Сярод музейных артэфактаў – прадметы культу, убор святара, абразы, старадрукі – творы ўніяцкіх аўтараў і выданні базыльянскіх друкарняў, карціны і фатаграфіі ўніяцкіх храмаў і знакавых мясцін. Яны адлюстроўваюць уплыў зменаў у культавай практыцы Уніяцкай Царквы на развіццё мастацкай культуры Беларусі, асветніцкую дзейнасць ордэна базыльянаў. У канцэпцыю экспазіцыйнай тэмы закладзена ідэя, што без ведання

[250] Флікоп-Світа Г. А. Іканастасы і алтары грэка-каталіцкіх храмаў Беларусі XVII – першай трэці XIX ст. Мінск, 2021. С. 299, 345.

гісторыі Уніяцкай Царквы немажліва цэласнае ўспрыняцце культурнай спадчыны беларускага народа.

Выданні базыльянскіх друкарняў зберагаюцца таксама ў зборах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, у аддзеле рэдкай кнігі і рукапісаў Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея і інш.

У Беларусі плануецца стварыць ***музей царкоўнай Уніі***. Першыя крокі да стварэння паўнавартаснага музея, які раскажа пра яе старажытную і багатую гісторыю, прадпрыянты гродзенскай парафіяй Маці Божай Фацімскай. Ідзе збор экспанаў, звязаных з гісторыяй Уніі ў Беларусі.

Асновай экспазіцыі музея стане ўжо сабраная ў парафіяльным будынку калекцыя прадметаў: кнігі XVIII ст., надрукаваныя ў базыльянскіх друкарнях; нацельныя медальёны з выявай Св. Язафата; рэліквіі з жыцця адроджанай у XX ст. Уніі, якая працягвала існаваць у эміграцыі,– Велікабрытаніі і Злучаных Штатах Амерыкі. Распрацавана канцэпцыя музея. Экспазіцыя будзе складацца з трох блокаў. Першы прысвечаны росквіту Уніі ў часы Вялікага Княства Літоўскага. Другі – адраджэнню Грэка-Каталіцтва ў XX ст., уключна з падпольным перыядам існавання Царквы ў часы СССР. Трэці распавядзе пра новае жыццё Царквы з пачатку 1990-х г. і да нашых дзён. Ёсць складанасці ў фарміраванні музея. Экспанатам гістарычнай Уніі мае быць як мінімум па 200 гадоў. Між тым, сакральныя рэліквіі знішчаліся з яе скасаваннем у 1839 г.: палілі кнігі, перамалёўвалі абразы, распілоўвалі статуі, разбівалі арганы. Крыху больш экспанатаў па Уніі з XX ст., якую прасоўвалі святары як у Беларусі, так і за яе межамі (у музейнай калекцыі – аблачэнне, у якім служылі а. Чэслаў Сіповіч і а. Аляксандр Надсан).

## Сакральныя святыні

Гістарычная Унія прысутнічае ў нашым жыцці ў сакральных рэліквіях. Хада часу ўзмяцняе іх каштоўнасць для беларускай культуры.

І на сённяшні дзень сілуэтнымі і сэнсавымі дамінантамі шэрагу беларускіх гарадоў і мястэчак з'яўляюцца ***помнікі ўніяцкага сакральнага дойлідства XVII – першай трэці XIX ст.*** Яны ўяўляюць сабой самабытную інтэрпрэтацыю архітэктурных форм і мастацкіх стыляў, якія выпрацавала ў сваім развіцці хрысціянская культура як Усходу, так і Захаду Еўропы.

Лепшыя ўзоры ўніяцкага храмабудаўніцтва сталі неад'емнай часткай гісторыі і культуры Беларусі, а творы віленскага (уніяцкага) барока – каштоўным унёскам беларускага народа ў скарбніцу еўрапейскай культуры.

Сярод культурных славутасцей Беларусі – былыя ўніяцкія мураваныя святыні, узведзеныя ў стылі віленскага барока: царква Святой Сафіі ў Полацку (1044–1066, 1738–1750), Успенскі сабор (1715–1743) і Васкрасенская царква (1740-я – 1750-я г.) у Віцебску, Петрапаўлаўская царква базыльян у Беразвеччы (Глыбокае, Віцебскай вобласці, 1756–1763 г.), касцёл Святых Апосталаў Пятра і Паўла ў вёсцы Баруны (Ашмянскі раён Гродзенскай вобласці, 1747–1757), царква Святой Тройцы (вёска Вольна, Баранавіцкі раён, Брэсцкая вобласць, 1768), Пакроўская царква ў Талачыне (1769–1779), Багаяўленская і Крыжаўзвіжанская цэрквы ў Жыровіцах (1769). Гэтыя помнікі вызначае вытанчаная прыгажосць галоўных фасадаў храмаў, вертыкалізм, ажурнасць, маляўнічасць і найбагацейшы сінтэз мастацтваў.

Сафійскі сабор у Полацку адносіцца да тых твораў культуры, якія ўяўляюць сусветную каштоўнасць. Беларусь прапаноўвае ўключыць яго ў Спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА і патэнцыйна храм можа атрымаць такі высокі статус.

На нашай зямлі захаваўся шэраг помнікаў драўлянага ўніяцкага храмабудаўніцтва XVII ст., праўда, істотна перабудаваных у пазнейшы час. Ацалелі дзясяткі драўляных храмаў XVIII ст. – менавіта ўніяцкае царкоўнае дойлідства складала асноўную частку (каля 90%) драўляных царкоўных пабудоў XVIII ст[251].

Нягледзячы на значныя страты (з прычыны войнаў, паўстанняў, недаўгавечнасці дрэва як будаўнічага матэрыялу, змены ідэалагічных прыярытэтаў, атэістычнай палітыкі XX ст.), архітэктурная спадчына Беларусі захоўвае яшчэ дастаткова шмат выдатных помнікаў уніяцкага сакральнага дойлідства. Многія з іх вернуты да жыцця пасля шматгадовага занядбання. Праўда, ніводзін з іх сёння Грэка-Каталіцкай Царкве не належыць.

У працы “Сакральнае дойлідства Беларусі: 1000-гадовая спадчына” доктар мастацтвазнаўства, прафесар Тамара Габрусь прыводзіць інфармацыю, як мы падлічылі, пра 19 мураваных і 37 драўляных уніяцкіх храмаў XVII – першай паловы XXI ст., якія праз стагоддзі цудам ацалелі да нашых дзён[252]. Інфармацыя пра гэтыя храмы прыведзена ў складзенай намі на аснове гэтай кнігі ***табліцы “Помнікі ўніяцкай сакральнай архітэктуры” (гл.:*** *Аріхтэктурная спадчына****).***

А ў манаграфіі “Драўлянае хрысціянскае храмабудаўніцтва Беларусі” Тамара Габрусь характарызуе

---

[251] Габрусь Т. В. Сакральнае дойлідства Беларусі: 1000-гадовая спадчына. Мінск, 2014. С. 18.

[252] Тамсама. С. 373–448.

архітэктурныя асаблівасці 418 драўляных храмаў у асноўным XVII–XVIII ст. розных хрысціянскіх канфесій. Не для ўсіх указана іх канфесійная прыналежнасць з-за недахопу інфармацыі гістарычных крыніц. 116 з гэтых храмаў, па нашых падліках, у манаграфіі называюцца заснаванымі як уніяцкія[253]. Звесткі пра іх, прыведзеныя Т. Габрусь, мы звялі ў ***табліцу "Помнікі драўлянага ўніяцкага храмабудаўніцтва XVII – першай паловы XIX ст."*** *(гл.: Аріхтэктурная спадчына)*.

Творы архітэктуры жывуць адначасова і ў гістарычнай, і ў рэальнай прасторы. Кожная, нават самая сціплая святыня напоўнена эмацыйным, эстэтычным, духоўным сэнсамі, багацце якіх яна нам перадае.

Аднак лёс культавых помнікаў Беларусі XVII–XVIII ст. усіх веравызанняў іх даследчыца Т. Габрусь ацэньвае як трагічны, нягледзячы на карэнныя змены ў стаўленні грамадства і дзяржавы да рэлігіі. У наш час, пасля адраджэння рэлігійнага жыцця розных канфесій, з "благими" намерамі над архітэктурнай традыцыяй Беларусі ажыццяўляюцца жорсткія эксперыменты, якія ніякім чынам не нагадваюць рэстаўрацыю ці нават пачцівы рамонт. Многія старажытныя храмы зменены да непазнавальнасці непрафесійнымі перабудовамі і страцілі сваю мастацкую сапраўднасць і прывабнасць, нават сакральнасць. *"Больш таго,* – піша Т. Габрусь, – *з боку іерархічных колаў асноўных хрысціянскіх канфесій, як праваслаўя, так і каталіцтва, на сённяшні дзень пануюць валюнтарызм і тэндэнцыйнасць у адносінах да гісторыка-культурнай спадчыны, непавага і неразуменне эстэтычных каштоўнасцей традыцыйнага*

[253] Габрусь Т. В. Драўлянае хрысціянскае храмабудаўніцтва Беларусі. Мінск, 2020.

*айчыннага храмабудаўніцтва. Адраджэнне рэлігійнага жыцця паўсюдна суправаджаецца не адраджэннем старажытных храмаў, але іх маральным ці фізічным знішчэннем, насаджэннем чужароднай эстэтыкі з выкарыстаннем больш прагматычных сучасных будаўнічых матэрыялаў. … Руйнаванне сакральнай архітэктурнай спадчыны, абумоўленае рэлігійным супрацьстаяннем, тэндэнцыйнасцю, спекулятыўным прагматызмам і недасведчанасцю, працягваецца”*[254].

Чыноўнікі з сістэмы аховы і рэстаўрацыі помнікаў, па словах Т. Габрусь, часта не вырашаюць, а камуфлююць рэальны стан праблемы. *“Нягледзячы на пэўныя пазітыўныя зрухі, за прайшоўшыя паўстагоддзя з прычыны безгаспадарнасці, нядбайнасці і непрафесійнасці бюракратаў ад дзяржаўнай аховы і некваліфікаванай рэстаўрацыі страчана вельмі многа помнікаў хрысціянскага драўлянага храмабудаўніцтва, а грамадскі рух па іх ахове зведзены амаль дашчэнту. І ў бягучым стагоддзі,* – б’е трывогу даследчыца, – *на жаль, працягваецца працэс вынішчэння нацыянальных архітэктурна-будаўнічых традыцый і ўнікальных матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі, што спрадвеку была краінай дойлідаў”*[255].

Больш-менш захаваныя да нашага часу ***ўніяцкія інтэр’еры*** можна пабачыць толькі ў адзінкавых храмах: Сафійскім саборы г. Полацка, Пакроўскай царкве г. Талачын Віцебскай вобласці, царкве Св. Тройцы аг. Вольна і царкве Праабражэння в. Порплішча Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці.

Да нас дайшлі адзінкавыя структуры іканастасаў XVII – пачатку XIX ст. і нешматлікія прыклады

[254] Габрусь Т. В. Драўлянае хрысціянскае храмабудаўніцтва Беларусі. Мінск, 2020. С. 290.
[255] Тамсама.

архітэктурных прысценных алтароў, пераробленыя ў рыта ківоды.

***Захаваліся іканастасы***: каменныя іканастасы XVIII ст. у Сафійскім саборы Полацка і Пакроўскай царкве Талачына; трох'ярусны драўляны іканастас 1676 г. (па другой версіі – 1730 г.) – ва Успенскім саборы Жыровіцкага манастыра Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці; барочная алтарная агароджа XVIII ст. і аднаярусны іканастас 1830-х г. – у царкве вёскі Порплішча Докшыцкага раёна; эталонны чатырох'ярусны іканастас першай паловы – сярэдзіны XIX ст. – у аг. Олтуш Маларыцкага раёна; самабытныя незвычайныя канструкцыі XIX ст. – у храмах в. Сінкевічы Лунінецкага раёна і Альгомель Столінскага раёна; трох'ярусныя іканастасы апошніх гадоў Уніі – у цэрквах аг. Кажан-Гарадок Лунінецкага раёна (чатыры апошнія ў Брэсцкай вобласці) і г. Стоўбцы Мінскай вобласці. Самы старажытны сярод захаваных уніяцкіх іканастасаў – у саборы Успення Багародзіцы Жыровіцкага манастыра. Самыя маладыя з захаваных да нашага часу, створаныя ў 1836 г., незадоўга да скасавання Уніі, іканастасы – у царкве Св. Ганны г. Стоўбцы Мінскай вобласці і царкве Св. Мікалая ў Кажан-Гарадку Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці[256].

***Прысценныя алтары***, якія з'яўляюцца спадчынай Уніяцкай Царквы, былі выяўлены іх даследчыцай Галінай Флікоп-Світа ў Сафійскім саборы Полацка, Пакроўскай царкве г. Талачын, царкве Праабражэння в. Порплішча Докшыцкага раёна – усе тры ў Віцебскай вобласці; у царкве Св. Тройцы аг. Салтанаўшчына Нясвіжскага раёна, царкве Праабражэння г.п. Ракаў Валожынскага раёна – абедзве ў Мінскай

[256] Флікоп-Світа Г. А. Іканастасы і алтары грэка-каталіцкіх храмаў Беларусі XVII – першай трэці XIX ст. Мінск, 2021. С. 345.

вобласці; касцёле Св. Пятра і Паўла аг. Баруны Ашмянскага раёна, у праваслаўным храме Св. Тройцы г. Зельва аднайменнага раёна – абодва ў Гродзенскай вобласці; у шэрагу цэркваў Брэстчыны: Св. Тройцы аг. Вольна і Праабражэння в. Новая Мыш (абедзве ў Баранавіцкім раёне), Св. Мікалая аг. Кажан-Гарадок і Св. Георгія-Пераможцы аг. Сінкевічы Лунінецкага раёна, Св. Тройцы в. Войская Камянецкага раёна, Св. Параскевы аг. Дзівін Кобрынскага раёна, Св. Параскевы в. Збірогі Брэсцкага раёна, Праабражэння в. Олтуш Маларыцкага раёна і інш[257].

Архітэктурна аформленыя нішы ў каменных сценах, прызначаныя для фарміравання бакавых алтароў, захаваліся ў царкве Св. Дзмітрыя Салунскага ў в. Шчорсы Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці. Прыклад ілюзорнага іканастаса, напісанага на сцяне храма, можна ўбачыць у каменнай царкве Дабравешчання Багародзіцы манастыра в. Малыя Ляды Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці[258].

Большасць захаваных да нашага часу (у значнай частцы ў музеях) ***твораў уніяцкага жывапісу*** – іканапісных выяў і алтарных карцін – прэзентуюць мастацтва Брэстчыны, бо менавіта туды ладзіліся музейныя экспедыцыі для збору абразоў. З усходніх абласцей Беларусі помнікаў захавалася мала – іх значная частка загінула ў першыя дзесяцігоддзі існавання савецкай улады, якая вяла барацьбу з рэлігіяй. На захадзе Беларусі – Гродзеншчыне, Брэстчыне і заходняй Віцебшчыне, якія ў 1921–1939 г. знаходзіліся ў складзе Польшчы, сакральныя помнікі, працягвалі захоўвацца[259].

[257] Тамсама.
[258] Тамсама.
[259] Тамсама. С. 9.

Унікальныя здабыткі ўніяцкай даўніны захоўваюцца ў нашай візуальнай памяці дзякуючы фотаздымкам беларускіх фотамайстроў, якія з найлепшых ракурсаў прэзентуюць скарб, пакінуты нам продкамі.

Багаты ***фотаархіў*** сабралі ў час навуковых экспедыцый супрацоўнікі Інстытута этнаграфіі, мастацтвазнаўства і фальклору Акадэміі навук БССР – здымкі інтэр’ераў храмаў, абразоў, царскіх брам, скульптур, фератронаў, зробленыя ў 1970-я – 1980-я г.

Значная колькасць уніяцкіх цэркваў і абразоў захавалася на Брэстчыне. Супрацоўнікі, якія вялі экспедыцыйнае даследаванне, былі ўражаны сустрэчамі з храмамі Брэстчыны. Многія з іх былі зачыненыя або зруйнаваныя. Вільгаць і дождж прасочваліся ўнутр праз старыя гонтавыя стрэхі. У некаторых храмаў зусім не было пакрыцця. Абразы часам ляжалі на падлозе сярод смецця. Сустракаліся цэрквы, у якіх абразамі былі забітыя вокны.

Шмат што змянілася з таго часу – у постсавецкі перыяд многія храмы былі адрэстраўраваны і перабудаваны, іканастасы ў іх былі перафарміраваны, абразы перапісаны. А створаны Інстытутам этнаграфіі, мастацтвазнаўства і фальклору фотаархіў і сёння дае нам уяўленне пра іх аўтэнтычнае аблічча. Шматлікія ***іканаграфічныя крыніцы*** з гэтага архіва – малюнкі, чарцяжы, старыя фотаздымкі – апублікавала ў сваім даследаванні “Іканастасы і алтары грэка-каталіцкіх храмаў Беларусі XVII – першай трэці XIX ст.” кандыдат мастацтвазнаўства Галіна Флікоп-Світа. Яна прывяла таксама шэраг фотаздымкаў помнікаў сакральнага мастацтва, якія сёння захоўваюцца ў дзеючых храмах, музеях, прыватных зборах і былі зроблены ёю ў 2020–2021 г. падчас асабістага наведвання храмаў і натурна-

га вывучэння помнікаў[260]. Працу Галіны Флікоп-Світы можна лічыць першым так багата ілюстраваным выданнем, спецыяльна прысвечаным мастацкай спадчыне Уніі. Кніга выдадзена на высокім паліграфічным узроўні і аздоблена якасным каляровым іканаграфічным матэрыялам.

***Творы сакральнага жывапісу*** Уніяцкай Царквы можна таксама ўбачыць у альбомах "Іканапіс Беларусі XV–XVIII стагоддзяў", "Беларускі іканапіс XVI – першай паловы XX ст." і інш[261].

***Узоры разьбы па дрэве, якія ствараліся для грэка-каталіцкіх храмаў***, сярод іншых апублікаваны ў каталогу і альбоме, укладзеных Н. Ф. Высоцкай, "Скульптура и резьба на Беларуси XII–XVIII веков" і "Пластыка Беларусі XII–XVIII стст."[262].

Нацыянальным беларускім брэндам сталі адноўленыя рэстаўратарамі ***Царскія Брамы, плецены з саломкі***, з некалькіх цэркваў Пінскага Палесся. Яны захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі (саламяныя Царскія Брамы з вёскі Вавулічы Драгічынскага раёна і вёскі Лемяшэвічы Пінскага раёна) і ў Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным

[260] Флікоп-Світа Г. А. Іканастасы і алтары грэка-каталіцкіх храмаў Беларусі XVII – першай трэці XIX ст. Мінск, 2021. С. 9.

[261] Іканапіс Беларусі XV–XVIII стагоддзяў / Аўтар тэксту і складальнік Н. Ф. Высоцкая. Мінск, 1992; Сакральная живопись Беларуси XV–XVIII веков / Автор текста и составитель Н. Ф. Высоцкая. Минск, 2007; Иконопись и алтарная живопись Беларуси XII–XVIII веков / автор текста и составитель Н. Ф. Высоцкая. Минск, 2012; Беларускі іканапіс XVI – першай паловы XX ст.: альбом / Г. А. Флікоп-Світа. Мінск, 2019; Іканапіс і алтарны жывапіс Беларусі XVI – пачатку XIX стагоддзя: альбом-каталог / аўтар ідэі і кіраўнік праекта У. І. Пракапцоў. Мінск, 2021.

[262] Скульптура и резьба на Беларуси XII–XVIII веков: Каталог / Автор-составитель Н. Ф. Высоцкая. Минск, 1998; Пластыка Беларусі XII–XVIII стст. / Аўтар і складальнік Н. Ф. Высоцкая. Мінск, 1983.

музеі (брама, якая паходзіць з вёскі Ляскавічы Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці). Відарысы гэтых унікальных помнікаў манументальна-дэкаратыўнага мастацтва змешчаны ў манаграфіі Вольгі Лабачэўскай "Мастацтва дзеля славы Божай: саламяныя іканастасныя вароты і царкоўна-культавыя прадметы"[263].

***Візуальнае ўяўленне пра архітэктурную спадчыну Уніяцкай Царквы*** даюць працы доктара мастацтвазнаўства, прафесара Тамары Габрусь "Сакральнае дойлідства Беларусі: 1000-гадовая спадчына" і "Драўлянае хрысціянскае храмабудаўніцтва Беларусі"[264], багата ілюстраваныя вялікай колькасцю каляровых сучасных і архіўных фотаздымкаў, планаў і рэканструкцый збудаванняў.

Шэраг знакавых помнікаў уніяцкай сакральнай архітэктуры ў іх стане на 2021–2022 г. зафіксаваны на фатаграфіях з зямлі і з паветра (дронам) аўтарам гэтых радкоў[265].

***"Прастору гісторыі" Уніі пашыраюць экранныя мастацтвы***. Яркі вобраз Свята-Мікалаеўскай царквы ў в. Кажан-Гарадок Брэсцкай вобласці, узведзенай у 1814–1818 г., стварае відэафільм з серыі "Архітэктура Беларусі"[266]. Пра беларускія абразы распавядае ў серыі відэаперадач (18 відэа) пад агульнай назвай "Прыхаваныя каштоўнасці: беларускія іконы

[263] Лабачэўская В. А. Мастацтва дзеля славы Божай: саламяныя іканастасныя вароты і царкоўна-культавыя прадметы. Мінск, 2018.

[264] Габрусь Т. В. Сакральнае дойлідства Беларусі: 1000-гадовая спадчына. Мінск, 2014; яе ж: Драўлянае хрысціянскае храмабудаўніцтва Беларусі. Мінск, 2020.

[265] Марозава С., Марозаў С. Мастацкая спадчына Беларусі. Гродна, 2022. 576 с. https://pawet.net/files/mspadczyna.pdf

[266] Свята-Мікалаеўская царква (в. Кажан-Гарадок, Брэсцкая вобласць) | АРХІТЭКТУРА БЕЛАРУСІ. Рэжым доступу: https://www.youtube.com/watch?v=JMWmLwKtp9c&t=18s

са сховішчаў” гісторык мастацтва, кандыдат мастацтвазнаўства, навуковы супрацоўнік аддзела выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Галіна Флікоп-Світа[267]. Значная ўвага даследчыцы прысвечана іканаграфіі ўніяцкіх абразоў.

У наш час ***памяць пра Унію ўсё больш выходзіць на прасторы інтэрнэта***.

Гэту памяць у папяровым і электронным варыянце зберагае, назапашвае і шырыць з 1995 г. грэка-каталіцкая парафія Святых апосталаў Пятра і Андрэя ў Брэсце. Галоўны рэдактар – а. Ігар Кандрацьеў, выпускны рэдактар – брэсцкі гісторык і краязнаўца, адзін з заснавальнікаў гэтай парафіі Ігар Бараноўскі. Яны ствараюць матэрыялы па гісторыі Уніяцкай Царквы, асвятляюць жыццё грэка-каталіцкіх супольнасцяў у Беларусі і за мяжой ды іншую рэлігійна-асветніцкую інфармацыю.

Свой уклад у гістарычную памяць пра Унію ўносяць разнастайныя інфармацыйныя рэсурсы. Гэта старонка “Грэка-каталіцкая Царква” на сайце “Catholic. by”[268], сайты Грэка-каталіцкага цэнтра Святога і Праведнага Язэпа ў Мінску, Грэка-каталіцкай парафіі Маці Божай Фацімскай ў Гродна, “Рэдэмптарысты візантыйскага абраду ў Беларусі”, старонкі Грэка-каталіцкай парафіі Святога Язафата ў Лідзе, “Грэка-каталікі (уніяты) Беларусі”[269], блогі грэка-

[267] Прыхаваныя каштоўнасці: беларускія іконы са сховішчаў. https://www.youtube.com/playlist?list=PLmYS4cZ8qzcMS8Q1AOvrHMk9PBKAUeHA

[268] https://catholic.by/3/tags/gkc; https://old.catholic.by/2/home/news/belarus/gkc.html

[269] svjazep.org; https://facimskaja.by/; https://www.facebook.com/lidabhkc/; https://vk.com/hrekakataliki; http://www.cssr.by/.

каталіцкіх святароў, рэсурс “Былыя ўніяцкія храмы Беларусі”[270] і іншыя, якія асвятляюць пытанні гісторыі і сучаснага жыцця Беларускай Грэка-Каталіцкай Царквы.

***Памяць пра Унію падтрымліваюць, пашыраюць і ўзбагачаюць яе даследчыкі.*** Сёння вывучэннем дзейнасці Уніяцкай Царквы ў 1596–1839 г. актыўна займаецца цэлая група беларускіх гісторыкаў (Святлана Марозава, Дзяніс Лісейчыкаў), філосафаў (Дзмітрый Смалякоў), філолагаў (Іван Саверчанка), мастацтвазнаўцаў (Тамара Габрусь, Галіна Флікоп-Світа), краязнаўцаў (Леанід Лаўрэш) і інш[271]. Набыткам навукі і грамадства становяцца адкрытыя імі новыя артэфакты Уніі, выяўленыя і апублікаваныя новыя гістарычныя крыніцы *(гл.: Берасцейская унія як з’ява культуры: гістарыяграфічнае асэнсаванне. Сучасная беларуская гістарыяграфія).* Навуковыя працы спрыяюць актуалізацыі гістарычнай памяці пра Унію і папулярызуюць яе культурную спадчыну[272].

Можна гаварыць пра дваякага роду “месцы памяці” Уніі: уласна гістарычныя артэфакты і месцы другаснай памяці, якая ўвасоблена ў даследаваннях і навукова-папулярных выданнях пра Унію, у цар-

---

[270] Былыя ўніяцкія храмы Беларусі [Электронны рэсурс] https://m.vk.com/album-1687893_162386620?z=photo-1687893_287885972%2Falbum-1687893_162386620

[271] Марозаў С. П. Сучасныя беларускія даследчыкі гісторыі Вялікага Княства Літоўскага: біябібліяграфічны даведнік. Гродна-Каўнас, 2022. С. 55–57, 146–147, 148–149, 169–170, 205–207, 222, 245–246.

[272] Напрыклад: Манастыры ў Тараканях і Быцені ў свой час лічыліся культурнымі і рэлігійнымі цэнтрамі. Як гэта было і што з імі сталася далей? Слухайце перадачу, падрыхтаваную паводле артыкулаў кандыдата гістарычных навук Дзяніса Лісейчыкава [Электронны рэсурс] https://radiomaria.by/audyyateka/102-pa-staronkakh-krayaznauchaj-gazety/2006-pa-staronkakh-krayazna-chaj-gazety-vypusk-9

коўных святах і юбілейных урачыстасцях, шанаванні святых і святынь, у сучасных творах мастацтва і лічбавых рэсурсах. Новай з’явай нашага часу стала графічная рэканструкцыя страчаных або захаваных у руінах храмаў у электронным выглядзе або ў выглядзе кардонных макетаў[273].

[273] Графічнае адраджэньне страчанай архітэктурнай спадчыны [Электронны рэсурс].

# Заключэнне

Ніхто з падзей беларускай мінуўшчыны можа паспаборнічаць з Берасцейскай уніяй узроўнем папулярнасці і няспынным ростам цікавасці ў айчынных і замежных даследчыцкіх колах. Унію хвалілі, лаялі, абыходзілі маўчаннем. Яе першыя інтэрпрэтацыі ўзыходзяць да часоў сабора 1596 г. Асновы навуковага вывучэння ўніяцкай праблематыкі былі закладзены ў апошняй трэці XIX – першай трэці XX ст. Тады ж паўстала і пытанне аб Уніі як з’яве культуры.

Аднак у савецкі час узмоцненая ўвага ўсходнеславянскай гістарыяграфіі да Уніі змянілася тэндэнцыяй да застою ў яе вывучэнні. На помнікі культавага мастацтва ўсіх канфесій многія глядзелі тады нядобразычліва, насцярожана, а часам і варожа. У выніку гэтага трагічнага непаразумення часу мы страцілі многія сотні цэркваў, абразоў, драўляных скульптур, твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якія паступова адыходзілі ў нябыт.

Зняцце ідэалагічнага прэсінгу з гістарычнай навукі ў другой палове 1980-х г., пасля паўтаравекавога цкавання Уніі спачатку ў жыцці, а потым у навуцы,

прывяло да новага вітка даследчай цікавасці да яе. Найбольшую цікавасць праяўляюць гісторыкі Беларусі і краін, з якімі ў мінулым яе звязвалі агульныя дзяржаўныя межы.

***XXI ст. прынесла значныя змены ў канцэптуальныя падыходы да гісторыі Уніі і яе культурнай спадчыны.*** Былі выяўлены новыя архіўныя дакументы і пераасэнсаваны ўжо вядомыя крыніцы. Па "берасцейскай праблематыцы" з'явіліся сотні новых артыкулаў, дзясяткі салідных манаграфій, абаронены многія кандыдацкія і доктарскія дысертацыі. Рашуча абвергнуты стэрэатыпы царскай і камуністычнай гістарыяграфіі, якія раней навукоўцамі толькі падвяргаліся сумневу. Сталі ледзь не аксіёмамі палажэнні, што з цяжкасцю прабіваліся ў навуку.

Фарміраванню сучаснага навуковага ўяўлення пра Унію спрыяюць працы філосафаў, якія бачаць у ёй беларускі сацыякультурны феномен. Значны ўклад у разуменне феномена Уніі ўнеслі працы беларускіх вучоных, якія займаліся яго спецыяльным вывучэннем: філосаф С. Падокшын, гісторыкі С. Марозава, Д. Лісейчыкаў, культуролаг А. Суша, мастацтвазнаўцы Т. Габрусь, Г. Флікоп-Світа, філолаг І. Саверчанка, музыказнаўцы Т. Ліхач, У. Неўдах і інш.

Хоць асноўныя з'явы і працэсы гісторыі ўніяцкага сакральнага мастацтва сёння вядомыя навуцы, пытанні аб ролі Уніяцкай Царквы ў развіцці нацыянальнага мастацтва і ўклад праз яе беларускага народа ў еўрапейскую і сусветную культуру яшчэ далёкія ад вычарпальнага вывучэння і асэнсавання. У наш час усё больш відавочнай становіцца неабходнасць паглыбленага даследавання культавай творчасці нашага народа. Мы па-новаму адкрываем для сябе своеаса-

блівасць і хараство старажытнага ўніяцкага дойлідства, манументальных роспісаў, абразоў, скульптур. Яны і сёння ўдзельнічаюць у фарміраванні сістэмы каштоўнасцей, уяўленняў народа, яго нацыянальнага духу. Таму ўлік і апісанне ўсёй мастацкай спадчыны Уніяцкай Царквы – як той, што дайшла да нашага часу, так і страчанай, вядомай толькі па інвентарах, – мае культурную і навуковую значнасць.

Беларускі культурны ўздым канца XVI – першай паловы XVII ст., абуджэнне нацыянальнай свядомасці этнасу, павышэнне гістарычнай культуры грамадства ў значнай ступені звязаны з заключэннем і пашырэннем Берасцейскай уніі. 1596 год даў моцны штуршок актывізацыі інтэлектуальна-культурнага жыцця. Гэта выявілася ў літаратурным уздыме, кароткачасовым узлёце кірылічнага кнігадрукавання, актывізацыі школьнай справы, навуковым вывучэнні мінулага, увядзенні нацыянальнай мовы ў сакральную сферу.

З самагу пачатку свайго існавання Уніяцкая Царква пачынае ствараць уласны культурны набытак: школы, кнігі, абразы, храмы і г.д., з дапамогай якіх імкнулася прыцягнуць на свой бок беларусаў. Культуратворчая дзейнасць узмацняецца з канца XVII ст, са стабілізацыяй Царквы, а яе росквіт і нараджэнне новых творчых павеваў адбываецца ў XVIII ст. Выключна важную ролю ў гэтых працэсах адыгрывалі базыльяне. У канцы XVI – першай палове XIX ст. на патрэбы Уніяцкай Царквы працавалі пісьменнікі і друкары, педагогі і вучоныя, архітэктары і будаўнікі, скульптары і рэзчыкі, іканапісцы і ювеліры, кампазітары і музыканты.

За два з паловай стагоддзі (1596–1839 г.) Уніяцкая Царква Беларусі ўнесла значны ўклад у развіц-

цё адукацыі, кніжнай культуры, архіўнай справы і сфарміравала магутны пласт мастацтва (у сферы архітэктуры, жывапісу, скульптуры, музыкі, тэатра, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва) з выразна акрэсленымі нацыянальнымі асаблівасцямі. Грэка-Каталіцкая Царква, як гэта вынікае з самой яе назвы, сінтэзавала рэлігійныя і эстэтычныя каноны абедзвюх канфесій. Творы сакральнага мастацтва візуальна засведчылі сутнасць уніяцкай канфесіі, шмат у чым заснаванай на сінтэзе традыцый. Спецыфіку ўніяцкага мастацтва Беларусі складаюць яго народны характар, рэлігійная талерантнасць, творчая крэатыўнасць і этнічная самабытнасць.

***Найбуйнейшымі цэнтрамі развіцця мастацтва, звязанага з Уніяй, былі гарады, у якіх мясціліся епіскапскія кафедры (Вільня, Полацк, Віцебск, Брэст, Пінск), або мясцовасці, дзе знаходзіліся найважнейшыя манастыры (Жыровіцы, Мінск, Баруны і інш.).***

Культуратворчая дзейнасць Уніяцкай Царквы спрыяла павышэнню ўзроўню пісьменнасці ды асветы ў Беларусі, падрыхтоўцы значнага пласту інтэлігенцыі, стымулявала развіццё мастацтваў, у тым ліку нетрадыцыйных для класічнага Праваслаўя, пашырала міжнародныя кантакты і садзейнічала набліжэнню Беларусі да еўрапейскай культурнай прасторы.

***Адным з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці Уніяцкай Царквы было стварэнне і развіццё сваёй сістэмы адукацыі, адпаведнай уласнай спецыфіцы і арыентаванай на патрэбы грамадства.*** Справу асветы сканцэнтраваў у сваіх руках базыльянскі ордэн. На працягу XVII – першай трэці XIX ст. Царква на ўласныя сродкі стварыла розна-

тыповыя навучальныя ўстановы, прызначаныя для манаства, свецкага духавенства і шляхецкай моладзі. Яны рыхтавалі кадры не толькі для Царквы, але і для дзяржаўнай службы ў Вялікім Княстве Літоўскім і фарміравалі інтэлектуальную эліту Беларусі. Вялікая ўвага ў гэтых навучальных установах надавалася свецкім дысцыплінам. Адукацыя мела патрыятычную скіраванасць. Педагогамі працавалі многія выдатныя людзі свайго часу, якія падрыхтавалі шмат вядомых царкоўных, культурных, грамадска-палітычных дзеячаў, вучоных і пісьменнікаў.

Выдзяляюцца два этапы адукацыйнай актыўнасці Царквы: першая чвэрць XVII ст. і апошняя чвэрць XVIII – першая трэць XIX ст. Найбуйнейшымі асветніцкімі цэнтрамі Уніі ў XVII ст. былі Вільня, Мінск, Быцень. У другой чвэрці XVIII ст. базыльяне забяспечвалі працу вялікай колькасці сярэдніх школ ва ўсёй Рэчы Паспалітай. У апошняй чвэрці XVIII ст. пазіцыі базыльян у сферы адукацыі ўзмацніла перадача ім шэрагу навучальных устаноў ордэна езуітаў пасля яго скасавання ў 1773 г., і базыльянскае школьніцтва стала найбольш прадстаўнічым на тэрыторыі Беларусі. У гісторыю адукацыі Беларусі, Усходняй Еўропы ўвайшлі свецкія школы (вучылішчы) у Барунах, Беразвеччы, Брэсце, Віцебску, Вярбілаве, Жыровіцах, Лядах, Паддубісе, Талачыне і інш., якія ўтрымліваліся базыльянскім ордэнам. Уніяцка-базыльянскія школы адыгралі вялікую і карысную ролю ў развіцці адукацыі і асветы ў Беларусі.

Расійскі ўрад меў намер выкарыстаць педагагічны досвед базыльян для падрыхтоўкі маладога пакалення, прасякнутага вернападданніцкімі пачуццямі, і спачатку стварыў спрыяльныя ўмовы

для рэалізацыі імі сваёй адукацыйнай праграмы. Сваёй дзейнасцю на ніве асветы базыльяне працягвалі існаванне Уніі на забраных Расіяй тэрыторыях. Былі створаны навучальныя ўстановы павышанага тыпу для падрыхтоўкі свецкага духавенства (семінарыі пры Віленскім універсітэце, у Полацку, Лаўрышаве і Жыровіцах; прапрацоўваўся праект заснавання духоўнай акадэміі ў Полацку). Але надзеі царызму на базыльян не апраўдаліся. Вучонае манаства паралізоўвала намаганні ўраду па ўнутраным зліцці краю з імперыяй, прышчэплівала ўніяцкай моладзі ліцвінскі сепаратызм і мясцовы патрыятызм. Таму на мяжы 1820-х – 1830-х г. базыльяне былі выцеснены са сферы адукацыі, а іх кляштары скасаваныя. Уніяцкая сістэма адукацыі зазнала карэнную рэарганізацыю і была пераарыентавана на падрыхтоўку духавенства да аб'яднання з Праваслаўем.

***Важкім укладам у пашырэнне асветы, пісьменства і культуры Беларусі стала кнігавыдавецкая дзейнасць Уніяцкай Царквы, у якой вызначыўся ордэн базыльян.*** Кніжныя патрэбы Царквы ў першай чвэрці XVII ст. забяспечвала Віленская друкарня прыхільных да Уніі беларускіх выдаўцоў Мамонічаў, потым – друкарня Троіцкага базыльянскага манастыра ў Вільні, а таксама базыльянскія друкарні ў Пачаеве, Львове і Уневе. У канцы XVII ст. новы цэнтр уніяцкага кнігадрукавання быў заснаваны на тэрыторыі Гродзенскага павета, у Супрасльскім манастыры – буйным інтэлектуальным асяродку Вялікага Княства Літоўскага. За 100 гадоў існавання (1695–1803 г.) Супрасльская друкарня выпусціла каля 500 назваў кніг на розных мовах. Больш за палову яе друкаў ніяк не звязана з мэтамі базы-

льянскага ордэна. Гэта філасофскія, мастацкія творы, падручнікі, заканадаўчыя акты, працы па геаграфіі, гісторыі, медыцыне, сельскай гаспадарцы, практычныя парады і г.д. У эпоху Асветніцтва Супрасльская друкарня прыклала шмат намаганняў для пашырэння навуковых ведаў у Княстве. Яе навукова-папулярныя выданні былі выразнікамі ідэй той эпохі. Гэта адна з найбуйнейшых кірылічных друкарняў другой паловы XVIII ст. Выкарыстаннем ва ўмовах працэсаў паланізацыі беларускай мовы ў выданні кніг базыльяне ўздымалі яе прэстыж нароўні з мовамі польскай і царкоўнаславянскай, пацвярджалі яе адпаведнасць патрэбам Уніяцкай Царквы і прыдатнасць для патрэб культуры. На кніжным рынку Вялікага Княства Літоўскага таго часу панавалі выданні базыльян і езуітаў.

***На працягу двух стагоддзяў Уніяцкая Царква назапасіла вялікі кніжны скарб з выданняў друкарняў Вялікага Княства Літоўскага і кніжных ведаў іншых краін і народаў.*** У кожным манастыры мелася бібліятэка – ад некалькіх дзясяткаў да некалькіх сотняў тамоў. Свае кніжныя фонды стварылі ўніяцкія навучальныя ўстановы. Найбуйнейшымі былі базыльянскія кнігасховішчы ў Вільні, Супраслі, Жыровіцах. Праз кнігу, што месцілася на паліцах базыльянскіх бібліятэк, адукаванае беларускае грамадства далучалася да дасягненняў еўрапейскай навукі і культуры. Уніяцкая кніга, будучы адным са сродкаў масавай камунікацыі, больш за два стагоддзі ўздзейнічала на духоўнае жыццё грамадства – фарміравала менталітэт, маральныя традыцыі, культуру народа ў цэлым.

***Беларусь заняла годнае месца ў гісторыі еўрапейскага дойлідства шэрагам архітэктурных шэдэўраў бяспрыкладнага гісторыка-культурнага значэння і высокай мастацкай каштоўнасці, выкананымі ў стылі віленскага (уніяцкага) барока.*** Гэты стыль атрымаў распаўсюджанне ў 30–80-х г. XVIII ст. у культавай архітэктуры Вялікага Княства Літоўскага, у арэале функцыянавання Брэсцкай царкоўнай уніі, на тэрыторыі Віленскага біскупства (Беларусі і Віленшчыны). Ён быў створаны на аснове творчага сінтэзу візантыйскага, заходнееўрапейскага мастацтва, традыцый мясцовага дойлідства і набыў яркую нацыянальную адметнасць. Глебай для ўзрастання мастацкіх прынцыпаў гэтага стылю стала Уніяцкая Царква.

Значную ролю ў фарміраванні ўнікальнай архітэктуры віленскага барока адыграла будаўніцтва ўніяцкіх храмаў пад патранатам полацкага архіепіскапа Фларыяна Грабніцкага. Росквіт стылю звязаны з творчасцю архітэктара Яна Глаўбіца, а распаўсюджванню спрыяла дзейнасць беларускага архітэктара італьянскага паходжання Іосіфа Фантана III і беларуса Аляксея Асікевіча.

Да ліку найбольш дасканалых узораў віленскага барока адносяцца сабор Святой Сафіі ў Полацку (аднаўлены Фларыянам Грабніцкім), Успенскі сабор і Васкрасенская царква ў Віцебску, цэрквы ў Беразвеччы, Барунах, Вольна, Талачыне, Багаяўленская і Крыжаўзвіжанская цэрквы ў Жыровіцах і інш.

Абсалютную большасць уніяцкіх храмаў складалі драўляныя вясковыя пабудовы. На іх долю прыпадала каля 90% драўляных храмаў XVIII ст. усіх канфесій. Да нашага часу ацалелі лічаныя ўзоры ўніяцкага

драўлянага храмабудаўніцтва XVII ст. Значна болей ацалела храмаў XVIII – першай паловы XIX ст. Доктар мастацтвазнаўства Тамара Габрусь апісала і ахарактарызала больш за сотню храмаў, заснаваных як уніяцкія. Сярод выдатных твораў традыцыйнай беларускай драўлянай архітэктуры – царква Святога Мікалая ў Кажан-Гарадку, Пакроўская царква ў в. Покры (Брэсцкі раён), Спаса-Праабражэнская царква ў в. Порплішча (Докшыцкі раён), Крыжаўзвіжанская царква ў в. Гошчава (Івацэвіцкі раён), Спаса-Праабражэнская царква ў в. Олтуш і Спаса-Праабражэнская царква ў в. Хацiслаў (абедзьве Маларыцкі раён), царква Святой Параскевы Пятніцы ў в. Дзівін (Кобрынскі раён), Мікалаеўская царква ў в. Сцяпанкі (Жабінкаўскі раён).

***Уніяцкая Царква актыўна ўдзельнічала ў развіцці і ўзбагачэнні новымі рысамі мастацтва скульптуры.*** Асабліва плённым для скульптуры Беларусі было XVIII ст. з яго арыентацыяй на мастацкі стыль барока. Храмавая скульптура развівалася ў гэты час па дзвюх лініях. Адна з іх арыентавалася на "высокае" заходнееўрапейскае барока. Таленавітыя мясцовыя майстры – разьбяры, скульптары, цесляры аздаблялі новапабудаваныя і старыя храмы, што пацярпелі ад пажараў і войнаў, скульптурнымі алтарамі, якія ўражвалі пышнасцю і хараством, стваралі ілюзію заможнасці. Таксама інтэнсіўна развівалася скульптура "нізавога барока", якая спалучала рысы высокага мастацтва і фальклору. Скульптурная спадчына Уніяцкай Царквы дайшла да нас у вельмі сціплым выглядзе.

Уніяцкая Царква шанавала старажытныя іконы агульнанацыянальнага значэння, развівала іх культ, працягвала ім жыццё (абразы Маці Божай Мінскай,

Маці Божай Жыровіцкай і інш.). Узнікненне ўласнага іканапісу было выклікана неабходнасцю вызначыць сваю ідэнтычнасць, пазначыць сваю асобнасць ад Праваслаўнай Царквы, з аднаго боку, і адносна Каталіцкай Царквы, з другога. ***Іканатворчасць Уніяцкай Царквы развівалася на скрыжаванні візантыйска-"рускай" і заходнееўрапейскай традыцый.*** На працягу XVII–XVIII ст. ва ўніяцкім жывапісе адбыліся іканаграфічныя змены. Ішоў павольны працэс страты рысаў кананічнага праваслаўнага жывапісу і ўзмацнення ўплыву заходнееўрапейскага мастацтва. З другой паловы XVII ст. ва ўніяцкім іканапісе ўзмацняецца творчая самабытнасць і арыгінальнасць. Часам яго росквіту стала XVIII ст.

***Уніяцкі абраз актыўна ўдзельнічаў у фарміраванні і развіцці беларускай школы іканапісу і стаў непаўторнай з'явай нацыянальнай культуры.*** Яму ўласцівыя адступленне ад візантыйскіх іканаграфічных канонаў, сакральны дэмакратызм, этнаграфізм, рэалізм, простанародны тыпаж, імкненне да арнаментыкі, узорыстасці. Гэтыя рысы ярка выявіліся ў іконе "Выбраныя святыя Васіль Вялікі, Рыгор Багаслоў, Іаан Златавуст", якая з'яўляецца характэрнай для ўніяцкага сакральнага жывапісу. У ім выдзяляюцца дзве плыні: высокапрафесійная і народная. У творах таленавітых мастакоў з народа – пры іх свабодным стаўленні да канонаў – сялянскае жыццё ўзнімалася да значнасці сакральнага быцця.

Храм быў месцам канцэнтрацыі ды захавання твораў сакральнага мастацтва. Сярод знакамітых жывапісцаў, звязаных з Уніяцкай Царквой, – Антон Грушэцкі, Валенцій Ванькові, Іван Хруцкі.

***Культурная функцыя Уніі праявілася ў музычным мастацтве.*** Літургічная музыка з'яўляецца эстэтычным феноменам, а храм – свайго роду канцэртнай залай. Пры цэрквах і манастырах працавалі людзі з музычнай адукацыяй і талентам. Буйнымі цэнтрамі ўніяцкай музыкі ў XVII–XVIII ст. з'яўляліся Супрасль, Жыровіцы, Вільня. Важнейшыя помнікі ўніяцкай музычнай культуры – ірмалагіёны, Багагласнікі. Знакаміты музычны помнік Беларусі XVII ст. "Полацкі сшытак" паходзіць з уніяцкага асяроддзя.

Уніяцкая Царква сфарміравала ўласную музычную традыцыю. Яна захавала старажытныя праваслаўныя пеўчыя традыцыі, якія ўзбагаціла заходнімі элементамі ды ўвядзеннем у свой рытуал інструментальнай музыкі. У канцы XVII–XVIII ст. у шэрагу храмаў былі заведзены музычныя інструменты, з якіх найбольш распаўсюджаным стаў арган. Гэта быў час росквіту арганнай культуры ў Еўропе і ў яе кантэксце развівалася музычная культура Беларусі. Першы арган з'явіўся ў Жыровіцах. Пасля Замойскага сабора 1720 г. арганы ўводзяцца нават у невялікія мястэчковыя і вясковыя храмы. Уніяцкая Царква стала важным цэнтрам развіцця прафесійнай музычнай культуры Беларусі, а ўніяцкае духавенства адыграла важную ролю ў далучэнні да яе народа.

Уніяцкая Царква, якая перайшла мяжу культурнай прасторы Праваслаўя, дабудавала сістэму культуры – ***запазычыла і засвоіла тэатральнае мастацтва, у якім у XVIII ст. дамінаваў школьны тэатр***. Гэта быў тэатр асобага роду – ён перакладаў хрысціянскія дагматы на мову сцэны.

***Культурны набытак, створаны ва ўлонні Уніяцкай Царквы, стаў агульнанацыянальнай***

***спадчынай. Шэраг высокамастацкіх твораў, якімі Царква ўзбагаціла беларускую культуру, маюць агульначалавечае значэнне. Сярод падзвіжнікаў Уніі было нямала значных гістарычных асоб, якія ўнеслі ўклад у развіццё асветы, навукі, мастацтва.***

З уключэннем Беларусі ў склад Расійскай імперыі лёс Уніі быў прадвызначаны. ***Рэвізія ўніяцкага культурна-абрадавага комплексу ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. абярнулася вымываннем гэтага пласту нацыянальнай культуры, якое асабліва актыўна ішло ў 1830-я г.*** Адбывалася разбурэнне і перамяшчэнне назапашаных Царквой больш чым за два стагоддзі бібліятэчна-дакументальных калекцый. Праводзілася рэарганізацыя царкоўнага інтэр'ера і пераабсталяванне храмаў. Ішло "выпраўленне" сакральнай архітэктуры. З былых уніяцкіх цэркваў прыбралі абразы, якія не адпавядалі ўсходняму абраду, – іх знішчылі або перапісалі, або перадалі ў каталіцкія касцёлы. Была страчана большасць алтарных карцін. Не прайшлі гэта выпрабаванне і шэраг славутых цудамі абразоў і роспісаў, на якія некалі спадзяваліся многія вернікі, якім прыносілі падзякі і ахвяры, запісвалі кнігі цудаў. На змену творам аўтэнтычнага беларускага іканапісу прыходзіў жывапіс іншакультурнага паходжання. Ахвярай палітыкі "разлатынівання" стала скульптура, аб'ектам рэпрэсій – арганы. Ішло разбурэнне сакральнай прасторы храма і пераакцэнтацыя яе культавых сэнсаў. Мянялі святы, абрады, імёны, мову. Ганенням падверглася ўніяцкая кніга. Гэта быў час знішчэння і "перастварэння" спадчыны Уніяцкай Царквы, час змены культурнай мадэлі Беларусі і культурнага кода народа. Кожны акт ліквідацыі Уніі наносіў шкоду культуры і быў скіра-

ваны супраць беларускай культурнай і нацыянальнай ідэнтычнасці.

Знішчэннем помнікаў беларускай гісторыі і культуры, і не толькі звязаных з Уніяй, вызначыўся мітрапаліт літоўскі і віленскі (з 1840) Іосіф Сямашка. Разам з Мураўёвым-“вешальнікам” ён быў адным з галоўных праваднікоў палітыкі русіфікацыі Беларусі. З ініцыятывы і пад кіраўніцтвам Іосіфа Сямашкі ў цэрквах і манастыроў адбіралі старыя беларускамоўныя багаслужбовыя і іншыя кнігі і замянялі іх на маскоўскія выданні, палілі выданні беларускіх друкарняў, знішчалі або перамалёўвалі старыя беларускія абразы, разбівалі статуі і арганы. Пры ім пачалася перабудова беларускіх цэркваў на расійскі ўзор.

Беларускі гісторык літаратуры і публіцыст першай паловы XX ст. Рамуальд Зямкевіч, збіральнік рукапісаў і рэдкіх выданняў па гісторыі беларускай культуры, занатаваў у сваім артыкуле вобраз Іосіфа Сямашкі ва ўспамінах яго сучаснікаў: *“Сямашка добра вядомы як злы дух і інквізітар беларускага руху; ён яшчэ ў Віленскім універсітэце праз даносы спыніў нацыянальны беларускі рух пасярод клерыкаў-уніятаў, затым ён увёў забарону беларускае мовы ў цэрквах, ён паліў на двары свайго палаца ўніяцкія беларускія абразы, гравюры і кніжкі, якіх цяпер бібліёграфы не могуць знайсці (лік знішчожаных старабеларускіх кніжак, цяпер нікому не вядомых, апрача загалоўка, правышае пяць тысяч экземпляраў!)”*[274].

***Падаўленне ў 1830-я г. уніяцкай традыцыі ўкінула беларускае грамадства ў шокавы стан.***

[274] Зямкевіч Р. Стары Мінск у беларускіх успамінах // Пачынальнікі. З гісторыка-літаратурных матэрыялаў XIX ст. Укладальнік Г. В. Кісялёў. Мінск, 1977. С. 27. https://bfc.rcbs-bar.by/wp-content/uploads/2020/07/pachynalniki.docx

Святары і вернікі абаранялі свае сакральныя рэліквіі – абразы і статуі, кнігі ды арганы, якія выдалялі з храмаў, ды і самі храмы баранілі ад пераварочвання. За супрацiў святароў па загаду Іосіфа Сямашкі каралі эпітыміяй, паніжэннем у пасадзе, аддаленнем ад прыхода, зняволеннем у манастырскай турме, высылкай за межы сваёй епархіі.

Усё XIX ст. працягвалася вынішчэнне помнікаў Уніі і сціранне яе самой са старонак гісторыі і з памяці беларусаў. Аднак настальгія па Уніі і страчанай разам з ёй сакральнай культуры захоўвалася ў народзе да пачатку XX ст., якое зведала тры спробы адраджэння Уніі ў Беларусі: у пачатку стагоддзя, у 1920-я – 1930-я г., у 1989 г.

***Беларуская Грэка-Каталіцкая Царква адрадзілася ў канцы XX ст. на хвалі "мемарыяльнай эпохі".*** Многія народы звярнуліся тады да сваёй даўняй, адабранай у іх памяці, сталі пераглядаць існуючыя версіі гісторыі і адваёўваць выцесненыя старонкі ўласнага мінулага. Для беларусаў, як і для іншых народаў постсавецкай прасторы, аднаўленне слядоў знішчанага або адабранага мінулага стала неабходным кампанентам сцвярджэння ўласнай ідэнтычнасці.

***Люстэркам ідэнтычнасці Грэка-Каталіцкай Царквы і яе вернікаў з'яўляюцца "інстытуты памяці" – архівы і музеі***. Архіў уніяцкіх мітрапалітаў з дакументамі за 1470–1839 г. – адзін з нешматлікіх захаваных да нашага часу буйных дакументальных комплексаў Вялікага Княства Літоўскага. Гэта багаты і каштоўны збор крыніц па канфесійна-культурнай гісторыі Беларусі.

Культурная спадчына Уніяцкай Царквы Беларусі панесла безліч страт. У гістарычных выпрабаваннях

XIX–XX ст. губляліся і гінулі здабыткі цэлых пакаленняў. Тыя сакральныя рэліквіі, якім пашчасціла захавацца, якія здолелі вытрымаць выпрабаванне часам і ўваскрэснуць, сталі важнай часткай беларускай нацыянальнай культуры. Час узмацняе іх каштоўнасць. Захаваныя да нашага часу помнікі Уніі XVII – першай паловы XIX ст. (абразы, скульптуры, прадметы культу, кнігі) захоўваюць Музей старажытнабеларускай культуры, Нацыянальны мастацкі музей і Нацыянальны гістарычны музей Беларусі (усе ў Мінску), Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі. У разнастайнасці музеяў Беларусі мусіць з'явіцца і асобны тэматычны музей гісторыі Беларускай Грэка-Каталіцкай Царквы. Гэты аб'ект, без сумневу, быў бы цікавы для беларусаў і турыстаў з-за мяжы.

***Грэка-Каталіцкая Царква – гэта беларускі сацыякультурны феномен, які мае два розных вымярэнні: як гістарычная спадчына і як сучасная рэальнасць. Звёнамі, што звязваюць у адзін ланцуг сучаснасць з мінулым, з'яўляюцца "месцы памяці".*** Да "месцаў памяці" Уніі 1596–1839 г. адносяцца гістарычныя артэфакты: культавыя прадметы, храмы, рукапісныя і старадрукаваныя кнігі, іконы, дакументы, песні, традыцыі, цырымоніі, рытуалы, эмблемы, паданні, месцы падзей і інш. Шмат якія царкоўныя рэчы (абразы, багаслужбовыя кнігі, дакументы) захаваліся ў былых уніяцкіх, а цяпер ужо праваслаўных храмах. Яны нагадваюць аб часах Уніі.

Памяць пра Унію актуалізуюць і пашыраюць царкоўныя святы і юбілейныя ўрачыстасці ў гонар знакавых гістарычных постацей і падзей; шанаванне святых і святынь; а таксама прысвечаныя Уніі манаграфіі, навукова-папулярныя выданні і фільмы, інтэрнэтрэсурсы і творы сучаснага беларускага мастацтва.

# Спіс ілюстрацый

На вокладцы – карціна Напалеона Орды “Баруны”, 1879 г.

Уводзіны. Грамата Берасцейскай уніі 1596 г. Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Украіны ў Львове.

Глава I. Выданні, прысвечаныя Берасцейскай царкоўнай уніі ды Уніяцкай Царкве.

Глава II. Касцёл Святых Пятра і Паўла ў Барунах з двухпавярховым будынкам (за ім) базыльянскай школы для свецкай моладзі, сярэдзіна XVIII ст. Сучасны выгляд.

Глава III. Кніжны помнік Беларусі. Лексикон Сиречь словесник славенский. Супрасль, 1722. Тытульны аркуш.

Глава IV. Свята-Троіцкая царква ў Вольна, 1768 г.

Глава V. Абраз “Тры свяціцелі” (“Выбраныя Святыя Васіль Вялікі, Рыгор Багаслоў, Іаан Златавуст”) з царквы г.п. Шарашова Пружанскага р-на Брэсцкай вобл. Створаны да 1725 г. Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь.

Глава VI. Укрыжаванне, XIX ст. (грэка-каталіцкая традыцыя). Дрэва (дуб, ліпа), фарба. Разьба.

Глава VII. Інтэр’ер Сафійскага сабора ў Полацку, 1738–1750 г. Сучасны выгляд.

Глава VIII. Супрасльскі Ірмалой, 1598–1601 г. Самы ранні помнік праваслаўнай і ўніяцкай музычнай культуры Вялікага Княства Літоўскага на старабеларускай мове. Першая старонка.

Глава IX. Фрагмент партытуры “Плач прарока Ераміі” кампазітара-базыльяніна Багуслава Згірскага, стваральніка музыкі да спектаклей базыльянскага школьнага тэатра

Глава X. Царква Святых Пятра і Паўла ў Беразвеччы, 1756–1763. Разбурана ў 1960-я г. Справа – яе камп’ютарная рэканструкцыя ў сучаснай забудове.

Глава XI. Малітва Папы перад рымскай копіяй Жыровіцкай іконы Маці Божай. 11 студзеня 2023 г.

# Спіс рэкамендаванай літаратуры


1. Брэсцкая унія як сацыякультурны феномен // Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі: у 6 т. Т. 3: Рэфармацыя. Контррэфармацыя. Барока. Мінск: Беларуская навука, 2013. С. 197–285.
   *http://adverbum.org/b-gistoryja-philasofskaj-dumki-belarusi3*
2. Габрусь Т. В. Сакральнае дойлідства Беларусі: 1000-гадовая спадчына. Мінск: Беларуская навука, 2014. 483 с.
3. Габрусь Т. В. Драўлянае хрысціянскае храмабудаўніцтва Беларусі. Мінск: Беларуская навука, 2020. 318 с.
4. Гіль А., Скочиляс І. Володимирсько-Берестейська єпархія XI–XVIII століть: історичні нариси. Львів, 2013. 288 с.
   *https://shron1.chtyvo.org.ua/Gil_Andzhei/Volodymyrsko-Beresteiska_ieparkhiia_XIXVIII_stolit_istorychni_narysy.pdf?*
5. Гудзяк Б. Криза і реформа: Київська митрополія, Царгородський патріархат і генеза Берестейської унії / пер. з англ. Львів: Інститут Історії Церкви Львівської Богословської Академії, 2000. 16, 426 с.
   *http://irbis-nbuv.gov.ua/cgi-bin/ua/elib.exe? Z21ID=&I21DBN=UKRLIB&P21DBN=UKRLIB&S21STN=1&S21REF=10&S21FMT=online_book&C21COM=S&S21CNR=20&S21P01=0&S21P02=0&S21P03=FF=&S21STR=ukr0002029*
6. Дмитриев М. В. Между Римом и Царьградом: Генезис Брестской церковной унии 1595–1596 гг. М.: Изд-во Московского университета, 2003. 320 с.
7. Канфесійны фактар у сацыяльным развіцці Беларусі (Канец XVIII – пачатак XX ст.) / В. В. Яноўская [і інш.]. Мінск: Беларуская навука, 2015. 496 с.
8. Климов С. М. Базилиане. Могилев: УО “МГУ им. А. А. Кулешова”, 2011. 149 с.
9. Лабачэўская В. А. Мастацтва дзеля славы Божай: саламяныя іканастасныя вароты і царкоўна-культавыя прадметы. Мінск: Беларуская навука, 2018. 263 с.
10. Лісейчыкаў Д. В. Святар у беларускім соцыуме: прасапаграфія ўніяцкага духавенства 1596–1839 гг. Мінск Беларусь, 2015. 717 с.
    *https://www.academia.edu/29468151/Святар_у_беларускім_соцыуме_прасапаграфія_ўніяцкага_духавенства_1596_1839_гг_Дзяніс_Лісейчыкаў_Мінск_2015_719_с_16_л_іл*
11. Лісейчыкаў Д. В. Штодзённае жыццё ўніяцкага парафіяльнага святара беларуска-літоўскіх зямель 1720–1839 гг. Мінск: Медысонт, 2011. 198 с.
    *http://kamunikat.org/usie_knihi.html?pubid=20881*

12. Лыч Л. Уніяцкая царква Беларусі: этнакультурны аспект. 2-е выд. Мінск: Кнігазбор, 2011. 128 с.
*http://pawet.net/library/history/bel_history/lych/28/Уніяцкая_царква_Беларусі:_этнакультурны_аспект.html*

13. Мальдзіс А. І. Францыск Скарына як прыхільнік збліжэння і ўзаемаразумення людзей і народаў. Мінск: Навука і тэхніка, 1988. 33 с.

14. Марозава С. В. Берасцейская царкоўная унія 1596 г. у беларускай гістарыяграфіі. Гродна: ГрДУ, 2002. 132 с.
*http://pawet.net/library/history/bel_history/marozava/04/Берасцейская_царкоўная_унія_1596_г._у_беларускай_гістарыяграфіі.html*

15. Марозава С. “Сваёй веры ламаць не будзем…”: супрацiў дэўнiзацыi ў Беларусі (1780–1839 гг.). Гродна: ЮрСаПрынт, 2014. 218 с.
*http://pawet.net/library/history/bel_history/marozava/10/’Сваёй_веры_ламаць_не_будзем…’:_Супраціў_дэўнізацыі_ў_Беларусі_(1780_–_1839_гады).html*

16. Марозава С. В. Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1839 гг.). Гродна: ГрДУ, 2001. 352 с.
*http://pawet.net/library/history/bel_history/marozava/02/Уніяцкая_царква_Ў_этнакультурным_развіцці_Беларусі_(1596–1839_гады).html*

17. Падокшын С. А. Іпацій Пацей. Царкоўны дзеяч, мысліцель, пісьменнік на пераломе культурна-гістарычных эпох. Мінск: Беларуская навука, 2001. 118 с.

18. Падокшын С. А. Унія. Дзяржаўнасць. Культура (Філасофска-гістарычны аналіз). 2-е выд. Мінск: Беларуская навука, 2000. 111 с.
*http://adverbum.org/padokshyn-unija*

19. Пануцэвіч В. Сьвяты Язафат, архіяпіскап полацкі. Полацак: “Сафія”, 2000. 274 с.
*http://pawet.net/library/history/bel_history/_rhist/0015/Пануцэвіч_Вацлаў._Сьвяты_Язафат,_архіяпіскап_полацкі.html*

20. Полацкія пакутнікі: Збор дакумантаў / Укладаньне й апрацоўка М. Баўтовіча. Полацак: Сафія, 2000. 86 с.
*http://pawet.net/library/history/bel_history/bautovich/002 /Полацкія_пакутнікі..html*

21. Пустаход Т. С. Навукова-педагагічная і асветніцкая дзейнасць М. К. Баброўскага (1784–1848 гг.). Аўтарэферат дыс. … канд. гіст. навук. Мінск, 2017. 24 с.
*https://elib.bsu.by/bitstream/123456789/187759/1/Pustakhod.pdf*

22. Российский государственный исторический архив. Фонд 823 Канцелярия митрополитов греко-униатских церквей. Описи.
*https://fgurgia.ru/object/441117*

23. Саверчанка І. Апостал яднання і веры: Язэп Руцкі. Мінск: Навука і тэхніка, 1994. 71 с.
24. Самусік А. Ф. Адукацыя базыльян на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XVII ст. // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. 2021. Т. 66, № 1. С. 58–67.
*https://vestihum.belnauka.by/jour/article/view/814*
25. Суша А. А. Культурная спадчына грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі ў XIX–XX ст.: інтэграцыя ў сістэму каштоўнасцей і сферу ўжытку новых уладальнікаў // Хрысціянства у гістарычным лёсе беларускага народа: зб. навук. арт. У 2 ч. Ч. 1. Гродна, 2009. С. 343–348.
*https://pawet.net/library/history/bel_history/marozava/82/06/Глава_5.html*
26. Флікоп-Світа Г. А. Іканастасы і алтары грэка-каталіцкіх храмаў Беларусі XVII – першай трэці XIX ст. Мінск: Беларуская навука, 2021. 347 с. (з электронным дадаткам)
27. Цімашэнка Л. Спрэчныя пытанні з гісторыі Берасцейскай уніі // Палітычная сфера. 2014–2015. № 22–23. С. 161–172.
*https://journal.palityka.org/wp-content/uploads/2016/01/05_PS22-23_Cimashenka.pdf*
28. Эпісталяцыя Сьвятога Язафата: Збор дакумэнтаў / Укладаньне і апрацоўка М. Баўтовіча. Полацак: Грэка-каталіцкая парафія Сьвятапакутніка Язафата, 2006. 144 с.
*29. http://pawet.net/files/epis.pdf*
30. Getka J. U progu modernizacji. Ruskojęzyczne drukarstwo bazyliańskie XVIII wieku. Lublin, 2019. 315 s.
*https://depot.ceon.pl/bitstream/handle/123456789/19148/U%20progu%20modernizacji_ebook.pdf?sequence=1*
31. Walczak W. Unicka eparchia Turowsko-Pińska w XVII–XVIII wieku. Struktura organizacyjna. Białystok, 2012. 297 s.
*http://repcyfr.pl/Content/12448/PDF/1.%20Unicka%20eparchia%20turowsko-pi%C5%84ska.PDF*
32. Radwan M. Carat wobec kośćioła greckokatolickiego w zaborze rosyjskim. 1796–1839. Roma–Lublin: Polski Instytut kultury chreścijańskiej, 2001. 504 s.
33. Osadczy W., Jędrzejewska B. Dzieje i martyrologium Unii Św. na Litwie: W świetle żywotu i pamiętników ks. Grzegorza Micewicza, kapłana obrządku unickiego. Warszawa–Radzymin: Wydawnictwo von Borowiecky, 2022. 308 s.

# Змест

Уводзіны ... 3

Берасцейская унія
як з'ява культуры: гістарыяграфічнае асэнсаванне
- З гісторыі пастаноўкі пытання ... 11
- Сучасная беларуская гістарыяграфія ... 15
- Сучасная замежная гістарыяграфія ... 33

Уклад Уніяцкай Царквы ў развіццё адукацыі
- Канец XVI – першая палова XVII ст.: стварэнне навучальных установ на "рускай" адукацыйнай аснове ... 45
- Заняпады і новыя ўздымы актыўнасці ў асветніцкай сферы (другая палова XVII – першая палова XVIII ст.) ... 56
- Апошняя чвэрць XVIII ст.: базыльяне апаноўваюць адукацыйную прастору Беларусі ... 59
- Уніяцка-базыльянская сістэма адукацыі ў першай трэці XIX ст. ... 61

Кніжная спадчына
- Узнікненне кнігадрукавання – цывілізацыйная рэвалюцыя ... 71
- Уніяцкае кнігадрукаванне як фактар культуры ... 77
- Кнігапісанне ... 91
- Інтэлектуальны досвед чалавецтва на паліцах базыльянскіх бібліятэк ... 92

Архітэктурная спадчына
- Пачатак уніяцкага храмабудаўніцтва ... 103
- Архітэктурная спадчына барока ... 107
- Шэдэўры віленскага барока ... 109
- Помнікі драўлянага дойлідства XVIII – першай паловы XIX ст. ... 114
- 1830-я г.: аб "неумножении без надобности" ўніяцкіх бажніц ... 129

Жывапісная спадчына
Традыцыя шанавання старажытных святынь 135
Уніяцкі абраз – з’ява беларускай нацыянальнай культуры 146
Іканаграфічны рэпертуар уніяцкага жывапісу 155
Мастакі, якія распісвалі ўніяцкія храмы і малявалі для іх абразы 157
Скульптурная спадчына
Пластыка ў арганізацыі храмавага інтэр’ера 163
“Высокае барока” ў скульптуры 165
Уніяцкая скульптура “нізавога барока” 167
Дэкаратыўна-прыкладная спадчына
Храм як месца канцэнтрацыі твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва 171
Вырабы людвісарства. Званы 172
Творы ювелірнага мастацтва. Абклады кніг і абразоў 173
“Беларуская рэзь” 175
Іканастасы, алтары 177
Царскія Брамы, выкананыя ў тэхніцы саломапляцення 184
Музычная спадчына
Храм як асяродак музычнага прафесіяналізму 189
Помнікі музычнай культуры 194
Арганная культура Царквы 199
Школьны тэатр
Школьная драма як элемент адукацыйнай сістэмы базыльян 209
Інтэрмедыі 211
Лёс культурнай спадчыны Царквы ў XIX ст.
Рэвізія ўніяцкага культурна-абрадавага комплексу ў Расійскай імперыі 217
Разбурэнне і перамяшчэнне бібліятэчна-дакументальных калекцый 218

Рэарганізацыя царкоўнага інтэр’ера
і пераабсталяванне храмаў 222
Жывапіс іншакультурнага
паходжання – на змену творам
аўтэнтычнага беларускага іканапісу 223
Антыарганная кампанія 228
Скульптура – ахвяра палітыкі “разлатынівання” 230
“Выпраўленне” сакральнай архітэктуры 233
Новыя святы, абрады, імёны і моўныя рэаліі 235
Ганенні на ўніяцкую кнігу 238
Знішчэнне і “перастварэнне” спадчыны 242

Грэка-Каталіцкая Царква як “месца памяці”

“Мемарыяльная эпоха” – кантэкст
адраджэння Беларускай
Грэка-Каталіцкай Царквы 247
Гістарычная памяць
і “месцы памяці” Уніі 250
Юбілейныя даты гісторыі Уніі 254
Архівы, музеі – “інстытуты памяці”
пра Унію 257
Сакральныя святыні 264

Заключэнне 276

*Спіс ілюстрацый* 291
*Спіс рэкамендаванай літаратуры* 292

Навуковае выданне

**МАРОЗАВА** Святлана Валенцінаўна
**МАРОЗАЎ** Сяргей Паўлавіч

# Культурная спадчына Уніяцкай Царквы Беларусі (1596–1839 г.)

*Выдадзена ў аўтарскай рэдакцыі*

Макетаванне, вокладка *Алесь Рыжы, Ілля Рыжы*

Падпісана ў друк 01.05.2023. Фармат 60 × 84 $^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Друк лічбавы.
Ум. друк. арк. 17,3. Ул.-выд. арк. 12,9.
Наклад 100 паас. Замова 05-16/2023.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Таварыства з абмежаванай адказнасцю “ЮрСаПрынт”.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/388 ад 01.07.2014 г.
Вул. Карла Маркса, 11, 230015, г. Гродна.
+375 152 32 00 01
+375 295 87 84 11
www.usp.by

“Сучасная навука разглядае генезіс Берасцейскай уніі на шырокім фоне ўсходневізантыйскай і заходнерымскай культур у кантэксце еўрапейскіх рэлігійна-культурных з’яў.

… сёння ні адзін сур’ёзны гісторык не ў стане запярэчыць аб’ектыўнай абумоўленасці падзеі, якая была рэакцыяй часткі ўкраінска-беларускага грамадства на тагачасныя крызісныя з’явы ў царкве і культуры і на няўдалыя спробы выхаду з іх”.

***Леанід Цімашэнка (Драгобыч, Украіна),***
*доктар гістарычных навук, прафесар,*
*спецыяліст па гісторыі Царквы і рэлігійнай культуры Усходняй Еўропы XVI–XVIII ст.*